ЗЬМЕСТ

Стар.

Прывітаньне Сэкратарыяту БелАПП 3

А. Александровіч. Напор 5

С. Баранавых. Два канцы 83

Ц. Зарэчны. Эльбрусы чалавечага шчасьця 103

Мікуліч. Ліст пра Хацімат 119

В. Палескі. Слова пра гэроя спаранай 125

Нарысы

Р. Мурашка. На паўтаратонцы і „амэрыканкай“ 127

С. Знаёмы. Паходы 144

Краіна павінна ведаць сваіх гэрояў

Я. Скрыган. Гомсельмаш 155

Ліхадзіеўскі і Зарэчны. Поэма пра гэройства 173

Крытыка і гісторыя літаратуры

Ю. Дворкіна. Творчы шлях А. Александровіча 177

С. Куніцкі За ідэёва мастацкі рост рабочых-ударнікаў 189

Е. Гальперына. Праявы вялікадзяржаўнага шовінізму ў літаратуразнаўстве і крытыцы 199

Рабочая крытыка

П. Галавач. Доляры 212

Хроніка 214

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

МАЛАДНЯК

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЯ І ГРАМАДЗКА-ПОЛІТЫЧНАЯ ЧАСОПІСЬ—ОРГАН БЕЛАРУСКАЙ АСОЦЫЯЦЫІ ПРОЛЕТАРСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ

ПАД РЭДАКЦЫЯЙ
ІЛ. БАРАШКІ, П. ГАЛАВАЧА, А. ЗВОНАКА, В. КАВАЛЯ, Я. ЛІМАНОЎСКАГА, А. МОРКАЎКІ, А. СЯНЬКЕВІЧА

ГОД ВЫДАНЬНЯ ДЗЕВЯТЫ

КНІЖКА АДЗІНАЦЦАТАЯ

Центральный государственный архив литературы и искусства БССР
Библиотека
Инв. № 1919-А

МЕНСК ■ БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА ■ 1931

ЦЕНТРАЛЬНЫЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ АРХИВ-МУЗЕЙ ЛИТЕРАТУРЫ И ИСКУССТВА БССР
01

Надрукавана ў друкарні
„ПАЛЕСДРУК“, Гомель.
Зак. № 264—3000 экз.
Галоўлітбел № 17.

Наперад, да новых перамог!

Беларускаму пролетарскаму поэту АНДРЭЮ АЛЕКСАНДРОВІЧУ—братэрскае прывітаньне.

Твой дзесяцігадовы юбілей—гэта ня толькі падагуленьне барацьбы поэты, але ў значнай меры і юбілей усёй беларускай пролетарскай літаратуры.

Творчыя посьпехі поэты—вынік росту пролетарскай літаратуры, ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай політыкі партыі.

Посьпехі поэты яшчэ не гавораць за тое, што ўся работа Андрэя Александровіча па глыбіні партыйнага асмысьліваньня нашай рачаіснасьці, па глыбіні яе дыялектычнага пазнаньня і мастацкі актыўнадзейнага паказу поўнасьцю адпавядае вымаганьням, якія ставіць бальшавіцкая эпоха перад пролетарскай літаратурай.

Баявой задачай Андрэя Александровіча, як і ўсёй беларускай пролетарскай літаратуры, павінна быць барацьба за больш поўнае і глыбокае аўладаньне вышынямі марксысцка-ленінскага сьветапогляду, барацьба за стварэньне пролетарскай літаратурай сапраўдных Магнітабудаў.

Твае посьпехі і перамогі ў значнай ступені забясьпечаны тэй таварыскай ідэйнай дапамогай, што аказвала табе Беларуская Асоцыяцыя Пролетарскіх Пісьменьнікаў, актыўным членам якое ты зьяўляешся. Асоцыяцыя, якая пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі вяла і вядзе змаганьне за гегемонію пролетарскай літаратуры, дапамагла табе пазбавіцца ранейшых памылак, дапамагла стаць на правільныя пролетарскія рэйкі ў сваёй творчасьці і літаратурна-грамадзкай дзейнасьці.

Мы ўпэўнены, што Андрэй Александровіч і далей захавае тую актыўнасьць і дзейнасьць, якую ён праявіў за апошнія часы ў барацьбе за бальшавіцкую лінію ў літаратуры, у рабоце па закліку рабочых-ударнікаў, у барацьбе за мастацтва, вартае вялікай эпохі.

Пад кіраўніцтвам партыі
наперад, да новых перамог!

Сэкратарыят БелАПП'у.

Лынькоў, Бэндэ, Галавач, Сянкевіч, Швэйдэль, Ліманоўскі, Малашэнка, Дунец, Мурашка.

Рэдакцыя часопісі "МАЛАДНЯК".

Андрэй Александровіч

Напор

(П'еса)

Выключнае права на пастаноўку перададзена БДТ2. *Аўтар.*

Кірыл Антонавіч—дырэктар заводу.
Таварыш Клім—сэкратар партколектыву.
Стрэльбін—сэкратар комсамольскага колектыву.
Базыль Агнёў—культпроп комсамольскага колектыву.
Акуліна Карпаўна Заяц—старшыня фабкому.
Зарэмба—бракер заводу.
Юзэфа—яго жонка.
Цімох—іх сын.
Аркадзь Карлавіч—інжынэр.
Крот—дзелавод заводу.
Сенька—тэхнік.
Радзецкі—тэхнік.
Васіліса—работніца, комсамолка.
Галька Гладыш—работніца, комсамолка.
Чыж—рабочы, комсамолец.
Мішка Пачын—рабочы, комсамолец.
Мар'ема—пэнсіонэрка.
Ліпа—прачка.
Кандраль—стараста арцелі сэзоньнікаў.
Клыч—сэзоньнік.
Міколка—сэзоньнік.
Ігнат Зубіла—рабочы заводу.
Рабочыя заводу.
Сэзоньнікі.
Вартавы заводу.
Агітгрупа клюбу.

Мітынг дружбы.

Сыплецца сьняжынкамі змрок. Стромкая сьнежная гара. Моладзь заводу катаецца на санках, каньках. Паступова запальваюцца, апаясваюць гару рознакаляровыя праменьні Дзяўчаты (іх многа) закідаюць сьнежкамі Чыжа; у баку стаіць Радзецкі, пад час усьміхаецца.

Чыж (*да дзяўчат*)

Эх, ідры-тваю кавалку,
сып-надбаў, давай закалку.

Дзяўчаты

Досыць, до'—няхай жыве,
Няхай ратунак просіць.

Васіліса (*паглядваючы на Радзецкага*)

Дапамогу, хай заве,
Мо' тады і просьцім.

Галька

Прызнавайся, чыжык-Чыж,
Што ты хочаш ад жыцьця?

Дзяўчаты

Чыжык, чыжык, што-ж маўчыш?
Ну, заплач, заплач, дзіця...

Васіліса

Раскажы нам, што майструеш,
Мы тады табе даруем.

Дзяўчаты

Раскажы нам, раскажы,
Слаўны майстра, чыжык-Чыж.

Галька

Ты сяброўствам беражы!

Дзяўчаты

Раскажы нам, раскажы.

Чыж

Расказаць? Ну што-ж, магу.
Я сакрэт не сьцерагу.
Я працую над машынай,
Усё прадумана, як сьлед.
Ашчасьлівіцца краіна,
Што краіна, цэлы сьвет.
Адратую на заўсёды,
Узьніму высока сьцяг.
А было—вякам, народам
Скарачала дні жыцьця...

Дзяўчаты

Малацчына!
Вось яна,
Вось машына,—
Навіна.

Чыж

А прызначан апарат
Справе нашай роднай—
Каб... зрабіць усіх дзяўчат
На людзей падобных.

(*Вясёлы іюман. Зноў закідваюць Чыжа сьнегам*).

Дзяўчаты

Ах, ты, Чыжык, ах, Ліхі,
Узяць за крыльлі,—на штыхі!
Сып, дзяўчаткі, сып, сып...

Чыж

Шась—ратуйся, уліп!

(*Уцякае. За ім іоняцца дзяўчыты. Васілісу затрымоўвае Радзецкі*).

Радзецкі

Васіліса!

Васіліса

Што?

Радзецкі

Чакай!
Быць з табой хвіліну дай...
Я хачу, каб зразумела,
Зразумела ты мяне.
Я хачу, каб шалясьцела
Сэрца шэлестам вясьне.
Я хачу, каб мы спаткалі
Удвох прадвесьні карагод.
Я хачу, каб шчасьце хваляй
Выйшла горда з берагоў.

Васіліса

Ой-ей-ё, ай-яй-я,
Песьня гладкая твая.
А мая—ня так багата,
Нават крышку сукавата:
— Кінь сваю круціць катрынку,
Будзь-жа хлопцам, ня... нудзі.

Радзецкі

Васіліса, стой хвілінку,
Зразумей мяне, ня йдзі.
Я сузор'ем шлях усею,

Зоры век ня гаснуць, не!
Знаю, знаю—зразумееш,
Зразумееш ты мяне.
Будзем разам, дружна будзем
Клікаць будучыні ўсход.
Пачуцьцё каханьня будзіць
Лоскат перыстых пяшчот.

Васіліса

Я дзіўлюся, глянеш—сталы,
Малады, перадавы.
А калі такое стала,
Што ён стаў без галавы?
Адрываецца, як можа,
Ад зямлі—кудысьці ўвысь.
Апынуцца ў бездарожжы—
Знача стаць без галавы!
Гэта-ж цені, а ня людзі
Горда ўздыбленых гадоў.
Хочаш, мы сябрамі будзем—
У грамадзе сваіх сяброў.

Радзецкі

Я табе хілюся нізка,
Лепшых дзён ня хочу знаць.
Васіліса, Васіліса—
Не магу я больш маўчаць:
Залацістым лягу лістам
У сонцатканым дыване.
Васіліса, Васіліса—
Ты—адзіная ў мяне.
Будзь-жа чулай, прытуліся,
Сэрцу я твайму пяю.
Васіліса, Васіліса—
Маладосьць прымі маю.

Падыходзіць з-за гары Мішка Пачын у чырвонаармейскай шынэлі, шлёме, за плячыма ранец. Узьбіраючыся на гару ён не заўважае, як унізе катаюцца на каньках Васіліса і Радзецкі.

* * *

Мішка

Цішыня... Нікога ня відно.
Будынку гэтага, як быццам, ня было.
І часу не багата праплыло,
А ўсё зьмянілася... Яно

Здаецца, можа, мне?..
(*Уплдаецца*).
Збудаваны. Раней ня бачыў, не.
Ішлі дзянёчкі, год за годам...
Дзе-ж людзі ўсе?
(*Падымаецца вышай. Убачыў Васілісу і Радзецкага*).
Аднак...
— Таварышы, вы з гэтага заводу?
Вечар добры.

Васіліса і Радзецкі

Добры вечар.

Радзецкі

Та-ак...
Каго знаёмага шукаеце ці як?

Мішка

Ды я, сказаць вам, сам тутэйшы.
(*Падыходзіць да іх*)
Іду... і шлях не прыгадаю.
Багата зьмен наўкола...

Радзецкі

Сьпешна,
Перабудоўваем, будуем, вытвараем.

Мішка

Чаму завод маўчыць,
Работа ваша дзе?

Радзецкі

Сягоньня ў нас выходны дзень...

Васіліса (*спазнала Мішку*)

Мішка, Мішанечка, ай-яй-я...
Думалі, цябе, як жабу, зьеў кітаец.

Мішка

Васіліса-ліса-лісанька-лісічка,
Вырасла, хоць замуж выдавай.
А можа выйшла?

Васіліса

Мішка, ты?

Мішка

А можа і ня я, ня знаю.

Васіліса

Расказвай, брат,
Расказвай, дзе ты быў,
Як змагаўся, што рабіў?
Знаёмся—наш—Радзецкі Ян,
Тэхнік—значыць, практыкант.
(*Вітаюцца*).
Выкладвай нам прыгоды ўсе свае.
Кажы, мо' стрэльнуў кітаянку?
Чаго-ж адзін? Прывёз-бы і яе...

Мішка

Стала шустраю... А вочы, як маланка.
Скажу яшчэ, пасьпееш. Будзе час.
Я—застаюся тут. Аднак зусім прыехаў.

Васіліса

А паказалі вы кітайцам ланцадрас!?

Мішка

Глушылі, эх! А помню, неяк раз,
На ўвесь, ты знаеш, полк была пацеха:
Жыўцом злавілі мы бандыта-афіцэра,
Рускага—з пагонамі, какардай.
Ён пад гармоніку шпарыў „яблычка",
А ўперад—
Сьпяваў романсы нам... І гэткая пагарда,
Хоць і сьмешна наглядаць было.
Быў гад разьюшаны—паручык Сакалоў.

Васіліса

А ўсё-ж кітайцаў бачыў ты, ці не?

Мішка

А як ня бачыць іх, дзіўная...
Што бачыў я, ня ўбачыш ты і ў сьне.
Мы-ж вёрстаў тысячу зрабілі па Кітаі.
Раскажу яшчэ, ці-ж то апошні вечар?

Васіліса

Мішка, ты?.. Ваяка! От, сустрэча...
(*жартліва пяе*)
Вас пабіць, пабіць хацелі,
Вас пабіць стараліся...

Мішка (*пяе ў адказ*)

Мы таксама не сядзелі,
Мы падрыхтаваліся.

(*Васіліса хапіла за ранец і коўбаецца з ім па лёдзе*)

Радзецкі (*злосна ў бок*)

Мне праясьняецца. Эх, людзі...
Ну, што-ж, сьпявай, а... плакаць будзеш.

Васіліса (*пяе*)

У кітайцаў—генэралаў —
Усе ваякі сьмелыя.

Мішка (*пяе ў адказ*)

Ад бальшавіцкае навалы
Пруць, як ашалелыя...

* * *

Уваходзіць грамада моладзі, хто на лыжах, хто на каньках. Праляцелі з гары санкі. Грамада зьдзіўлена паглядае на Мішку Пачын—не спазнае яго. Радзецкі абураны, глянуўшы на Васілісу, кіўнуў рукой і пайшоў.

Васіліса (*да грамады*)

Чаго-ж вы зьбіліся ў кліч?
Гэта-ж Мішка, наш, Пачын!

Галасы

— О, далёка-ўсходні госьць!
— Здароў!
— Як жыў?
— Як маешся?
— Здароў!
— А вырас...
— Дужым стаў.

Галька

Пахарашэў...

Базыль

Кажы, як маешся?

Мішка

А от... як бачыце,—
Акрэп і пасталеў.

Чыж

Эх, любі тваю, качалку,
Жыў-здароў, маё, Міхалка.
(*Працівае руку. Вітаецца*).

Мішка

Малайчына, брат, гарыш...
(*да ўсіх*)

Добры вечар вам, сябры.
Што чутно ў вас? Як завод?
Як жыццё ў вас?

Чыж

Поўны ход!

Мішка

Бачу, бачу...

Чыж

І... няйначай.

Мішка

Хлопцам вырас ты харошым.

Чыж

Хлопец-во, на самы большы!

* * *

(Мост. Праходзяць бракер Зарэмба і дзелавод Крот).

Крот

Я-ж за вас стаю, вядома.
Кажуць... спэц вы падазронны,
Хоць работнік крышку здатны.

Зарэмба

Крышку, кажуць?

Крот

Далікатна...

Зарэмба

Кажуць, кажуць... Хай гавораць.
Гутарка—што вецер.
А ярчэй пасьля віхору
Сонца нам засьвеціць.
(*Іронічна*)
Сходы, мітынгі, нарады—

Крот

Кожны дзень!

Зарэмба

Рэйд, налёт, абход, брыгады—

Крот

Кожны дзень!

Зарэмба

Брыгадзір, рабкор—запоем

Крот

Кожны дзень!

Зарэмба

Усе—ударнікі—гэроі

Крот

Кожны дзень!

Зарэмба

Самакрытыка да поту.

Крот

Кожны дзень!

Зарэмба

Вось і ўся яна работа—

Крот

Кожны дзень!

* * *

(*Моладзь заводу і Мішка*)

Мішка

Мне, здаецца, дзень ці два
З вамі я ня быў, братва.
А два гады...

Сенька

Яно кароткім
Час здаецца нам заўжды.

Галька

Дзіву даўся, пяцігодка
Прабегае ў тры гады.

Мішка

У тры гады... А вы,
Ці здолелі змагацца,
Каб стаць ударнай працай
Пад сьцяг перадавых?
Мінула два гады,
Вялікіх,
Векапомных,
Ня зломных
Два гады.

Базыль

Яшчэ і Маркс казаў калісь,
На многа ўперад не пайшлі.

Галька

І ўсё-ж мы зрух вялікі маем.

Чыж

Бяз толку, што аполкі,
Жывем і... падгніваем.

Сенька

Нагрузка, браце... аднаму
Не пад сілу...

Цімох

А чаму?

Васіліса

Даволі ныць!

Базыль

Мы йдзем наперад!

Галька

Мы не адны!

Васіліса

А хныкаць—крыўда, верна?

Чыж

Верна адно:
Крыўда к табе праз дзьверы,
А ты ад яе праз вакно.

Базыль

Слухай, Мішка, нам тымчасам,
Як сказаў і Энгельс Марксу,—
Праца ёсьць!

Сенька

Хоць з носу кроў!

Базыль

Завод наш мусіць даць Донбасу
Стандартных тысячу дамоў.

Галасы (*як водгульле*)

Стандартных... тысячу... дамоў...

Сенька

Рэспубліцы патрэбен вугаль.
І пад зямлёй ад зор да зор
За зьменай зьмена ударным кругам
Шахцёра зьменьвае шахцёр.
Пасьля напружнай цяжкай працы
Кватэра ўдарніка—барак.

Васіліса

І мы, што сіл, павінны ўзяцца
Будынкі выслаць!

Галасы

Час! Пара!

Галька

Я знаю, знаю—вышлем мы
У Донбас патрэбныя дамы!

Чыж

Пераварот—
Пераварачвае завод.

Базыль

Заводам выйшлі ў перагонку,
Комсамолам зроблены пачын.
Брыгады ўдарныя ўключыліся на конкурс.
Яшчэ і Гегель так сказаў рабіць:
Хто плян у тэрмін здасьць,
Таму аўтомобіль.

Чыж

І фото-апарат дастанецца таму,

Хто працуе—во-як!

Цімох

А чаму?

Базыль

У лесапілцы створана

Вытворчая комуна.

Васіліса

Паміж цэхамі спаборніцтва расьце.

Галька

Мы маем зрух!

Сенька

Варушыцца работа!

Чыж

Калі абед з кампотам...

Базыль

Кавалі выклікаюць нас—
Праграму ўдарную ў адказ.

Мішка

Перавыканаць?

Чыж

Раз.

Базыль

Зьніж сабекошт, хоць прэч галава

Чыж

Два

Базыль

Якасьць уверх, а брак з гары!

Чыж

Тры.

Базыль

І яшчэ, і яшчэ, і яшчэ!

Мішка

Працаваць, працаваць, працаваць!

Чыж

І чатыры, і пяць, і шэсьць!

Галька

Мы ў намаганьні
Першымі станем!

Васіліса

І прэмію—знаем—

Грамада

Мы—атрымаем!

Базыль

Аднак, пакуль парадкам
Турбот і перашкод.
Дарогаю ня гладкай

Ідзе яшчэ завод.
Плеханаў гаварыў,
Як добра не працуеш,
Падточвае прарыў.

Васіліса

Яно па духу чуеш,
Дзе спад, а дзе прыліў.

Базыль

Сьлясарны цэх, ці кузьня
Не дадуць у час
Замкоў ці шпіц, ці лузіны—
Затрыманы заказ.
Вось так і нечакана
Ўразаешся на мель.

Чыж

Якія капітаны,
Такі і карабель.

* * *

Прыбягае Стрэльбін.

Стрэльбін (*убачыўшы вясёлую грамаду, абурана*).
Сабраліся, а ё... Час марудзіць?
Ноч, глядзіце, стукаеце, стукаецца ў грудзі.
Растрачваеце сілы?.. Раніцою—
На работу позьнецеся,—гэр-ро-і...
(*Бачыць, што крыкам ня ўзьдзейнічаеш, просіць*).
Разыходзьцеся...

Галька (*жартліва*)

Максім,
Глядзі, я высахла зусім...

Васіліса

І мне ты сэрца так нараніў...

Стрэльбін

Я... я... ні я... Даволі! Я пытаньне
Аб вас пастаўлю на бюро!

Мішка

Стрэльбін, што з табой? Здароў!

Стрэльбін (*углядаецца*)

А ё... у парадку спрэчак—госьць!

Центральный государственный архив литературы и искусства БССР
Библиотека ИНВ. № 1919-А
Центральный государственный архив литературы и искусства БССР
Библиотека ИНВ. № 87

Галька

Максімка, зжальця, сэрца ў ранах...

Стрэльбін

Ну, як пчала на мёд...
(*расказвае Мішку*)
Удар-ні-кі, нябось,
А не кратае іх проблема прамфінпляну.
За працай—охкаюць,
А як гуляць—гарой?
Пытаньне я пастаўлю на бюро.

Мішка

Працаваць—умова важная, вядома—
Але й на лыжах часам маладому...

Базыль

І Роза Люксэмбург казала бязупынна,
Адно другому шкодзіць не павінна.

Васіліса

А якраз наадварот!

Чыж

Дзе сасна, а дзе асіна,
Стрэльба палец на курок.

Стрэльбін

Языкачос... я... на бюро!

Мішка

Гуляць павінен ты, каб дужым быць,
Загартваны ты павінен быць.

Васіліса

Само неяк па сабе,
А выйшаў мітынг дружбы.

Галасы

— Мітынг дружбы,
— Росту,
— Барацьбы!

Усе (*пяюць*)

Здымем адвечную цьвіль,
Здымем вякоў павуціну.
Поступам нашым нястрымным

Новыя тысячы міль
Браць мы штодзённа павінны.
Сілай магутнаю рушымся біцца—
Ў бой—
Грамадой,
Штурмавой,
Бальшавіцкай!
Хто ў нашы дні перамог
Лютымі змовамі шкодзіць,—
Штурмам прыбою разводзьдзя
Зломім на нашых шляхох,
У нашым вялікім паходзе.
Сілай магутнаю рушымся біцца—
У бой—
Грамадой,
Штурмавой,
Бальшавіцкай!
Гукнем наступнаму дню—
З гонарам на рыштаваньнях:.
Наша жыцьцё—што ўсход сьвітаньня,
Яго маладому разьліву—агню
Слава і песьні змаганьня.
Сілай магутнаю рушымся біцца—
У бой—
Грамадой,
Штурмавой,
Бальшавіцкай!

Вязьмо I

тэра бракера Зарэмбы. Зарэмба і Кандраль п'юць гарбату. Пыхціць самавар. Ля камоды сядзіць жонка Зарэмбы—Юзэфа, разглядае віды-паштоўкі.

Зарэмба

Яшчэ, яшчэ, швагруська, налівай...

Кандраль

Да ўжо-ж, чаго-чаго, а ёсьць вады...
(*наліває*)

Зарэмба

Хруктовы толькі чай.

Кандраль

Такой бяды...
(*шклянка трэскаецца*)
Трэснула... Ну й шкло пайшло,
Ці-ж гэткае раней у нас было?

Зарэмба

Дый гэта брак, адкід, а не тавар.

Кандраль

Які тавар, такі і гаспадар.
Крута...

Зарэмба

Воблаю падкарміваюць гуту...
Гэ, Кандраль, з вялікага палёту
Нізка сядуць...

Кандраль

Бітымі ў балота.

Зарэмба

Ведама, дзе-ж дзенуцца?

Кандраль

І скора.

Юзэфа (*разглядваючы паштоўку*)

А во—Бэрлін. Вось гэта горад!
Мужчыны, гляньце, тут пажыць
За дзень і год аддаць ня шкода.

Зарэмба

О-го і год...

Кандраль

Ну, што там, пакажы?
(*падыходзіць да Юзэфы, разглядае паштоўку*).

Юзэфа (*да Кандраля*)

А колькі тут жыцьцёвай асалоды!..

Кандраль

Гэт, ці-то-ж Бірлін?
Вось да вайны, тым часам.
Там былі
І выдраштрасы...

Юзэфа

А я... хацела-б там пабыць.

Зарэмба

Пабудзеш, дзе-небудзь пабудзеш.

Кандраль

Маліся, выпрасі канчыну галыцьбы,
Маліся зноў—
Пад богам будуць людзі.

Зарэмба

Маліцца, ведама...
Але аднэй мальбой
Ня справіцца з бязбожнай галыцьбой.
А сьціхам трэба, мірна і з падходцам,
Узяць к сабе, бліжэй, вось гэтак, хлопцаў.

Кандраль

То праўда божая...

(*зачэпліваецца за падлогу, падымае бот і разглядае яго*).

Юзэфа

Ад чаю ап'янелі?

Зарэмба

Сукі адны, бракованыя зрубы...

Кандраль (*трасучы ботам*)

Цьвікі савецкія... Нашу нядзелю,
А вышчырылі зубы.
І хата, як з карчоў. А но-овы
Пасёлак для рабочых пабудован.
Затапіць-бы... Сьледу каб ня стала,
Паводкаю няхай папаласкала-б!
Бывала да вайны і зносу ім няма...

Юзэфа (*пра сябе*)

Бывала і я гуляла, расьцьвітала,
Як сукала я бывала захапляла...

Кандраль (*мацае самавар*)

Халодны ўжо...

Зарэмба

Астыў? Юзэфа, падагрэй.

Юзэфа (*бяручы самавар*)

Гэй, Андрэй, душагрэй,
Маладзіцу абагрэй.

Зарэмба

Саграваў я маладзіцу,
Задымілася спадніца.

Кандраль

І праз год, ад граха —
Нарадзілі... курыцу.

(*Сьмех. Юзэфа выходзіць. Круцяць цыгаркі з махоркі. Кандраль бярэ ласкуток паперы, ляпдзіць на агонь, чытае*).

Зарэмба

На сэрцы нуда, а паверыш,
Закурыш і ўсё неяк дарма.

Кандраль (*чытае*)

Рыс-сава-я папера...
(*жартам*)
Папера засталася, а рысу і няма...
(*сьмяюцца*)

Зарэмба

Сягоньня я процантаў сорак
Брак прызнаў...

Кандраль

Сорак?

Зарэмба

Сорак.
І адразу рапарт у кантору,
Што калі такая якасьць—
Ой, дадуць, пішу я...

Кандраль

З гакам.

Зарэмба

І толькі так. Тады—
Дырэктар на дыбы,
Ячэйка за чубы.
Брак. Брак.
Паніка. Брак.
На ногі завод.
На ногі барак.
Крык на дварыі
Пр-ра-арыў...
Сход. Мітынг. Штурмавалі,
Гаварылі і крычалі—
А машыны... прастаялі.
Разумееш? От, з паходцам,
Сьціхам, мірна, але моцна.

Кандраль

І ў мяне арцель—што я,
Справа ў нас—адна, свая.

Зарэмба

Хлопцаў ты сваіх настрой—
Хай спэцоўкі патрабуюць.
Не дадуць—хай грамадой
Усе... як быццам забастуюць.
(*Кандраль садзіцца на канапу*).

Зарэмба

Будзь, швагрась, напагатоў.
Донбасу тысячу дамоў
Завод наш вырабіць змушаюць.
Калі-ж хто сьціхам, мірна—памяшае...

Кандраль

Хай толькі бог благаслаўляе!

Зарэмба

Ты разумееш—дзе паслуга,
Ціж мы нячулыя з табой?
Саветам, знай, патрэбен вугаль.

Кандраль

Як хлопец дзеўцы маладой...

Зарэмба

Бяруць шахцёра, а кватэру
Яму зрабіць павінны мы.
Мы зробім... з гнілак і фанэры,

Каб не ўстаяў аднэй зімы.
Раз—хата дрэнь, раз—вецер шорыць,
Дык менш вугля дадуць шахцёры.
А менш вугля—дык з кожным годам
Усё больш зачыніцца заводаў.
Заводаў зьменшыцца—за тое
Пачнецца болей беспрацоўе.
Ці-ж мы нячулыя з табой?
Пілі сучкі, Кандраль,
Падпільвай прамфінпляны.

Кандраль

А галава ў цябе разумная, што ў пана,
Галовы гэткія бывалі да вайны.
Разумна кажаш... Сукіны сыны,
Ня дзецца ім нідзе, ня дзецца ад труны.

Зарэмба

Ня трэба змовы, не, ня трэба,
Я сам сабе, а ты сабе...

Кандраль

З божай ласкаю, як-небудзь
Іх... з зямелькі саскрабем.

Зарэмба

Баяцца, што?—Наадварот!
Цяпер рабочых недахоп.
А з сьціхам, мірна і з падходцам
Палівай у сэрца воцту.
Змоў ня трэба, не, ня трэба—
Ты сабе, а я сабе.

Кандраль

Сьведкай будзе толькі неба
Ў нашай страшнай барацьбе.
(*Юзэфа прыносіць самавар*).

* * *

(*Уваходзіць дзелавод Крот*).

Крот (*страхае сьнег, расьцірае вухі*)

У-ух-жа скруха-завіруха...
Мабыць вымарозіў вуха.
Добры дзень.

Кандраль

А ўжо-ж, нішто.

Юзэфа

Распранайце паліто.

Зарэмба (*жартліва*)

Прашу... Мірон Саўкавіч Крот.

Крот

Не Мірон-жа я, а Нэр-рон,
І не Саўкавіч, а Саулавіч
І ні Крот-т, а Крод-д,—
На заводзе старшы дзелавод,
Нэрон Саулавіч Крод-д.

Юзэфа (*углядаецца ў вакно*).

А сыпіць сьнег, ой.. сыпіць.

Зарэмба

Гарбату шкляначку выпі.

Юзэфа

Грэйцеся (*паказвае на вуліцу*)
А круціцца заўзятна.

Крот

Дзякую.
(*Юзэфа падае цукар*).
Далікатна.

Зарэмба

Пасьпееце дзякаваць.

Юзэфа

Проша...

Крот (*выскаквае з-за стала*)

Забыўся я скінуць галёшы.
(*Адыходзіць у кут—скідае, але ніяк ня можа іх зьняць*).

Кандраль

Ці-ж гэта галёшы?—Чаўны.
Бывала былі да вайны,
Глыбокія, акуратна.

Крот (*успомніўшы*)

Ага... Далікатна.
Я ўспомніў... Да нас
На завод значыць...
Навіна.

Юзэфа

Сядайце, кубачак...

Зарэмба

Аднак...

Кандраль

Навіна?

Крот

А-га.

Зарэмба

Навіна?

Кандраль

Кажы.

Зарэмба

Расказвай, адразу.

Крот

На завод прыехаў цяпер
З дырэктарам—інжынэр.

Кандраль

З кім?

Крот

З дырэктарам.

Зарэмба

На зусім?

Крот

А-га.

Зарэмба

Малады?

Кандраль

Знатны?

Крот

Ня ведаю.
(*Юзэфа частуе цукеркамі*)
Далікатна.

Зарэмба

Адзін?

Юзэфа

Сямейны?

Кандраль

Комуніст?

Крот

Беспарцейны.

Зарэмба

Глянем, як дуне вецер...

Кандраль

Цяпер інжынэры—сьмецьце.
Да вайны бывала... Ну!

Юзэфа (*налівае гарбату ў шклянкі*)

Выпьем за навіну.

Зарэмба

Чай хруктовы
(*садзяцца за стол*)

Кандраль

Фрукта... сус-стр-рэнім!..

Крот (*дуе на сподачак з гарбатай*)

Будзем здаровы!

Юзэфа

Бярыце варэньне.

Крот

А-га. Забыўся якраз,
Інжынэр, што прыехаў да нас,
Шкоднік. На дзесяць год
Па трыбуналу...

Зарэмба

На наш завод?

Крот

А-га. Справіцца хоча.
Казалі, рабочым
Прышла папера.

Зарэмба

Якая?

Крот

Каб інжынэра
абкручвалі атмосфэрай...

Зарэмба

Гым... абкруцім. Асколак.

Кандраль

Сволач.

* * *

(*Уваходзіць Цімох*)

Зарэмба

Справіцца хоча?

Кандраль

Бач іх...

Зарэмба

Асколак.
Цюрму прамяняў на цюрму.
(*да Цімоха*)
Чаго швэндаешся?

Цімох

А чаму?

Кандраль (*да дзелавода*)

Сволач... Прыехаў зусім?

Крот

Ды я, далікатна, пры чым?

Юзэфа (*да Цімоха*)

Цімачка, выпі гарбаты...

Зарэмба

Яшчэ што, гарбаты яму?

Цімох

А чаму?

Зарэмба

Ты глядзі—у комсамолы—
Я тады цябе прыму,—
Хай ня прымуць!

Цімох

А чаму?

Зарэмба

Што ты чамкаеш? Ч-чаму?
(*Юзэфа абымае Цімоха*)
Крэслам зараз абніму.

Цімох

А чаму?

Зарэмба

Вон адгэтуль, абармот!

Юзэфа

Сьціхні...

Зарэмба

Твой-жа гэта недарод.
От, удаўся. Змый сьляды...

Цімох (*выходзячы*)

А куды?

Крот (*спачуваючы Юзэфе*)

Валаводзяцца па сьвету...

Юзэфа

Не шчасьлівыя яны...

Кандраль

Вось, бывала, да вайны,
Як дубы, расьлі сыны.

(*Цімох адчыняе дзьверы, высунуўшы галаву, зьвяртаецца да бацькі*)

Цімох

Інжынэр прыехаў. За табой
Ён мяне паслаў.

Зарэмба

Цяпер?

Кандраль

Інжынэр?

Юзэфа

К яму?

Зарэмба

А чаму?

Вязьмо II

Пакой Чыжа. На сьценах сярод портрэтаў правадыроў Леніна і Карла Маркса портрэт Ньютона, а поруч чарцяжы. Над усім гэтым лёзунг—„Комсамолец, вынаходкі—аддавай для пяцігодкі". Лёзунг напісаны рукой, вакол тэксту малюнкі знараду—ракеты. Па пакоі раскіданы кавалкі жалеза, дрэва, інструмант. Чыж за работай.

Чыж (*пяе*)

Сяду, сяду ля граніцы—ей-жа-ей.
Закуру сваёй махрыцы—ей-жа-ей.
І на Захад, як разьведка,—ей-жа-ей.
Дым плыве цераз палеткі—ей-жа-ей.
Пераплыў істужкай шэрай—ей-жа-ей.
У палацы Бэльвэдэра—ей-жа-ей.
Там—гармідар, гвалт, адразу—ей-жа-ей.
Адзяюць працівагазы—ей-жа-ей.
Крык падняўся між панамі—ей-жа-ей.
— Зноў рука Масквы над намі—ей-жа-ей.
Я-ж смалю каля граніцы—ей-жа-ей.
Нашу ўкраінку-махрыцу—ей-жа-ей...

(*Струіае трубкі. Захоплены працай крапатлівай і цікавай*)

Чыж

Мне жыцьцё ня мілым будзе,
Як свайго не дасягну.

Э... эх, Чыж,
Не прагарыш!
Целеграф забудуць людзі,
Усю навуку ўскалыхну.
Ліха, гора, сьмех і сорам
Будуць сыпацца, як град.
Э... эх, Чыж,
Не прагарыш!
Цераз пушчы, горы, мора —
Будзе лётаць мой знарад.
Каб пабіць рэкорд сусьветны,
Трэ' цярплівасьць і напор.
Э—эх, Чыж,
Не прагарыш!
Выйдзе, выйдзе—гэтым летам,
Я сусьветны бью рэкорд!

(*Вымярае цыркулем даўжыню трубак*)

Раз... два...
(*Далей лічыць неразборліва*)
Дваццаць два!
(*Бяжыць, вымярае на чарцяжы*)
І тут латва,—
Дваццаць два!..
Эх, ідры тваю ў Эўропу,
Каб удаўся толькі вопыт,
Што матэрыя людзкая
Мой знарад не затрымае...
Э... эх, Чыж,
Не прагарыш!
Пусьціць, выпусьціць—чаго там,
Не дарма мая работа.

(*Зноў бярэцца за працу*).

Каб сусьветны ўзяць рэкорд,
Трэ' цярплівасьць і напор!

* * *

Уваходзіць Цімох з заявай у руках. Дзьверы за ім мэханічна зачыняюцца. Цімох аглядаецца; яго дзівіць: што гэта такое?

Чыж (*да Цімоха*)

Малайчуга-валацуга,
Рад табе я аднаму:
Стань вось гэтак, будзь-жа другам,
Ты ня бойся...

Цімох

А чаму?

Чыж

А чаму?—Хадзі, вось гэта,—
Будзе лётаць па сусьвету.
(*Паказвае чырцёж*)

Цімох

А чаму?

Чыж

Таму, што гэта
Мой знарад, мая ракета.
(*Скарагаворкай*)
Цераз горы, цераз мора,
У любы на сьвеце горад,
Праз муры і цераз люкі
Проста кожнаму ў рукі,
Ці ў Бэрлін, ці ў Будапэшту
Перадам адсюль дэпэшу.
І па сувязі таму
Міравы рэкорд вазьму.
Разумееш?

Цімох

А чаму?

Чыж

Зробім вопыт. Досыць чмекаць,
Стань вось тут, гудзі, як хват.
Трэба, каб праз чалавека
Праляцеў стралой знарад.

Цімох

А чаму?

Чыж

Гудзі, дубіна,
Варушыся, рві прастор!
(*Падыходзіць да ракеты*)
Чалавек, як і машына,
Мае ўласны свой матор.

(*Глядзіць на Цімоха, які бесьперапынку верціцца*)

Гэтак, гэтак... Больш рухава...
Зараз зловіш...

(*Займаецца сваёй ракетай. Цімох кінуў вярцецца, падыходзіць да Чыжа з заявай, у гэты момант Чыж уключае ракету*)

Цімох

Слухай, Чыж,
Рыкміндуй маю заяву...
Ў комсамольцы падпішы.

Чыж (*узяўшыся за галаву*)

Праляцела дзікай галкай...
Во, разьбі тваю, качалку,
Падпішу табе... прышвацькай!

Цімох

А чаму сказаў мне бацька?

Чыж

Стань назад. Гудзі маторам.
Варушыся! Скорасьць... Скорасьць.
Ну, яшчэ!

(*Цімох зноў пачаў гудзець і вярцецца. Чыж сябе супакойвае*)

Узяць рэкорд—
Трэ' цярплівасьць і напор.
(*Чыж зноў рыхтуе к стрэлу ракету*)
Я цябе, цюхцяй, дайму.
Раз, лаві!

(*Трэск ракеты. Цімох круціцца. Падлятае Чыж, Цімох яму выпроставае рукі*)

Няма?

Цімох

Чаму?

(*Чыж шукае ў Цімоха па кішэнях, лазіць за пазуху, глядзіць у валёнках так нэрвова і злосна*)

Цімох (*стаіць, разьняўшы рукі для вобыску*)

Наказваў бацька падпісаць
Рыкміндацыю ў ячэйку...

Вязьмо III

Рэчка. Лёд. Сэзоньнікі-зімшчыкі за працай. Падаюць на круках бярвеньні.

Кандраль

Што, прысядзем падкапіцца?

Міколка

А чаму не закурыць.

1-шы сэзоньнік

Калі ё махра-махрыца.

Кандраль

Ну, давай, брацья, махры.

Галасы

— Ты ня дуры...
— Вымай свой кіцель

Клыч

Магу ўдружыць вам аганьком...
(*шаркае сярнічкай*)

Кандраль

Дый ці-ж я вам распрадзяліцель?
Няхай махоркі дасьць заўком.
Вы, што, працуеце? Агулам
Соцыялізм прышлі рабіць?
Няхай-бы ўласьць пра вас пачула,
І вам прыслала-б закурыць.

2-гі сэзоньнік

Якая ўласьць—такі закон.

Клыч

„На-пяць у тры" бяры разгон

Кандраль

Хэ-хэ-хэ-хэ... Яно з разгону
Соцыялізма ўся—тарчма.

Клыч

Махры няма,
Дык на... талёны.

Кандраль

Чакай, чакай, яшчэ дарма!
Пакуль там тая пяцілетка—
У галаштаньніцу абернецца народ

1-шы сэзоньнік

Не загаварвай, на газэтку.

Клыч (*бярэ газэтку*)

Дымок падпусьцім пад... завод!

2-гі сэзоньнік

Давай-давайце, ліквідуем.

Міколка

Глядзі, арцельна разьдзяры.

Клыч

Бязьмежку, так сказаць, касуем,
На гаспадаркі—хутары.

(*Рвуць газэту на роўныя кавалкі. Кандраль дае тытунь. Закурваюць*)

Кандраль (*задуменна*)

Жыцьцё падмочана...

Міколка

Тым часам,
А ў нас там плодзяцца колгасы...

Кандраль

Дый-не! Ня з гэткіх я! Ой, не!
Мяне колгасам не кране.
Глядзі, густры ўсплывае дым
Увысь, увысь, глядзі ўсплывае—
Але... як і туман
Над поплывам заўжды
Узьнімаецца, затым і асядае.
Вось гэтак і жыцьцё,
І край,
І наша ўласьць,—
Ішла ў гару,
Цяпер садзіцца ў гразь.

Міколка (*выпусьціўшы дым цыгаркі*)

Клубком пайшоў, а ніцам
Рассыпаўшыся—во—
Садзіцца,—во, садзіцца...

Кандраль

Куды-б жыцьцё ні йшло,
Яно к магіле прыдзе...

* * *

Прыходзіць Мішка Пачын.

Мішка

Добры дзень, таварышы.

Галасы

Дабрыдзень.

Мішка

Як бачу курыце?

Міколка

Ў зацяжку...

1-шы сэзоньнік

Перадышка ў працы цяжкай.

Клыч

А-а... дзень добры, шматтыражка...

Мішка

Закурыць—ня ёсьць памылка,
Усё ў свой час.

2-гі сэзоньнік

З вусамі самі...

Кандраль

Былі бывала чышчаныя жылкі,
Тады й закурвалі часамі.
А цяпер...

Міколка

Рады ў гады...

1-шы сэзоньнік

Зацягнем самасею.

Клыч

Што-ж, пацерпім...

Кандраль

Ад бяды
Курыць наўчылася Расея.

Клыч

Дзе-ж набрацца ўсім?

2-гі сэзоньнік

Ня дзіва.

Кандраль

А народ мы церпялівы.

Мішка (*да Кандраля*)

Барада, ты хітра гнеш,
Другое ў разуме трымаеш.

Кандраль

Ня гну і не ганю... А мне
Не закурыць—радзіны праклінаю.

Мішка

Не за-ку-рыць?.. Куры!
Ці-ж не стае махры?

Мікола

Зусім няма ў нас.

Мішка

Як?

Галасы

— Няма.
— Уг-га...
— Даўно не выдавалі.
— Дзярмо жыцьцё!

Клыч

Чарней дзярма!

Мішка

Як бабы, от, засакаталі.
Мне ясна ўсё... Братва,
Ці-ж на плячох у вас не галава?
Ці-ж кожны з вас малы?..
Вы гляньце—там—
Працуюць, як валы!
А вы?... Страхнецеся,
Гуртом—людзкой асадай,
Усім агульную, для ўсіх народзім радасьць!
Рабо-отнічкі... Рабо-очыя!.. Ссычом—
Сакочаце—махры ня-ма, што куры.

Кандраль

Брацья, зьвярні яму,
Махры няхай закурыць.

Клыч

Магу ўдружыць вам... аганьком!

(*Падыходзяць да Мішкі, соваюць яму акуркі, нарачыта дзірліва*)

1-шы сэзоньнік

На, пацягай.

Мішка

Ты ня дуры.

Галасы

— Не зазнавай!
— Маёй махры...

— Курні...
— Яй-яй!

Мішка

Не забывайцеся!.. За працу!

Кандраль

Ня пужай!

Клыч

Таварышу радактару—з рабкораўскім прыветам!

Мішка

За працу, хлопцы! Што-ж, давай, давай.
З прарываў, ганьба вам, ня вылезьці дагэтуль.

(*Паступова рассыпаюцца, бяруцца за працу*)

Голас здалёку

Лес... Давайце лес.

Клыч (*увіваючыся ля Мішкі*)

— Ест!
Хата,
Дзьве сасонкі,
Сам куртаты,
Голас тонкі...

Кандраль

Бывала, помню, да вайны
Нас не ганялі так паны.
А цяпер—
І шкоднік інжынэр
Будзе комісарам.

Мішка

Барада, ня дарам
Ты, як зьвер,
Чакаеш нашай згубы.
Ой, глядзі, паломіш зубы...
(*Выходзіць*)

* * *

Мост. Праходзяць дырэктар заводу, сэкратар партколектыву і інжынэр. Працуюць сэзонныкі. Неўзабаве Кандраль іх заўважае, прыслухоўваецца да гутаркі, затым падбухторвае хлопцаў—„наіскай, далікатна, але моцна"...

Дырэктар

Расьцём, Аркадзі Карлавіч, расьцём.
(*Паказвае на грады лесу*)
Ад гэтуль мы харчуемся сырцом.
Па берагу—запасы нашы, склад.

Кандраль

А мы народ сумленны...

Дырэктар

Не разумею.,.

Клім

Што гэта?

Дырэктар

Падход з цікавым скрогатам.

(*Кран-конвэер з гулам абрываецца*)

Інжынэр

Абрыў!

Дырэктар

Аварыя?

Галасы

— Няшчасьце!
— Што такое?
— Хутчэй!
— Назад!
— Аварыя?
— Бяда!

Інжынэр падыходзіць разам з дырэктарам і Клімам да месца аварыі, за імі сьцяной сэзоньнікі. Відаць прачка Ліпа, што палошча бялізну. Яе крык парушае цішыню.

Ліпа

А ліханька... Я грусікі згубіла...

Інжынэр

Ясна. Неахайнасьць:
Бервяном заблытаны ланцуг—
Загарадзіў дарогу валіку й зубцу.

Дырэктар

Нядбайнасьць толькі?

Клім

Жартуеце з агнём!

Кандраль (*да інжынэра, хітра*)

Першы дзень у нас,
А не пашанцавала.

(*убягае Ліпа*)

Ліпа

Людцы добрыя, праз вас
Я бялізну паласкала—
Раптам... трусікаў ня стала.

Клыч

А спадніцы ня згубіла?

(*Сьмех*)

Дырэктар

Таварышы, ўручную!
Колькі сілы!

(*Дырэктар, Клім і інжынэр выходзяць. Галасы ім у след*: „*уручную*").

Ліпа

Хлопцы, мілыя,
А трусікі згубіла я.

Вязьмо IV

Вечарэе. На сьнежным сумёце Васіліса і Радзецкі.

Радзецкі

Мы народжаны вальсіцца,
Як арлы увысь узьвіцца.
Мы з табой заўжды ў дваіх,
Мы вышэй, вышэй за ўсіх!

Васіліса

А пакуль з тваіх высот—
Пабягу, пайду на сход.
І ня ўдвох, а колектывам...

Радзецкі

Ліквідацыя прар-рываў?
Васіліса!

Васіліса!

Ян!

Радзецкі,

Кахаю!
Ты—мая! А я?

Васіліса (*жартам*)

Ня знаю.

Радзецкі

Васіліса,
Мой гэрой!

Васіліса

Хай зайздросьцяць нам з табой.

(*Цалуюцца*)

(*З-за гары ідзе Мішка і Галька*)

Мішка

Зіма. Зіма прышла.
Гэткая, здаецца, й ня была...

Галька

А сьнегам колькі замяла...

Мішка

Такой бяды!
Пашто нам халады,
Калі гарачая ваўчыцай
Кроў у нас з табой бруіцца.

(*Радзецкі і Васіліса, трымаючыся за рукі*)

Радзецкі

Васіліса!

Васіліса

Ян!

(*цалуюцца*)

Мішка

Як замерзьнеш, дарагая,
Я ў шынэль цябе скатаю,
Прытулю вось так, вось гэтак...

(*ахутвае Гальку ў шынэль*)

(*Ускаквае Стрэльбін, запыхаўшыся: сьпяшаецца на сход. Насустрач ямў Ліпа з падштанікамі ў руках. Стыкаюцца*)

Ліпа (*трасучы падштанікамі*).

Знайшла я трусікі, знайшла
Саколік, глянь...

Стрэльбін

Сыйдзі, смала.
Сьпяшаюся на сход!..

Радзецкі

Васіліса!

Васіліса

Ян!

Мішка (*тулячы Гальку*)

Гось гэтак!..

Ліпа

Мой, саколік, лёс—шчасьлівы!

(*Вылазіць з-пад гурбы сьнегу. Бачыць—пара—адна, другая, трэцьцяя—сха·піўшыся за галаву*).

Чыж

Во, ідрытваю, тваю качалку,
Ліквідацыя прарываў!

Заслона

Другі акт

Вязьмо V

Штурм прарыву. Працуюць комсамольцы, сэзоньнікі: дружна, уздымна, весела. На грудзе лесу сядзіць бракер Зарэмба. На вышцы правяць кран-конвэер Мішка, Сенька і Чыж.

Грамада (*за працай*)

Гэй-жа, разам,
Гэй-жа, разам,
Гэй, адразу,
Возьмем разам!
Гуртам, дружна,
Хлоццы, здужым!
Гэй—

Яшчэ,
Яшчэ,
Яшчэ!

Будзе сонца зьзяць ярчэй.
Што ня стане
У час рабочы,—
У нас і камень
Зарагоча.
Гэй, адважна!
Ўсё для нас!
Дай, наляжам,
Дружна!
... Раз!

Базыль

Клара Цэткін гаварыла:
Перамога там, дзе сіла.

Сенька

За работу!

Галасы

— Дружна!
— Гуртам!
— Штурмам!
— Ротай!

Кандраль

Так загоняць і ў чуму...

(*дастае папяросы, частуе сезоньнікаў*)

Адпачні. Курні хвіліну,
Пасядзіце.

Цімох

А чаму?

Кандраль

Чалавек-жа не машына...

(*Да Цімоха*)

Пасядзі. Скідай хамут.

Надарвешся.

Цімох

А чаму?

Невялікая група сезоньнікаў на чале з Кандралём сядзяць, курыць.

Міколка (*ён працуе ля конвэера*).

Эх, сасоньніца-сасна,
Дні суровыя.
Бервяно да бервяна—
Хата новая.

Мішка

Тысячу, братцы, тысячу—
Выпілiць, выстругаць, высячы!

Міколка

Гаратлівасьці былой
Час пазбыцца нам.
Забудуем шыр балот
Камяніцамі..

Базыль

Таварыш бракер, снасьць
Такое дрэва ў дрызг разможжыць.

Бракер (*добра і не разгледзеўшы*)

Гэткі сук валюту дасьць,
Падавайце, можна!

(*Прыходзіць Радзецкі*)

Чыж

Хлопцы, глянь, маладажон!

Міша

Сьціхамірся, Эдысон!

Цімох

А чаму?

Чыж

Дык гэта-ж ён,
Васілісу—у палон!

Стрэльбін

Ёсьць у нас на гэты конт...

Клыч (*перабіваючы Стрэльбіна*)

Стаў на кон-маладажон!

Стрэльбін

Прынялі мы пастанову!

(*Радзецкі хутка выходзіць*)

Базыль

Трэба так:—работа стане,
Дык гуляй тады ў каханьне.
Роза Люксэмбург пісала:—
— Я змагалася й кахала.

(*Уваходзяць дырэктар і інжынэр. Дырэктар, пачуўшы апошнія словы Базыля, усьміхнуўся. Гэта заўважылі комсамольцы і давай Базыля браць на „ўра“*).

Сенька (*дырэктару*)

Ленінізмам ён багат,
Вандроўны склад любых цытат!

(*Сэвоньнікі, што сядзелі і курылі, убачыўшы дырэктара, адразу ўзяліся за работу*)

Дырэктар

Штурмуеце? Ударнікам вітаньне!

Чыж

Штурмуем—хто прарыў,
А хто каханьне.

Галька

Лес, Кірыл Антонавіч, струной.
Бервяно
Адно ў адно!

Дырэктар

На заводзе—пералом.
Калі прарыў пакрыем—
Значыць мы—усе, гуртом—
Напорам, мужасьцю—бяром
Шляхі перадавыя!

Чыж

Каб сусьветны ўзяць рэкорд—
Трэ' цярпівасьць і напор!

Дырэктар

Напор—аснова ў пераломе.

Чыж

Пераломім!

Галька

І дагонім!

Мішка

А дагнаўшы, перагонім!

Базыль

Перагнаўшы і загонім!

Чыж

А загнаўшы, шыю зломім
Чарчылю, Амаль-Пашы,
За Пілсудзкім Чанкайшы,
Макданальду, П'ер-Дзюрэ,
Чэмбэрлэну, Пункарэ..

(*Сьмех. Дырэктар і інжынэр падымаюцца на вышку аледзець ход працы па рамонту кран-конвэера. Бракер заварушыўся, стаў пільна ўглядацца на якасьць лесу*).

Стрэльбін (*просіць не адрывацца ад працы*)

Хлопцы, браццы...

Бракер (*да Галькі злосна*)

Паглядай,
Што-ж ты брак пускаеш?
Адкідай назад, кідай!

Галька

Гэта брак? Тады... з адчаю
Ўвесь адкінуць трэба сплаў.

Сенька

Відаць са сна...

Базыль

Не разабраў...

Дырэктар

Што такое?

Галька

Брак прызнаў!

(Інжынэр сыходзіць з вышкі і аглядвае бервяно)

Базыль (*да бракера*)

Як сказаў дырэктар наш,
Раней зірні—затым узваж.

Інжынэр

Для работы—годны краж.

(*Бракер, разьвёўшы рукі адыходзіць. Работа пачынаецца поўным ходам. Бракер шустра праходзіць ля грамады. Нарачыта глядзіць за кожным бервяном. Хлопцы сьпяць над бракерам*).

Дырэктар

Плян асіліць—першы ўсход!
Выйдзе ў людзі наш завод.
Весялей на сэрцы стане,
Як цалком здадзім заданьне.

(*Сыходзіць з вышкі*)

Сенька

І шахцёраў мы запросім
На ўрачыстасьць к нам у госьці!

* * *

Прыходзіць заклапочаная Акуліна Карпаўна Заяц.

Акуліна Карпаўна

Таварышы, спыняй работу!
Кропля ў кроплю—пяць гадзін!

Цімох

А чаму?

Стрэльбін

Браточкі!..

Бракер (*да Базыля*)

Што-ты,
Брак ня бачыш? Асадзі!

Базыль

Слухай, бракер, што ты хочаш?

Сенька

Зьмёрз?—Пагрэйся!

Чыж

Дурня корчыць!

Акул. Карп.

Пяць гадзін!

Бракер (*злосна*)

Абавязкова.

(*Дае знак адкінуць бервяно*)

Інжынэр

Гэта брак?
Памылка, што-вы...

Грамада

Го-го-го!.,

Дырэктар

Братва, даволі!

Выйшаў, за ім інжынэр)

Чыж

Грэчкі-сечкі намалолі,
Пакі-пакі бракер з носам...

Акул. Карп.

Пяць гадзін! Даволі, досыць!

Кандраль

Я-ж ня конь і ня вол.

Сенька

Вол—па твойму комсамол?

Кандраль

Што па-твойму—не па-мойму.
Ты ня ўзьдзенеш мне хамут.

Акул. Карп.

Пяць гадзін.

Кандраль (*заве сэзоньнікаў*)

Хадзем.

Цімох

Чаму?

Стрэльбін

Братцы, хлопцы,—скончым меру,
Скончым, хлопчыкі,— за тым
Адпачыць пасьпеем...

Голас

Верна!

Акул. Карп

Пяць гадзін!..

Галька

Асадзі!..

Акул. Карп.

Больш цяпер я не магу,
Вашу-ж моц я сьцерагу.

Чыж (*жартам*)

А на тым на берагу
Раздаюць па пірагу.

Базыль

Дала нам партыя заданьне,
Дык выконваць!

Сенька

З перавыкананьнем!

Мішка

Шчэ ня больш аднэй хвіліны—
Заракоча і машына.

Галька (*просіць дапамагчы*)

Акуліна, падтрымай!

Акул. Карп. (*разьвеўшы рукі, ідзе дапамагчы*)

Пяць гадзін...

Галасы

Давай, давай!

Базыль

Трэ' па-леніску—на славу
Да канца давесьці справу.

Стрэльбін (*за ім астаткія*)

Гэй-жа разам,
Гэй-жа разам,
Гэй—адразу—
Возьмем разам!
Руш, адважна!
Усё для нас!
Дай, наляжам!
Дружна!
... Раз!

(*Пасьля слоў „возьмем разам" Чуж уключае рубільнік—пайшоў працаваць кран-конвэер. Канцоўка—праца машыны, праца—ў ручную. Штурм*).

Вязьмо VI

Пакой Радзецкага. Утульнасьць—па смаку недавучанага провінцыяльнага мешчаніна. Васіліса адна. Ляжыць на канапе, аблажыўшыся падушкамі, чытае кнігу.

Васіліса

Дванаццаць, дванаццаць дзён...
Дванаццаць, дванаццаць начэй...
Здаецца парой, гэта сон,
Зазыўны, узбуджаны сон,
Яркага сонца ярчэй.
Пакорна жыццю прынясу
Свае маладосьці агонь.
Бывае абудзіцца сум,
Імглісты, устрывожаны сум,
І крыўдай кладзецца на скронь,

(*схамянуўшыся*)

Ня трэба нудзіцца і каяцца,
Іграй на вясёлай струне..
... У гультайстве і думкі гультаяцца,
А добра, так хораша мне!
... Дванаццаць сумесных дзён...
Сёньня—трынаццаты дзень.
Звычайна ня позьніцца ён—
Відаць затрымаўся...

(*чуе за дзьверыма крокі*)

Ідзе.

(*Становіцца ля дзьвярэй—рыхтуецца напужаць мужа Адчыняюцца дзьверы. Васіліса—закудахтала. Раптам бачыць, што ўваходзіць не Радзецкі, а з бялізнай у руках Ліпа. Страхаецца, а за тым абедзьве сьмяюцца*).

Ліпа

Гэта-ж пеўня спатыкала,
І вось дай не ўшанцавала.
А глядзіш—са скрыпам, рыпам—

Васіліса (*весела*)

Пявунок?

Ліпа

Ды, што вы, Ліпа,
Пеўнем век свой ня была я.

Васіліса

Ня была... А хто-ж такая?

Ліпа

Ліпа—я, а хто-ж я?—Ліпа!
Шчасьцем хай цябе засыпіць,
Улюблены твой вучоны,
Маладым, здаровым плёнам,
Каб дурэлі на двары,
Карагоды дзетвары—
І ўсе—прахвэсары...

(*Съмех*)

Васіліса

Ну, чаго-ж ты, Ліпка, хочаш?
Зараз муж падыйдзе—ён
Стрэне тут чужыя вочы

Ліпа

Загудзіць, як авадзён?
Эт-жа
(*Дае бялізну*)
Зьверце, як адна
Не бялізна,—бялізна.

(*Васіліса лічыць бялізну. Уздыхнула*)

Ліпа

Уздыхаеш? Ня сумуй,
Будзь ласкавая к свайму,
Будзе хлеб табе й яму.
А што гэну пяцігодку
Адштурмуюць, няўнывай
Век дзяўчыны—век кароткі;
Перасьпееш—што ўдава.

Васіліса (*дастае з камоды грошы*)

Добра. Дзякую... Рубля
Дам цяпер, яшчэ... пасьля.

Ліпа

Пацярплю
І на рублю

(*Успомніўшы*)

Што ў мазгу мне замуціла?
Гэта-ж я сказаць хачу,—
Бялізну тваю мачыла
Бачу... трусікі згубіла.
Страх праняў, як закрычу!..

Васіліса (*трывожна*)

Не знайшла?

Ліпа

Знайшла, чын-чынам,
Як-жа так, ці-ж я мужчына?

(*Падыходзіць да камоды, паказвае ёй падштанікі. Затым склаўшы іх акуратна кладзе зьверху*).

Васіліса

Добра. Дзякую. Заходзь.

Ліпа

Быццам я і не зайду.
Запрашаеш... Мой заход—
Будзе часта. Ў сераду,
Не бядуй, па доўг зайду.

Васіліса

Ідзі ўжо, ідзі.

Ліпа

Іду ўжо, іду.

(*Выходзіць*)

Васіліса (*сэрвіруе стол*)

Надакучала чакаць.
Дзе ён? Доўга так...

(*Паглядае ў акно*)

Змушае,
Турбавацца, выглядаць...
Завіруха, сьцюжа злая...

(*Адыходзячы ад акна*)

Час ідзе зіме сканаць
У разьліве сонечных праменьняў.
Вясна мая, дваццатая вясна,
Мяне вясьнянкаю сустрэне.
Будзе рэяць песьня-ўзьлёт
Маладосьцю сакалінай.
Кроў румянамі пяшчот
Абудзіць горача дзяўчыну.

(*Уваходзіць Радзецкі*)

Васіліса

Зваць вясну... Зазыўная вясна.
Ах, Яня, ты? Так доўга...

Радзецкі

На!

(*Яна кідаецца к яму, ён яе адштурхоўвае, даючы заводзкую газэту шматтыражку*)

Васіліса

Што такое? Што з табой?
Што? Чаму такі настрой?

Радзецкі

Праклятую той дзень, той год,
Калі прыйшоў сюды ў завод.
Дзіч! бандыты! хуліганы!

(*Васіліса, разгарнуўшы газэту, убачыла шарж на Радзецкага, весела засьмялася*)

Радзецкі

Сьмешна? Шайка ў вас адна.

Васіліса

Што ты, Яня, ты-ж ня п'яны.
Так ня скажуць і сп'яна.
Страх які—пра-ма-ля-ва-лі...
Гэта—шарж. Махні, змаўчы.

Радзецкі

Праз цябе ўсё... Бачыш, кралю
З колектыву, гвалт, укралі...

Васіліса

Кінь, ды гэта, мабыць, Чыж.
Ён штукар. Падумаць, гэтак
Хваляваць нутро сваё.

Радзецкі

Кінуць-кіну. Лепш на сьвету!
Ты—праціўна мне... Жульё.

Васіліса

Сьцішся, мне незразумела,
Хто павінен больш крычаць—
Ты—ці я?

Радзецкі

Ты на-да-е-ла,
Не хачу цябе я знаць.
Прападаць ня хочу, чуеш?

Васіліса

Ня крычы ў канцы канцоў!

Радзецкі

На-да-ела... Не хачу я,
Разьвядуся. Чуеш? Чуеш?

Васіліса

На-да-е-ла? Вось як? Кроў
Атруціў маю дзявочу,
Зганьбаваў, зманіў, цяпер—
Надаела? Больш ня хочаш?

Радзецкі

Сьціхні, сьцерва.

Васіліса

Злыдзень, зьвер!
Што, ня праўда? Не скалечыў?
Сорам глянуць мне на сьвет.

Радзецкі

Ціха, сытая авечка.

Васіліса

Як асьлепла... Людаед!

Радзецкі

Знаць магла, што жыць ня будзем,
Ты, як п'яўка, улезла ў грудзі...

Васіліса

Злодзей. Гад. Аддай назад.
Мне. Жыцьцё. Скаціна. Гад.

(*Моцна ўдарае яе. Васіліса замахнулася і ў адказ. Радзецкі люта пачынае біць Васілісу. Яна галосіць, стараецца ўдарыць яго. Хутка* (*падзёрты ўвесь*) *Радзецкі падымаецца, хватае сваё паліто. Яна скрозь сьлёзы*: „*не дарую*“. *Радзецкі сплюнуў*: „*Прастытутка*“—*выбег за дзьверы. Васілісу раз'ядае горкі плач. Незадоўга ўваходзіць Мер'ема*

Мер'ема

Хто галубіцца, той і чубіцца.
Добры вечар у хату... Заўжды,
Лёгка знойдзецца—лёгка згубіцца,
Каб-жа толькі тае і бяды.
Васіліса, трывай, век нязьмераны.
Усё здараецца. Не гаруй.
Вытры сьлёзы свае—сьлёзы шэрыя.
Ты гаруеш па шчасьцю-дабру.
Гаравала я горам-горасьці,
Праклінала сябе і дзяцей...
Будзеш ты яшчэ ў прастор расьці
І гарэць маладосьцю сваей.
Сорак тры гады працавала я
На заводах, была і ў паноў,
А саветы прышлі—нябывалыя,
Ад іх пэнсію атрымала—
За работу, за сорак гадоў.

Васіліса

Пашкадуй мяне. На зусім,
Дарагая Мер'ема, павер
На зусім разлучылася з ім.
Што рабіць? Ашукаў, абакраў,
Дарагая Мер'ема, як зьвер,
Зьняславіў, гразёй закідаў.

Сорам глянуць цяпер на людзей,
Дарагая Мер'ема, сорам.
Мне цёмна ў вачох...

Мер'ема

Разьвей
І сорам, і крыўду, і гора.

Васіліса

Куды мне, куды мне пайсьці?

Мер'ема

Мне ўжо і шэсьцьдзесят скора.
Цярпела ня мала ў жыцьці,
Ня мала цярпела гаворак.
Ставала турботы, клапот,
Адна-жа, няхай я сівею,

Бывала зайдуся ў завод—
Нейкай палёгкай павее,
Завод наш цяперча-за-авод.
Работы—каб толькі сілы!
Людзей не стае... На звод
Стома ўсіх падкасіла.
Гляну на сына—кіпіць
І ночы і дні на заводзе...
Надумала,—век табе жыць,—
быць мне на пэнсіі годзе.
Кропля часамі і камень праб'е.
Патроху, патроху і змогуць...
Хай і ня дужыя сілы мае—
Пайшла я ў завод на падмогу.
Была я ў канторы, заяву дала—
Зьдзівіліся неяк адразу.
Ідзем, Васіліса, вылазь з вузла,
Ідзем, папрацуем разам.

Васіліса

Што я чую? Лепш пятля,
Сорам, гэткі сорам!
Гэткі сорам!.. Лепш зямля,
Чым нядоля, гора.

(*Нэрвуецца. Ходзіць па пакоі. Падаюцца ёй на вочы падштанікі. Яна іх, узяўшы за калошы, разрывае*).

Мер'ема

Супакойся... Трэба жыць,
Ты сябе паберажы.

Васіліса (*у роспачы*)

Больш нічога не кажы.
Не магу я... не магу.

(*Выбягае з хаты*)

Мер'ема

Лёгка знойдзецца—лёгка згубіцца.
Пабягу-ж я, пабягу,
Ад бяды ўсьцерагу.

(*Выходзіць*)

Вязьмо VII

Вечар. Вуліца рабочага пасёлку. Праз замарожаныя вокны хат ледзьве відаць сьвятло. Холадна. Блукае Васіліса. Ідзе п'яны Клыч, прымае Васілісу за гуляшчую.

Клыч

Дождж ідзе,
Суччы клоняцца.
Разрашыце мне
Пазнакоміцца.
(*Васіліса ўцякае. Клыч ёй усьлед*)

Эх, яблычка,
Дый румянае.
Я дзевачка
Нечапаная...

(*Зачэпліваецца нага за нагу. Клыч валіцца, корчыцца ад холаду, засыпае і ўсё цішэй мурлыча:*)

Пастух блудзіў,
Штаны згубіў.
Пастушка ішла—
Штаны...

(*Бяжыць Чыж у клюб. У руках яго розныя прылады вынаходства. Пераскаквае праз сонная Клыча. Усё бліжай і бліжай чуваць песьня*)

Яго маладому разьліву-агню
Слава і песьні змаганьня.
Сілай магутнаю рушымся біцца,
Ў бой
Грамадой,
Штурмавой,—
Бальшавіцкай!

(*Грамада моладзі прыблізілася і ўбачыла Клыча*)

Галасы:

— Хлопцы, ёж!
— Замёрз!
— Ня дзіва!

Сенька

Гэта—ёрш,
Гарэлка з півам.

Галасы

— Ручкі ў скручкі,
— Ножкі ў качарэжкі.

Сенька

Ад палучкі
Зблыталіся сьцежкі.

Базыль

Казаў калісь Будзёны так:
Разбудзіце і—ў барак.

Сенька

Верна, хлопцы, дай разбудзім
(*пачынаюць тузаць*)

Галасы

— Як забіты!
— У бок удар!
— Страхані мацней, за грудзі!.
(*Падыходзіць Кандраль*)

Галасы

— От заснуў...

(*Адзін з грамады схіляецца над Клычам і пад самым яго вухам крычыць:*)

— Пажар! Па-жар!..
(*Усе рагочуць. Клыч не шалахнецца*).

Кандраль

Што за гвалт? Што за зьдзек?
Перад вамі ча-ла-век!
Сорам вас сарамаціць.
Комсамольцы... Біць вас, біць!

Голас

Сьпіць, як бітая скаціна!

Базыль

Палец—во—ўсадзіў у рот.

Голас

П'е й закусвае венглінай

Кандраль (*да комсамольцаў*)

Ну, й народ пайшоў, н-народ.

Голас (*жартам*)

Паж-жар, ратуйся...

Сенька (*да Кандраля*)

Півасек,
Перад табою ча-ла-век,
Падымі яго, ня хныкай.

Базыль

Як сказаў калісьці Рыкаў.
(*сьмяюцца, ідуць у клуб*)

Кандраль (*калі моладзь зайшла ў клюб*)

Свалата, парцейнай масьці...
(*пачынае тузаць Клыча*)
Уставай, дубіна, ну!
Я цябе, як сатану,
Раскрышу, парву на часьці.

(*П'яны ня рушыцца. Кандраль плюе яму ў твар, бярэ за галаву і цяіне, як бервяно, у барак. Зноў пуста на вуліцы. Вечер. Сьцюжа. Сіратліва блукае Васіліса. Ідзе Цімох з пачкаю газэт-шматтыражак*).

Цімох

Вось касілка „Пілка" наша,
Завадзкая шматціраша.
(*Заходзе ў хату. Стукаецца*)
Адамкні. У дом пушчай...
Свой. Ня бойся. Адчыняй.
(*Пайшоў у хату*)

(*З бараку выходзіць сэзоньнік. Глянуў на бакі—нікога няма. Пабег у хату бракера. Чыж выбег з клюбу—пабег па вуліцы*).

Цімох

Хто газэткі ня чытае,
Той палітыку ўважае...

(*Заходзіць у суседнюю хату. Выходзіць з хаты бракер і сэзоньнік. Падыйшлі к бараку. Бракер стукнуў адрыўчата тры разы. Пачуўся голас Кандраля „хто"—і адказ бракера „свае". Выходзіць з двара Цімох, стукаецца ў барак. Голас Кандраля—„хто там"?*

Цімох

Я!

Кандраль

Назад.

Цімох

Чаму?
Газэткі вам не аднаму.

(*Упускаюць Цімоха ў барак і ў момант з гулам-сьмехам выкідаюць яго на вуліцу*).

Бракер.

Ой-жа дам табе я ўтруску...

Цімох

Комсамольскую нагрузку
Сам прасіў мне даць...

Кандраль

Хамут! (*ідзе ў барак*)

Бракер

Нос раскваШу (*ідзе ў барак*)

Цімох

А чаму?
(*Паціскае плячыма, ідзе далей*)

Цімох

Я палітыку разношу,
Разьбірайце ўсе бясплатна!
(*Сустракаецца з ім Крот з жонкай*).

Цімох

Вам газэтку проша, проша!

Жонка

Вельмі ўдзячны...

Крот

Далікатна!

(*Крот з жонкаю ідуць у клюб. Цімох—далей па вуліцы. Разьлівам звонкага сьмеху ўбягае Галька за ёй Мішка, ён ловіць яе і ля клюбу за фасадам зьнікаюць. Зноў заклапочана бяжыць у клюб Чыж. Адчыняюцы дзьверы ў клюб. Чыж асьвятліў Мішку і Гальку, што асымаліся ў кутку. Сьвятло ўстрывожыла іх. Галька бяжыць, робіць круг па вуліцы.*)

Галька

Больш ня зловіш!

Мішка

Я?

Галька

Спрабуй!
Зловіш—моцна пацалуй!

(*Бяжыць у клюб, за ёю Мішка. Ідзе невялікая грамада моладзі пяючы—„Ты марак—прыежы сам-сабою“... Зноў нікога на уліцы—толькі ве-*

цер сьцюдзёны байдосуе. Адчыняюцца дзьверы барака. Чуваць, як на гармоніку хтосьці грае „Разлуку“... Выходзіць Кандраль і бракер.

Бракер

Змоў ня трэба, не, ня трэба,
Ты сабе, а я сабе.
(*хутка ідзе да хаты*)

Кандраль (*яму ўсьлед, спакойна*)

Я сабе, а ты сабе.

(*Калі бракер зайшоў у хату, Кандраль глянуў на неба, перахрысьціўся і пайшоў у барак. Завіхаючыся ідзе ў клюб Акуліна Карпаўна*).

Акул. Карп (*амаль ля кожнага вакна*)

У клюб, у клюб—жанкі, мужчыны,
У клюб! Дзевятая гадзіна.
Таварышы, культурны адпачынак..

(*Вецер. З гулам-гоманам адчыняюцца дзьверы барака. Выходзяць з сундучкамі, клумкамі сэзоньнікі. З гулу-шуму толькі і чуваць выкрыкі слоў*:)

Сэзоньнікі:

— Мы ня буйвалы!
— Ня коні!
— Норма дзе?
— Мы не валы!
— Уціскаюць-ціснуць!
— Тронім!
— На куцьцю ў свае вуглы!
— Досыць кроў смакталі...
— Гады!
— Чаго сталі?
— На каляды.

Клыч (*ледзьве стаіць на нагах*)

Цёпла хата,
Дзьве сасонкі.
Хто да дзевак,
Хто да жонкі...

Адзін з сэзоньнікаў

У хату сьвятам
Я і ты...

Кандраль (*голасна*)

На цягнік пара, браты!

З грамады сэзоньнікаў.

Сьмела дамоў ідом,
Да баб і дзевак,
З сабою мы нясом...

(*Ідзе дарогай у клюб з грамадой Стрэльбін. Загараджвае дарогу*)

Стрэльбін

Што? Куды? Таварышы, куды?

Кандраль

Усып, брацья, на жалуды.

Сезоньнікі

— Разані!
— Шчанё!

З грамады Стрэльбіна

— Задзіра!

Сэзоньнікі

— Ткні!
— Дарогу!

Стрэльбін

Што вы?

Сэзоньнікі

— Сьмірна!
— Маць тваю!..
— Вазьмі за грыву!

Стрэльбін

Вы-ж падумайце, прарывы!

Кандраль

Хто-ж зрабіў іх?

Сэзоньнікі

Крый да хаты!

Стрэльбін

Што?

Сэзоньнікі

— Няштокай.
— Эх, шчаняты!.

(*Пачынаецца бойка. Выбіваюць з клюбу, пачынаюць іх разьнімаць. Увесь час праз дзьверы, высунуўшы галаву, баязьліва наглядае бракер*).

Чуваць з гурту:

— Ачумелі?
— Хуліганы.
— Шчэ паддай!
— Пад ножку?
— Гад!
— Праваслаўныя.
— Наганам.
— Сьціхамірцеся.
— Назад...
(*Іх разьнімаюць*)

Мішка (*запыхаўшыся*)

Чаго вы, хлопцы, чорт вас знае,
Чаго, чаго вам не хапае?
(*да Стрэльбіна*)
А ты с сваёй гарачкай сядзь!

Сэзоньнікі:

— Мы ня буйвалы!
— Ня коні!
— Мы завод ня хочам знаць!
— Як скаціна...
— Горш скаціны прымушаюць працаваць!

Мішка

Хто?

Комсамольцы

— Калі?
— У якіх краінах?

Акул. Карп.

Не ламайце дысцыпліны.
(*Ідзе інжынэр*)

Комсамольцы

—Хто?—Калі?

Сэзоньнікі

— Калі?—Цяпер!

Мішка

Вось, таварыш інжынэр,
Без падстаў зусім народ
Пакідае наш завод.

Інжынэр

Я ня ў курсе... я іду...
У чым тут справа, я ня знаю.
Выбачайце...
(*ідзе ў клюб*)

Сэзоньнікі

— Заядуць!
— На цягнік пара!
— Сплываем!..

(*Рухаюцца ісьці.—Насустрач ім ідзе дырэктар*)

Срэльбін (*дырэктару*)

Пачыналі расхадзіцца
Вы чаго? куды?—Спытаў,
А яны... адразу біцца.

Сенька

Пэўна нехта падкаваў...

Дырэктар

Таварышы... Таварышы... Зьдзіўляе
Ганебны ўчынак ваш. Я не пайму,
Чаго? Ну, што вас данімае,
Завод пакінуць, што змушае
Падумайце, таварышы, чаму?

Сэзоньнікі

— Мы не валы!
— Ня буйвалы!
— Ня хочу!

Дырэктар

Чаго ня хочаш? дай адказ.
(*няпэўны гул*)
Таварышы, такі адказны час,
Ганьбуеце імя сваё—рабочых.
Будуем мы...

Сэзоньнікі

— Не залівай!
— На цягнік пара.
— Гайдай!
— Сып, ударнічкі, дамоў!

Мішка

Адумайцеся!

Клыч

Высасалі кроў...

Клыч зачэпліваецца, з плеч валіцца мех, і пасыпаліся банкі консэрваў, цукар і інш. Рогат. Сэзоньнікі кінуліся хватаць. Бракер хітра падыходзіць і пытае ў дырэктара).

Бракер (*цішком*)

Кірыл Антоныч, што такое?
У чым тут справа? От, гэроі.

Сэзоньнікі (*да Клыча*)

— Капцінармус, сукін сын,
— Абкрадаў?!
— Паёк наш зводзіў?!

Клыч

Я, бра-точ-кі... не... адзін.

(*Кандраль падышоў да Клыча каб забраць яго*).

Сэзоньнікі

— Абкрадаў?
— Не дадаваў?
— Браў?
— Злодзей!

Кандраль (*баронячы Клыча*)

Супакойся, сьцішся, годзе!

(*Прыходзіць таварыш Клім і адразу да яго—бракер. Кандраль адводзіць Клыча ў бок, затым у барак*).

Бракер

Таварыш Клім, што тут такое?
У чым тут справа? От героі...

(*Клім махнуў рукой, падышоў да Мішкі*).

Дырэктар

Таварышы, ня варта дурня строіць.
Каго за нос надумалі вадзіць?
Падвыпілі? Катайце адпачыць.
Верна, хлопцы?

(*нявясныя рухі*)

З песьняй баявою
Заўтра зноў за працу, штурмаваць,
Вялікае, агульнае,
Жыцьцё свае ствараць,

Сэзоньнік (*расчаравана*)

Эх-ма...

Клім

Паёк вам выдавалі?
Выдавалі!
На арцель?
На арцель!
А мазгі вам бунтавалі?
А пайкі ў вас абкрадалі?
Досыць! Кіньце карусэль.
Разьбяромся заўтра. Досыць!
Я валынкі не цярплю.

Мішка

Хто п'яны—катай на просып!

Сенька

Хто цьвярозы—з намі ў клюб!

(*Дырэктар і Клім пайшлі ў клюб*)

Мішка

Верна, хлопцы, кінь валынку.

Сэзоньнік

Не пайду (*і рупліва пайшоў у барак*)

Сенька

Мяхі скідай...

Акул. Карп.

У бараку скідайце скрынкі
І—у клюб—давай,—давай.

Міколка

Эх, заблытаўся зусім...

Сэзоньнік 1-шы

Маць тваю жыцьцём такім...

Сэзоньнік 2-гі

Вот... і выпіў бы сітры...

Мішка

Хлопцы, хопіць, не хандры.

(*Запальваецца электра-ліхтар на фасадзе клюбу*)

Акул. Карп.

У клюб! У клюб, абавязкова!

Чыж (*высунуўшы галаву з дзьвярэй*)

У мяне ўжо ўсё гатова.

Базыль

Луначарскі нават знае:
Клюб—сьвятло, а цьма—піўная.

Сэзоньнікі

— Пілі ў барак,
— Зальлем на зуб!
— Эх, цёрты мак,
— Загляну ў клюб!

(*Адны, перамяшаўшыся з комсамольцамі ідуць у клюб, другія бурлыкаючы ў барак. Застаўся толькі Міколка. Узяў свой сундучок і задумена павольна ідзе ў клюб. Качаецца ад ветру ліхтар на фасадзе клюбу. Холадна. Васіліса падыходзіць—чытае афішу*).

Васіліса (*у роспачы*)

Не дараваць злачынак мой.
Я горш за ўсіх. Ня жыць бядой.
Мне цяжка жыць не з грамадой...

Вязьмо VIII

Клюб. Прэзыдыум. Трыбуна. Заля аздоблена лёзунгамі: „Шчыльней пролетарскія рады за пяцігодку ў чатыры гады", „Пад кіраўніцтвам ЦК КПБ загартуем сябе ў штурмавой барацьбе", „Ударнікам шмат у тэрмін дамо—1000 нашых стандартных дамоў". „Узброім трактарамі колгасы—ліквідуем кулацтва, як клясу".

Акул. Карп. (*адчыняе сход*).

Ціха. Ліквідуйце лямант.
Слова. Стрэльбіну. Прыняць
Мы прымушаны рэглямант.
Для дакладу 35.

Голас.

І ніводнай больш ня даць.

Акул. Карп.

Таварыш Стрэльбін—35.

Стрэльбін

Палажэньне ўнутраное
Ў нас, як мур. Адно дзівіцца,
Ўзрастае баявое
Пяцігодкі будаўніцтва.
І расьце ўсё вышэй, вышэй
Крышыць гніль ударным маршам.
У краіне вольнай нашай
Нават сонца ўпрэглі ў дышла...
Моц энэргіі праменьняў

На ўгнаеньне карыстаем.
Кулакоў, паноў карэньне,
Прэч, як клясу, выкідаем.
СССР—брыгада, крэпасьць.
Як маяк сусьветнай славы
А каго... забрала сьлепасьць,
Ён блукае—ўлева,—ўправа.
Праміком, напорам, проста
Ўдарнай працай заўладалі—
Перамогу, росквіт росту!
Хай жыве таварыш Сталін!
(*Вопіескі*)
Ясна вам цяпер, якое
Палажэньне ўнутраное.
А на Захадзе трывога.

Акул. Карп. (*да Стрэльбіна*)

6 хвілін вам засталося.

Стрэльбін

Там паноў бяруць пад ногаць,
Крызіс голадам галосіць.
Беспрацоўных там мільёны,
Ў іх калёнах кроў ня стыне.
А ідуць пад сьцяг чырвоны
Пролетараў батальёны.
Сьмерць фашысту Мусаліні.
А з Гішпаньні тэлеграма,
Што агонь і дым краіну,..

Голас

Старшыня, давай рэглямант!

Акул. Карп. (*да Стрэльбіна*)

Вам яшчэ адна хвіліна.

Стрэльбін

Панна Польшча ў завірусе,
І ў Заходняй Беларусі
Жах памешчыкам нагналі.
Крый Пілсудзкага параліч!
І ў Нямеччыне, тым часам,
Бой ідзе рабочай клясы.
Звар'яцеў Цэргібель шэльма,
Хай жыве таварыш Тэльман!
Рух плыве па ўсіх краінах

Барацьбы рэволюцыйнай.
І ў Кітаі на шышы
Аблажылі Чан-Кай-шы.

Акул. Карп.

Вы рэглямант скарысталі.

Стрэльбін

Мне хоць дзьве...

Голас

Даволі. .

Стрэльбін

Мне—

Скончыць думку.

Голас

Мы чыталі!

Акул. Карп.

Поўхвіліны і... канец.

Стрэльбін.

Так-што крызіс і трывога
Толькі трэба нам падмогу
Даць рабочым, што ў вастрогах.
Праца—возьме перамогу!
Дык-жа ўперад, шляхам верным
Нам—
і гонар і ўрачыстасьць!
Ім
разьюшаным фашыстам
Сьмерць
над знакам Камінтэрну!..
(*Воплескі*).

Акул. Карп.

Слова мае рабочы-ударнік,
Былы бяспрытульны
Таварыш Чыжэвіч.

(*Авацыя. Ідзе Чыж, за ім Цімох*).

Акул. Карп.

15 хвілін вам і... канчаткова.

Сход

— Дай гаварыць!
— Не абмяжоўвай!

Акул. Карп.

Без рэгляманту?

Сход

— Давай!

— Ты прысядзь, не зацiскай!

Чыж

— Я, таварышы, каротка.
Я... усім сэрцам моцна веру,
Тэмпы нашай пяцігодкі
Ў тры Амэрыку абмераць,

Сход

— Ты давай пра вынаходкі.

— Мы ўжо ведаем даклады...

Чыж

Я, таварышы, каротка...
Я... знайшоў-змайстрыў прыладу
Хуткасьць сувязі. Да гэтуль
Шчэ ня ведала плянэта.
Гаварыць і як і што тут,
Вельмі доўгая работа.
Лепш я вам продэманструю,
Як яна ў мяне працуе.
(*Воплескі. Чыж падыходзіць да карты*)
Гэта вось знарад-ракета,
Будзе лётаць па сусьвету:
(*скарагаворкай*)
Праз горы, цераз мора,
У любы на сьвеце горад,
Праз муры і цераз люкі,
Проста кожнаму ў рукі,—
Ці ў Бэрлін, ці ў Будапэшу—
Перадам адсюль дэпэшу.
Мы, таварышы, для вас
Зробім вопытны паказ.
(*Цімох становіцца на сярэдзіну*).

Чыж

Умаўляемся хвілінай
Што цяпер ён за Бэрлінам,—
Шумна будзе браць прастор
(*адыйшоўшы да ракеты*)
Чалавек, як і машына
Мае ўласны свой матор
Пачынаем.

Голас

А чаму?

Цімох

А таму—
Чалавек, як і машына,
Мае ўласны свой матор.
(*Пачынае вярцецца*),

Чыж

Варушыся... Тэмпы... Дзякуй.
Раз! Два! Тры!

(*Ракета сваім хвастом, як прыклад вінтоўкі, аддае назад. Ударае Чыжа—Чыж валіцца. У залі ўздымаецца рогат, гул*).

З залі

— Што, Чыж,—
Не ляціш?
— Ён цяперка над Чыкага!
— А ляцеў з якой адва-гай...
— Раз-два—
Ў дрызг—галава!

Акул. Карп.

Я вам слова не давала,
Ціха!

З залі

— Во не ўшанцавала.
Уверх нагамі-вынаходца.

Акул. Карп.

Вам рэглямант...

Стрэльбін

Досыць, хлопцы!

Акул. Карп.

Досыць. Ня зрывайце сход!

Галасы

— Хуткасьць сувязі...
— Палёт!
— Чыж, сядай—махні ў дарогу,
— Раз і... з печкі на падлогу!

Акул. Карп.

Дысцыпліну парушаем.

Стрэльбін (*адсоўвае Акул. Карп.*)

Сходам ты не аўладаеш.
Кінь...

Акул. Карп.
Чаму?
Стрэльбін
Пусьці... Цішэй
Дысцыпліну парушаем!
Голас (*да Чыжа*)
Падкатай мяне, ей-ей!
(*І Стрэльбін ня можа супакоіць сход. Сьмех, гоман ня сьціхае. І толькі тады, калі на трыбуне зьяўляецца Клім, сход паступова падпарадквасцца цішыне*),
Клім
Няпрыстойна. Не да твару.
Што-ж, магла памылка быць,
Чыж—сьмякалісты таварыш,
Здольны новае стварыць.
Для вытворчасьці ў парыльні
Вам, вядома, даў ён шмат.
Мы-ж яго прэміравалі
Хлопец здатны, слоў няма.
Хай-памылка, што-ж дзівіцца?
Церпіць ён і так удар.
Мы пашлем яго вучыцца,
Будзе творца і змагар.
Базыль (*спачываючы Чыжу*)
Зіноўеў казаў, ідучы на мяцеж:
Сем адмерай—раз адрэж.
Стрэльбін
Слова даецца цяпер
Аркадзь Карлавічу...
(*Шопат прабягае па залі „інжынэр“*)
Інжынэр
Таварышы! Работа
Наіўная... Адно
Зярно ідэй палёту—
Здаровае зярно.
Напорам браць высоты,
Конкрэтна маем сьлед,—
Проблемы пералёту
Газавых ракет.

У дні—крыві і лоску,
Як правіў царскі бот,
Профэсар Ціалкоўскі
Марыў пра палёт.

Цяпер ажыццяўляе,
І на зьдзіўленьне ўсім—
У савецкім толькі краі
Росквіт творчых сіл.

(*Паказваючы на конструкцыі Чыжа*)

Наіўна хай. Мы бліжай
Павінны стаць. Адно—
Зярно ідэі Чыжа—
Здаровае зярно.

Яно закаласіцца.
На ўчобу ўзяць упор.
І будуць бліскавіцай
Ракеты браць прастор!

(*Рэдкія воплескі*)

Галасы

— Ад сьмеху мы паплакалі...
— Концэрт!
— Даеш спэктаклі!..

Стрэльбін

Базылю Агнёву-слова
Зачытаць програму.

Акул. Карп.

Поўхвіліны, ня суровы
Для інформацыі рэглямант.

Базыль

Зараз, згодна дырэктывы,
Мы пачнем другую частку.
Шчыра просім, калі ласка,
Сесьці ціха, церпяліва,
Не сьмяяцца і ня пляскаць.

(*Апускаецца вялікае палотнішча-насьценгазэта — „Чырвоная Пілка“. Сход у голас чытае шапку: „Промфінплян пад пагрозай зрыву. Лесапільны цэх выканаў заданьне на 37 проц. Комсамольцы наладзілі суботнік для ліквідацыі прарыву. Рабочыя і работніцы, падхапіце пачын комсамольцаў!“*)

Базыль

Перадавую прачытае
Наш рабкор таварыш Гаеў.

Гаеў (*чытае*)

Партыя і ўрад усклалі ганаровы
абавязак выпускаць стандартныя

дамы пахцёрам-ударнікам Донбасу.
Як выконваецца плян? Лесапілка
не дадала за дэкаду 2-га месяца
37 проц. Лесапілка—тормаз у пра-
цы іншых цэхаў. Ліквідаваць пра-
рыў можна толькі шляхам разгорт-
ваньня спаборніцтва і ўдарніцтва.
Выканаць плян у тэрмін!

(*Пад артыкулам віньетка—шахцёр-забойшчык*)

Базыль

Зараз ідзе вершаваны твор,
Яго прачытае таксама рабкор...

Сход

— Аўтара!.. Аўтара, даёш!

Базыль

Ён у залі (*углядаецца*)
Суніца, ідзі чытай сваё!

Суніца (*чытае*)

„5 у 4".
Штурмуйце, штурмуйце прарывы.
Па-ўдарнаму і церпяліва.

(*Скрып дзьвярэй. Уваходзіць Міколка, аглядваецца і садзіцца ля сьцяны на свой сундучок*)

Акул. Карп.

Хто там дзьверы ломіць?

Сход (*сьцішае і гэтым самым падымае большы гул*)

— Ціха!
— Ціха, там!
— Цішэй!

Акул. Карп.

Паталкуем у заўкоме!

Базыль

Ціха вы... Чытай далей.

Суніца (*чытае*)

„Пяць у чатыры".
Штурмуйце, штурмуйце, прарывы—
Па-ўдарнаму і церпяліва.
Тысячу даць у Донбас
Мы абавязаны ў час.
Хай ворагі нашы скрыгочаць,
Яны не заслоняць нам вочы.

Горача, ударна і шчыра
Зробім мы „пяць у чатыры"
Дык-жа штурмуйце, штурмуйце прарывы
Па-ўдарнаму і церпяліва.

(*Воплескі*)

(*Суніца садзіцца на месца*).

Базыль (*да бракера*)

Можна вас прасіць хвілінай
Стаць вось тут, дапамагчы нам.

Бракер

Калі ласка, з вамі я,
Я і вы—адна сямья.

Базыль (*дае яму шнурок*)

Крыкну „раз"—адскочу ў бок—
Вы—пацягнеце шнурок,
Вось і ўсё.

Бракер

І ўсё?

Базыль

Канец.

Бракер

Калі ласка...

Базыль (*чытае*)

Крываспэц.

Ёсьць у нас крываспэц. Лічыць сябе вялікім знаўцам Любіць без патрэбы бракаваць шмат годнае продукцыі. Па яго віне 9 гадзін прастаяла парыльня. Як установлена, ён забракаваў годны для працы сырэц. Дзейнасьць крываспэца льле ваду на млын ворага. Па нашаму, гэта сваяасаблівы мэтод шкодніцтва. Зьняць ў іх маскі. Павінны ведаць іх. Гляньце, крываспэц перад вамі. „Раз".

(*Базыль адыйшоў у бок. Бракер пацягнуў шнурок, адскочыў квадрат, і перад сходам паказаўся твар бракера—вясёлы самадавольны*).

Юзэфа

Які кашмар!

Голас

— Ну і ... твар.
— Так і просіцца на ўдар!

Бракер

Тут пра мяне?

Базыль (*весела*)

Але, пра вас.

Бракер (*бяжыць на сваё месца*)

Не-не-не-не!

Сход

— Раз у раз,
— Якраз пра вас!
— На Пілсудзкага працуе,
— З Чэмбэрленам!

Язэфа

Ён нявінны.

(*і лясь па шчацэ бракера*)

Як ты дазваляеш,

Зьдзекваццa? Мужчы-ына...

Акул. Карп.

Не ігнарыраваць, прашу я,
Профсаюзнай дысцыпліны.

(*Гасьне на сцэне сьвет. Базыль асьветлены променем проэкцыйнага ліхтара*).

Базыль

Таварышы, ціха. Нельга гэтак...
Зараз пачнем сьветавую газэту.

(*На палатне любоўная пара Радзецкі і Васіліса. Пад акомпанімэнт скрыпак, балалайкі і бубна 2 дзяўчыны пяюць прыпеўкі-тлумачэньні*).

1-ая

На гародзе рос качан,
А пасьпеў радзісай.

2-ая

Падрываюць промфінплян
Радзецкі з Васілісай.

Базыль

Таварышы! У момант рашаючага штурму прарыву на заводзе камсамолка Васіліса выходзе замуж, і толькі з гэтае прычыны ў час найвялікшай патрэбы ў рабочай сіле—пакідае завод.

Ці ёсьць гэта лінія комсамолу?

(*На палатне „любоўная" пара: Стрэльбін і Ліпа*).

1-ая

Па конвэеру падрад
Ідуць дубы-сталеткі.

2-ая

Стрэльбін пудзіцца дзяўчат,
Што конь мотоцыклеткі.

Базыль

Таварышы! Стрэльбін — комсамолец, добры грамадзкі працаўнік. Але ён у адносінах да жанчын дапускае вялікія загібы. Ён іх чураецца. Угледзеўшы комсамольца з комсамолкай, абураецца, бачыць у гэтым перашкоду для пабудовы соцыялізму.

Ці ёсьць гэта лінія комсамолу?

(*На палатне любоўная пара Мішка і Галька*)

1-ая

Гордасьць нашых гарадоў,
Тэмпы пабудовы.

2-ая

Ў Галькі з Мішкаю любоў
А завод—аснова.

Базыль

Таварышы! Мішка-ўдарнік, які дае вышэйшыя нормы выпрацоўкі, і комсамолка-ўдарніца Галька стаяць моцна на перадавых позыцыях вытворчых баёў. Па-бальшавіцку ясна ўяўляюць сабе месца асабістага і грамадзкага ў нашу сучаснасьць.

Ці ёсьць гэта лінія комсамолу?

(*На палатне пара Мер'ема і Кандраль*)

1-ая

Дзень і ноч, дрыгва і сталь,
Б'юцца дзьве сыстэмы.

2-ая

Любіць дым пусьціць Кандраль,
Працаваць—Мер'ема.

Базыль

Таварышы! Кандраль толькі і прагне затрымаць ход нашае працы, іграе на струнах цяжкасьцяй, якія перажывае краіна. Мер'ема — старая работніца, пэнсыонэрка, прышла на завод, каб дапамагчы нам справіцца з ганаровай задачай.
Ці ня ёсьць лінія старэнькай Мер'емы ліняй комсамолу?

Зацейнік

Толькі давайце парадкам:
Гульня для ўсіх нас.
Будзем даваць загадкі,
А вы ў рыфму—
адказ.
Пачынаем.

Загадка

Сыніць у вочы рабочым туман,
Пра „Пан-Эўропу", пан ...

Адказ

Брыан.

Загадка

Тысячу выслаць ад нас у час
Нашым таварышам у...

Адказ

Донбас.

Загадка

Усадзім Пілсудзкаму вострае шыла,
Няхай загадае Нарком...

Адказ

Варашылаў.

Загадка

Заіржавела прадольная пілка,
Прарыў за прарывам дае...

Адказ

Лесапілка.

Загадка

Соцыялізму фундамэнт заклалі,
Намі кіруе таварыш...

Адказ

Сталін.

Загадка

У нас—мы Чырвоную армію маем,
І маем другую ў Далёкім...

Голас

Кітаі.

Акул. Карп.

Не парушаць заўжды павінны —
Профсаюзнай...

Адказ

Акуліны!

Акул. Карп.

Дысцыпліны!

Загадка

Паляваў Радзецкі лісу,
А падстрэліў...

Адказ

Васілісу!

Зацейнік

А цяпер давайце крышку
Мы гульнём ў ката і...

Адказ

Мышку.

Галасы

— Давайце, давайце—усе ў карагод.
— Я буду мышкай. Я буду кот.
— І я... І я. Шырэй карагод!
— Кірыл Антонавіч, з намі ў прыпрыжку!

Дырэктар

Ня выйдзе.

Галасы

— Выйдзе!
— Будзеце кот,
— Галька—вашаю мышкай.
— Пачынаем. Раз! Два!
— Лаві, лаві! Уцякай, лаві!

(*Пачынаецца гульня, шумна, весела. Праз каралод з сваім сундучком прабіраецца Міколка*)

Міколка

Дазвольце заявіць.
Дазвольце сказаць...

(*Усе спыняюцца. Зьдзіўлена акружаюць яго*)

Нас... падбухторваў... бракер.

(*Заслона*)

Сымон Баранавых

Два канцы[1])

Частка другая.

I

Восень ужо ўзмахнула над Чырвоным сівымі крыльлямі. Каршуном закружылася над раскінутымі палямі, палянкамі. З слугамі сваімі—туманамі імжыстымі, дажджамі золкімі—прыляцела з выраю. Парадкі свае пачала наводзіць—лістам жоўтым слала зямлю.

На свой манэр перарабіла восень плывучыя дні. Укараціла іх, урэзала—ноч прытачыла тымі днямі. А самую ноч, як пружыну, туга, туга сьціснула. З таго яна гушчаю зрабілася чорнаю, непрагляднаю—галодным ваўком на ўцеху.

Вецер раскілзаны гойсаў, па разьежджаных дарогах, наўзавадкі. Акяніцамі бразгаў, воўкам праз каміны выў.

І цудны-ж гэты асеньні вецер! Восень прывядзе яго за руку пусьціць як адхінуцца, а ён суткамі гойсае ганчаком. Засапецца расхрыстаны, а гойсае—гаспадарыць, мірыць.

Лясы высокія, гаі кучаравыя. Яны гоманам разьлягаюцца, а ён яшчэ, яшчэ гне іх верхавінамі да долу. А то возьме—хмары валакністыя распудзіць. І так сьпяшаюцца яны—адна другую пераганяюць за сто кілёмэтраў, а ён іх разадзьме, альбо верне назад—муштруе на тым самым месцы. З людзьмі вецер ня можа зладзіць: ня слухаюцца яны яго, па свайму густу жыцьцё тарнуюць.

Але-ж жыцьцё людзкое ня брат ветру, не таварыш; жыцьцё людзкое—глыбіня крынічная. Глядзіш зьверху і як-бы нічога няма—адно гладкае дно.

А прыгледзішся ў тое дно—стружкамі з-пад цындабора сьвідруе вада. Не ваду заўважыш першым разам, а самыя стружкі. Тады ўжо здагадаешся, што вада тут вінавата. Мудрая штука—жыцьцё! Колькі бур хавае яно ў сабе, колькі скрыжаваных дарог! І ні аднэй кроплі не хавае спакою. Усе дарогі жыцьцёвыя з шумам ідуць, усе яны крыжуюцца ў непакладзеным баруканьні.

...У гэтую восень дні колгасныя гасьцьмі прыйшлі. Не збаяліся дажджоў золкіх, вятроў раскілзаных. Уся ваколіца Чырвонаўская гаманіла колгаснымі днямі.

---

[1]) Пачатак глядзі ў № 9 і 10.

А яны сьвежыя прыйшлі, новыя—і ў Пячуркава, і ў Крынічкі, і ў самую Прыстань. Уціху пакрыўджаным людзям прынесьлі шчасьце, што вякамі брэнгала ў тых людзей украдзенае зьняслаўленае, што вякамі блудзіла яно ў пацёмках, у бяздарожжы.

І было ў тых днёх—

„Мяняйце, пакрыўджаныя, старызну свайго жыцьця палатанага на новы корт. Чаго-ж чакаеце? Ці-ж не дакучыла вам сарочка зрэбная, скроеная бяз белі? Ці-ж вы ня людзі, ці-ж ня можаце вы насіць на пашэве сваё права—пацеху сваю гадаваць? Узглянеце поўнымі вачмі перад сабою і скажэце: колькі загінула—змарнавалася дзедаўскага ды прадзедаўскага жыцьця ў пустацьвеце? Колькі-колькі цьвіло яго, а дзе-ж яго хаця-б макавая завязь? Дык пакуль-жа гаціць гаць будзеце сваім адным тым жыцьцём? Дакуль будзеце разьліваць жыцьцё па пасудзінах, у якіх злосная іржа пратачыла дно? Хіба-ж яно нязьмеранае нязважанае ў вас, мае добрыя людзі?“

А гэты канец Муравейнікаў на сваём трымаўся:

— Мы ў калгас ня пойдзем.

Вацік з Харытонам былі—гаварылі на гэтым канцы Муравейнікаў:

— Далучайцеся да таго канца. Гэта-ж як рукою падаць. Будзеце разам працаваць. Большы калгас—лягчэйшая праца.

Лаўрэн сваё гаварыў. Цёр кулакамі сьлязьлівыя вочы, глядзеў на дол зямлі ды:

— Я вас, таварыш Вацік, і люблю і павагу маю да вас. Я кожны дзень гляджу і бачу, як вы клапоціцеся ў Чырвоным: і на поле ходзіце і з поля прыдзеце—у вас работа гарыць. Вы чалавек—ня тое, што працяцюляцца, вы не з такога, чалавек, роду. Бацька, відаць—работу любіў. Дык я-ж кажу: я да вас нічога, але мяне—як вы пачынаеце пра далучэньне гаварыць—аціпае. Не магу я...

— Чаму вы, дзядзька Лаўрэн, ня можаце?

Лаўрэн маўкліваць трымаў у роце. Як усе словы праглынуў і ня было яму чым сваю думку выкласьці. „Не магу“—толькі і было ў астачы з яго слоў.

А ўчора падатак здаваў Харытону ў сельсавеце. Нікога ня было ў канцылярыі і Харытон адзін на адзін—пішучы прапіснымі літарамі „тры рублі“—апошнюю Лаўрэнаву рату:

— Прысядзьце, Лаўрэн. Садзецеся... Раскажэце, што ў вас чутно.

Лаўрэна кашаль схапіў за грудзі—трос яго старэчыя плечы. Сеў Лаўрэн, усьпёрся над сталом, рукою галаву падпёр—доўга тросься ад старэчага, скрыпучага кашлю. А калі выпусьціў кашаль з рук яго грудзі—вочы ўціраў прывычнымі кулакамі. Лаўрэн ня трэ сваіх вачэй, а штурхае шчыкаладкамі. З таго і макрата ня сходзіць ніколі на яго вачох.

— Як тамака,—гаварыў Харытон,—маюцца вашы калгасьнікі? Ці скончылі яны малаціць?

Сушыў прамакацельнай папераю Лаўрэну выпісаны квіток—кідаў зірк на Лаўрэна ды і зноў:

— Даўно я ўжо—тыдні з два—як быў у вашых Муравейніках...

Лаўрэн маўчаў, як-бы зьбіраў усё Харытонам казанае, на адзін раз.

— Танцулька-ж, здаецца езьдзіў, я чуў, у горад—коні вадзілі на продаж; якія там, яны, хочуць прадаваць коні?

— Я чуў,—казаў Харытон,—што яны калгасам радыё зьбіраюцца купляць...

Тады Лаўрэн цярплівасьць сваю згубіў, каля стала паварушыўся кажухом, плячыма цёпнуўся як ад мурашак: як-бы ўзьбеглі яны на яго цела.

— Ня ведаю нічога пра радзіву,—сказаў Лаўрэн, а пра гусей магу сказаць.

Харытон хацеў квіток аддаваць, але не аддаў—трымаў у руцэ, пазіраў на Лаўрэна:

— Што пра гусей?

— Падохлі ўсе гусі,—адказаў Лаўрэн.—З дзьве засталося, дык. і тыя кавэнчацца бяз ног—мо‘ ужо і тыя дайшлі. Курч успала на гусей

І сам як бы да сябе:

— А вы, мне, гаворыце...

Ад стала ўстаў, хацеў з рук браць у Харытона квіток. Харытон руку прыняў да сябе:

— Пачакайце... Дык ад чаго-ж на іх успала курч? Што ім ня было цёплага хлява, ці што?

— То-ж то,—адказаў Лаўрэн.—Хлявоў было колькі хочаш, а гаспадара ня было. Гусі гэткімі замаразкамі начавалі на дварэ. Я-ж кажу: каму гэта клопат? Танцулька будзе табе, пра гусей дбаць, ці Атрахім?

— Дзядзька Лаўрэн,—узьняўся Харытон.—Танцулька добры калгасьнік: не гаварэце. Танцулька першым пайшоў у калгас. Вы за невашта вока на Танцульку ня маеце—гэта ваш інтэрас. А Танцулька-чалавек калгасны, і за работу магу ручыцца. Хоць і ён багацейшым крыху быў за другіх... Ніхто, потым сабе з вас не захацеў перш на перш, вы вот дзядзька і да гэтага часу не ўступілі...

— І ня ўступлю...—з лупнаўшаю злосьцю сказаў Лаўрэн,—пакуль Танцулька з Атрахімам будуць гаспадарыць—не хачу ўступаць. Божа мяне бронь!

Харытона на злосьць паднялі Лаўрэнавы словы. Трымаючы ў кішэнях рукі—да парога прайшоўся па канцылярыі. Каля самага Лаўрэна затрымаўся: хацеў спакойна гаварыць і ня мог:

— Пачакай Лаўрэн... сказаў Харытон.—Цябе-ж ніхто гвалтам ня цягне на повадзе: ня ўступай сабе хоць да самай сьмерці. Толькі нашых калгасьнікаў, брат, не абгаварвай. Не—э... Ты стары, і я на цябе толькі ўважаю. Ты, Лаўрэн, з шкоднымі думкамі ходзіш і хочаш, каб калгас раскідаўся: гусей на відавока выстаўляеш. Гусь і ў вас можа

здохнуць і ў кожнага гаспадара з цёплымі, нават, хлявамі. Чорт не бяры, тую гусь. Калгас нам у сто столак даражэй за, тую, гусь. Вот

— Я хачу...—сказаў сярдзітым голасам Лаўрэн, і кашаль зноў апанаваў старога.—Я хачу, каб калгас...—скрозь кашаль гаварыў,—каб жыў калгас. Мне толькі крыўдна-ж вельмі... хай сабе ня ў гусяк інтэрас. Мне крыўдна, што ён сваё пражыў, а я век у лапцях праха-дзіў. Ды і лапці, тыя, на яго сіўцы з касою стаптаў... Мяне агортвае жаля, калі бачу я, што яно..

Ізноў кашаль падскочыў. Не дасказаў сказу, а Харытон:

— Кінь, стары, сваім жалем выстаўляцца. Партыя наша ня любіць жаласьлівых людзей, а мы барукаемся за кожнага калгасьніка. Мы яго, стары, шануем як наша вока, а ты вот гусьмі сваімі засланяеш калгасную дарогу. Брыдка!

У канцылярыю зайшоў Бярчукоўскі Антон. Счуў апошнія словы Харытона—на Харытонаў бок стаў з сваімі словамі.

— Сарамаці.. пасарамаці старога Лаўрэна: што ён калгазамі брызгае.

І да Лаўрэна:

— Трэба, таварыш стары, трэба ісьці ў калгаз. І няма чаго брызгаць калгазам. У калгазе ўстанаўляецца новая жызьня. Так што падзякуй богу, што прычакаўся ў старасьці. Хоцькі кавалачак невялічкі захапіў. Я і сам як ня ішоў—усялякае ліха вярзлося, а цяпер—вот ужо другі тыдзень—і не шманаю. Каню ня трэба, па крайняй меры, досьвіткам усхоплівацца—даваць. Ляжы, сабе, як пан у пасьцелі, ды з бабай паракачвайся—хэ-хэ ..

— Стыднік...—сплюнаў Лаўрэн.—Табе толькі і на вуме бабы. Сарамату згубіў. Здаецца дзеці пагадаваў, як дубы.

І да Харытона:

— От-жа гэгакія і псуюць калгасы. Нядбайнасьцю жывуць—дні лічаць. Ты за яго працуй, а ён бачш—з бабай будзе перакачвацца. Прутам—бы табе па скабам пакачаць, чалавеча. От-жа чаму яно, калі па розуме пусьціш—і ацінае на такіх аматараў гледзячы.

Харытон маўчаў. Антон твар абліў сьмелым сорамам. Неякавата трымаў на сваім твары прымушана — спаўзаючую ўсьмешку: круціў у газэтную паперу дробную самасейку — увесь свой сказ нятрапны хаваў у папяросе. А Лаўрэн гаварыў:

— Дзеля маіх старых гадоў угавор не патрэбен... Кажуць—старыя людзі прывыклі да сваёй хаты і ты іх не адарвеш. А я скажу:—хата мая мне зьвесная. Гумно маё карою яловаю палапленае, таксама ўсім зьвеснае, і мне гэтага лому аніяк ня шкода: хоць сёньня можаце забраць яго на дровы. Толькі трэба неяк яно найначай рабіць. Ці-ж я, скажам, ня цямлю, што дабро для людзей робіцца? Я-ж, дзякаваць богу, жызьню зжываю і маю, як той казаў, каліва розуму. Але-ж калі рабіць—трэба не на сьмех рабіць. Трэба, як той казаў, каб і сабе было на пахвалу і людзям на пацеху. А калі мы з бабаю пачнем

перакачвацца, дык ня толькі ў гусіныя ногі курч упадзе, а і свае ногі згубім. А ты, Харытон, ні з сяго, ні з таго, злосьць падносіш. Ты, хоць і старшыня над намі, хоць і пра сёё-тое ведаеш, а людзей ня ведаеш—не за вочы, а ў вочы скажу табе.

Харытон, як і ня чуў, што гаварыў Лаўрэн: сядзеў за сталом ды перагортваў, шамацеў папяровымі абрэзкамі. Перакідаў іх—як бы шукаў з іх гурту вельмі важнага папяровага кавалку. У яго галаве чамусьці заняла месца тадышняя гугарка з Вацікам пра курносую Міхлю.

З таго часу, як Вацік кпінку пра курносую Міхлю даў яму ў падарунак, ня зьлюбіў Харытон Ваціка. Пры сустрэчы з ім і гаворку трымае і здаецца рад чалавеку, а ў самога іголкамі, тонкімі, працінаецца нутро.

„Што ты мяне за малакасоса лічыць, ці што? Прыехаў з усяго сьвету ні знай, ні ведай ды перад людзьмі выстаўляешся. Думаеш—вялікая ты шышка. Я сам, сабе, свой розум маю і ты мне ня ўказчык".

І з кожнаю стрэчаю, хоць чым маленькім, малюпенькім, хацелася дапячы.

На гэтых днёх замаразкі, былі, разагналі хмары. Неба было выцерта чыстаю фанцінкаю, аж да сіняга бляску. Добра малаціць у такую пагоду: начыстую выбіваецца збожжа пад жалезным цэпам. Мароз нашатырыць яго аж да саламянага трэску—салома пылам курыць.

І ў Чырвоным малацілі.

Вацік сядзеў на трактарным крэсьле—глядзеў на бягучы пас, на яго размашыстую сілу. Трактарны лопат, ды гул бубністае малатарні—глушылі сырабоіню. У зацятай маўклівай варушыліся людзі каля малатарні. Не хацеў кожны расчыняць рот дзеля гаворкі, каб не набраць сабе ў сярэдзіну непатрэбнага аржаністага пылу. А ён валам валіў праз паадчыняныя дзьверы, раставаў на панадворным прасторы. Тады і падышоў Харытон да трактара, да Ваціка.

— Малоціце...—замест дзіньдобраньня сказаў Харытон.—Позна малоціце. Зьніжаеце процант хлебных нарыхтовак.

— А мы гэты процант за адзін раз пугнем,—трымаўся Вацік за трактарнае кола, пільнаваў цягу трактарнае сілы.—Як скончым малацьбу—сіла ўдзесяцярыцца — наш процант не захварэе на падучую тэмпэратуру.

Харытону словы ня ішлі на язык, а так стаяць—ніякавасьць трымаць на сябе кілёграмным цяжарам.

— Быў на Малінаўках...—сказаў Харытон.—Сустрэўся з Міхляю. Яна нешта паблажнела з твару: ці ня ты фарбу яе сьціраеш?

Вацік даў трактару тормаз, праразьлівым лопатам аглушыў Харытона. Як-бы заняты быў трактарным рулем—ня чуў, не адказаў.

А Харытон:

— Заўсёды так бывае: „Ня плюй у ваду—прыдзецца напіцца".

Ды:

— Ну што-ж: дзяўчына як бурнэлька. Іскрыстая. Націскай, пане Вячэславе на застаўкі. І да разгарыцца ў вас, як той казаў, полымя закаханай рэвалюцыі.

І пайшоў.

Ваціка агарнула, была, пякучая крыўда: „Два разы меў з чалавекам сустрэчу і на табе—упічышчы падносіць".

Ды разганяючы з дна мутою ўзьняты настрой:

„А што ты мне, калі на тое пайшло—забароніш?"

...Харытон не заўважыў, калі Лаўрэн выйшаў з канцылярыі. Развагі пра Міхлю асілілі—узялі над ім сваё права. Яму хацелася пабачыць Ваціка—сказаць больш пякучае, больш прыкрае слова.

Харытон разважаў:

„Хай ня будзе ўпраўным. Носа хай, не ў сваё ня тыцкае. А мо' яна, Міхля, нават і будзе маёю жонкаю?"

II

З круглага стала капала чырвонае палатно. Лямпа стаяла на папяровым лістку—каб не чадзіла палатно газным пахам. А Вацік сядзеў за сталом. Наўкруг яго—чырвонаўскія хлопцы: Кастусь Карбуноўчык, Апанас Стручок, Крэўчык Стапан... а вуньдзе—Адам Бірка з саўгасаўскім кавалём Ласкевічам, Манечка з дачкою старой Дзянісіхі—Варкаю... і яшчэ скрыпалі дзьверы ў клюбе—прапускалі саўгасную моладзь.

Другім месяцам час ішоў, як ня зьбіралася, не гаварылі гуртам пра тое, што ўпісуе ў газэту кожны дзень. Работа саўгасаўская не давала часу. Увесь яго забрала да сябе—трымала аберучкамі. А тут і сам Вацік—ня стыкаўся дома—начаваў на калгасных сходах.

Разборка, як празываў Вацік „Бягучай палітыкі", пачалася з тых дзён, як прыехаў ён у Чырвонае. Ляксандра тады сказаў яму, што—„іхняя моладзь кульгае на палітыку, харчуецца самапасам". Вацік пачаў заводзіць з моладзьдзю бліжэйшае знаёмства, жыцьцё іхняе пачаў перабіраць рукамі.

І знайшоў, быў, сярод іхняга жыцьця тыя самапасныя кавалкі.

Кастусь Гарбуноўчык, як увайшоў у большае знаёмства з Вацікам, выклаў з захаваных слоў:

— Стасюк піў на хутары, у Данілы Шчупака...

Манечка гаварыла пра Мішу і таксама скрадваючы словы:

— Ляксандра сварыўся на дзядзьку Мішу. Ноч малая, а ён яе не дасьпіць—гуляе на ачко... а потым возьме і губляе каровы па лесе. І жонка на яго сварыцца...

Вацік як убачыў першым разам Мішу—сьмех сабраў на свой твар: думаў, што хлапчук—Міша, аж гэта пад шэсьцьдзесят гадоў чалавек. Увесь сівы, як тая старая, сівым мохам заімшэлая хвоя.

Вацік на саўгаскай ячэйцы сарамаціў Стасюка:

— У нас наўкола ворагі, капіталісты, мы павінны глядзець за нашай савецкай гаспадаркаю, каб яна расла і сваім ростам палохала ворагаў. А таварыш, Стасюк, п'е—спрыяе ворагу.

І яшчэ:

— Камсамолец—новы чалавек. Камсамолец—матар'ял для новага вету. І ў яго нутро не павінна ўсяляцца старая атрута.

— У нас ня чытаюць газэт—казала Манечка.—Газэты выпісваюцца і марна, ня чытанымі, ідуць на папяросы.

А Кастусь Гарбаноўчык:

— Апанас Стручок за сабою не глядзіць. Кладзецца не разьдзяваным спаць, а потым чухаецца, скрабецца. Гэта, таварыш Стручок, трэба казаць табе ў вочы: нямашака ў вашым хлапцоўскім пакоі гігены. І ячэйка павінна загадаць, таварышу Стручку, як камсамольскаму кандыдату, каб у яго было чыста і каб ён ня чухаўся.

Ваціка вы дні зжыліся с чырвонаўскімі днямі, як з сваімі суседзямі. І ня толькі дні, а і самыя гадзіны—суседзямі—дружакамі пачалі жыць. Тамака—заводзкі гудок рубцаваў, завязваў вузлы - гадзіны дзяліў на работу і на адпачынак. Тутака—рэйка прывязаная да слупу, што стаіць на саўгаскім дзядзінцы, вытылінгвала штодзённае, гадзінное разьмеркаваньне. Нават, тым самым дымам, дні саўгасаўскія пахлі. Толькі—тамака з завадзкога коміна ішоў дым, а тутака—з трактарнага коміну. Нават зямля, з якой зроблен саўгасаўскі дзядзінец як і іхні завадзкі двор—пакуцана ў зеленаватую аліву.

І ўся гэта работа здаецца Ваціку работай адных, альбо адных на другіх падобных—рук. Бо іначай-жа ня быў-бы чуваць пах, такога самага дыму... Ня была-б зямля, там і тут пакуцана ў зеленаватую аліву.

Вацік любасьць мае да пакапанай на зямлю з цыліндрычных колцаў, алівы. От ён ідзе з ліцейнага цэху, а пад нагамі ўсё разам зьмешанае—і аліва і патаптанае вугольле. Фарба сінея таксама, то тутака, то вуньдзе—пакапана: фарбавалі цёмную гартаваную сталь сячкарнага станка. А потым—стукатня і шаргаценьне пасоў... Вацік любіць, калі ўсё чалавечае жыцьцё ўзмашынена. Здаецца тады—машына памагае стукатні яго сэрца—

..жыць ...жыць ...жыць...

Ад таго і ня спыняецца сэрца, а жыве бойка—узрывістым трапятаньнем, жыве вялікаю волю чалавека-асілка.

Трымаў Вацік гэтым разам у руках заняткі пра ангельскіх людзей, што дастаюць з-пад зямлі закамянелае вугольле. Гаварыў, як цяжка людзям, тамашнім рабочым, цэлую палавіну свайго жыцьця быць пад зямлёю.

— Скажам, рабочы ангелец,—гаварыў Вацік,—аддае кожны дзень палавіну сутак, каб накапаць пану Сьміту, уладару над шахтамі, норму вугольля. Рабочы павінен дастаць у ва што-б ні было, столькі

вуглёў (Сьміт ўжо вылічыў), ад якіх, каб ня было ў рабочага ані адной хвіліны паражняком. І гэта за мізэрную плату. Палову сутак, палову свайго сутачнага жыцьця, рабочы павінен сядзець пад зямлёю і дзяўбці кіркаю. Бо іначай ён застанецца беспрацоўным і будзе жабраваць з торбаю. І рабочы церпіць да свайго часу гэтую нятрывалую пакуту. Ён жыве ў вузкай кватэры, есьць нішчымныя булёны, ніколі ня ходзіць па тэатрах... і ад гэтага ўсяго, у рабочага, ізноў-жа адымаецца частка жыцьця. Так што, палавіна сутак, якія пражывае рабочы ангелец на версе зямлі—дзеляцца яшчэ адзін раз, на адну палавіну. І ўсё яго жыцьцё разгублена, разьбіта на дробныя кавалкі—палавіны. За тое, пан Сьміт, падбірае тыя рабочыя палавіны—складае сабе дубальтаванае жыцьцё.

На рэштку заняткаў, у клюб сабраліся, бадай, ня ўсе саўгасьнікі, уважліва слухалі Ваціка, самі гаварылі пра дзе-кольвек выслуханае, прачытанае. Ставілі перад Вацікам на стол сабрана—запытальныя думкі:

— Навошта мы дружым з капіталізмам: пасылаем шпалы і нават цэлыя бярвеньні, калі яны такія шалёныя?

— Што думаюць капіталістыя, калі чуюць пра нашыя калгасы?

— Чаму мы, наша савецкая ўлада, ня хочам купляць у буржуяў паркалю, корту, бадзісту... У нас-жа не хапае, а ў іх—колькі хочаш?

А стары Мамчыц:

— Скажы, таварыш Вацік, колькі капіталізму мае год і хто яе бацькі?

Клюб выбухнуў пырскамі маладога сьмеху, а Мамчыц—як і ня было нічога:

— Чаго, ты, каторае, продаеш свае зубы? Я, таксама, маю права запытаць і ён хай адкажа мне.

І Вацік клаў пэўнасьць у свае адказы, як сам быў тамака, дзе кожнае запытаньне расло-гадавалася.

Запытаў у Ваціка саўгаскі „ўдавец", як бабы яго празвалі—Адам Бірка.

— Дазволь мне сказаць...—Пылец выставіў да Ваціка.

Адам Бірка любіць, каб яму слова падаць: хай бачаць маладыя ды ведаюць, што стары Адам пра невашта мае кемлівасьць.

— На прошлым разе,—казаў Адам,—я не забыўся, ты гаварыў, што буржуі ляскочуць зубамі за тое, што мы робім нашу сацыялізму...

Бірка разгладзіў свае доўгія, цёмныя, вусы—павагі да сябе назьбіраў. Па барадзе нястрыжанай правёў рукою. Глядзеў не на Ваціка, а перад сабою, па падлогу. На яго ўтаропіўся Ласкевічаў хлапец—Піліп, а Бірка гаварыў:

— ...дык, ты казаў, мы робім і буржуі ведаюць пра нашу работу. Я вот не магу, сабе, уцяміць. Я думаў праз гэты час—хацеў з табою на сустрэчы пагаманіць...

— Ну дык што ты хочаш сказаць?—ня сьцерпіў Ласкевічаў хлапец.

— Пачакай,—перапыніў Вацік.

— То-ж бок: не перапыняй.

І Бірка гаварыў:

— Я хачу сказаць пра тое, як гэта яно выходзіць? Буржуі, скажам, ведаюць пра нашу работу, буржуі ведаюць як ты тады казаў, што наша соцыялізма нашле на іх жызьню згіненьня. Мы тады гаварылі, што рабочыя, тамашнія, з кожным часам усё бяруць сябе на розум пра нашу работу. Мы яшчэ казалі, што тамашнія людзі ведаюць, што іх збавеньне будзе, калі яны выратуюцца ад сваіх паноў. Мы гаманілі на прошлым разе, што наша будоўля, не раўнуючы, як маяк, што стаіць на Вірышчы, рабочыя, загранічныя, бачаць гэты маяк з сацыялізму...

Піліп, Ласкевічаў хлапец, ня сьцярпеў:

— А дзе твая, дзядзька Адам, лера?

Хлопцы і дзяўчаты сьмехам ударылі па ўсім клюбе, а Вацік ўзьняўшыся з-за стала:

— Няма нічога, таварышы, сьмешнага. Правільнае дзядзькі Адама пытаньне. І вельмі, нават каштоўнае.

— Дык вот-жа...—храбрасьць сваю вярнуў Адам да сябе.—А яно каторае бяз дай рацы, ня ўслухаецца, ды выскаляе зубы.

А Вацік ізноў:

— Правільна... Буржуазія ведае, што мы будуем сацыялізм. Буржуазія ўсямерна рыхтуецца, каб нам перашкодзіць у нашай будоўлі. Яна яшчэ і вунь як прымае меры, каб перашкодзіць. Толькі тут у гэтай перашкодзе тамашнія рабочыя перашкаджаюць. Буржуазія хоча, каб нам зрабіць перамешку, а рабочыя ёй робяць. Буржуазія баіцца сваіх рабочых. Яна іх усямерна зацікае: трымае ў божай веры; не дае ім гаварыць пра свае права; пакідае, больш сьмелых на гаворку, без работы; саджае ў турмы... Усё робіць, каб яны толькі ня ўзьняліся, ды ня скінулі буржуяў гэтак, як мы скінулі Кастрычнікаўскімі днямі...

— Я і пра гэта...—абарваў Адам Вацікавы словы.—Але я і пра другое. Я ня скончыў маёй думкі.

І ён гаварыў:

— Тутака вось што: ты казаў на прошлым разе, што... (я праз увесь час меркаваў у сваіх думках і ніяк ня мог уцяміць) мы гаманілі тады, што буржуі праміж сабою згушчаюцца—каб быць моцнымі—вырастаюць у вялікіх гаспадароў.

Піліп паправіў Адамаву думку:

— Ён пра тое, што мы тады гаварылі: буржуазія вырастае ў адзін кулак, што яна ў кожны дзень канцэнтруецца.

— Аб тым-жа...

А Ласкевіч, і таксама, каб не марнаваць у маўклівасьці сваіх слоў:

— Ну то-ж, што з гэтага?

— Дык вот-жа,—на ўвесь свой голас гаварыў Адам.—Я і пытаю... мне і не спанятна: яны зьбіраюцца ў адзін кулак, а мы кажам, што яны на сваю гібель зьбіраюцца. Дык мне не спанятна, навошта мы гаворым у слух і ў газэтах гаворым? Хай, сабе, зьбіраюцца па здароўечка, а тады возьмуць і загінуць. Пачакай, пачакай:—убачыў што Піліп мяркуецца перапыніць,—бо як мы пра гэта будзем гаварыць—яны не захочуць быць кулаком і нам будзе горш.

Сьмех ізноў ударыўся ў клюбныя сьцены. Вельмі моцны ўзрывісты—аж здрыгануў яркую залю саўгасаўскага клюбу.

Чырвонаўскі клюб ганарыцца сваім прасторам. Выкінулі канявую сьцяну, дзьве палавіны злучылі паміж сабою—зрабілі адно вялікае клюбнае поле. На адной палавіне, некалі, была танцавальная заля для Калечыцавых гасьцей, другая—меншая за танцавальную, празывалася „Блакітным пакоем". Быў тут некалькі адпачынак потных людзей—пасьля скокаў. Тут і вячэра з „хірасам", ды з „спатыкачом", чакала тых людзей. І вот цяперака,—канявую сьцяну выкінулі і прастор ўзяў сябе ў рукі. І палотны расьцягнуліся па сьценах даўжэйшымі чырвонымі дарогамі. Літары вырасьлі на палотнах большай велічынёю: здалёк стоячы можна прачытаць літары.

„Толькі калгасам зьвядзецца кулакова племя. Трымайце бедняке і серадняке праміж сабою тугую калгасную змычку".

І яшчэ:

„Ваенізоўвайся камсамолец дзеля адпору капіталістычнага ворагу".

— Каб зразумець, таварышы саўгасаўцы,—казаў Вацік,—правільнасьць барацьбы, каб пэўнаму быць у наш соцыялізм, трэба, канечне, ведаць склад капіталістычнага кулака. Бо вырастаньне з дробных буржуяў, вялікага буржуя, гэта ня што іншае, як нарыў вялікай скулы. Скула, скажам, расьце і ад яе боль нашаму целу, пакуль яна аж ня вырасьце і не прарвецца. Расьце і багацее, таксама. буржуй, а рабочыя пакутаюць ад яго росту. І гэта аж пакуль ня выйдзе з іх цярплівасьці, пакуль ня спрэчаць яны з сваёй шыі гэтую нарыўную скулу. А не расьці, буржуйская скула ніяк ня можа. У яе росьце—ўсё жыцьцё. Толькі як ёсьць рост у яе—яна і жыве і цешыцца. Бо буржуйскае нутро ўсмактала прывычку ўласнасьці нават у свае косьці. У буржуя адзіная думка—нажыцца і толькі каб аднаму, самому сабе. Усе іншыя людзі—для яго як і не раджаліся. Ён нарадзіўся на сьвет адзін і ў яго аднаго павінна быць усё сабранае чалавечае шчасьце. Ён, кожны па сабе, клапоціцца перагнаць усіх сваіх прыяцеляў. Вот у гэтай перагонцы і нарастае да яго нарасьцю багацтва. Ён, як багатыр, бярэ пад сваю волю маленькіх буржуйчыкаў —Так што, дзядзька Адам, мы не баімся, што гаворым буржую ў вочы пра яго пагібель.

Ён усяроўна ніяк ня зможа выкруціцца. Ён сваім ростам столькі выпускае рабочых жабракоў, што яны потым ад голаду задушаць яго.

— Хто мае што яшчэ?—да ўсяе клюбнае залі зьвярнуўся Вацік.

Усе маўклівасьцю выстаўляліся адзін перад другім. Вацік абвёў вачмі, хацеў знайсьці чалавека, што будзе яшчэ пытаць і ня было. Адам с Ласкевічам трымалі пра невашта гаворку. Кастусь гаварыў з Апанасам...

— Скончым, у такім...—не дасказаў Вацік:—адчыніліся дзьверы і ўвайшоў у клюб Танцулькаў Арцём. Раўнамернымі крокамі падыйшоў да стала, да Ваціка. З кішэні дастаў парашком складзеную пісульку—падаў самому Ваціку. Нясьпехам раскінуў Вацік папяровы парашок і вачмі зараз забраў, што тамака было.

І да саўгасаўцаў:

— Дык больш ніхто ня мае аб чым пытацца?

— Няма...—выгукнуў нехта з гурту.

А Вацік за стала ўстаючы:

У такім разе—скончым.

Манечка, прагным зіркам глядзела на Вацікаў твар. Бачыла як заблішчэлі, пад лямпіным сьвятлом, яго вочы. А ён, не трапляў аплікам у кароткім кажусе, за гафтку,—напала на яго рукі сьпешнасьць. Вочы яе лазілі па ўсіх заканурках, непадголенага на сёньня, Вацікавага твару. Хацелася ведаць, што ён там прачытаў?

Як прыехаў Вацік, жыве ў іхнім пакоі—Манечка жыве ахвотным неспакоем. Калі сустракае твар гэтага чалавека—з прыемнасьцю трапечацца яе маленькае сэрца. Доўгім позіркам блудзіць па твары, што пакарабачаны зарубцаваным шрамам. І гэта так от... ня ведае чаму хочацца бачыць, пазіраць... Толькі калі пазірае—з патайка пазірае. Вельмі-ж страхам абдаецца сэрца: хаця-б ён ня ведаў, што яна любіць страпацца двума, сваімі маленькімі, сінімі агоньчыкамі вочак.

Пакуль выходзілі з клюбу, каб не заўважыў—адвяла свой зірк ня вялікі папяровы, на сьцяне прыклеены, плякат. Глядзела на той плякатны лісток і бачыла ў нецьвярозай думцы—

на папяровым лістку вялікі круг. У гэтым крузе стаіць тоўсты, тоўсты, на доўга адкормлены, кулак... На ім паркалёвая кашуля ў цёмныя кружочкі-бубачкі; а паверх кашулі — картовая камізэлька. Кашуля на кулаку доўгая—з пад камізэлькі займае аж да каленяў. А ў кулаковых руках „адрэз". Моцна, моцна сьціскае кулакова рука „адрэз", а другая—сьціскае поўную, у рыла налітую, пляжку перагоннай гары. А наўкруг кулака, па тым крузе:—

адзін за адным ідуць, цесным колам, трактары. Усё вужэй і вужэй кулаку робіцца, той круг. Ён нават ад злосьці пачырванеў. Два пярэднія, вялікія, выставіў зубы—пагрозу пасылае трактаром...

Варка ўбачыўшы Манечку:

--У што ты ўрэпілася?—аклікнула,—ідзем! А то застанешся адна начыцаю.

З месца скранулася Манечка: пайшла за Варкаю. Ідучы акінула вокам клюбныя дзьверы. Ваціка ў клюбе, як і ня было.

III.

У пісульцы было напісана:

„Прыходзьце да мяне па вельмі пільнай справе. М. П.

Шыбкаю хадою ішоў Вацік, а ня мог сваіх думак адагнаць. Спрытнейшыя чалавечыя думкі за самага чалавека. Ён на адным месцы варушыцца, а яны пабываюць і за горамі, і за морам. Нават у чалавечую маладосьць сходзяць—пратрасуць усе клункі запаканага жыцьця.

Стрэчны вецер цярушыў Вацікавы вочы. Неба напілося глыбокаасеньняй чорна-непраглядпай жужаўкі. Добра, што дарога перад Вацікам—дзесяць раз па дзесяць—ходжаная сюды і туды: ногі ня зблудзяць. А зямля маладым марозам угрунтавана—стукаціць здранцьвелым грудзьдзем. Лёгка ісьці нагам па такой зямлі. Ды, калі яшчэ за плячыма чуваць сьляды грознай маладосьці... калі кроў чалавечая ў разгоне...

Ваціку на ўспамінак узбрыло з самага пачатку. Ногі самі сабе ішлі, а ён, сваімі ўспамінамі—сам сабе.

... Было гэта, як у Чырвоным, неяк надвосеньню ставілі спэктакль. Вацік быў аматарам спэктаклінай пастаноўкі: цешыўся, што рэпэтыцыя ідзе добрым ладам. І вот у самы той спэктакляўскі дзень прастудаю захварэла „Палашка". Хто мог валодаць адказнаю роляю без рэпэтыцыі? Хто мог замяніць хворую Варку—„Палашку"?—заменнага чалавека ў Чырвоным не маглі знайсьці.

Вацік гаварыў:

— Трэба адкласьці спэктакль.

А Кастусь Гурбаноўчык:

— Адкладаць спэктаклю ня трэба. Я ведаю чалавека, што можа без рэпэтыцыі... Паклікаць Муравейнікаўскую Міхлю.

Вацік ідзе цяпер—трымае на ўспамінах як на прывязі:

... Заслона шчэ ня ўздымалася. Ды яна і ня ўздымаецца, а рассоўваецца шпагатным шнурам па тонкім дроце на дзьве палавіны. Людзі ў клюбнай залі, з кароткіх слоў праміж сабою, зрабілі калатушню. Гоман вісеў над людзкімі галовамі густою, зблытанаю сеткаю. А потым разрываецца сетка зьлітых слоў—трымціць заля ціхатою.

— Вось ты сьмяешся з Амэрыкі,—кажа „Паўлюк" да „Палашкі", а там хіба гэтакая неўцтва, як у нас? Там навука.

Рукою размахвае „Паўлюк“, на носікі становіцца бліскучых сваіх камашаў, выпучваецца... Банцік ружовенькі пад самаю шыяю на яго беленькай рубашацы. У руках—тоненькая палачка тростачка—

— Вось, скажам, трэба вам кавы,—ізноў гаворыць,—вы сабе ўстаўляеце штэпсэль, такія відэльцы... у дзюрачку і—кава ў момант гатова!

І зноў:

— „... вось, скажам, трэба вам чаравікі пачысьціць... вы сабе ўстаўляеце штэпсэль і—у момант чаравікі вашы блішчаць як люстэрка...“.

„Палашка“ падносіць „Паўлюку“ спрэчк: абкідае яго неўцтва маладосьцю зьвінючага сьмеху.

Вацік з-за куліс чуе гэты сьмех: у яго шмат ахвоты слухаць. А яе сьмех такі самы бесклапотны, як і тады—калі гаварыла Міхля пра яго сэрца—каля ячменнага поля.

... А потым быў антракт: праводзілі драцяныя правады—рабілі электрычны млын... Яна падпраўляла яго, „Несьцеравы“, вусы. Калі глядзёўся Вацік у люстэрка—адклеіліся, ліпелі адным канцом, маленькія вусы. Яна моцна прыціснула двума пальцамі да яго вусны, сьвежы кавалачак чорнай, раскубенай, ёжыкам натапыранай, воўны. Так і трымала, пакуль не прыхапілася воўна. А калі прыняла пальцы засталася руплівасьць на Вацікавай вусьне: „хай бы яшчэ пратрымала вусы—а можа яны яшчэ і не прысохлі“.

І яшчэ:—у той апошняй п'еснай дзеі.—

Яна, „Палашка“ аддала ключ „Несьцеру“. Уся клюбная заля чакала: кінула мусіць на заўсім „Палашка“ свайго „Несьцера“—пайшла ад яго куды глядзяць вочы. І от раптоўна адчыняюцца дзьверы.. „Несьцер“ ня чуе, калі яны адчыніліся. Ён узьдзеў ключ на палец і круціць яго ў раскіданых думках. А яна падыходзіць да яго крадзенымі крокамі. Вацік—„Несьцер“—яе ня бачыць... (Ах як добра была зроблена гэта апошняя дзея). Яна падыходзіла ўсё бліжэй і бліжэй. Вось, вось... Вацік чуў шорах яе крокаў, але ня чуў. Заля чакала і ня ведала як разьвяжацца жыцьцём завязаны вузел. І потым—вельмі проста:

— „Дай ключ ад хаты...“—сказала „Палашка“. І не сказала больш нічога.

Здавалася Ваціку тады: бярэ яна ключ ад сумеснага іхнага жыцьця. Яна пойдзе з гэтым ключам і адамкне іхную хату. Яна прыбярэ ў Вацікавым пакоі: рубашку яго, што ляжыць абыяк на крэсьле, паложыць у плеценую карзіну... Вытра сухім рушніком потныя шыбы.. акуркі, што ляжаць нацёртым сьмецьцем у расчыненым каробку ад сярнічак, выкіне ў бляшанае вядро... вытра, нанесены за нагамі пясок, з памаляванай падлогі... Прынёс Вацік учора ад новай саўгаскай сырабойні сухія трэскі—пакладзе іх у ляжайку... А ён прыдзе з калгаснага сходу і ў хаце у яго будзе так цёпла...

Усёроўна як угадала Міхля—„Палашка" Вацікавы думкі: калі спэктакль быў скончаны—сказала:

Вацік стаяў каля сцэны, глядзеў на скокі пад гармонік Мішы-пастуха, а яна ў жарт хаваючы свае словы:—

— Прыдзецца, цяперака праводзіць мяне... Паклікалі на свой клопат...

І вот такая-ж самая была тады ноч: уся цёмная, хмарамі зацярушаная. Тою ноччу ішлі яны па гэтай дарозе. Толькі зямля была пад нагамі, у той раз мяккая, тлустая, а цяпер – скованая яркім марозам. Лужок, што наабапал доўгай грэблі, у тую ноч, кішэў няскошанаю маладою атаваю. І нават вісела густая на атаве раса. Па старой летняй прывычцы туманы балацяныя ўздымаліся над лужком на дыбы.

Той вечар вельмі пакойна трымаецца на Вацікавай памяці.

Пасьля, таксама, ішлі дні, праходзілі густа-узмучаныя вечары. Але ад іх мала заставалася ў Ваціка пакінутага сьледу. Адна імжыстакартлівая руплівасьць, што засталася ад спэктаклю, суцэльнаю ніткаю выцягвалася з асновы выбрызганага кноту, ды тлела незгасаючым агнём. Мо' таму і ня былі прыкметнымі подбегам проходзячыя дні.

Некалькімі разамі меў Вацік стрэчу з Міхляю пасьля спэктаклю. Намёкі насіў на відавоку і—

шукаў і нідзе на знаходзіў сваёй згубленай адвагі.

... Калі адчыніў Вацік калітку, чырвонай Танцулькавай брамы, прабег па целе гарклява-спуджаны холад.

А ў думках:

— Што яна, цяперака, робіць?

І чамусьці, як у адказ на яго думку, як ад некуль з схаванай цемнаты—роем асела на ўспамінках:

— „... мужчынскае сэрца, так сама, цяжка ведаць, як і жаночае. Кожнае сэрца, калі вы вывучалі фізіолёгію чалавека..."

Ухмылку пусьціў на сваім твары. Скрозь надворную цемру бачыў вялікі клін саўгасаўскага ячменю. Ад таго, можа, пылам сьцерся з Вацікавага цела надыйшоўшы той гарклява-спуджаны холад.

Каля ганку Ваціка стрэў бела-лапісты сабака. Ускочыў на ганак тышчыўся мызаю ў шчыліну туга зачыненых дзьвярэй. Варушыў мятлістым хвастом—гаварыў: „Ты мяне прапусьці ў цёплую хату і я цябе ня буду чапаць".

Пабаяўся адганяць чужога сабаку.

„Хай ідзе"...

А калі зайшоў Вацік у Міхлін пакой—не застаў Міхлі. На стол узлакаціўшыся, прыціснуўшы грудзьмі засланы абрус, ад чаго скарабаціўся абрус сваім палатном, сядзеў Харытон.

— От... і ты тутака .. сказаў Вацік, да стала падыходзячы.

— Тутака... ня ўзьняў Харытон вачэй. Сядзеў і барабаніў па абрусе пальцамі.

Вацік зьбянтэжаным зіркам лавіў Харытонаў твар.

„Чаго яму трэба?"

Сеў насупроць Харытона і ня мог зразумець:

„Навошта яна паклікала мяне, калі ён тутака?"

Харытон прымушана паварушыўся седзячы каля стала. Узьняў ад стала вочы ды:

— Сустрэліся, кажаш, нечакана...

Яна калгасных справах...—твар ад лямпы тулячы, сказаў Вацік.

— Я таксама, па калгасных...

Вацік пырснуў схаванаю злосьцю, не паказаў раскіданых злосных пырскаў, а як і ні ў чым:

— Тут, у іх, дрэнна наладжана калгаснае разьмеркаваньне харчоў. Я ішоў да Атраxіма... дык ужо спаць, мусіць, лёг. Дай, думаю, зайду, можа даведаюся, як у старшага брыгадзіра... што зрабіла іх калгаснае праўленьне? Па-мойму. ведаеш, яны дрэнна зрабілі... гэта-ж сёньня, была ў нас старая Старавойціха... Прышла ды скардзіцца— кажа: „Мы ўтраіх і ўтраіх на работу хадзілі, рабілі душы паслухаючы: а як прышлося—нам вызначылі, кажа, па шэсьць пудоў на душу, на цэлы год... Што гэта, кажа, насьмешка над намі.

Глядзеў на Харытона і рад быў, што тормаз уставіў у яго думкі, „Хай ня думае. што мне патрэбна, вельмі Міхля".

— ...Казала,—гаварыў Вацік,—паеду ў горад да сына: хай сын прыедзе ды паглядзіць на калгаснае жыцьцё. Праз яго, кажа, мы пашлі ў калгас. Яму на заводзе седзячы, як яна кажа—на хвабрыцы лёгка камандаваць... „Як нагаварыла, брат, як насыпала... ты-ж ведае старую Старавойціху: баба баявая.

І ад сябе:

— Да і на праўду тутака, Харытон, невашта трэба рабіць... бо калі па шэсьць пудоў на душу, канечне, у каго сям'я вялікая як скажам, у таго вашага Атраxіма—дзевяць душ...

— Чаго яна ляпу сваю разьзявіла?—голасам, афарбаваным у сярдзітую фарбу, сказаў Харытон.—На першы пачын далі па шэсьць пуддоў на душу, а тамака, счакаўшы, шчэ будуць даваць. Знаем мы такіх Старавойціх...

Дзьверы адчыніліся і ў хату ўвайшла Міхля. Як перастуціла парог дык адразу:

— Нечаканы госьць... Добры вечар:

Ці не ваўкі загналі вас, таварыш Такарскі...

А Вацік:

— А што думаеце, цяперака-ж восень. Ваўкі, кажуць, цяперака вельмі галодныя. Так што...

— А я на хвілінку пакінула таварыша Мамчыца, хай прабачыць мяне. Зайшла ў тую хату, пакуль сёе-тое... Тамака ў іх начуе якраз нейкі чалавек...

— Які чалавек?—запытаўся Вацік.

— Хто яго ведае... кажа, што ён быў недзе на дарожнай рабоце. Атрымаў грошы, а ў яго тыя грошы ўкралі... кажа, ня было за што праехаць—хацеў да Менску—дык вот ілзе пехатою...

Харытон галаву ўзьняў на Міхлю, а потым—пружыністым зіркам гледзячы на Ваціка:

— Можа якая-небудзь контра?

І да Міхлі:

— Які ён сам з сябе: у якой ён адзежы?

Міхля паслала Ваціку с крадзеную ўхмылку:

— Цяцер-то, сядзіць ён каля стала ў картрвай рубашцы, а на сьцяне відаць, вісіць—мусіцька яго—суконны фрэнч...на падабенства, як у нашага Арцёма. Ну-у, ён у ботах... круглаліцы, невялічкія вусікі, барада непаголена... гадоў, можа, пад трыццаць пяць ..

І перайшоўшы на другі бок стала, сядаючы на скрыпучае крэсла:

— Ну, дык як вы, таварыш Такарскі, тамака крэпіцеся?

— Так сабе.—прыклепным словам адказаў Вацік.—От сёньня былі заняткі нашых комсамольцаў...

Харытон узьняўся ад стала—шапку ўзяў у рукі. Цёр пакамечаны шапчын аколушак: хацеў, каб убачыла Міхля, што зьбіраецца ён ісьці да хаты.

А яна тымі самымі вясёла-гаварлівымі словамі:

(Як і ня бачыла яна, што Харытон устаў—каля стала муляе).

— Я, таксама, хачу хадзіць на вашы заняткі. Я ўжо думала... Толькі што далекавата крыху. У наш час жыцьцё так шпарка бяжыць, грэх, нават, каб аставацца ад жыцьця. А газэт, ведаеце, не дагледзіш. Праўленьне наша, калгаснае, выпісала нейкіх з дзьве, дык пакуль яны прыдуць... а як прыдуць, пакуль зьбярэшся прачытаць...

Абцугамі сьціснула злосьць Харытонава сэрца. Крыўдаю ўсьпенаю загаварыла нутро:

„Чаго ён прышоў да яе? Што яму тутака трэба?"—невашта пякучае хацеў сказаць Ваціку і ня мог.

Усёроўна як усе вышлі словы з Харытонавага запасу. Тады рашучасьць ўзяў у свае рукі. Крокам адмераў ад стала падлогу:

— Таварыш Такарскі,—нецярплівым сказаў голасам,—вы яшчэ застаяцёся?

Вацік не пасьпеў адказаць. Міхля перапыніла думку—сказала:

— Застаецца.

І да яго:

— Вы, таксама, з намі пабаўцеся.

Як сыпірытусу падліла ў агонь апошнімі словамі. Ні словам жадным не адазваўся больш. Скраў, толькі, свае ўзнэрваваныя крокі: раўнамерным ходам выйшаў за дзьверы.

А Міхля, як і ня мела кемлівасьці пра Харытонаву раптоўнасьць. Тым самым задорыста-жвавым голасам:

— Я вельмі рада што вы прышлі...

З крэсла ўзьнялася, большаю цаною важыла свае словы:

— Я вас чакала—думала, што вы самі зойдзеце... Проста, ведаеце, хочацца пагаварыць. Час так марудна ідзе, калі чалавек ня мае з кім асьвяжыць сваю гаворку. А сягоньня дзень такі няўдалы... Я вельмі ня люблю гэтую восень, калі яна надыходзіць—мне хочацца заснуць і спаць пакуль ня прыдзе, хаця-б сабе, зіма. Зіма ведаеце, і то—саўсім другі надае настрой. Дык сёньня якраз такі дзень.., Я папрасіла Арцёма, каб ён занёс вам гэту пісульку... прабачайце, што я можа вас патурбавала.

— Не...—адказаў Вацік.—Я таксама... І ня ведаў, якім словам скончыць пачатую думку.

А Міхля:

— Я на адну хвілінку, вы тутака пабудзьце... адну хвілінку! Прабачайце...

І вышла з хаты.

Ня сустракаў Вацік сваім жыцьцём такога гаварлівага чалавека: вельмі ішла на спадобу яе жвавасьць. Калі гаварыла яна—ня чуў слоў, а цешыўся музыкаю жаночага голасу. Здавалася Ваціку—іграе нехта на скрыпцы. І тая скрыпка не гаворыць словамі, а гаворыць зьлітым нутраным голасам. Не разьбярэш слоў яе голасу, а ведаеш што яны цану сваю маюць. Тым больш тутака, на раёне, пачуць трапятлівы голас дзяўчыны... Ваціка. радасьць слалася мяккім пухам. Пра Харытона думкі згубіў у той радасьці. Ахвотаю пазіраў, калі сабіраўся Харытон ісьці з хаты. Хацелася толькі, каб хутчэй выйшаў, каб хутчэй. А яна хай гаворыць для яго і ён будзе мець поўнае сэрца шчакатлівага голасу.

. . . . . .

... Я вельмі сёньня ўночы жудасны, ведаеце, сон бачыла.

— Раскажэце!..

— Не, я не раскажу майго сну, калі вы ня скончыце гэтай кроплі.

— Я, таварыш, Міхаліна Домікаўна, буду вельмі п'яны. Вы мусіць, забыліся, што я ў сваіх абавязках...

— Як вам ня брыдка: а яшчэ і мужчына! Я-ж больш, калі на тое выпіла...

— Па- першае—ня больш, а па-другое—вы, а гэта я. Вы зможаце заўтра адпачываць, а у мяне...

— Ну, а пра сон паслухаць хочаце?

— З ахвотаю. Што хочаце—ад вас магу паслухаць.

— Ну дык выпіце-ж... Эх, вы—мужчына...

Яна даліла вішнёваю настойкаю недапіты Вацікаў кілішак, потым наліла да самых краёў свой, квяцістай цьмянасьцю афарбаваны бакальчык ды:

— Ну-у...

Падняла бакальчык, трымала яго перад Вацікавымі вачмі.

А ён пазіраў на яе і бачыў:

Сьвятло ад стаяка лямпы, што стаяла на Міхліным стале, пласкалася ў яе зрэнках. Такім самым круглым агнём гарэла яно ў глыбіні яе вачэй. Як ўсяроўна, запаліў нехта далёка-далёка, другія такія самыя лямпы... З такімі самымі стаякамі...

А яна зноў:

— Нін-у...

Тады за адзін раз перакінуў у рот салодка-гарклявую вадкасьць.

Нечаканасьць, што трапілася сёньня з Вацікам, кінула яго ў топкае дно. Галава ішла ходарам скрозь маленькія, потым большыя, потым яшчэ большыя, шкляныя кругі. І яны ўсе адзін за другім расставалі, як разьбіваў іх нехта жалезнаю палкаю.

А ў думках варушыліся сямастойныя развагі:

„Што я зрабіў?.. Няўжо-ж гэта ёсьцека тое, што празываецца любіць дзяўчыну? Які, яна, ветлівы чалавек... Якое добрае жыцьцё—любіць чалавека. Мы будзем з ёю шчасьлівымі людзьмі. Жыцьцё наша зьмеранае гадамі і яго трэба як мага ў пашане трымаць. А Харытон—сьмешны чалавек. І вельмі, нават, сьмешны... Чаго злаваць на мяне? Хіба-ж я тут вінаваты? Мы-ж людзі самі па сабе маем права на каханьне. Я не магу загадаць, каб яна яго любіла. Я заўтра пагавару з Харытонам, чаго-ж сярдзіцца на нас? Харытон чалавек нядрэнны і ён мяне зразумее. А як гэта ўсё... шмат на сьвеце добрых людзей!..“

Вацік устаў ад стала, крэсла адсунуў—каб быў яму праход. Падышоў да Міхлі Цяпер ня было ў яе зрэнках тых двох агнёў ад лямпы. Усёроўна як стушыў іх нехта наўмысьля.

— Ну дык што-ж вы не гаворыце пра ваш сон?

А яна:

— сядайце на сваё крэсла і слухайце.

— А калі я на ваша сяду...

— На маім—удваіх будзе цесна...

— Я чуць-чуць... Адзін рубчык... от адну кропельку... от так...

Рукою ахапіў абручы Міхлінага крэсла—прысеў на самым яго беразе.

— Ог так: бачыце, як добра?

Проціву ня кідала ў яго вочы. Пасунулася толькі—прастор дала на сваім крэсьле. Як сеў—дакрануўся да яе цела: густа запаленая цеплата яе рукі прабегла па яго целе. Вацік адчуў: нібы падпаліў нехта правы Вацікаў бок. Агонь пайшоў, як запаўшая іскра ў торф, у самую глыбіню, і цяпер ніхто ня зможа ніякаю вадзяною сілаю застаць іскру, затушыць. Ды і навошта даставаць?—Хай ідзе, мяшаецца з яго цяплынёю—гарыць двайным чалавечым агнём.

А Міхля трымала між пальцаў відэлячныя тронкі, стукала па абрузе відэлячнымі зубʻямі і да яго:

— Па-першае, ці верыце вы снам?

— Снам...—пачын зрабіў для свайго адказу. Час вышукаў, каб падабраць можна было трапную думку.—

— Як да якіх сноў,—сказаў урэшце.—Бывае, можна паверыць... Бо чалавечыя сны, разгадка, на якія хочаце манэры. І так здарыцца яно—можна сказаць:—сон як у руку даўся; і гэтак здарыцца—сон угадаў.

— Я, таксама, ня веру гэтым снам,—сказала, пазіраючы Вацiку ў вочы. Толькі я не магу зразумець, чаму бываюць сны ні з таго, ні з сяго? Каб скажам чалавек думаў, каб чуў, ці каб бачыў.. А то і ня думаеш, і ня бачыш, а возьмеш ды сасьніш?

І ня ўзяўшы да сябе Вацікавага адказу, выпусьціўшы з пальцаў відэльцы:

— Ну дык слухайце...

Усёю сабранаю сілаю пальцаў сьціснуў Вацік абручы яе крэсла. Другою рукою моцна стукнуў па сваіх каленях. Вацiку схапіць хацелася сваімі рукамі з абодвых бакоў Міхлю і таксама, як гэтыя абручы, моцна сьціснуць... Але не зрабіў гэтага—чакаў пакуль пра сон будзе гаварыць.

І Міхля гаварыла:

—... горад. Я ня ведаю, які горад. Але вялікі, прыгожы горад. Вуліцы выбрукованы ўсе адным клінкерам. І от я іду па самай галоўнай вуліцы. Нідзе нікога, ні аднаго чалавека. Як вымерлі людзі, нават як зьмёр увесь сьвет. А я іду на рынак. Мама мая, нябошчыца, паслала мяне, каб я купіла пучок маладой радзіскі. У руках у мяне карзінка, і я сама сабе думаю: ці ёсьцека на рынку радзіска, калі нідзе няма на вуліцы ні аднаго чалавека? І мяне апанаваў нейкі страх. Ня тое, што я ня куплю радзіскі, а што—адна я на бязьлюднай вуліцы. Іду я гэтак, іду... прамінаю адзін квартал, прамінаю другі... Паварачваю за рог вялікага дому—і раптам цэлая мора людзей Узрадавала я, што людзей убачыла. Пайшла, была, аж подбегам. Падыходжу ўжо нават да таго людзкога натоўпу і... ізноў апанаваў мяне вялікі страх: людзі тыя ўсе, як адзін, маўчаць. Дзе-та відана, каб людзі ў вялікім натоўпе, ды маўчалі? Аж калі я не праціснуся

сярод таго натоўпу—тры вісільніцы. Тоўстыя, вялікія слупы ўкопаны ў зямлю і на іх матляюцца засмаргі. Я вочы зажмурыла ад страху. Бегчы хацела, а потым падумала: каго-ж будуць тутака вешаць? і хто будзе каго вешаць і завошта? І не пасьпела я гэтак падумаць—раступіўся натоўп. Усероўна як нехта раптам расчыніў патаемныя дзьверы. І вот калі я ўзглянула—вядуць трох чалавек. А па натоўпе шопат:—„камуністыя". Тады я, толькі ўбачыла, што вядуць іх не чырвонаармейцы нашы, а салдаты з пагонамі.

„Завошта-ж іх?"...—запыталася я ў нейкага барадатага чалавека. „За тое, што яны рабілі калгасы",—адказаў ён мне. І я... прачнулася.

— Што вы на гэта скажаце, таварыш Такарскі?

— Нічога...—падняўся Вацік з Міхлінага крэсла. Вы мусіць дрэнна спалі, ад таго такое і зьвярэлося. Па-мойму блытаны сон: барадаты чалавек, бадай, вас падманіў.

Ды расстрошшы прымушаны сьмех:

— Ня тых вешалі, хто калгасы рабіў, а тых, хто шкодзіў нам у калгаснай рабоце.

— Хто яго ведае,—адказала Міхля.—Мо' стары барадач і зманіў мне. На тое-ж гэта і сон.

(Далей будзе)

Цім. Зарэчны

Эльбрусы чалавечага шчасьця *)

(Аповесьць)

С У Д

Гута надрывалася, быццам адчуваючы надыход сьмерці. На гуце было безладзьдзе, неорганізаванасьць, — прарыў:

Шкломаса з кожным днём горшылася, шкло выходзіла з яе цьмянае, з каменьчыкамі, у пузырох. Ад неасьцярожнага дотыку яно трэскалася.

Рабочыя хвалявaліся; некаторыя прарочылі спыненьне гуты. Шаганскі заклікаў рабочых супакоіцца, напружыць сілы. Паркан Астап быў усе дні на нагах: мітынгаваў, угаварваў, пагражаў. Наста Корбут выбівалася з сіл, хацела ўсюды сама пасьпець, зрабіць усё сваімі рукамі. Браніслаў Віктаравіч не адыходзіў ад яе, даючы свае парады, часам перарабляючы тое, што яна рабіла. Ён не хацеў, каб Наста ведала пра гэта, а таму заўсёды, куда-б яна ні пашла, украдкай ішоў усьлед за ёю. Майстар Калакалуха таксама быў устрывожаны, часам спалохана паглядаў на ванную печ, на рабочых. Адзін толькі дырэктар гуты быў у палоне ўпэўненасьці. Калі яму казалі, што гута напярэдадні спыненьня, ён хітра ўсьміхаўся і адказваў:

— Нічога, перамелецца—мука будзе... Мы цяпер знаходзімся ў пэрыодзе цяжкасьцяй росту...

Рабочыя былі нездаволены, лаялі яго за вочы, а Сьцяпан Гарбуз нават у вочы назваў яго дурнем. Дырэктар на гэта толькі ўсьміхнуўся і адказаў:

— Гонар называцца дурнем мае толькі той, хто ў дурнях застаецца апошнім...

Многія рабочыя вялікія надзеі ўскладалі на суд над прагульшчыкамі, хуліганамі, зрыўшчыкамі прамфінпляну, які павінен быў адбыцца не ў забаве. Яны спадзяваліся, што суд узварухне масу, мобілізуе ўсіх на выкананьне задач, якія стаялі перад гутай. Кожны рабочы, пабыўшы на судзе, будзе ня толькі ганьбіць падсудных, але і праверыць

*) Пачатак у 9 і 10 №№ „Маладняка"

сябе: „Ці не павінен і я сесьці на лаву падсудных? ці не зрабіў і я што-небудзь шкоднае? ці не павінны і мяне судзіць?“. Суда чакалі з дня на дзень, як быццам нечага вялікага, што дапаможа вырашыць усю справу. Урэшце, на сьценах зьявіліся аб'явы:

Таварышы—увага!

СЁНЬНЯ роўна а шостай гадзіне ўвечары У КЛЮБЕ

ПАЧЫНАЕЦЦА С У Д

над злоснымі зрыўшчыкамі прамфінпляну:

1. Касавокіным Янкам,
2. Зайцам Лукашом,
3. Калупаенкам Рывонам.

Заўком запрашае ўсіх рабочых ранішняй і начной зьмен прысьці на суд.

Ганьба прагульшчікам! Узмацнім барацьбу за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады! Ганьба зрыўшчыкам прамфінпляну!

Вышэй сьцяг соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва!

І ўвечары, ня „роўна а шостай гадзіне“, як паведамлялася ў аб'явах, а крыху пазьней, суд пачаўся. Народу сабралася — поўны клюб, нават не зьмясьціліся некаторыя. Сталі на дварэ, каля адчыненых вокнаў.

У клюбе было горача, душна. Стаяў гоман. Глядзець на кожнага ў паасобку—здаецца не гаворыць, маўчыць але ўсёроўна заля дрыжыць ад гулкага гоману, і гоман гэты заглушае гулы гуты – ахрыплыя, з надрывам. Рабочыя паглядвалі на плякаты, што віселі на сьценах; — плякаты ганьбавалі дэзэртыраў, зрыўшчыкаў прамфінпляну, заклікалі падвоіць продукцыйнасьць працы, напружыць сілы на выкананьне вялікіх задач пролетарыяту ўсяго сьвету. Шмат хто курыў — самасейку, махорку, папіросы, і дым у клюбе быў посьцілкай пад стольлю,—посьцілка ўсё ніжэй і ніжэй апушчалася да лаў. Тыя, што ня курылі, кашлялі, адварочваліся ў бок і прасілі курцоў пашкадаваць іх. Але курцы—народ упарты, і для іх нават сьмешна, калі возьме някурца чох: „Чохай, чохай!.. На здароўе!... Вялікі расьці!“— казалі яны някурцам. Толькі калі пачаўся суд, старшыня забараніў курыць у залі.

Клюбная сцэна знаходзілася ў распараджэньні суда. Пасярод сцэны, за вялікім сталом, сядзеў старшыня—нахмураны, нечым незаданолены; паабапал яго знаходзіліся засядацелі, радавыя рабочыя гуты. З левага боку, за маленькім столікам, нэрвова лістаў паперы, кусаючы губы, грамадзкі абвінаваўца Браніслаў Віктаравіч Сакалоўскі. За ім, у глыбіні сцэны, памясьціўся сэкратар суда, малажавы хлапец з вясёлымі вачыма. З правага боку, таксама за невялікім столікам, спакойна сядзеў, заклаўшы нага на нагу, чарнявы і лысы абаронца. Усё было ў парадку, як мае быць, але сцэна ўносіла ў гэты малюнак нешта тэатральнае і ўрачыстае, быццам адбыўся акт з якой-небудзь трагэдыі.

Перад сцэнаю, на адгароджанай лаве, сядзелі падсудныя: Касавокін Янка, Заяц Лукаш і Калупаенка Рывон. Настрой у іх быў вясёлы, быццам сядзелі яны не на лаве падсудных, а ў тэатры: такая ўжо вясёлая п'еса, проста ня стрымаешся, каб ня ўсьміхнуцца. Касавокін Янка, аскаліўшы свае белыя зубы, нешта весела і ціха расказваў Зайцу Лукашу, а той, закінуўшы шапку на патыліцу, доргаў за рукаў Калупаенку, як-бы кажучы: „Слухай, братка, як цікава ўсё гэта!“. Адным словам, падсудныя ня былі ў сваёй ролі, яны трымалі сябе, як пастароньнія сьведкі нечага надзвычайнага і вясёлага. І гэта яшчэ павялічыла цікавасьць да суда: кожнаму хацелася пабачыць, як гэтыя вясёлыя хлопцы пачнуць апраўдвацца і як зломіцца непакорлівасьць іхняя, бо на сцэне быў сапраўдны суд—„ў поўнай форме“, як выказаўся адзін з прысутных, „з усім прычындальлем“, як пацьвердзіў другі.

Суд, як прызвычаіліся казаць спакон вякоў, пачаўся. Старшыня суду зачытаў абвінаваўчае заключэньне. Яно ўзвальвала на падсудных цяжкія грахі, адкарастацца ад якіх простымі ўсьмешкамі нельга было. Каб апраўдацца, выйсьці сухім з вады, скінуць з сябе ўсе гэтыя абвінавачваньні, неабходна было мець ня толькі вонкавы спакой і бясьпечнасьць, вёрткую хітрасьць і ўменьне асьвятляць факты такім сьвятлом, які больш падыходзіць да моманту, але і нейкія больш важныя падставы, злоўжываць якімі ніводзін адвакат не адважыўся-б. З пункту погляду законнасьці, а ў даным выпадку— суда, падсудныя такіх падстаў ня мелі, а таму іхняя бясьпечнасьць здавалася членам суда фальшывай, яны былі ўпэўнены, што сьцяна спакою распадзецца, пакрышыцца, як распаленае шкло, апушчанае ў ваду.

— Падсудны Калупаенка, прызнаеце сябе вінаватым? — запытаў старшыня суда.

— Не! —лёканічна адказаў Калупаенка.

Тон быў дадзены. Калупаенка зьяўляўся душой кампаніі, яе ідэёвым кіраўніком, верхаводам, як-бы атаман, але з прэтэнзіяй на высокую годнасьць філёзофа, сэнсавіка вакольнага жыцьця, а таму адказы астатніх падсудных зьявіліся дакладным паўтарэньнем калупаенкаўскага „не!“.

Касавокіна Янку і Зайца Лукаша можна было параўнаць з тымі авечкамі, якія пераскакваюць усьлед за першым бараном загароду — якраз э таго месца, дзе спыніўся першы, якраз з такой сілай (на такую-ж вышыню і адлегласьць), як першы; памыліцца павадыр — уявіць, напрыклад, перад сабою канаву або прыме маленькую лужыну за вялікі раўчак (прымаць дробнае за вялікае ўмеюць ня толькі людзі, але і бараны)—за ім паўтараюць тую-ж самую памылку ўсе авечкі. Калупаенка лічыў, што ён не памыляецца, калі адказвае гэтаму нахмуранаму судзьдзю абрывістым пагардлівым „не!", — сябры-ж яго проста ішлі за сваім правадыром, як авечкі за павадыром. Інстынкт даверлівасьці прымушае авечак пераскакваць загароду, хоць-бы яна і не існавала, хоць-бы яна толькі мільгнула ў не заўсёды разумнай галаве правадыра; спадзяваньне на другога, больш моцнага, спрытнага, гэты фанатызм скоцкасьці прымушала сяброў Калупаенкі ісьці па яго сьлядох.

А сьляды Калупаенкі былі, відаць, загадзя абдуманы, узважаны, і хада яго на судзе была ўпэўненай і трывалай. Ён не ўдаваўся ў падрабязнасьці таго, пра што пытаў судзьдзя; ён не перамалваў з пустога ў парожняе, як тая свацьця сваёй куме; адказы яго, кароткія і ясныя, былі, так пабудаваны, што лішне чапляцца за іх нельга было; ён удаваў з сябе чалавека, які куды вышэй стаіць за драбнату фактаў, якімі арудуе судзьдзя. Для чалавека, які ня ведаў Калупаенку, магло паказацца, што яго абвінавацілі памылкова, што ён зьяўляецца ня „зрыўшчыкам прамфінпляну", як казалі пра яго на судзе, а самым звычайным, якіх сотні і тысячы, рабочым сярэдняга прадпрыемства, закінутага ў глухамань лясоў.

Пасьля судзьдзі Калупаенку пачаў дапытваць грамадзкі абвінаваўца Браніслаў Віктаравіч Сакалоўскі. Ён дапытваў па мэтодах шахматнай гульні, з разьлікам на далёкі ход, на буйную перамогу над праціўнікам за шэрагам дробных, нязначных уступак (пусьціць пыл у вочы праціўніку, ускружыць яму галаву лёгкімі перамогамі...); дапытваючы падсуднага, Сакалоўскі вёў складаную палітыку, якую нават не зразумеў Калупаенка: яму здалося, што запытаньні абвінаваўцы служаць яму, Калупаенку, на карысьць, апраўдваюць яго праступкі, але гэта толькі спачатку; чым далей раскідваў Сакалоўскі запытаньні, тым больш пераконваўся Калупаенка, што перад ім сапраўдны вораг, толькі ў трыніцы ласага вужа: крадзецца, як тая ласіца на сваю здабычу, лісьлівая і ласкавая з вострымі зубамі і спрытнымі кіпцямі. І калі зразумеў гэта Калупаенка, яму зрабілася злосна: на суд—хмуры і шэры, як дзень на фронце, набухлы гулам гармат і смуродам, на прысутных—бязьлікіх і халодных, як лёс, пастаўлены ўніз галавою, на Сакалоўскага—вёрткага і сьлізотнага, як вуж, як ласіца, як неадступнае і абрыдлае..

— Вы ня стоіце маёй падошвы!—ускрыкнуў Калупаенка, і голас яго прагучэў дзікай роспаччу па глухой цішыні клюбнае залі. — Вы, паважаны Браніслаў Віктаравіч, сёньня абвінавачваеце мяне, але заўтра самі сядзеце на гэтую лаву!

— Да парадку, грамадзянін падсудны!—узьняўся з крэсла старшыня суда, пільна гледзячы на Калупаенку.

— Я раскажу ўсё па парадку!—як-бы не заўважаючы старшыні суда, працягваў Калупаенка крыху ніжэйшым голасам.—Я да гэтага часу маўчаў, а калі і казаў, дык толькі выпіўшы. На сэрцы набалела, душу перавярнула, і я далей цярпець не магу. Мне хочацца, каб суд адказаў: для чага гэта калатня, якому чорту прыносіць яна карысьць? Быў я на фронце, палякам мардасіны біў, балахоўцаў па лясох лавіў, на Кубані вошы карміў, але-ж я зьяўляўся вольным чалавекам. Я ня ведаў, калі прачынаўся раніцой, што застануся жывы да вечара, мы жылі як скот тады, але-ж я быў вольны, я, што хацеў, тое і рабіў, над маім каркам не стаяў начальнік і не сачыла якая-небудзь гніда за маімі ўчынкамі. Першае, што трэба чалавеку, гэта воля. Калі я ня вышаў на работу, значыць—была прычына, і такая прычына, пра якую я не хачу каб ведалі другія, мая прычына собсьцьвеная, якая пры мне і павінна застацца... А тут узьнімаюць гармідар, мяне ў чорныя сьпісы, як ворага, заносяць. Гэта-ж ганьба, мяне топчаць з гразьзю, з брудам, быццам я не чалавек. А калі так, дык я нарошна ня іду на работу, можа мне выпіць хочацца, якое вам дзела, я сам сабе гаспадар!... Падумайце—усё роўна-ж я не чалавек, а зрыўшчык прамфінпляну, у чорных сьпісах састаю, чаму-ж такому зрыўшчыку і не пап'янстваваць у ахотку? Ды ня толькі пап'янстваваць, морды хочацца біць тады ўсім, бо ўсёроўна-ж да апошняга дайшло, як кажуць—прапала каняка, прападай аброць! Можа і ня так я кажу, бо мне цяжка сябе стрымліваць, і к таму-ж мы народ някультурны, але ўсё такі—галава з плеч далоў, а праўда—праўдай застаецца: я хочу быць вольным чалавекам, як тады, на франтах,—няхай вошы, няхай сьмерць, а каб воля была, каб не падштурхоўвалі мяне!..

— Якой вам волі хочацца? насьмешліва запытаў Сакалоўскі.

— А такой, паважаны Браніслаў Віктаравіч,—з падробкаю пад голас Сакалоўскага адказаў Калупаенка,—як вам сядзець на чужым карку, так мне на работу... Воля на работу, Браніслаў Віктаравіч...

— Грамадзянін падсудны, без асабістых выпадаў! — заўважыў старшыня суда.

— Я-ж і кажу, грамадзянін судзьдзя, воля на работу...

— Я вас не запытваю, якой вам волі хочацца...

— Я-ж кажу...

— Можаце не казаць... Садзіцеся... Падсудны Заяц Лукаш!

Па залі прайшоў шэпт—трывожны і варожы для Калупаенкі. На яго ўпіліся сотні вачэй, а ён, не глянуўшы на іх, з пагардаю пашоў на сваё месца. Здавалася, ён шкадуе сябе—за тое, што выказаў усё і не сказаў самага галоўнага, за тое, што не давёў да гістэрыкі Сакалоўскага (яму думалася, што „гэтая гніда можа ў гістэрыку ўдарыцца"), за тое, што за сьпіною адчуваў халадэчу і пусташ бязьлікае масы людзей. Ён апынуўся ў забыцьці, калі на душы пуста і холадна, як на голым полі ў марозную ноч, калі хочацца праваліцца наскрозьдоньне—у мгненьне, у адзін момант, каб ня бачыць, ня чуць, не адчуваць вакольнага—варожага і сьцюдзёнага. Аўтоматычна ўрываліся ў сьвядомасьць харобрыя словы Лукаша:

— Я, можна сказаць, ня прызнаю сябе вінаватым... Ударнік з мяне, бязумоўна, першы сорт: калі ўдарыць хто, я ў даўгу не застануся, рэшты дам нават з ліхвою. Можна сказаць—ліхой парняга, не падкачаю самаму першаму ўдарніку. Ну, канешна, сьмех — сьмехам, жарты на бок, а ўдарнікам я ўсё-ж такі быў. Вот на вайне мяне часта пасылалі ўдарнікам... І я не качаў, можна сказаць, быў харобры салдат... Правільна казаў таварыш Калупаенка: на хронце мы былі вольныя рабяты. Вот, помню раз значавалі мы ў вёсцы адной. Гэта дзела было, значыцца, на Украіне. Туды—сюды па станіцы, няма жратвы для хлапцоў... Вот я, значыцца, цап парасёнка за нагу, ён як запішчыць...

— Грамадзянін падсудны!..

— Я, канешна...

— Нам ня цікава, як вы цапалі парасёнка...

— Слухаю, таварыш судзьдзя...

— І не таварыш, грамадзянін падсудны...

— Грамадзянін, грамадзянік, — скарагаворкай адказаў Заяц, — выбачце, таварыш... цьфу!.. грамадзянін...

Па залі прашла хваля сьмеху. Сьмяяліся ўсе—ад падсуднага, членаў суда і да самых апошніх радоў. Нават хмуры старшыня суда і той неяк злосна пакрывіў твар—ня ўхмыльнуцца нельга было. Заяц сьвяткаў перамогу: ён высокую трагедыю абярнуў у вясёлы фарс. Сьмех—самая моцная зброя ў барацьбе, і той, хто ім умее карыстацца, выходзіць пераможцам. Хваля сьмеху па залі не абяцала поўнай перамогі, але тое, што частка сымпатыі ўжо заваявана на бок падсуднага, было бясспрэчным. Гэтага толькі і чакаў Заяц.

— Я-ж і кажу,—працягваў ён, калі сьмех уціхамірыўся, — што мы любім волю і прастор. Нам каб песьню зацягнуць, каб вясёлую, каб яна—во!—зямлю ўскалыхнула. Мы—народ вясёлы: нам хлеба, і да хлеба ды чарку яшчэ—горы перавернем... Усіх ударнікаў абгонім... А тут,—ну як-жа ня возьме злосьць? — папіхаюць табою, як пешкай... Мне каб самому, каб сам я, сваёй галавой... А тут думаюць

за нас... а кажуць, што гэта наша галава... Наша галава, можна сказаць, простая, і каб гэта мы ўсё, дык было-б зусім іншае. Ну, вот, помню, прышлі да нас на экскурсію сяляне. Хацелася ім паглядзець, як гэта робіцца шкло. Калі ласка, гэта змычка, мы самі ведаем. А вот-жа выш'а, можна сказаць, непрыемная штука: узялі ды намазалі шклодуўныя трубкі мазілам нейкім... Сяляне ў рот іх, дзьмухаюць з усёй сілы, а мазіла і расплылося па губах... Тут сьмех і сьлёзы, проста бяда... Змычка і расстроілася, падвялі, значыцца... А чаму, скажыце, вышла так? Сяляне і пролетарыят, гэта значыць—мы, як-бы браты, працоўныя, адзін на аднага працуем... Тут якраз-бы змычку і наладзіць... А вось-жа ня вышла дзела, шклодуўныя трубкі намазалі нейкай трасцай, а сяляне, як тыя дзеці матчыну цыцку, у рот іх. Вось і давярайся пасьля такога здарэньня нашаму народу. Поўны падрыў, можна сказаць. Я сам першы пакараў-бы таго, хто гэта зрабіў. Гэта, можна сказаць, поўнае шкодніцтва. Дык вось, я-ж кажу, што трэба нешта такое зрабіць, каб сілу і розум гэтых жартаўнікоў скарыстаць на чым-небудзь карысным... А то ў нас ўсё неяк кладзецца адно на адно, як-бы ня жыцьцё на зямлі, а скрозь адны кашары...

Ад пытаньняў Заяц адкараскаўся жартамі. Пасьля яго адказаў некалькі разоў рагатала заля. Сярод прысутных чуліся шэпты:

— Свой ў дошку хлопец!

— Каб яго з гэтага балота вырваць!

— О, ён-бы першым ударнікам быў!

Касавокіну-ж Янку не павязло. Ён ня меў зайцавай весялосьці,— яго душэўная структура складалася з некалькіх простых ліній, разгадаць якія можна было без асаблівай цяжкасьці простаму сьмяротнаму, ужо ня кажучы пра такую спрактыкаваную асобу, як старшыня суда. Судзьдзя некалькімі наводнымі пытаньнямі навёў Касавокіна на самае галоўнае, і той са шчырай адкрытасьцю расказаў усё тое, што набалела на душы, пра што не адважваліся казаць Калупаенка і Заяц.

— Нам па трыццаць год ужо, а мы яшчэ, прасьці госпадзі, да гэтага часу не сабраліся жаніцца...—(па залі прайшоў лёгкі сьмяшок, але ўсе адчулі ў гэтым нешта цяжкае і няпрыемнае).—Мы ня маем кутка, дзе можна было-б прытуліцца. Мы, як тыя валы, цягнем лямку на плячох і канца-краю ня бачым. У нас не заробак, а нейкае пасьмешышча...

— А хто вінаваты вам, кваліфікацыю чаму не набываеце? — перабіў яго Сакалоўскі.

— Галовы дурныя ў нас, таварыш інжынэр!—зласьліва адказаў Касавокін.—Галовы, паўтараю, не ў парадку... Клёпкі аднэй не хапае... Ха-ха-ха! Вам што—вы нарадзіліся на сьвет разумным, вам і кнігі ў рукі... А нам—з носа ды ў рот, наша дзела малае... Вот каб я пад

вашаю плянэтаю зьявіўся на сьвет, тады-б зусім іншае было-б. Можа-б я вас тады прасьвяшчаў, раіў-бы вам кваліфікацыю набываць...

— Пачакайце, падсудны,—страпянуўся абаронца, які да гэтага часу моўчкі пераліствaў перад сабою папку,—скажыце, калі ласка...

— Я вам нічога не скажу, грамадзянін аблакат. Я вас не запрашаў сюды, і комэдыі прашу ня строіць...

— Грамадзянін падсудны... Гэта-ж на вашу карысьць...

— Я сам за сябе ўмею пастаяць... Абарона мне не патрэбна...

Абаронца, праказаўшы нешта сабе пад нос, змоўк. Лысіна яго зачырванелася і чарнявыя вочы апусьціліся ў паперу. Пасьля гэтага „інцындэнту з падсудным" ён не падавай голасу да абарончае прамовы.

Засядацель, з шырокаю барадою рабочы, запытаў у Касавокіна...

— А як ты думаеш на далей быць?

Другі заседацель, ловячы свае абстрыжаныя вусы, дадаў:

— І ці думаеш ты выправіцца?

Касавокін пільна паглядзеў на іх, разьвёў рукамі і з незахаванай усьмешкаю праказаў:

— Як бог дасьць!.. Варажыла бабка на двое...

Касавокін больш нічога не сказаў, і заседацелі не адважыліся задаць яму новыя запытаньні. Допыт падсуднага быў спынены. Пачаліся паказаньні сьведак.

Сьведкі—адзін за адным, чарадою, — праходзілі перад судом. Першым дапытваўся Пятрусь Гарушка. Ён падрабязна расказаў правыпадак ноччу—як узьнімалася і валілася на дарогу старасьвецкая хата, як абкружыла яго п'яная кампанія і як ён ледзь-ледзь выкруціўся ад іх. Ён нічога не дадаў, ня зьменшваў, проста расказаў тое, што бачыў. Былі ўспамянуты прозьвішчы ня толькі падсудных, але і Ляшча Піліпа і Петрыкава Рыгора.

— Адкажыце, сьведка, як яны трымаюць сябе ў інтэрнаце?— запытаў старшыня суда.

— У інтэрнаце наогул непарадкі вялікія,—ажывіўся Гарушка.— Там нельга ні кніжкі пачытаць, ні адпачыць па-людзку. У адным куце, глядзіш, у карты рэжуць, у дваццаць адно, на грошы, не абы як; у другім—анэкдоты расказваюць, ды такія, што сьвежаму чалавеку аж брыдка становіцца:, у трэцім—гарэлку п'юць, уадкрытую, нагбом, проста з бутэлькі... У карты гуляюць, гуляюць, не паладзяць, відна, ці паддурыць хто каго—біцца пачынаюць, а тыя, што анэкдоты расказваюць, на лаянку пераходзяць, аж вушы вянуць, ну, а тым, што гарэлку п'юць, і сам бог вялеў ліхтары пад ілбамі адзін аднаму

паставіць... З інтэрнатам—проста бяда, гэта наша хворае месца... Ну, вядома, гэтыя хлопцы, каторых мы судзім сёньня, самыя завадэвушы там, бяз іх нідзе не абойдзецца, яны галава ўсяму...

Сьцяпан Гарбуз, калі яго папрасілі ахарактарызаваць падсудных, так сказаў пра іх:

— Былі-б добрыя хлопцы, каб троху пахарашэлі. Але іх як-бы хто зьбівае з правільнага пуці. Я ўжо колькі разоў казаў пра іх. І на мітынгах, якія ў нас адбываліся, і на сходах, і ў прыватных гутарках. Ня слухаюцца хлопцы. Відаць, глыбока засела гэта самая атрута, калі ніяк не скавырнеш іх з гэтае дарогі. А выправіцца трэба. Гэта вас ня суд судзіць, а мы—рабочыя. Мы зацікаўлены ў тым, каб усе аднолькава адносіліся да работы. Праца—гэта вялікі гонар для сумленнага чалавека. Калі няма ўмоў для працы, калі праца перашкаджае чалавеку, давайце разам абмяркоўваць, як перамагчы гэтыя перашкоды, як зрабіць так, каб праца не перашкаджала чалавеку, а, наадварот, зьяўлялася неабходнай часткай у яго жыцьці. Перакідваць-жа хаты ў знак протэсту, ня ісьці на работу, п'янствваць—гэта самы лёгкі шлях, але шлях не рабочага, а нашага ворага які хоча падарваць наша разьвіцьцё. Вось і вы, магчыма самі таго ня ведаючы і не асьведамляючы, дапамагаеце ворагу ў яго барацьбе супроць нас. Трэба выправіцца, хлопцы, і ўсё будзе добра.

Сэкратар комсамольскай ячэйкі Ляксей Буры з пафасам і нянавісьцю кідаў словы:

— Вы—нашы ворагі, падрыўшчыкі комсамольскай работы на гуце! Нядаўна мы вывешалі аб'явы аб скліканьні комсамольскага сходу, а вы нарачыта арганізавалі вечарынку і перацягнулі туды ўсю нашу моладзь. Гэты факт нельга інакш расцэньваць, як сьвядомае шкодніцтва, накіраванае супроць комсамолу. Вы льлеце ваду на млын клясавага ворага, вы зьяўляецеся самым шкодным элемэнтам на нашай гуце!

Калі прысутныя ўбачылі перад судом Антося Шалага, заля сьціхла і настаражылася. Ён ціха, як-бы гаспадарліва раскладваючы словы, казаў:

— Помню, я яшчэ быў маладым, у мяне захварэла жонка. Ну, от як-бы пры сьмерці ляжыць. Працаваў я тады ня тут, а ў горадзе. Ну, і не пашоў на работу. Нельга было пайсьці, я ўвесь час знаходзіўся каля хворай. Ня быў на рабоце толькі адзін дзень. І што-ж вы думаеце, мяне за гэта зволілі. „Как так сьмееце ня прыці на работу?.. Жонка хворая? Ну, і сядзіце,—кажуць,—каля жонкі... От я ўспамінаю гэта, калі гляджу на вас. Тады работы шукалі, як бога веруючыя, і калі хто знаходзіў, ён думаў, што яму пашанцавала, што яму дапамог бог. Працавалі за кавалак хлеба, і ня сем гадзін, як цяпер, і ня восем а цэлыя дванаццаць. Я, вось, нізашта ня ўцямлю

як гэта робіце вы і што такое думаеце, калі ня хочаце ісьці на работу. Раз пачалі працаваць, то нельга-ж кідаць, гэта-ж вытворчасьць, а ня што-небудзь, і вытворчасьць нашая для нас-жа саміх. Другая справа, каб гэта быў капіталісты. Згары яна тады, работа гэтая, калі можна не пайсьці, дык чаму-ж? Ды і то гэта не барацьба, а так сабе, калі ўзлуешся на сваю кішку... Вот я і схіляюся да таго, што вы падумаеце добра. узважыце тое, што вам тут кажуць, зусім зьменіцеся. Трэба глядзець на сьвет не праз сваю шчыліну, а вачыма ўсіх людзей, з якімі працуеш.

Гэта быў ня допыт, а агітацыя. Сьведкі трымалі сябе, як мітынгоўшчыкі. Кожны з іх лічыў абавязкам пасароміць падсудных, давесьці ім усю шкоднасьць іхніх паводзін, зьвярнуць увагу злосных прагульшчыкаў на недапушчальнасьць у далейшым такіх учынкаў. Толькі апошнія два сьведкі—Петрыкаў Рыгор і Лешч Піліп—унесьлі нешта непадобнае з паказаньнямі іхніх папярэднікаў. Іх знарок пусьцілі пад канец,—гэта была справа рук спрытнага Браніслава Віктаравіча,—каб больш эфэктыўнае было завяршэньне процэсу, каб ушчэнт разьбіць непакорлівасьць падсудных, каб заваяваць канчаткова сымпатыі прысутных. „Гэта прагучыць дзіўным дысонансам у параўнаньні з паказаньнямі падсудных,—весела казаў Сакалоўскі напярэдадні процэсу старшыні суда,—гэта пакажа масе, што лепшыя рабочыя,выпадкова трапіўшыя пад уплыў зрыўшчыкаў прамфінпляну, усьведамляюць сваю вінаватасьць і шчыра жадаюць выправіцца".

Невялікага росту, з русявымі рэдкімі валосікамі, замест барады, з дробнымі рысамі твару, непаседлівы і хітраваты, крыху згорблены, як бы нешта яго прыгняло да зямлі, трымаючы шапку ў руках, перад сцэнаю стаяў Лешч Піліп, і, апусьціўшы вочы на падлогу. вінавата дакладаў суду:

— Я ўвесь час быў сьвядомым рабочым. Я састаяў у розных гуртках, у Мопру і Асаяхіму хадзіў, на сходах заўсёды сядзеў. адным словам, быў як усе. Я ўвесь час быў, гэта ня хлусячы, акуратным рабочым. Але, вось, самі ўжо ведаеце, давялося мне падружыцца з гэтымі самымі, каторыя цяпер сядзяць тут. Я ня ведаю, як гэта вышла, але пайшло і пайшло. У мянё-ж, самі ведаеце, сям'я, дзеці, я не раўня ім,—з іх кожнага вазьмі, дык ён гол як сакол, а я ўсё-такі інакшы, чым яны,—але-ж давялося здружыцца з імі. Ну, і пайшло, і пайшло. Адным словам, я папаў пад іх уплыў. Яны злавілі мяне, як той павук муху ў свае цянёты. Ну, і пачаў разлагацца. Я ўжо запамятаваў і на Мопру, і на Асаяхіму, мне ўжо было мора па калена: гарэлка ды карты, гарэлка ды песьні. А з песьнямі далёка не заедзеш! Як ёсьць мы ўдарнікі, і як трэба нам пяцігодку за чатыры гады, то, як падумаю я цяпер, мы вялікае злачынства рабілі. Нам бы толькі працаваць ды ўдарніцтва на высокую нагу ўзьнімаць,

амы біндзікі білі,чырвоныя галоўкі раскупорвалі. І вот, адным словам, цяпер, калі я зноў стаў сьвядомым рабочым, я кінуў гэты дурман і заклікаю вас, таварышы рабочыя, зрабіць тое-ж самае, бо калі мы будзем рабіць усе так, як гэтыя адсталыя і несьвядомыя, наш хронт ня вытрымае. І вось я кажу: няхай жыве Камуністычная партыя, як ёсьць яна адзіны наш кіраўнік, і сусьветная рэволюцыя, збавіцель усяго пролетарыяту ад гідры капіталізму.

Заля маўчала, як-бы ў чаканьні нечага надзвычайнага. На безьлічы твараў былі прыкметны цені нездавальненьня. Усё адбывалася так, як быццам у кампаніі сваіх людзей праходзіла жвавая гутарка—і вось, раптам, уварваўся ў гэты круг блізкіх людзей нехта чужы і пачаў малоць лухту, зусім не па свойску, наскімі тэрмінамі на чужынскай мове. І круг сяброў сьцішыўся, змоўк, агорнуты няпрыемнасьцю і глыбока захаванаю агідаю. Гэта адчуваньне яшчэ больш паглыбляецца тым, што той, нясвойскі, чужы, адчувае сябе ў гэтым кругу людзей сваім чалавекам, блізкім, наскім, быццам ён з таго ж цеста зьлеплены, што і людзі, якія яго ненавідзяць. Тады сябры не глядзяць адзін аднаму ў вочы, адчуваюць нейкую вінаватасьць перад усімі, і кожнаму хочацца як мага хутчэй уцячы з гэтага кругу людзей. Лыжка дзёгцю, як кажуць, псуе бочку мёду, але кожны мае свой густ, і напэўна знойдуцца аматары, каторыя будуць даводзіць адваротнае.

Паказаньні Петрыкава Рыгора былі дакладным паўтарэньнем слоў Піліпа Ляшча, толькі ў яшчэ больш прымітыўнай форме. Ён кляўся, б'ючы сябе ў грудзі, што ён першы і апошні раз сяброўе з гэтай кампаніяй зрыўшчыкаў прамфінпляну, і што ён перародзіцца ў зусім новым напрамку; ён абзываў падсудных і контрамі, і гідрамі, і ворагамі дыктатуры пролетарыяту, як быццам на лаве падсудных сядзелі ня жывыя людзі, а нейкая абстракцыя падонкаў чалавецтва. І дзіўна: па залі замест хваляў сьмеха прабягалі хвалі агіды—нявыказнай, захаванай, але прыкметнай ў вачох і рухах. І душа ўсяго гэтага пляну—грамадзкі абвінаваўца Сакалоўскі—адчуваў інстынктыўна крах свае выдумкі, і пачынаў ужо раскайваць у яе ажыцьцяўленьні. Але паправіць ужо нельга было, трэ'было даглядаць інсцэніроўку да канца. І яна няўхільна набліжалася да гэтага прыглушанага канца,усё глыбей топчачы ў гразь задуманы эфэкт. Замест бліскучага эфэкту—нямінучы крах інсцэніроўкі, і нейкая нявыказная вінаватасьць на тварах людзей за чалавечае глупства.

Слова для абвінаваўчага заключэньня атрымаў Сакалоўскі. На яго долю выпала доля ўзьнімаць патаптаны эфэкт, і ён напружыў усю сілу волі і свайго красамоўства, каб хоць ня поўнасьцю, хоць на палову ўзьняць задуманае яшчэ напярэдадні процэсу. Паджарая яго фігура сабралася ў адзін камок—дзябёлы і пругкі, і нават акуляры засьвяціліся бляскам нянавісьці і свае ўласнай магутнасьці.

— Таварышы!—падышоўшы да трыбуны, пачаў Сакалоўскі.— Абвінаваўцу пакладзена па штату абвінавачваць і патрабаваць. Такі ўжо лёс абвінаваўцы. Справа абароны—абараняць. Калі ён ня будзе рабіць гэтага—ён ня будзе абаронцам. Абвінавачваньне і абарона—гэта дзьве супроцьлеглыя сілы, якія сустракаюцца на арэне суда і ўступаюць у бязьлітасную барацьбу. Хто пераможа—той правы. Чыя возьме—на баку таго праўда. Гэтак было з-пакон вякоў. Цяпер гэтага няма. Мы жывем у той шчасьлівы час, калі нараджаецца новая сутнасьць і новая форма. Але не заўсёды форма пасьпявае за сутнасьцю, і часам новае віно напаўняе старыя мяхі. Я, прынамсі, асабіста супроць старых форм судовае практыкі, але ня месца тут разважаць на гэту тэму. Сёньня мая задача—давесьці вінаватасьць падсудных, паказаць шкоднасьць іхніх праступкаў. Першае, што кідаецца ў вочы пры разглядзе гэтае справы, гэта ўпартае няпрызнаньне падсуднымі сваіх памылак. Гэта толькі паглыбляе віну. Шчырае і адкрытае прызнаньне памылак—гэта, на мой погляд, палова гарантыі на тое, што гэтыя памылкі будуць выпраўлены. Бязумоўна, за падсуднымі—цэлы шэраг вялікіх праступкаў, за якія яны павінны адказаць па ўсёй суровасьці рэволюцыйных законаў. Краіна наша ўся ў тэмпах і барацьбе за соцыялізм, краіна ва ўдарнасьці і соцыялістычным спаборніцтве, краіна ўпарта будуе новае жыцьцё. Уся рабочая кляса з закасанымі рукамі—на будоўлі, у капальнях, каля варштатаў. Сельская гаспадарка пераводзіцца на рэйкі арганізаванае, машынізаванае, соцыялістычнага тыпу гаспадаркі. Краіна перажывае пэрыод бязьлітаснай клясавай барацьбы. Наша будаўніцтва стаіць на крыві. Мы гэта ведаем, і для нас асабліва яно дорага. Клясавыя супярэчнасьці абвастрыліся да немагчымасьці, стаяць у баку ніводзін чалавек ня можа, кожны павінен быць або на той, або на гэтай старане. Нэйтральных ня можа быць, нэйтральнасьць—гэта таксама свайго роду ўдзел у клясавай барацьбе. Пад маскай нэйтральнасьці звычайна хаваецца наш самы бязьлітасны вораг. Далоў маскі!—кажам мы. Або з намі, або супроць нас. Інакш разважаць нельга. Гэта той-жа фронт, дзе брат брату можа быць зьверам і дзе ўсё ставіцца на кон. Вось на гэтым фоне вялікага будаўніцтва, у агні клясавай барацьбы праступкі падсудных набываюць асабліва цяжкі для рабочае клясы характар. Падсудныя, зьяўляючыся адзінкамі свае клясы, фактычна здраджваюць ёй. Сваёй, на першы погляд, здавалася б, нэйтральнасьцю, яны фактычна становяцца на той бок барыкад. Трэба глыбока ўдумацца ў сутнасьць дробных фактаў, каб зразумець вялікую шкоднасьць праступкаў рабочых. Гэта—дэзэртырства з фронту будаўніцтва, гэта—здрада сваім таварышам па клясе. Нашы сябры па Вялікай французскай рэволюцыі расстрэльвалі такіх эдраднікаў. Гісторыя барацьбы за Кастрычнік таксама багата такімі фактамі. І гэта зусім натуральна: здрада аднаго таварыша можа сарваць увесь

фронт, можа зацягнуць канчатковую перамогу на невядомы час. Дзеля выдаліць зло ў пачатку, чым весьці з ім барацьбу пасьля, калі яно пусьціць ужо глыбокія карэньні. Цяпер, калі ўвесь сьвет, справа нашай краіны, перажывае глыбокі крызіс, мы павінны асабліва напружыць сілы для барацьбы за канчатковую мэту. На Захадзе, у Амэрыцы—мільёны беспрацоўных, вайна за скарынку хлеба, а тут, у краіне вялікае будоўлі, даводзіцца прымушаць гультаёў працаваць. Гэта—сымболь нашае эпохі, ключ да разуменьня нашага часу. І вось, улічыўшы ўсё гэта, мне даводзіцца толькі сказаць, што праступкі падсудных патрабуюць суровага пакараньня. Судзіць ня суд, а ўся маса, мы выконваем толькі волю масы. Тую-ж волю, пра якую казалі падсудныя, мы адкідваем з агідаю, як волю гультаёў і абібокаў, якая об'ектыўна служыць нашым ворагам на руку. Выхаваўчай работай тут не дапаможаш, толькі суровы рэволюцыйны закон можа выправіць гэтых людзей, можа вярнуць іх да сваіх таварышоў, да грамадзкага жыцьця чалавека.

Процэдура падыходзіла да канца, заставалася выступіць толькі абаронцу. Ён падыйшоў да трыбуны, пагладзіў леваю рукою сваю лысіну, перагарнуў для прыліку некалькі лістоў у папцы, закінуў галаву назад і, углядаючыся ў столь, як адзіношны юнак на беразе мора ў неба, пачаў гаварыць:

— Абвінаваўца, на мой погляд, памыліўся крыху. Наша справа агульная—разабрацца як мага больш дакладна ў справе. А справа, на мой погляд, вельмі заблытаная. Гэта ня важна, што я сяджу на правай старане, а абвінаваўца на левай, я таксама, як і ён, зацікаўлены ў правільным выраш'эньні справы. Для нас закон—вышэй ад усяго, і мы павінны ўмець правільна яго скарыстоўваць. У адных руках ён можа апынуцца ў цацку, у другіх—у дышла, пра якое гавораць, што яго куды ні павярні—ўсюды выйдзе. Але, як правільна заўважыў абвінаваўца, тут ня месца для полемікі, трэба падыйсьці з усіх бакоў да справы. На мой погляд, падсудныя, бязумоўна, вінаваты, і апраўдваць іх абсолютна было-б вялікім глупствам. Мы людзі дарослыя, і ашукваць адзін аднаго ня зьбіраемся. Справа ня ў тым, каб падшукаць той або іншы артыкул і прыстасаваць яго да гэтых абставін, мы хоць народ юрыдычны, але не зьяўляемся мэханістамі. Таксама чытаць політграмату, першыя асновы, на мой погляд, політграматы, вельмі немэтазгодна. Мы павінны глыбока разабрацца ў акалічнасьцях справы, каб сказаць тое або іншае слова. Я, уважліва слухаючы паказаньні падсудных і сьведак, прышоў да заключэньня, што яны, гэтыя тры чалавекі, не заслугоўваюць такой суровай кары, якой патрабуе абвінаваўца. Бязумоўна, зрыў прамфінпляну—справа шкодная, але, на мой погляд, трэба прымаць пад увагу ня толькі об'ект, але і суб'ектаў. Трэба пакараць, бязумоўна, але так, на мой погляд, каб гэта пакараньне дало падсуд-

ным магчымасьць выправіцца ў найкарацейшы тэрмін, змыць з сябе пляму зрыўшчыкаў вялікага будаўніцтва. Падсудныя знаходзяцца ў нездаровым абкружэньні, бытавыя ўмовы ствараюць глебу для вырастаньня такіх пахучых кветак. Агонь, на мой погляд, павінен быць накіраваны ў першую чаргу не на самыя кветкі, а на тую глебу, якая іх парадзіла, каб з коранем выпаліць усе зло і сьмецьце, што схавана там. Пакараць гэтых трох падсудных вельмі лёгка, але, на мой погляд, гэтым канчаткова справы ня вырашыш: замест іх зьявяцца новыя. Я прашу суд не падумаць, што я абараняю абсолютна падсудных. Я прызнаю за імі вялікую віну, але я зварачваю ўвагу суда і на тыя ўмовы, якія парадзілі гэту справу.

— Ваша апошняе слова, падсудны Калупаенка!—зьвярнуўся старшыня суда да падсуднага.—Жадаеце што-небудзь сказаць?

— Так, жадаю!—узьнімаючыся з лавы, сказаў Калупаенка.—Я жадаю сказаць, што мы вінаваты, але ня так, як разумееце вы вінаватасьць. Мы вінаваты, што зьяўляемся такімі, а ня іншымі, як кожны іншы вінаваты, што зьяўляецца іншым, а не такім, як мы. Так можна абвінавачваць Лявона, чаму ён не зьяўляецца Кузьмой, а Кузьму, чаму ён не зьяўляецца Лявонам. Я скончыў. Больш нічога ня маю сказаць.

— Падсудны Заяц Лукаш, ваша слова?

— Я ня маю нічога.

— Падсудны Касавокін, ваша слова?

— Я ўсё сказаў.

— Такім чынам,—старшыня суда ўзьняўся з крэсла,—абвяшчаю перапынак на 15 хвілін.

Суд пайшоў на нараду. Заля загаманіла, зашумавала. Здавалася, што ў залі прачнуліся потэнцыянальныя сілы, дасюль некуды глыбока захаваныя, пра якія нават ніхто і ня ведаў,—такой напружанай была старожкасьць і цішыня. Падсудныя сядзелі абасоблена адзін ад аднаго, кожны ў адзіноцтве чакаў прысуду над сабой. Іхняя акамянеласьць і абыякавасьць да навакольнага наводзілі на думку, што над імі высока ўзьняты молат—важкі, магутны, і яны, асуджаныя падпасьці пад яго, спакойна чакаюць гэту кару.

А заля гаймавала, шумела. Пятнаццаць хвілін перарасьлі ў вечнасьць, каторай ня відна было канца. У хвіліны напруджанага чаканьня час расьцягваецца ў бязьмежнасьць, і патрэбна вялікая мужасьць, каб ня згубіць сябе ў гэтай бязьмежнасьці. А згубіш—на мгненьне, на момант,—і цяжка вярнуцца ў прошласьць, амаль не магчыма знайсьці пункт дотыку з часам, які так пэўна і цьвёрда адчуваў пад нагамі зусім нядаўна. Калупаенка добра ведаў пра гэта, і ён пільна ўглядаўся ў абраны ім пункт дотыку—у недакураны

кавалак цыгаркі на падлозе. Цыгарка зьяўлялася для Калупаенкі тым маякам у цемені бытнасьці, які зьвязваў яго з берагам рацаіснасьці.

— Суд, ідзе, прашу ўстаць!—пачуўся нейчы голас здалёк, з вышыні, і заля сьціхамірылася, замерла. Члены суда занялі свае месцы. Старшыня пачаў чытаць судовую пастанову.

Пастанова зьяўлялася як-бы драмай—з пэўнай завязкай, з кульмінацыйным пунктам, з абумоўленай разьвязкай; відаць, каля яе пахадзіла спрытная рука Сакалоўскага. У пастанове падрабязна пералічваліся праступкі падсудных, яны разьбіваліся на графы, да іх падводзіліся артыкулы з кодэксаў, і пастанова атрымлівала права на існаваньне.

Голас старшыні суда то ўзьнімаўся, то ніжэй апушчаўся, гледзячы, што ён чытаў: калі гэта было статычнае пералічэньне праступкаў падсудных, ён быў роўны і спакойны, як голас чыноўніка, калі гэта была кваліфікацыя праступкаў, ён на некалькі мерак падскакваў у гору і набываў сакавітасьць голасу прамоўцы, пераконнага ў сваіх ідэях; калі справа даходзіла да накладаньня кары за гэтыя праступкі, голас ператвараўся ў пафас актора высокай трагэдыі:... „грамадзянам Калупаенку Рывону, Зайцу Лукашу і Касавокіну Янку абвясьціць... (тут адбылася паўза, старшыня як-бы перавёў дух) суровае грамадзкае ганьбаваньне".

Атмосфэра як-бы набыла разрадку,—напружанасьць зьнікла, зноў натоўп зарухаўся і загаманіў,—адчыніліся дзьверы і з задніх радоў пачалі выходзіць. Людзям было неяк не па сабе: наэлектрызаванае адчуваньне палюцыянізавала ў фальшывае выйсьце, як бы гэтым самым паказваючы на хімэрнасьць з далёкасьці ўзятым натугам.

У крыві чалавека блудзіць інстынкт зьвярынасьці, і часам рафінаваны сноб ловіць сябе на прагнасьці да крыві, на смазе да пакут чаго небудзь жывога, каб смактаць, піць гэту пакутнасьць, як дзікун жыватворчую кроў свайго ворага, каб глядзець, любавацца сьмяротнасьцю жывога, як тыя рымляне на бойку бугаёў або на асуджаныя ўздрыгі нявольніка ў войстрых кіпцюрах льва. І калі не задавальняецца гэтая зьвярынасьць чалавека, ён адчувае спустошанасьць у самім сабе, асьнежанасьць сваіх адчуваньняў, і яму здаецца, што ён самы няшчасны ў сьвеце.

Натоўп выходзіў з клюбу і зьнікаў у цемені ночы. Тут былі і малыя, і старыя, і хлапцы з дзяўчатамі. Чуўся сьмех, гоман, жарты. Было весела, як увесну, калі ўся прырода пяе гімн маладосьці, жыцьцю. Азызлы вецер з поўначы можна было не заўважаць, ён проста зьяўляўся тут лішнім. А гразказьць, а сьлізота проста не існавалі,—яны панавалі некалі раней у далёкай мінуўшчыне. І ўсё-

такі людзі былі нечым не задаволены, ва ўладзе цьмянага суму па блізкім, але закаваным у ланцугі грамадзкае цьвярозасьці.

Апошнімі выходзілі падсудныя. На іх тварах ня відаць было сьлядоў грамадзкага ганьбаваньня, але і нельга было сказаць, што іх апанавала радасьць. Яны ў гэты момант былі проста людзьмі, для якіх навакольнае ня існуе;—яны ішлі, як тры вялікія абвінаваўцы, на суд у будучыню—судзіць прошласьць, яе цяжкія грахі;—іхнія постаці ў сьвятле вокнаў клюбу на чорным фоне ночы выраставалі ў агромністыя чалавечыя цені.

1-2-XI-31 г.
г. Менск.

(*Працяг будзе*)

Барыс Мікуліч

Ліст пра Хацімат

1

„Жыцьцё ў гэтым мястэчку адзначаецца вось чым:

Нудна і брудна. Нудна і брудна ў тутэйшым „готэлі“,—у ім—у гэтым „готэлі“—за два рублі пяцьдзесят капеек атрымліваеш усе земныя радасьці: шматгорбага вярблюда, што скавыча, стогне і сапе зусім не па-вярблюжаму (— прасьцей кажучы, гэта ложак); праз меру ветлівую ўсьмешку суседкі па пакоях,—яна часта—адвячоркам—стаіць перад вакном у цёмным калідоры і курыць папяросу за папяросай—тутунь дужа дрэннага гатунку; такі-ж ветлівы адказ работніцы гасьцініцы на сьлёзную просьбу даць лямпу: „Ідзеце ў гарсавет, лямпы у мяне няма“... Ветлівая гэтая работніца—у яе баляць зубы, зубны боль у яе хронічны, і шчака заўсёды абверчана брудней хусьцінкай адказвае на ўсе запытаньні лёканічным парадоксам, і потым ідзе павольнай хадой, шлёпаючы вялізарнымі мужчынскімі галёшамі, у свой брудны, як і хусьцінка, кут. Брудным, як работніца гасьцініцы, ідзе восенскі местачковы вечар“.

Спачатку я напісаў так, і вырашыў потым усё перакрэсьліць, напісаць табе пра іншае. Ты спытаешся—чаму? Зусім проста. Жыцьцё гэтага мястэчка, з патугамі ўдаваць з сябе горад, мае шмат граняй. Вядучы далей закрэсьленае, я-б мусіў быў напісаць і пра фотографа, што атайбаваўся са сваім „отэлье“ каля гасьцініцы, проста пад брудным дахам восенскага неба. Апарат у фотографа—універсальны. Ён нагадвае проекцыйны ліхтар, зроблены вучнямі. Гэта—вялізарны няўхлюды кораб з паржавелымі зацапкамі. Гэта—і камэра, і лябораторыя адначасова. Першыя дзьве фотографіі каштуюць па рублю, наступныя—поўрубля кожная. Фон для фотографій—дыван. Кажуць, што дываны маюць сваю мову. Я чытаў гэты дыван і, прызнаюся па-шчырасьці, здолеў прачытаць толькі адно: гэты дыван бачыў на сваім вяку шмат. Ён брудны, з паблеклым вяночкам лісьця, непазнанай ботанікай формы. Пасярэдзіне дывану, якраз на ўзроўні чалавечых плеч, калі чалавек сядзіць,—чмурая лысіна ад шматлікіх і частых датыканьняў чалавечых цел.

— Учора я фотографаваў аднаго масквіча... з Бярэзіна... Такі поўны, прыгожы... Каб вы толькі бачылі, што за здымак атрымаўся,—цуда!

Або яшчэ. Бухгальтар спажывецкага таварыства нагадвае замежны атракцыён—ілюзыяніста.

— Вось вам фактура!—і перад вачыма корэспондэнтаў цэнтральнай газэты далонь правай рукі.—Вось гэтая фактура адсылаецца ў сельскую краму!—і перад вачыма далонь левай рукі.

Так і ідзе на розум:

— Тут няма, тут пуста! Увага, грамадзяне! Гэтая пяцікапеечная монэта... Вось яна!

Але згубленая фактура — не пяцікапеечная монэта. „Тут яна ёсьць, тут... яе няма", яна пахавана ў аналах спажывецкай кооперацыі.

Салтыкоў-Шчэдрын жыве!..

Я зайшоў у кнігарню і купіў тваю кніжку. Ах, гэтая чараўнічая экзотыка! Мой мулкі ложак здаўся вярблюдам, караблем Сахары, а датыкі дажджавых пальцаў да шыбін ня цяжка было ўявіць музыкай морскага шквалу...

У надвячоркавым мораку мне захацелася думаць аб тым, „як шквал зьлятае раптам, узьбіўшы валаў морскі хмель", аб тым, „як бяз ветразяў і мачтаў імчыць на скалы карабель"... І пашло мае ўяўленьне бяз ветразяў і мачтаў гуляць па моры экзотычнай фантазіі, і калі сказаў я таварышу па пакою:

— Зірні, Пятрусь, як зарніцы дальнія небасхіл ліжуць,—

дык ён зірнуў на мяне з такім выглядам, нібы перад ім ляжаў на ложку ня я, а псыхічна хворы чалавек, зірнуў і адказаў:

— Гэта-ж ліхтар за парканам засьвяцілі, вось і адкідае сьвятло на хмары. Хіба ўвосень зарніцы бываюць, галава ты разумная?! Хадзем лепш на вечар.

Ну, нічога не парадзіш, калі законы прыроды нязьменныя, і я не спрачаўся, я толькі падумаў: „Эх, які непоэтычны чалавек, эх, які вандал"...

Пачакай! Я, здаецца, заняўся поэзіяй. Не, лепш пакінем гэта нашым крытыкам, а то не сваёй яны справаю часта займаюцца, сіл шкода іхных.

Пачакай! Хаціма? Гэта яна, зьбіраючы плён ночнага шквалу, высока падаткнула сваю спадніцу, прыгожыя — пругкія і моцныя ногі ўвязаюць у мокрым жвіры, пакідаючы ў ім глыбокія сьляды. Хаціма? Чорныя густыя валасы з-пад хусткі паўзуць машастовымі жгутамі (яны жывыя—гэтыя валасы, яны лашчуць шыю, нібы боа); смуглявы твар з ледзь улоўнай ружовасьцю (нібы россып рубінавы ў кавалку сьлюды); рухавая, вясёлая песеньніца! Яна, так яна зачынала ў часе перапынку песьню, так гэта яна мяккім контральто зачынала:

Трубы песьню заіграл,
Песьню пра вайну,—

і падхапілі гэтую песню.комсамольцы мясцовай ячэйкі:

Пэўне, братцы, хутка ў бойку
Гэээй! У апошні бой.

Так! Твая Хацімат сядзела ў першым радзе, каля самай сцэны, слухала даклад аб закліку рабочых-ударнікаў у літаратуру, слухала, як я чытаў нарысы пра будаўніцтва дарожнай магістралі, што паясом апаяша Беларусь Савецкую, слухала мяне, нешта, нахіліўшыся да суседкі, шаптала ёй на вуха (я гэта заўважыў), а погым, у перапынак, сьпявала разам з грудком моладзі.

Я, здаецца, зрабіў непапраўную памылку, калі чытаў свае нарысы. Трэба было-б узяць тваю кніжку, спаслацца на тое, что чытаць прозу цяжка, што лепш я прачытаю вершы свайго таварыша-поэта, і чытаць, і чытаць, і чытаць!..

... Я закрэсьліваю гэта. Я пішу табе новы ліст, ліст пра тваю Хацімат.

2

Тады мы зайшлі ў інтэрнат. На нарах разварушана чалавечымі целамі салома, шматкі яе паабвісалі долу, хрумстаюць пад нагамі. Сьлязьлівая газоўка з разьбітым комінам ледзь асьвятляе гэты пакой, агеньчык газоўкі бяссэнсава паміргвае штохвіліны. На нарах – людзі. Высокі стары чалавек, з пасівелай рукавіцай-барадой, хутаючыся ў пашарпаную сьвітку, кажа нам:

— Мы заўсёды на заработках, галубочкі мае, час прабаўляем... Падцягнецца крыху хлапец і пайшоў на дарогу зарабляць,.. Так ужо здаўна заведзена, ад дзядоў... Усю Расію аб'ехалі, абхадзілі...

Ён сьплёўвае на падлогу і вялізарным сваім ботам расьцірае сьліну.

— У нас дома бабы ўсё робяць ня так, як тут у вас... У нас бабы і за коньмі ходзяць, і ў лес езьдзяць, араць і сеяць яны мастакі...

Увесну пайшоў я сеяць і нічога, дальбог, не атрымалася, жыта ўзышло, аж глядзець сорамна.

— Хо, ідрыттваю качалку!—устаўляе трэці, паварочваючыся на нарах.—А я сеяў, і жыта пайшло сьцяной, вось яно як! А ты кажаш... Бабы яны верна, бабы робяць, але-ж і мы робім...

— Ты ўжо зробіш, на печы з бабай...

... Яраслаўскія, тульскія, цьвярскія, кіеўскія, палтаўскія, чарнігаўскія, гомельскія, полацкія... Арцелямі ідуць яны прасторамі неабдымнымі Краіны Савецкай, каб там, дзе прайшлі яны, шлях лёг, шосэйная дарога.

... Ён прыйшоў таксама з арцельлю сваіх землякоў, цьвярскіх. Ён рабіў шчэбнябойцам. Потым яго перавялі на камнядрабілку, бо быў ён спрытным, бо камнядрабілка акамсамолілася, а ён—комсамо-

лец. Аднойчы ён учуў, што вялізарны ёсьць прарыў на падносцы каменьня. Ён папрасіўся, каб яго паставілі на падноску. Дзесятнік адказаў.

— Шукай, хлопча, пары тады і станавіся...

... Яна даўно пакінула сваю бацькаўшчыну. Там, на бацькаўшчыне, яна хадзіла дасьвецьцем на ўзьбярэжжа зьбіраць у кошык плён ночнага шквалу, высока падтыкала спадніцу, прыгожыя, пругкія і моцныя ногі ўвязалі ў мокры жвір, пакідаючы ў ім глыбокія сьляды. Гэтую сваю прывычку яна прынясла сюды, і, носячы каменьне, падтыкала спадніцу, каб латвей ісьці было.

— Эх, вы, ножкі, ножанкі,—думаў не адзін з камнябойцаў, калі яна, паддаўшыся ад цяжару насілак, праходзіла паўз іх.

Быў гэткі вясёлы хлапец-зубаскал і моцна ў галаву ўвабраў ён, пажадаў, каб яна была ягонай, каб гэтыя пругкія ногі не спакушалі ў часе работы. Быў гэты хлапец-зубаскал гарманістам, і вечарамі хадзіў ён у навакольныя вёскі на вячорках кадрылі наярываць, і шмат вясковых красунь на яго зазуралася. Быў хлапец-зубаскал у сваёй перамозе ўпэўнены, бо якая-ж дзеўчына ўстоіць перад рокатам гармонікавым, перад заліхвацкаю песьняю маладзецкаю.

І памыліўся.

— Адчапіся ты, назола, а то як дам, дык і зубоў не далічышся!

І засталося гарманісту, хлапцу-зубаскалу адно: агрызацца на кпіны таварышовыя дый марыць, як марылі многія:

— Эх, вы, ножкі, ножаньні...

Аднойчы—у абед—цьвярскі шукаў сабе пару. Ён убачыў яе. На пень паставіўшы міску, абедала яна.

— Ты з кім робіш?

— А ты што за начальнік?

І абодвы засьмяяліся.

— Пары шукаю. Насілкі адзін не пацягнеш...

— Пэўна, доўга шукаеш...—бліснулі ў рогаце зубы.—І ніяк ня знойдзеш? Вось бяда, дык бяда...

— Ну, ты... не залівай.

— Угу! Бач ты...

Ён пайшоў ад яе з такім адчуваньнем, нібы злосна пакпілі з яго, нібы гэтая смуглявая дзеўчына ўпікнула комсамольскую яго сьвядомасьць: чагосьці сорамна было. Ён узяўся за абед. Ён прыслухоўваўся да говарак навокал. Ён чуў:

— Халодна робіцца, а дарогі вэнь яшчэ які кавалак незалатаны застаўся. Кілямэтраў пятнаццаць...

— Дый усе дваццаць пяць будуць.

— Людзей мала, няма каму камень на трасу ссыпаць...

Ён еў і думаў: калі няма пары да насілак, дык ці варта аб гэтым думаць; ён карысны і на іншай працы, хоць-бы ўзяць конскі транспарт. Да яго падышоў дзесятнік.

— Ну, што, не знайшоў сабе пару? Ідзі ў вучастак, пашлюць цябе да коняй.

— А за пару я магу быць,—сказала яна, падыходзячы да іх.— Мая Галена нагу сабе зьбіла, у барак адвезьлі.

— Ну, вось і добра. На дванаццаты кілёмэтр ідзеце працаваць.

Прайшлі дні. Насілкі цьвярскога і татаркі рабілі цуды. Яны зьбілі норму. Яны рабілі дзьве з паловаю нормы. Яны выходзілі на дарогу раней за ўсіх. За імі ня лічылася ніводнага прагулу. Іх прэм'явалі.

Камнябойцы пайшлі протэставаць да тэхніка.

— Усюды, як у людзей робяць, а тут шалеюць. Мы ў пяцёх не спраўляемся выбіваць для іх, чортавых дзяцей.

— А вы паднацісьніце, не адставайце,—сьмяяўся тэхнік.

— Калі вы адстанеце, дык падносчыкам ня будзе чаго рабіць, прыдзецца ім прастой аплочваць.

А гарманіст-зубаскал прышоў да яе ў час абеду, падсеў, кашлянуў, падмігнуўшы.

— Вазьмі мяне ў пару, хочу з табой працаваць.

Яна зарагатала і адсунулася далей.

— Ідзі, ідзі, ведаем мы вас.

Татарку і цьвярскога прэм'явалі ў другое.

3.

Тады мы зайшлі ў другі інтэрнат, шукаючы іх. Было гэта ў выходны дзень. Ішоў дождж, і, бязумоўна, яны павінны былі быць дома. Цьвярскога я сустрэў каля „Ільлічоўкі". Ён праглядаў зводку за дзень. На чырвонай дошцы было напісана:

„Насілкі Іванкевіча і Андросік даганяюць насілкі Шамаравай і Пятрова. Яны зрабілі да абеду 2,67 кубамэтры. Трэба думаць, калі-б ня было дажджу, гэтыя насілкі дасяглі-б увогуле выпрацоўкі Шамаравай і Пятрова".

Цьвярскі зірнуў на мяне і зарагатаў.

— А мы да абеду зрабілі тры з паловай. Мы яшчэ пабачым, як яны дагоняць. Пойдзем, таварыш, я цябе з маёй Хацімат пазнаёмлю, так сказаць.

Неўзабаве мы ўтрох сядзелі і вялі гарачую размову.

— Ды не, таварыш,—казала яна.—Гэта дужа простая штука... Я інакш і працаваць ня ўмею.. У нас двое насілак і кожны з нас накідае каменьне паасобку. На выперадкі ідзем.

— А калі хто прыстане?

— Дык вас-жа двое, абодвы ня прыстанем. Наогул у нас дрэнна працуюць. Пачухаецца, пазяхне, зірне ўгару, ці хмаркі ня відаць і тады сабе возьмецца за насілкі. А мы пасьля працы адпачываем. Ды хутка і канец рабоце...

Потым я ішоў з цьвярскім. Ён па-таварыску ўзяў мяне пад локаць, расказваў пра свае любоўныя прыгоды. І быў цёплым тэмбр ягонага голасу, бо гаварыць пра-гэткія рэчы чалавек можа толькі цёплым напоўшэптам, адчуваючы, што слухае яго сябра.

— Як скончым дарогу, паедзем да Хацімат у Крым...—казаў цьвярскі... Ня бачыў я гэтага дзіўнага Крыму... Шмат яна мне пра яго расказвае цікавага... Нават і дахаты не паеду, потым зьбяруся як-небудзь... А ў мяне, ведаеш, у нашай вёсцы дзяўчына засталася, дык ёй да Хацімат далёка, дзе там. Перакруціла, перайначыла мяне гэтая чорнавокая. Агонь дый толькі!.. І зморы не адчуеш, няма калі.

Ішоў на зямлю мяккі восенскі вечар. Воддаль, над мястэчкам, засьвяцілі ліхтары, і край неба ўпрыгожыўся электрычнымі зарніцамі. Недзе граў гармонік. Цьвярскі кіўнуў галавой.

— Вось гэты... гарманіст... увіваецца за ёю... А мне сьмешна.

Я ехаў у мястэчка, дзе чакала мяне экзотыка „готэлю", земныя радасьці, густа прыпраўленыя хатнімі жывёлінкамі. У той вечар маё ўяўленьне ніяк не хацела пагадзіцца з тым, што мулкі ложак з пісклявым фальцэтам разгайданых спружын—вярблюд, карабель Сахары, а стукат дажджу аб шыбу—хвалі морскага шквалу...

І канчаючы гэты ліст да цябе, любы поэт мой, я прашу прабачэньня за тое, што крымскія твае вершы ў той вечар засталіся недачытанымі.

Чэрвень—Менск,
Кастрычнік, 1931 г.

Вячаслаў Палескі

Слова пра гэроя спаранай

Ты вёў састаў
Скрозь мармурную сінь.
Палаў трывогай,
Быццам гаркі порах,
Калі на станцыю
Пазьніўся твой цягнік,
Цягнік за нумарам
Щ-112.40.
І ты шчадзіў
Разьлічаны запал,
Каб грузным поступам
Ісьці ў дзяжуркі станцый.
З калючым сорамам
І больлю запісаць,
Што сам спазьніўся
На гадзіну дваццаць.
Плывеце полем,
Карпусы начы.
Хавайся, сонца,
За пукатым валам.
Сухая крыўда
Здолее тачыць
Пакуль іскрацца
Вочы перапалам.
Ты вёў цягнік
Ў раскратаную сінь,
Пад строгім месяцам
І квадратурай зораў.
Але чамусьці
Часта гэтак ты
Гарэў нэрвовай
Віннасьці дакорам.
Знайдзі карысны,

Правільны пачын,
Узруш работу
Баявым запалам.
Бо крыўда сэрца
Здолее тачыць,
Пакуль іскрацца
Вочы перапалам.
Гарачы розум
Кратае вінты,
Бэрэ на выпрабы
Ранейшую сыстэму.
Расклад работ
І графік, як і ты,
Ўшчыльняюцца конкрэтнасьцю
Ўсямерна...
Праходзіць дзень.
Ля каляровых рам,
Застыў прабег
На рэйкавых таблічках.
І ты ідзеш
Гэроем на парад,
Узброіўшы напорам
Абязьлічку.
Калі краіне
Розум аддаеш
І мускулы і сэрца—
Для краіны,
Тады знаходзіш
Чым распальваць дзень,
Якім шляхом
Да перамогі рынуць.
Ты мчыш састаў
У далявую сінь,
Пад мяккім месяцам,
Па чорных касагорах.
І ў пэўны час
Прыходзіць твой цягнік,
Цягнік за нумарам
Щ-112.40

Гомель
Сакавік 1931 г.

НАРЫСЫ

Р. Мурашка

На паўтаратонцы з „амэрыканкай“ [1])

(*З падарожнага блёк-ноту*)

Далей у паход

Раніцаю пад‘ём нашага лягеру ...падзявана асьвяціла сонца. Ку... здаецца, падзявалася тая восен... цемра, ад якое гэтак хочацца ...забавіцца. Аб бесьперапынным даж... за ўсе мінулыя дні напаміна... толькі адно суцэльнае балота ...мест вуліцы. Высока над ліпамі ...лога памешчыцкага саду дзе-ні... плылі рэдкія белыя аблачынкі.

— Глядзі ты, надвор‘е... Чаго доб... га дый астоіцца,—заўважвае не...

— Шкада,—ня ў тон яму азываец... прадстаўнік нашае поліграфбазы. —Гэтак даўно быў дождж, ай як ...ўно, хоць бы пыл гэты папрыбі...ла.

І быццам сапраўды спачуваючы ...таму жарту, як бачыш, адна за ...днэю выпаўзаюць аднекуль з-за ...ду цёмныя хмары, зьніжаюцца ...д саўгасам, і частыя кроплі даж...жу пачынаюць „прыбіваць пыл“.

— На табе...

— Ах, як занудзілася па дажджы. Пад рытмічнае прасейваньне як ...раз нявідушчае сіта драбнюсень...х кропель дажджу пачынаецца ...сьпешная пагрузка. Але як і заў...ёды робіцца, дзесятая гадзіна на...шага ад‘езду адцягваецца да адзінаццатае, з адзінаццатае да дванаццатае. Тут дык ужо былі вінаваты вадзіцелі нашых баявых машын, бываюць такі часам об‘ектыўныя прычыны.

Лішнія часы непрадбачанае затрымкі выкарыстоўваем на падагульваньне першага этапу работы. Ці выканала сваю задачу выязная рэдакцыя? Пры гэтым запытаньні міжвольна ўспамінаецца ідылічна спакойная саджалка ў саўгасе, у якой відаць не адчуваецца цяпер ніякае патрэбы, бо ў шмат якіх мясцох дно яе павыпірала наверх цэлымі кустамі зельля. І міжвольна просіцца на язык параўнаньне з гэтай саджалкай тутэйшага жыцьця да манэўраў.

Роўная спакойная гладзіня паверхні, якую пачынаюць псаваць дзе-ні-дзе кусты зельля, што выпіраюць з дна бязьдзейнасьці і апушчэнства і якія пагражаюць стварыць ідылію спакойнага кутка патрыярхальнае глушы. Не, мы даўно вышлі з усялякіх пэрыодаў усялякіх ідылій, і ніколі ня ўстаць з таго сьвету слаўным гэроям гогалеўскіх „Мёртвых душ“. Мір праху вашаму, цудоўныя людзі, ня крыўдуйце, калі жорсткая сучаснасьць

[1]) Гл. № 10 „Маладняка“.

не пакідае вам помнікаў у форме жывых патомкаў вашых. У гэтым выпадку аўтары тэорыі аб спадчыннасьці памыліліся, ці праўдзівей кажучы, не прадбачылі ўсіх акалічнасьцяй справы і згубілі пэрспэктыву.

Свойскія тэмпы жыцьця былі ўзбураны гэтымі днямі. Агітгрупа абслужыла сваімі сіламі каля паловы ўсіх буйных насельных пунктаў сельсавету. Выязная рэдакцыя ўліла жывасьці ў рух селькораў, насьценкораў, рэдколегій газэт. Тады пачулася жыцьцё тэмпаў, тое, што з гонарам займае сваё месца ў вялікім процэсе грандыёзнага пераўтварэньня грамадзтва. Бальшавіцкія тэмпы...

Гэтыя простыя два словы вызначаюць сабою пульс жыцьця новага організму і ў пэўнай меры яны адбіліся ў жыцьці нашага сельсавету. Выпуск насьценных газэт на другі-ж дзень пасьля нарады ў сальсавецкім цэнтры. Актывізацыя селькораў навакол насьценгазэт і ўва ўсёй рабоце, па стварэньню пералому ў колектывізацыі, па выкананьню плянаў і заданьняў у галіне сельскае гаспадаркі, па добрасумленнаму выкананьню ўзятых на сябе перад дзяржавай грамадзкіх абавязкаў колгасамі, саўгасамі і аднаасобніцкім сэктарам гаспадаркі. Селькоры пайшлі ў бой за пералом, за тэмпы, за выяўленьне цёмных бакоў розных „об'ектыўных прычын". Выцягнуты былі на відно запыленыя экспонаты кулацкага паноптыкуму. Знайшліся нават і такія экзэмпляры, якія, карыстаючыся адсутнасьцю культмасавае работы сярод беднаты і сераднякоў па прыліву ў колгасы, павялі сваю культмасавую работу. Знайшоўся адзін такі настаўнік.

— А вы ня ідзеце цяпер у колгас,—гаворыць аднаму.

— Лепей за ўсё дык гэта пача каць,—тлумачыць другому.

— Ня варта ісьці ў колгас,—ап'янёны сваёй нахабнасьцю ўбівае ўжо ў галаву трэцяму.

Настаўнік кулацкага толку, [illegible] лацкае школы, адзін з экспонат[illegible] кулацкага паноптыкуму. Але не ў[illegible] жаючы на ўсе спробы гэтых пігме[illegible] супраціўленьня, насупроць ім ад[illegible] асобнікі разам з колгасьніка[illegible] адказалі на заклік пералому [illegible] усёй рабоце, пад знакам надых[illegible] дзячых манэўраў Чырвонай арм[illegible] організацыяй чырвоных абозаў, в[illegible] кананьнем хлебазагатовак, засева[illegible] „гэктараў абароны", вылучэньне[illegible] „коняй абароны", організацыяй н[illegible] вых колгасаў і новым колгасн[illegible] прылівам. Але аб гэтым крык[illegible] пазьней, бо штаб і база ўжо па[illegible] гружаны на „Аму", дзе ад самага Менску ня сыходзячы з месца стаіць наша „амэрыканка," і руплівыя шофэры падаюць сырэнамі (да рэчы галасы ў іх гучнейшыя за сырэны) сыгналы адпраўленьня.

„Форд" доўга буксуе і коўзаецца на адным месцы, пакуль не вырашае адмовіцца ад свайго пяршынства і пушчае наперад грузную паўтаратонку—па сьлядох у балоце ісьці ўсё адно як па сухой дарозе. Доўга равуць у балоце моторы, пакуль надзея, што мы ўсё-ж-такі вылезем з яго, перамагае нарэшце, і машыны выяжджаюць за сяло на шырокую палявую дарогу. Едзем па натхненьню, як той поэт, сэрцам угадваючы дарогу, бо ніхто з нас яе толкам ня ведае: пытаў нехта ў некага і нехта некаму паказваў у нейкі бок. Але не дарма гаворыць старая зьбітая прыказка: „Язык да Кіева давядзе". А наш Кіеў ня страх ведае як далёка— „за пяць гадзін адмахаем", як сказаў наш вопытны шофэр.

„Махнць" нам прышлося значна даўжэй, бо машына яшчэ з Менску апынулася ў перманэнтным стане капітальнага рамонту. Толькі гэта мы праехалі палову дарогі, як гучны стрэл з-пад задняга кола „Амы" паведаміў аб чарговай непрадбачанай астаноўцы. Выкідваемся за борт і ўключаемся ў процэс капітальнага рамонту. Падвозячы па

ююю вось дамкрат, шофэр, быц-
апраўдваючы машыну, гаво-
ы.
Дарога вінавата, глядзеце, якая
кая дарога, заднія колы ідуць
язьвюма, а аднэй шынай. Вось
эра пры поўнай нагрузцы ма-
ны і ня вытрымала.
„Форд“ ужо зьнік з нашых воч
ўзгоркам, ад якога пачынаецца,
казалі нам, добрая шырокая
рога да самага пункту нашага
азначэньня. Сіверкі вецер пра-
зе да самых касьцей, палошча
паветры палатку, якою накрыта
машыне паліграфбаза. Вялізнымі
рымі птушкамі зьніжаюцца да
днае зямлі палавыя хмары і
ў далячыні патае ў нуднай шэ-
ні.
– Што лепей: даць лапленую ка-
ру ці перамяніць кола?—чуецца
ад машыны прыглушаны грудны
ас шофэра.
Шофэр у аднэй спэцоўцы, але
яму ня холадна, ці ён не зьвяр-
е ўвагі на гэта, сядзіць пад ма-
ынай і запытальна глядзіць на
с.
– А што хутчэй будзе?—пытаем-
.
– Вядома перамяніць камэру.
– Давай камэру.
Жылаватыя грубыя рукі шофэра
рытна падкручваюць ключ—і не-
ачкі мізэрны дамкрацік на цэ-
х дзесяць сантымэтраў ад зямлі
дымае цяжэразную машыну з
ўтара тонамі грузу.
– А ўсе-ж лепей было-б перамя-
ць кола,—сам з сабою размаўляе
фэр.
– Каб прастаяць дзьве з паловай
зіны!—абураецца крыху „началь-
к“ паліграфбазы.
– Дык камэра-ж усё адно старая.
– А ліха яе бяры. Кола яшчэ
трэбіцца—чакай.
Шофэр нібыта згадзіўся,а мо'
кі паказаў гэта—работа ўжо
ела ў яго руках.
Праз сорак хвілін рушым у дарогу,
я на першым часе нічога добрага
ня зычыць паўтаратонцы. Паміж двума ўзгоркамі, па якіх цягнецца дарога, залягла мокрая, балоцістая лагчына. „Ну, тут сядзем“, прабягае няпрошаная думка. Пад'яжджаючы, бачым на грэблі сапёрную часьць. З нявылазнае балотнае твані чырвонаармейцы робяць праязную для коняй і машын дарогу. Пакуль што дарога ня скончана, яна яшчэ ў процэсе папраўкі. З разгону наша паўтаратонка ўрэзваецца ў мокрую, ужо трохі разгружаную, зямлю і пачынае сударгава трахкацець і калаціцца на адным месцы. Неаднаразовыя патугі мотору ня могуць скрануць з месца цяжкую махіну—на дапамогу прыходзяць чырвонаармейцы. Маладыя бязвусыя твары ва ўсіх. Шчокі пачырванелі ад работы і сіверу. Шэрыя, карыя, блакітныя вочы паблісківаюць гарэзьліва з-пад казыркоў зялёных шапак. У момант дзесяць пар рук з сілаю ўпіраюцца ў барты „Амы“, і шэсьцьдзесят конскіх сіл, падмацаваныя дзесяцьцю чалавечымі, даюць рады. Равучы і сатрасаючыся ўся, машына падаецца з месца.

— Но-но, Менск! — падбадзёрваюць сапёры.

— Р-разам!

Машына неахвотна выпаўзае з ямы, якую пасьпелі выціснуць колы, круцячыся на адным месцы, і павольна пачынае разьвіваць хаду.

— Но-но, Менск. Больш не садзіся,—крыху заглушанае шумам мотору, ляціць нам удагон.

Выяжджаем на шырокую роўную дарогу. Але шырокаю і роўнаю здаецца яна толькі спачатку. Неўзабаве сустракае нас зноў балота, калдабіны, ямы. На ямах высока падкідвае зад машыны і разам з гэтым падскаквае ўгору, як спартсмэн з трампліну, рэал з наборнымі касамі вагой каля тоны. Трымаемся за барты аберуч, каб ня выляцець як мячыкі ў балотную твань.

— Калі што ды трэсьне рэсора, тады закукуем,—азываецца „начальнік“ паліграфбазы, ён-жа і набор-шчык.

Я маўкліва згаджаюся.

А ён цягне далей сваю гаворку, цягне, здаецца, у невядомую далёкую бясконцасьць.

— Першага дня ў нас зламалася рэсора перад самым ужо саўгасам. Дык гэта добра, што блізка, дый кузьня была... Паўдня ладзіў. А гэта-ж бы...

Яго роўны голас растае ў гуках мотору, а я бязуважна гляджу на хмурны ляндшафт, які з кожнай хвілінай зьменьваецца чым-небудзь новым, але такім самым цьмяна-шэрым, хмурным, як сама восень. І ўжо здалёку-здалёку нехта гаворыць цягутка:

— А добры майстра, на яго страх. Прапалі-б мы без яго.

Я высоўваю з каўнера галаву—холадна—і адрываюся ад свайго сузіраньня. Гэтак ня доўга задрамаць і дзе небудзь на яме вылецець за борт.

Да пункту нашае астаноўкі заставалася ня больш 4—5 клм., трэ' было падняцца толькі на ўзгорак, з якога адкрываўся прыгожы від на ўсе бакі, як наша машына затармазіла і на гэты раз усур'ёз і надоўга. Іры напружана цяжкім пад'ёме на ўзгорак у тым самым няшчасным коле, з-за якога мы ўжо патрацілі каля гадзіны, лопнулі абедзьве камэры, апошнія камэры. Перад намі паўстала дылема, якую цяпер цяжка было вырашыць: да шасьці гадзін вечару дапаўзьці хоць на адным коле да месца. У нашым распараджэньні дзьве з паловай гадзіны. З сродкаў адно адзінае старое ардынарнае кола, якое за сваю выслугу папала ў запас. Перамяніць кола — патрэбна раскласьці цэлую сьлясарную майстэрню на дарозе. На ўсю работу пойдзе ня менш дзьвёх з паловай трох гадзін. У гэтым выпадку выкананьне нашае опэратыўнае задачы залежала цалкам ад шофэра. І тут мы пераканаліся, што ён стаіць на вышыні сваіх задач — недарма ён інструктар аўтатэхнікуму.

Раз'яднаць падвойнае кола, замацаванае пазабляхоўванымі шрубамі з пазьлізванымі вінтамі, надзеем другое і зноў злучыць шрубамі—неабходны былі і снасьць, і рукі і .. галава, а галоўнае—упэўненасьць. Па меркаваньнях шофэра на ўсю работу патрэбна тры гадзіны. Аўтамобільнае кола — надзвычайна капрызная штука. Такім чынам, чарговая непрадбачаная астаноўка разгарнулася ў сапраўдную майстэрню па капітальнаму рамонту.

У бок ад нас дарога, густа ўсаджаная прысадамі, грацыёзна зьбягае ў глыбокую лагчыну, адтуль ўзбягае на горку і хаваецца ў густой зеляніне. Пазадзе і ўперадзе, як абадва бакі дарогі, па якой мы едзем, а цяпер стаімо, тычкі з паказальнымі дошчачкамі: „У штаб галоўкіраўніцтва“. Вось па грацыёзнай дарозе проста на нас з прысадаў выскаквае чысьценькая легкавая машына з белым сьцяжком. За ёю другая, трэцяя... Ім насустрач у сваю чаргу—адна за аднэй, з абодвых канцоў гукі сырэн, шум мотораў, нясупынны струмень машын. Туды бягуць замурзаныя, як з цяжкае і доугае работы, назад—адпачыўшы, заправіўшыся, памытыя, сьвежыя, блішчастыя. Перад штабам, як даведваемся, паводле загаду машыны павінны мыцца і чысьціцца, і толькі пасьля гэтага ім дазваляецца заяжджаць у двор.

Тым часам у нас долата з молатам у цьвёрдай руцэ шофэра робіць сваю справу: шрубы павыманы, і кола разлучана на дзьве палавіны. Куча розных шрубак, нутэрак, шайбачак раскінулася пад нагамі. Засталося прарабіць тую самую работу, толькі ў адваротным парадку: на месцы зьнятага паставіць другое кола, злучыць абодвы шрубамі і ўсадзіць на вось. Аб тым, як гэта ўсё рабілася, добра сьведчылі, апроч патрачанага часу, паабдзіраньне на кроў і ўпэцканьне ў мазь рукі шофэра, ды нашы

куты ад голаду. Але мы трымаемся ошняй надзеяй — не дармовай, ецца, бо апошняя шруба закру-на, кола пастаўлена на месца і лічкі слаўны дамкрацік схаваўся саю скрынку. З часу астаноўкі йшло дзьве гадзіны з чвэрткаю. ны зэкономілі часу сорак пяць лін.

— Цяпер даедзем? — пытаецца не-верліва, але з надзеяй нехта.

— Можа і даедзем,—няўпэўнена казвае шофэр, заводзячы мотор.— едзем, толькі не ўракнеце,—з лёг-сьмехам азываецца ўжо.

Аблягчаем нагрузку на тым баку, е ў нас пакалечанае кола з аднэй мэрай, частку грузу перабаўляем другі борт і паціху разьвіваем чны.

Насупроць усёй нашай недавер-насьці гэгы вэтэран у запасе—ста-е абабітае, з паабтупаванай па-шкай кола вывезла — мы такі ехалі і нават не спазьніліся, як малі.

ролёг да ваенных дзеяньняў.

Мы спыніліся ў бліжэйшым саў-е. Першае, што прыемна зьдзівіла , гэта ажыўленьне, рух. Быў ве-р, і рабочыя ўжо вярталіся з ра-ты. Але дынаміка руху адчувал ся толькі ў воінкавым сваім выяў-леньні: шмат з рабочых саўгасу—мейшыя прыгнечаныя бяспраўныя рабкі—добра памятаюць тысяча евяцьсот пяты год, добра памя-оць, васемнаццаты, дзевятнаццаты, адцаты, калі з вінтовак, зроблен-х рабочымі рукамі, яны расстрэль-лі бяспраўнасьць свае клясы.

Дырэктар саўгасу, нядаўна пры-чаны сюды віцебскі рабочы, раецца ўвайсьці ў курс работы адначасова ўнесьці пералом у ста-вішча саўгасу. Ён заўсёды на воку, мешваецца ва ўсе дробязі жыцьця, очыся, як-бы што не стварылася з яго ўдзелу. Але адчуваецца, то ён яшчэ ня здолеў ахапіць усіх кою свае багатае фарбамі чынна-сьці і з-пад рук у яго ўцякае то тое, то сёе.

Сэкратар ячэйкі ў курсе ўсіх дробязяй жыцьця саўгасу; флегматычны, высокі хлапец-сваім тварам ён напамінае чамусьці гэрояў з карцін Ван-Дэйка. Але гэта на першы погляд, можа таму, што ён заўсёды пад уладай думак. Калі мы сустракаем яго і пытаемся пра сэкратара партячэйкі, адным бокам вуснаў ён стрымана ўсьміхаецца і коратка гаворыць:

— Я сакратар.

— Нам трэба пагутарыць з вамі, што вы конкрэтна робіце па сустрэчы часьцей Чырвонай армії на манэўрах.

— Рыхтуемся,—чуем таксама кароткі, але расьцягнуты ў сваім паняцьці адказ.

Мы пачынаем гаварыць яму вельмі конкрэтна, як трэба рыхтавацца, што рабіць, чым дапамагчы ў рабоце выязной рэдакцыі. Тады халодна абыякавы твар яго робіцца на хвіліну асабліва выразным і да кожнае нашае парады ён дадае:

—Зроблена... Робіцца... Падрыхтавана .. Зробім...

Выходзіць, што большасьць нашых парад гэтым крыху флегматычным, надзвычайна падобным да сьлесара, чарнявым хлопцам высокага росту прадбачаны конкрэтна, практычна. А пад канец гутаркі ён вельмі прыемна зьдзіўляе нас сваім сустрэчным меркаваньнем, ідэя якога ўжо вырысоўвалася перад намі, але конкрэтнае афармленьне якое мы пачулі вось тут, перасякаючы страшэнна брудны двор саўгасу. „Конь абароны“.

Да рэчы ніяк нельга ўявіць сабе, чаму гэта ва ўсіх саўгасах абавязкова ў дварэ балота, нават перад самымі вокнамі ў канторы такое, што коні гразнуць, а машыны выраблюць нябачны эксцэнтрычны танец, танец імкненьня выбрацца на сухую ў пэрспэктыве месьцінку. На гэтае пытаньне нам ніхто ня даў адказу. Цёмная штука. Але ва ўсякім разе

гэтая акалічнасьць ніколькі ня зьменшыла гасьціннасьці нашых саўгаскіх гаспадароў і іх руплівасьці. Бяз лішніх у такіх выпадках спрэчак друкарні і рэдакцыі далі па добраму пакою ў былым панскім доме, а цяпер канторы саўгасу. Тутжа за целых тры дні на свае вочы ўбачылі мы гарачую страву, пра ўсе гарачыя якасьці якое патроху пачало забывацца ў нашай абцяжаранай рознымі газэтнымі абавязкамі памяці. Сьвежая заскварэная бульба з саўгаскае сталовае нешта нязвычайнае ўнесла ў страўнікі, дзякуючы чаму мы нават агледзеліся ў пакоі. Чатыры сьцяны, як і ў звычайным пакоі, з чатырма крэсламі пры стале, з дармовым дадаткам з аднаго ложка ды двух кулёў саломы на падлозе. Гэтага вечару сядзелі датуль, пакуль хапіла ў лямпе энэргіі, і тая не пачала сонна хліпаць вачыма і драмаць. Паводле пляну чарговага нумару добрая палова матэрыялу была гатова да набору.

Перад тым як легчы спаць, цікава ўспамянуць пра адну рознавіднасьць мяшканцаў нашага пакою. Дырэктар саўгасу, праводзячы нас сюды, гасьціння запэўніваў, што доўгі час тут ніхто ня жыў і мы на свае вочы ўбачылі сьляды былое замуроўкі, якою быў закладзены ўваход. Хоць і ня зусім падабалася пэрспэктыва няжылога памяшканьня з яго пратухлым паветрам, але мы, па сэкрэту кажучы, былі здаволены і гэтым.

У саўгасе страшэнны жыльлёвы крызіс. Амаль у кожнай кватэры месьціцца па дзьве-па тры рабочых сям'і. Ад скучанасьці і цясноты не хапае паветра, парушаюцца ўсялякія правілы санітарыі і гігіены. Але што гаварыць пра гэта, калі ў самым цэнтры гэтых кватэр, перад нячульлівым носам канторы стаяць дзьве такія... канцылярыі, напоўненыя як зачыніць. Я невялікі спэц у пытаньнях концэсійнае прамысловасьці, але крыху сачу за разьвівіцьцём тэхнікі за межамі і таму ўпэўнены, што каб дазнаўся пра гэтыя ўстановы ў саўгасе які-небудзь амэрыканскі ка- роль гузікаў—гэтакі напэўна там- ёсьць,—дык ён безадкладна папрасі- -бы ў концэсію гэтыя ўстановы, чым урэшце гузікі з чалавечых адкід- горшыя за якія касьцяныя ці пэ- лямутравыя. Але я адхіліўся ад тэмы і сну, у які асалодай нырнулі амаль усе нашы штабнікі і ў які пацягло акунуцца з галавою і мяне.

Напалову разьдзеўшыся, пры стале ў задуменна цікавай позе застыў наш рэдактар, нешта ўпаўголаса гаворачы рыфмаю і час ад часу чыркаючы алоўкам у блёкноце.

— Ці не поэму якую, Павал Пятровіч?..

— Поэму, кажаш? Божа баранi Раешнік брат, раешнік... Пальчыкі заўтра абліжаш...

У абсяг майго зроку пры гэтым пападае нешта такое невялічкае, ня зусім рухавае, якое павольна паўзе па сьцяне нацянькі да галавы майго суседа па падлозе.

— Павал Пятровіч,—аклікаю я ціха.

— А?.. Што?..—азываецца той патрывожана ад стала.

— Ідзі зірні.

— Эге брат... Насьценкоры ворага пашлі ў выведку...

Прозьвішча кулацкіх насьценкораў гэтак і засталося ад таго часу за гэтымі невялічкімі, ня вельмі рухавымі насьценнымі выведнікамі, не ўважаючы на тое, што перадавыя дазоры іх памерлі сьмерцю харобрых, пакараныя аднэй з эгіпецкіх кар.

Гэтае невялічкае здарэньне крыху аддаліла час таго моманту, калі ў жаданых абдымках Морфэя забудзецца пра ўсе гэтыя сёньняшнія камэры, пакрышкі, астаноўкі... Нарэшце, пра гэтых самых варожа настроеных „насьценкораў“... І запэўніваў-ш дырэктар, што тут ніхто ня жыў,— млява трыпеча ў галаве лёгкая сьлі- кая думка—і зьнікае. Морфэй раскрыў свае жаданыя абдымкі.

Гадкуль толькі магло ўзяцца гэтае шаноўнае пасяджэньне вучоных мужоў, пасярэбраных сівізнаю, з акулярамі на мясістых насох. Быццам у акадэміі навук яны за абгаварэньнем надзвычайна важных пытанняў сусьветнае гісторыі, ад якіх залежыць жыцьцё чалавецтва ў гэтую хвіліну, гэткія сур'ёзныя ў іх твары, гэтак важна па-вучонаму сядзяць яны ў застольлі і час ад-часу слязьлівымі вачыма паблісквающь над акулярамі колега на колегу. Перад кожным ляжаць кучы папераў. Час-ад-часу поркаюцца ў іх старэчыя пальцы і ўсьлед за тым пішуць на чыстых лістох алоўкамі і замежнымі вечнымі пёрамі, пакуль адзін з іх патхнёна, але па-вучонаму, важна гаворыць нешта. Але давайце, не заўважаныя імі, паслухаем, абгарэньнем якога-ж гэткага важнага навуковага проекту заняты сівыя вучоныя мужы. Вось адзін з іх апрануты па замежнаму—і ўжо па адным гэтым адразу відаць, што ён з посьпехам выканаў сваю навуковую командыроўку за межы, з тварам скэптыка, гаворыць:

— Наша задача—усімі сродкамі выкарыстаць замежныя дасягненьні тэхнікі. Лепшыя людзі замежаў дапамогуць нам у справе абагачэньня нашае зьбяднёнае войнамі і вялікім выгнаньнем краіны. Прапаную ўвазе нашага высокага сходу працу, плод навуковае работы цэлых гадоў. На думку аб напісаньні гэтае працы навяло мяне наведаньне цэлага шэрагу савецкіх гаспадарак і асабліва былога прыгожага маёнтку, добра вядомага ўсім нам заслужанага грамадзкага дзеяча Беларусі...

Старшыня шаноўнага пасяджэньня няпрывычна пазяхнуў, але схамянуўся, убачыўшы дакорлівыя позіркі колегаў, закрыў рот рукою —ўвесь увага—аддаўся дакладу.

— Глыбокія залежы... цьфу ты... прабачце... вялікія запасы людзкіх ведаў навялі нас на геніяльную думку шырокага і пладатворнага іх выкарыстаньня, што ў нашых умовах магчыма толькі выключна на концэсійных падставах. У Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатах гэтую думку пачынаюць ужо ажыцьцяўляць практычна... Давядзем усяму сьвету, што наша навуковая мысьль здольна ісьці ўпоравень з перадавою думкаю сусьвету...

Чакайце, гэта ня ўсё яшчэ,—вучоныя мужы з глыбокадумным выразам на твары нярухома сядзяць у застольлі. Паважаны старшыня шаноўнага пасяджэньня корэктна бярэ слова. Пасьля цэлага шэрагу зусім законных пахвал вучонаму дакладчыку і яго заслугам у галіне эканомікі і эканомічнае географіі, з прычыны надзвычайнае важнасьці пытаньня, ён прапануе дэталёва азнаёміцца з ім усяму консорцыуму вучоных мужоў, каб потым паставіць на канчатковае вырашэньне ў роўніцы дачы свае высокааўторытэтнае санкцыі на фірму навуковае ўстановы.

Абвяшчаецца перапынак на чаяваньне і курэньне. Няхуткаю хадою жанчыны ўносяць і ставяць перад кожным мужам кофэ. Другая сьледам—здобныя булкі, бутэрброды, пячэньне. Пасьля перакусу павольнага, маруднага, калі вучоныя жуюць бутэрброды, як старыя каровы жвачку, папярэдні дакладчык, які з посьпехам выканаў сваю навуковую командыроўку, частуе колегаў замежнымі цыгарэтамі, з залатым абрэзам і шаноўнае пасяджэньне працягваецца. Але для формы паважаны старшыня корэктна звоніць у невялічкі сымпатычны званочак, вытрымлівае законную ў такіх выпадках, паводле статуту, акадэмічную паўзу і называе імя другога дакладчыка.

Ён яшчэ ня зусім стары, але вучоныя думкі зрэзалі зморшчкамі ня толькі яго лоб, а і ўвесь твар, і тонкая васковая бялявасьць твару, аблямованая густою шэвелюраю, надае яму поўнае права выступаць сягоньня перад вялікімі вучонымі мужамі. Але можа гэтая-ж акалічнасьць і вымушае яго ўнутрана трыпятаць: а

што калі дакладзнойдуць ня зусім навукова вытрыманым. А што калі хто з іх не ў патрэбным настроі сягоньня. І ўкрадлівым зіркам ён ахапіў вучонае застольле. Не... ён пастараўся. Як і папярэдні дакладчык, ён робіць доўгі, сахарынам перасыпаны уступ, пявучым голасам і сваёю шчырасьцю маючы на ўвазе падкупіць чорствыя сэрцы вучоных судзьдзяў.

— Як і папярэдні дакладчык, у высокай навуковасьці працы якога мы маглі пераканацца колькі часу таму назад, я аб'яжджаў нашу краіну ў пошуках рэдкіх гісторычных матэрыялаў для працы, якую сёньня я маю гонар зачытаць перад нашым вялікім сходам. Найбагацейшыя матэрыялы дало маё прабываньне ў былым маёнтку аднаго з нашых культурных і грамадзкіх дзеячоў, паважанага...

Папярэдні дакладчык поглядам заахвочваньня зірнуў на свайго маладога колегу і зноў уставіўся ў паперы. Дакладчык прыпыніўся на статутам устаноўленую мерку часу, абцяг для большага навочнага непарадку ў гарнітуры, што ўжо дае пэўны павуковы эфэкт, вышываную кашулю з суравога палатна, падперазаную слуцкім поясам, з містычным захапленьнем у поглядзе зірнуў на орнамэнт, у якім ня было нястачы ў гэтым пакоі, і працягваў гаварыць:

— Я шукаў сьлядоў былога месцазнаходжаньня мяцежнага ўраду Кастуся Каліноўскага, распытваючы старых бабулек, якія добра памятаюць гэтыя гады. Гэты выпрабаваны сродак нашых навуковых досьледаў, як убачым з дакладу, з посьпехам апраўдаў сябе, як апраўдваў і заўсёды. У былым панскім доме, як памятаюць людзі, застаўся і да гэтага часу няжылы пакой. Пры ўсямернай дапамозе старое бабулькі быў адкрыты замураваны ўваход у пакой, у якім паводле яе слоў—у часе мецяжу адзін час мясьціліся таемныя мяцежнікі, аднаго з якіх звалі Кастусём. Пакой досыць добра захаваўся і дух паўстаньня яшчэ, здавалася, лунаў у ім. Праўда, была акалічнасьць, якая ўнесла на некаторы час сумбур у такія пэўныя матэрыялы, як паказаньні жывое сьведкі тых часоў. Прашу прабачыць паважаныя колегі і настаўнікі мае, пры блізкім і дэталёвым аглядзе з мэтаю знайсьці пісьмо на сьценах, я ўстанавіў факт пражываньня ў пакоі істот, якія называюцца на звычайнай мове.. блыхамі. Яшчэ раз прашу прабачыць, але навукам ўстаноўлена, што памяненыя істоты вельмі жывучыя...

Імгненым зіркам дакладчык акінуў сваіх калегаў і настаўнікаў і, убачыўшы некаторых, здалося яму не ў настроі, даказаў:

— Але, нарэшце, справа не ў тым... Як вядома, гэтыя істоты маглі ім адным вядомым шляхам пайсьці ў пакой... факт устаноўлены, што адно з месцазнаходжаньняў мяцежнага беларускага ўраду 1863 г. было ў тым пакоі.. Для больш дэталёвага і поўнага навуковага досьледу пытаньня неабходна адпаведная командыроўка ў межах этнографічнае Беларусі.

Дакладчык, нарэшце, скончыў. Сівыя лысыя мужы навукі здаволена заварушыліся—кожнага дома чакаў гарачы полудзень—яны захапілі ўжо нават лішняга часу. Першы дакладчык у замежным гарнітуры схіліўся да апошняга дакладчыка і ўпаўголаса сказаў:

Вам безакладна патрэбна замежная командыроўка... Я падтрымаю вас...

Малады колега з нявыразным пачуцьцём падзякі, якое нельга апісаць, мо то ў гэтых вучоных было шостым пачуцьцём, паціснуў руку свайму колегу і настаўніку.

Старшыня пазваніў у званочак і, вытрымаўшы паўзу, сказаў нешта. Застольле, схіліўшы галовы, дало сваю згоду. Зноў званок...

Нізка над саўгасам ляцеў самалёт і гудзеньне мотору, якое з трэскам рвала паветра, прарвалася ў наш пакой і прымусіла Морфэя

...сьціць нас з сваіх абдымкаў і ...кнуць у цёмным кутку. Пакой ... да дзіва быў падобны на той, ... ўпамінаўся ў дакладзе маладога ...онага.

...аб атрапнуцца ад адчуваньня ...емнага сну, я вышаў на сьвежае ...етра. Векавыя таполі ў дварэ ...трэлі мяне пакрыўджаным шу... свайго пасярэбранага сівізнаю ...ьця.

...ул самалёту паволі аціхаў не... ў далячыні, у тым напрамку, ... групаваліся сілы „праціўніка“ ... наступленьня. Самалёт выкон... баявую задачу па выведцы. ...гортваліся „баявыя“ опэрацыі. У выніку рэдакцыйнае выведкі ...сьвятляецца, што ў суседняй ...сцы, не ўважаючы на колгаснае ...кружэньне, на моцны саўгас пры ...ку, увесь час зрываецца органі...ыя колгасу. Даём заданьне ...йму прадстаўніку высьветліць ...ычыны.

Прадстаўнік рэдакцыі разам з ко...ндзірам сапёрнае часткі і чырво...армейцамі склікаюць сход. Пры...дзіць уся вёска. Няма толькі ...ена сельсавету, які вельмі неах...тна загадваў на сход. Узбадзёра... прысутнасьцю таварышоў, га...ых дапамагчы і падтрымаць усе ...ынаньні, выступаюць адзін за ...ным—у першую чаргу беднякі,— ...скрываюць кулацкія махінацыі, ...о ўвесь час тармазілі жывую ...раву колектывізацыі. Выкрываюць ...чынцаў, якія пагражалі падпа... і забойствам організатарам кол...у. Выкрываюць кулацкіх агітпа...нікаў, якія за танную поліўку ...улацкага катла прадавалі най...шыя імкненьні беднякоў вёскі. ...дарма член сельсавету перад ...ліканьнем сходу заявіў прадстаў...у агітгрупы і выязное рэдакцыі:

— Калі вы склікаеце сход, каб ...анізаваць колгас дык ня думайце. ...ога, ня выйдзе... Ня будзе кол...у... Ня будзе І ня думайце нават.

Меркаваньні кулакоў і іхніх па...гіроў былі разьбіты ўшчэнт. Першаю выступае старая кабета—ёй ужо каля шасьцідзесяці гадоў—але што значыць гады, калі ўсюды гэткая барацьба. Яна называе кулакоў, тыкае ў іх пальцам, у кулакоў, якія застрашылі ўсю вёску. Яна гаворыць, і словы яе гарачым бобам сыплюцца на ўсіх прысутных.

— Досыць цярпець. Досыць... Нам ня страшны больш ні падпал, ні забойства. Годзі страшыць нас. Колгас усё-такі будзе, і я першая вось уступаю. Пішэце мяне!

Сьледам за ёю, нерашуча праўда, з аглядкаю, запісалася яшчэ восем чалавек. Кулацкія хвасты мільганулі цераз парог і зьніклі за дзьвярыма.

„Лёд крануўся“. Пад такою назваю дана была перадавіца экстранага нумару газэты, выпушчанага з гэтае прычыны. Яшчэ два сходы—ужо колгасьнікаў, разам з усімі беднякамі і сераднякамі—і ў новаорганізаваны колгас імя Чырвонай арміі уліваецца трынаццаць новых гаспадарак. Дваццаць дзьве гаспадаркі з трыццаці васьмі—вынікі конкрэтнае масавай работы некалькіх дзён. Колгасьнікі пішуць ліст да ўсіх аднаасобнікаў, беднякоў і сераднякоў сельсавету з заклікам ісьці ў колгасы. Такі падарунак прынесьлі Чырвонай арміі да манэўраў беднякі і сераднякі тэрорызаванае кулакамі вёскі. Найлепшы падарунак.

Але кулацкая агітацыя хавалася па завугольлю, выпаўзала няпрыкметнымі бруднымі струменьнямі плётак, хлусьні, паклёпаў. Газэта бярэ на мушку конкрэтныя факты іх і з нумару ў нумар бязьлітасна б'е па іх популярнымі раешнікамі пад агульным загалоўкам „Сказ колгасьніка Бывалага“. Раешнікі прабівалі сабе дарогу ў самыя закарузлыя ад уласьніцкіх традыцый соцень гадоў галовы—і трэ' было бачыць, як чытаўся кожны нумар газэты.

Тым часам, пасьля кароткае нарады, у адным з нумароў зьяўляецца

аддзел пад лёзунгам „За каня абароны“. На працягу трох-чатырох дзён газэта дзяўбе сьвядомасьць колгасьнікаў, будыруе шырокую колгасную і саўгасную грамадзкасьць. „Каня абароны краіне. Без каня нямысьліма абарона краіны!“

Рэдакцыя і поліграфбаза працуюць поўнымі тэмпамі. Калі іншыя газэты, такога самага формату,— выходзілі пры 4—5 работніках рэдакцыі і 6 рабочых друкарні з плоскай машынай, мы спраўляліся з задачай амаль штодзённага выхаду пры 3 работніках рэдакцыі (адзін захварэў на грып) і пры 2 рабочых друкарні з барбарскай „амэрыканкай“. А дні за тры да канца нашае работы мы страцілі яшчэ свайго друкара і засталіся з адным наборшчыкам. Адбылося гэтае вельмі трагічнае для рэдакцыі здарэньне ў вясёла-гумарыстычнай абстаноўцы.

У самы разгар работы, калі часьці нашага боку займалі позыцыі абароны, у рэдакцыю заходзіць з сьвежымі корэктурнымі лістамі наш друкар.

— Абраша, чаму ты гэтак змарнеў?—пытаемся спачуваючы.

Замест твару ў Абрашы суцэльная пакута.

— Ведаеце, што,—сур'ёзным тонам гаворыць ён,—я зусім захварэў. У мяне нейкі гемарой, мусіць ад гэтае самае машынкі.

Мы перахопваем яго пакутны погляд у напрамку „амэрыканкі“— дружны рогат ляціць усьлед мэлянхолічна праказаным словам. Ад гэтага Абраша крыўдзіцца, як нам здаецца.

— Вы ня верыце? Заўтра ня ўстану з ложка.

Апошняе было роўналежна зрыву ўсяе работы. Мы стараемся супакоіць яго:

— Ды не, Абраша, мы верым табе. Усё можа быць.

Ён спраўдзіў,—на заўтра на работу ня вышаў. Яшчэ ўвечары тага дня, калі адбылося гэтае прызнаньне Абрашу прышлося адправіць. Форд пад белым пасрэдніцкім сьцяжком займчаў яго на бліжэйшую чыгуначную станцыю, дзе ён сеў у цягнік і хворы паехаў у Менск.

Цяпер трэ' было шукаць выйсьця з крытычнага становішча, у якім апынуліся мы з адным наборшчыкам. Яшчэ да гэтага дзьве ці тры пасланыя ў Менск тэлеграмы з просьбаю даць аднаго наборшчыка ці друкара скончыліся поўнай няўдачай. Менск або маўчаў або абяцаў. Выпускаць-жа газэту з адным наборшчыкам ня трэ' было і думаць. Дапамога прышла адтуль, адкуль мы яе вельмі мала маглі чакаць.

Шофэр-інструктар, вадзіцель нашае „Амы“, прывычна ўзяў у руку вярстатку і стаў да наборнае касы. Спачатку набіраў ён за гадзіну па чайнай ложцы. Потым налажыўся як сьлед і тады высьветлілася, што ў першыя гады рэволюцыі цяперашні шофэр ваяваў на фронце літар пры наборнай касе цяперашняй друкарні імя Сталіна.

Выйсьце з становішча было знойдзена.

Сухія лічбы і голыя факты

Тымчасам калі ў нашай друкарні стварылася такое ня зузім прыемнае становішча, а восень бязьлітасна ўступала ў сваю першую фазу, брудныя вясковыя дарогі ўяўлялі з сябе нешта зусім нязвычайнае. Ударным парадкам сканчалася налада дарогі, мастоў, грэбель. Колгасныя і аднаасобніцкія хурманкі дзесяткамі і сотнямі вазілі на дарогу дзёран, пясок. Сапёрныя часьці, працуючы падвоеннымі і патроеннымі тэмпамі, надавалі дарогам сапраўды годнасьць дарог там, дзе ад іх заставалася адна толькі назва. І праз некалькі гадзін там, дзе яшчэ ўчора гразьлі коні, пайшлі броня-

ныя машыны, паўтаратонкі, мотоцыклі, хуткім маршам праходзіла коньніца, моторызаваныя часьці, пяхота.

Мясцовая парторганізацыя мобілізоўвала пролетарска-колгасную грамадзкасьць на падрыхтоўку да манэўраў. Прадпрыемствы, саўгасы, колгасы, клюбы, школы, нардамы, цэлыя вёскі зьменьвалі свой выгляд. Ажыўляліся пасьвятковаму вуліцы. Рабочыя, колгасьнікі, бядняцка-серадняцкае насельніцтва з чулай увагай сустракалі чырвоных байцоў.

Перад самай вёскай высокая арка, убраная зелянінаю, портрэтамі правадыроў і нават асьветленая электрычнасьцю ад бліжэйшай раённай сганцыі. Вось такая самая арка перад саўгасам. На адным з слупоў аркі рапарт Чырвонай арміі ад рабочых саўгасу аб сваіх дасягненьнях.

Дзякуючы шырока распаўсюджаным нумаром нашай газэты, лёзунг: „Каня абароны — краіне“, заваяваў усе правы грамадзянства. Саўгасы і колгасы выклікалі адзін аднаго на соцспаборніцтва. У адным з сельсаветаў вылучана для гадоўлі 10 „коняй абароны“. Сельсавет выклікаў на соцспаборніцтва суседнія сельсаветы па-ўдарнаму скончыць сяўбу, зябліва, хлебазагатоўкі. Першы чырвоны абоз колгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў, якія здалі 10 тон збожжа, вітаюць на лятучым мітынгу байцы першае манэўруючае часьці, што некалькі хвілін таму назад пакінула вагоны свайго эшалёну. У дапамогу Чырвонай арміі комсамольская ячэйка ў адным з мястэчкаў абвяшчае сябе мобілізаванай на час манэўраў, вылучае дружыну па ахове складу сена, выстаўляе на вуліцах бакі з перагатаванай вадой для чырвонаармейцаў праходзячых часьцей На прадпрыемствах, у колгасах і саўгасах організуюцца ўдарныя брыгады „Імя Чырвонай арміі“. Гарачаю хваляю творчага энтузыязму ахапляюцца шырокія масы працоўных.

Наша рэдакцыя ператвараецца ў сапраўдны штаб на полі ваенных дзеяньняў у момант гарачых баёў, калі данясеньні з часьцей ляцяць кожнае хвіліны. Стол рэдакцыі хаваецца пад лістамі ўмоў на соцспаборніцтва, абавязацельстваў, выклікаў. Вось у адным сельсавеце засяваецца грамадзкім парадкам 8 га „абароны„ і організуюцца 8 новых ячэек Асаавіяхэму. Распачынаецца шырокі колгасны прыліў імя „Чырвонай“. Першая вестка з гэтага фронту—прыліў у колгасы па адным сельсавеце 21 гаспадаркі, па другім—30 гаспадарак. Чатыры колгасы разам з аднаасобнікамі сваіх вёсак на 100 процантаў праводзяць самаабкладаньне і падпісваюцца на пазыку „3,рашаючага году пяцігодкі“ на 25 рублёў кожны двор. Колгасы ўзяліся дапамагаць манэўруючым часьцям транспортам і харчаваньнем. Зьбіраюцца сродкі на пабудову эскадрыльлі імя 8 загінуўшых баявых командзіраў і на моторызацыю пагранвойск.

Манэўруючыя часьці адразу і практычна ўключаюцца ў шырокую хвалю колгаснага энтузыязму. Байцы сапёрнае роты ў аднэй з вёсак наладжваюць мітынг, выпускаюць у колгасе плякат-газэту і наладжваюць варашылаўскі суботнік, у часе якога трактарамі роты ўзорваецца 8 га зяб іва. Пад непасрэдным уплывам манэўраў і пры блізкай дапамозе манэўруючай часьці ў другой вёсцы організуецца ячэйка Асаавіяхэму з 120 чалавек.

Гэтымі днямі ў урачыста сьвятковых клюбах, нардамох і школах усюды вечары сустрэч з манэўруючымі часьцямі. Тут узмацняецца сувязь з Чырвонай арміяй, забясьпечаная вялікімі прынцыпамі адзінства клясавых інтарэсаў. На такім самым вечары ў аднэй глухой, адарванай ад раённага цэнтру вёсцы, пры дзейнай дапамозе політкіраў-

ніка роты стралковага палка арганізуецца колгас у „Імя манэўраў".

Абкружым увагай Чырвоную армію. Гэтым лёзунгам прасякнуты адносіны грамадзкіх арганізацый і ўсяго працоўнага насельніцтва да Чырвонай арміі. Зьдзіўляе ўсё тое багацьце формаў і мэтодаў, праз якія чырвоным байцом выказваюцца самая задушэўная турбота і ўвага. Усе галіны багатага шматвобразнасьцю, жвавасьцю і дзейнасьцю жыцьця ўскалыхнуліся, каб дапамагчы з посьпехам правесьці завяршэньне летняе напружанае вучобы чырвоных байцоў. Вось пад лёзунгам „Будзем берагчы здароўе чырвоных байцоў" саюз мэдсанпрацы аднаго раёну сваімі сіламі адчыняе ў 3 больніцах палаты для чырвонаармейцаў з поўным абсталяваньнем і абслугоўваньнем. Арганізуецца 3 рухомыя шпіталі, 7 пунктаў першае дапамогі. На цэлыя суткі на мэдпунктах устанаўляюцца дзяжурствы дактароў. Вылучаюцца дактары для чыткі на пунктах санлекцый чырвонаармейцам. Вучні аднае сямігодкі праводзяць тры суботнікі па абсталяваньню аэродрому. Вылучаецца 10 настаўнікаў для культабслугоўваньня Чырвонай арміі. Ад вялікіх да малых і ад малых да старых—усіх захапляе шырокая хваля ўдзелу ў манэўрах. Шырокая сетка ларкоў, буфэтаў і сталовак па ўсіх пунктах прахаджэньня і стаянак часьцей разгортваецца спажывецкай коопэрацыяй. Колгасы і саўгасы падносяць байцом на паходах падарункі з садовіны. Бадзёрасьць была заўсёды з байцамі, дзякуючы ўсім гэтым турботам.

За адным з вакзалаў магіла невядомых чырвонаармейцаў, забітых у баі з белапалякамі ў 1920 годзе і пахаваных мясцовым насельніцтвам. Рабочыя чыгуначнікі арганізавана адпраўляюцца на магілу, папраўляюць яе, абкладваюць дзёранам, убіраюць зелянінай, кветкамі і ставяць невялічкі слупок з надпісанай дошчачкай: „Тут пахаваны невядомыя чырвонаармейцы, забітыя ў баі з белапалякамі ў 1920 годзе".

Нямала такіх магіл захавала памяць працоўных на абшарах усяе Беларусі. Папраўленыя рупныя рукамі, прыгожа ўбраныя, яны напаміналі маладым байцом аб слаўных традыцыях барацьбы за Савецкую Беларусь, за Саюз Савецкіх Рэспублік. Пры адным поглядзе на гэтыя могілкі невядомых герояў падцягваліся нямногія адсталыя ад часьцей байцы, прымыкалі да шэрагаў і з посьпехам выконвалі пастаўленую іх часьцям баявую задачу.

Вось крыху тых вынікаў з статыстыкі і баявое гатоўнасьці, якія непадкупнасьцю лічбаў і фактаў могуць расказаць аб тым, што робіцца ў краіне, дзе армія і народ—адно цэлае, і клясавыя інтарэсы якіх кроўна адзіныя.

Гэроі манэўраў.

З самага ранку сеецца як на сіта дробны назольлівы дождж. Падумаў-бы, што гэта едкі вільготны туман цяжэе і цяжэе прыліпае да зямлі, каб ня коўзалі гэтак ногі, каб ня лужыны і абрыдлае восеньскае балота. Бруднаю дзяругаю хмар апаўзло неба—нізка, нізка спусьціліся яны, акуталі кругавід. Адчуваньне вільготнае, стыжкае, няпрыемнае. Гэтак і цягне ў сухі пакой, дзе-б можна распрануцца, скінуць мокрую апранаху і аддацца цалкам спакойнаму адпачынку.

Нізка-нізка разрэзваючы хмары, кружаць самалёты, уносяць нейкі трывожны настрой—праціўнік блізка. Цераз двор саўгасу, увесь застаноўлены хурманкамі, машынамі, хуткім маршам праходзяць сапёры, стралковыя разьдзелы з шанцавым інструментам. Нясуць калючы дрот. Гэта робяць умацаваньне першае лініі абароны. Нейдзе ўперадзе ўжо разгортваюцца „баі".

Кулямётнае аддзяленьне, раскі-тае на ўзгорку, мае вельмі добры ...стар абстрэлу. Аддзяленьне ўдар-...е і гэтую ўдарнасьць апраўдвае ...аз усе дні манэўраў На рубяжох ...угое абароннае лініі яно справі-...ся з задачай выкапкі і замаска-...ньня акопу за паўтары гадзіны. ...сё гэта пад прыкрым восенскім ...жджом, які разгружвае зямлю, ...б лепш прыліпала да рыдлёвак, ...отаў і шынэляў. Але можа таму ...шэ больш упартасьці ў байцоў. ...андзір аддзяленьня дакладвае ...андзіру разьдзела, што ў выніку ...испаборніцтва (умовы тут заклю-...юцца бяз усякіх папер і алоўкаў, ...словах, каротка-конкрэтныя, на-...ду, каб ня траціць лішне часу) ...оп выкапаны да тэрміну, уста-...оўленага статутам.

Так заключаліся і выконваліся ...мовы. Часта агульная ўмова разь-...валася на паасобныя паміж бай-...мі свайго аддзяленьня, і тэмпы ...рамагалі непагоду, восенскую ...вань, перамагалі ўсе перашкоды ...пасьнае прыроды.

Перад саўгасам круціцца вужа-...ю рака. Абодва берагі абсаджаны ...сознымі ліпамі, алешнікам, пааб-...осталі кусткамі. Гэты бераг ракі, ...к павуціньнем, ад куста да куста, ...д дрэва да дрэва, аплёўся іржава-...ым калючым дротам. З поўдню ...асоўваецца група „праціўніка".

Падходы да рубяжоў другое аба-...роннае лініі па перасечанай мясцо-...васьці, праўда, адкрытыя, але стра-...энна нязручныя—балота, гразь. ...есцы для пераправы на рацэ ёсьць ...обрыя, але абаронны бок як мага ...астараўся зрабіць іх няшкоднымі ...ля сябе і небясьпечнымі для „пра-...ўніка". Умелымі рукамі абарон-...аў, якія выкарысталі амаль усе ...аенныя хітрыкі пры арганізацыі ...ацаваньняў абароны, рака пера-...варылася ў адну суцэльную пастку. ...ось зусім нядаўна, яшчэ ўчора, ...ераз раку, перакінуўшыся верхаві-...ю на другі бераг, ляжала вялізная алешына. Сягоньня яна ўжо пры самай зямлі сьпілена, ацярэблены камель удоўж кінуты на дно ракі, гальлё параскідвана па рацэ—пераправіцца тут на другі бераг ня лёгкая рэч. Тым больш, што абаронны бок чакаць ня будзе: максімы з узгоркаў сьвінцовым даждж ом абліюць „праціўніка", калі ён упрэцца лбом у калючы дрот.

Але ёсьць весткі, што ў распараджэньні „праціўніка" магутныя тэхнічныя сродкі барацьбы—танкі, якія цяжка будзе спыніць, калі разгорнутым фронтам пойдуць яны ў наступленьне. Пасьпешна выбіраюцца позыцыі і на пераправах устанаўляюцца гарматы кінджальнага дзеяньня, якія простай наводкай будуць біць танкі і бранявікі „праціўніка".

Далёка ўперадзе, гэтае далёка здаецца таму, што захаваны ад вока ўзгоркамі і кустамі, працягнулася паласа баявое аховы. Быць у абароне гэта ня значыць спакойна чакаць „праціўніка", пакуль ён прыдзе, быць у абароне значыць ведаць усе моцныя і слабыя бакі яго, каб у патрэбны момант самім перайсьці ў наступленьне. Баявым аховам, якія выконваюць задачу варты сваіх часьцей, гэты прынцып вядомы.

Командзір разьдзелу кіраўніцтва № батарэі назначаны ў ПНП у паласе баявой аховы. Задачай яго зьяўляецца артылерыйскім агнём сваёй батарэі падтрымліваць баявую ахову. Командзір разьдзелу безадкладна зьвязваецца з апошняю, але на гэтым ня спыняецца. Па ўласнай ініцыятыве ён робіць разьведку наперадзе і з боку ў сябе: самае лепшае самому разьведаць пра абстаноўку, каб мець поўнае ўяўленьне, дзе, сярод чаго і перад кім ты знаходзішся. Ініцыятыўны командзір сваёю разьведкаю даў вялізарную карысьць і баявой ахове і ўсёй сваёй часьці. Зусім неспадзявана з боку ў яго аказаўся полк, пра які ён нават нічога і не падаз-

раваў, і пра які нічога ня ведала і баявая ахова. Ён зараз-жа зьвязваецца з гэтым палком і паведамляе ў штаб свае часьці ўсе даныя, набытыя ў выніку разьведкі. Але гэта яшчэ ня ўсё. Добра ўявіўшы сабе ўсю абстаноўку, ён робіць разьведку наперадзе, разьведку „праціўніка". Апошняю ён устанаўляе перагрупаваньне і рух сіл „праціўніка", дзякуючы гэтай разьведцы баявая ахова цэлы дзень магла трымацца супроць вялікае сілы наступаўшых. Камандзір разьдзелу двое сутак падтрымліваў узорную сувязь са сваёй батарэяй—і калі пад моцным націскам „праціўніка" баявая ахова вымушана была адступіць—дакладнай корэктыроўкай агню батарэі даў поўную магчымасьць баявой ахове адыйсьці на новы рубеж. Умела праяўленая ініцыятыва камандзіра мела сваім вынікам тое, што баявая ахова амаль двое сутак трымала перад сабою наступаўшых, не даючы ім ходу.

На адным вучастку „праціўнік", падтрыманы танкеткамі, прарваўся да паласы абароны. Але тут выведка яго напаролася на раку, хітра аплеценую дротам. Абаронцы асяродкавалі моцны агонь на гэтым вучастку, і „праціўнік" вымушаны быў адкаціцца назад з пераўвялічаным данясеньнем, што перадавая паласа абароны ўмацавана па апошняму слову тэхнікі і абараняецца вялікімі сіламі. Гэтае данясеньне затрымала наступленьне больш як на суткі, на такі час, які патрэбен быў, каб сьцягнуць усе свае тэхнічныя сродкі наступленьня і ў першую чаргу танкі.

Гэты момант кароткага замяшаньня „праціўніка" абарона выкарыстала для яшчэ большага ўмацаваньня свае другое лініі. На дапамогу часьці прышло 150 сялян добраахвотнікаў са сваім інструментам. Па гэтых фактах мы констатуем кароткa: „Насельніцтва дапамагае". Нельга не ўспамянуць пры гэтым 1916 год, калі капаліся акопы на заходнім фронце супроць немцаў. Народ, асабліва падкі да грошай, камандаваньню прыхажалася спакушаць на работу ня толькі грашыма, але і казацкімі нагайкамі.

Наступнага дня раніца паказвала на добрае надвор'е. Сонца ўзыходзіла весела, бадзёра. Але ўжо праз якую гадзіну апошні раз усьміхнулася, і палавыя ды шэрыя хмары папаўзьлі адна за аднэй, і дзень зрабіўся падобны на ўсе папярэдзія восенскія дні.

Ідуць „баі". Ужо ў сталоўцы, адкрытай ЦРК у саўгасе, ня відаць начскладу. Сымпатычная дзяўчына з карымі вачыма і акуратна накручанымі на скронях кучаркамі валасоў, у чыстым, як сьнег беляным, халаце, стварае такое прыемнае ўражаньне, зусім у тон прыгожым букетам з жывых красак на чыстых століках. Але рухі ў яе сёньня лёгка павольныя, погляд запытальна імкнецца праз вакно. Ці ня сумуе яна па кім, хто пад пяшчотнымі поглядамі сымпатычнае блёндынкі з-за буфэту мог-бы сагрэцца за гарачай стравай. І погляд дзяўчыны міжвольна імкнецца праз вакно невялічкае і гэткае прасторнае цяпер сталоўкі туды, дзе відны драпяныя загарады і дзе ў акопах заселі стралкі, пільна вартуючы рухі „праціўніка". Камандзіры і політработнікі пры сваіх часьцях, кіруюць байцамі ў „баі". Цэлы дзень лётаюць самалёты.

Група самалётаў атрымала заданьне перашкодзіць прасоўваньню „праціўніка", дэзорганізаваць тылы. Надвор'е ня спрыяла выкананьню баявое задачы. Шэрыя хмары пазьвісалі нізка амаль над самай зямлёй і самалётам. Каб выкрыць „праціўніка", трэба нізка спусьціцца да зямлі. Гэта пагражае вялікай небясьпекай папасьці пад агонь з зямлі. Адзін з самалётаў групы ўмелым залётам нахопваецца на штаб. Пакуль „праціўнік" засьпявае ўявіць сабе ўсю небясьпеку, адна за аднэй „адрываюцца" самалёта бомбы" і ў момант расяваюць разбурэньне, ахвяры, а самалёт узмывае ўгару і ляціць далей.

Авіяцыя паказала вялікую баявую вывучку. Самалёты абароннага боку трымалі ўвесь час у трывожным настроі наступаўшых.

Гадзіне а восьмай вечару пачынаюць бомкаць батальённыя гарматы.

— Бум!—звонка ўрываецца раз-раз у наш рэдакцыйны пакой.

Чутны гукі мотору—гэта самалёт з баявым заданьнем накіроўваецца ў бок „праціўніка". Гадзіне дзесятай ад моцнага ўздрыгу паветра сатрасаюцца сьцены пакою, стол, за якім мы працуем над чарговым нумарам газэты, падскакваюе пад рукамі. У „бой" уступіла цяжкая артылерыя.

— Бах-у-у-у!—вядуць перамовы цяжкія гарматы.

Шібы ў тон падзеям, якія разгортваюцца на перадавых позыцыях, сярдзіта заходжваецца на дварэ вецер, шугае ў верхавіньні галетніх таполяў і сваім шумам падае гукі „вайны". Вось ясныя ракеты перарэзваюць кавалак цьмянага неба і зьнікаюць. Ракеты „праціўніка" спрабуюць асьвятліць позыцыі абароннага боку. Захліпаюцца ў брэху кулямёты. Лопаюць рэдкія стрэлы з вінтовак. Ноч, не ўважаючы на надвор'е, відная, бо‘ то вецер паразганяў хмары. Бо‘ гэта ад зарыва з „перадавых позыцый". Сярдзіта шуміць вецер.

Увесь гэты дзень прайшоў для рэдакцыі на лініі абароны. Сам рэдактар са сваім намесьнікам адсылі цэлы дзень на азнаямленьне з позыцыяй абароны Н-скага стралковага палка.

У штабе ішла гарачая работа. Праўнікі абароны не адыходзілі ад сваіх карт і амаль што хвіліны трымалі данясеньні з перадавых позыцый. Баявыя аховы пад націскам моцнае сілы „праціўніка" з „боем" адыходзілі да свайго распалажэньня. У пасьпешным парадку сканчалася ўмацаваньне другое лініі абароны, з рубяжоў якое адкрываўся ўдалы абстрэл.

Рэдакцыі заставалася выдаць апошні нумар газэты. Але атрымліваюцца трывожныя весткі, што „праціўнік" рыхтуе ўзмоцненую атаку пры дзейным падтрыманьні танкаў, і нам трэба быць гатовымі кожнае хвіліны выехаць.

Ноч мы спалі пад музыку гарматных і кулямётных стрэлаў. „Праціўнік" упарта прасоўваўся ўсё ўперад і ўперад. Упярэмежку з лёгкай артылерыяй і батальённымі гарматамі час-ад-часу кашляла цяжкая артылерыя—міжвольна ствараласа адчуваньне сапраўднае вайны. Наш сон быў перапынены нацямочку адрыўчатымі гукамі частых вінтовачных стрэлаў амаль над самым вухам. Трэба было ўставаць, складваць свае манаткі.

Пакуль два работнікі політаддзелу Н-скага стралковага корпуса, якія друкавалі ў нашай друкарні адозву, пад абаронай белага парэдніцкага сьцяжка на нашым „фордзе" пасьпешна пакідалі за сабою кілёмэтр за кілёмэтрам, мы ўдарным парадкам грузілі на паўтаратонку і рэдакцыю.

На дварэ была тая цішыня, якая ўласьціва сапраўднай вайне. Нідзе ня відаць людзей, чутны адны стрэлы, ды гудзеньне самалётаў. Крокаў за дзесяць ад нас у добра замаскаваным акопчыку на беразе ракі некалькі стралкоў час-ад-часу разражаюць свае вінтоўкі і ўважна ўзіраюцца праз густыя кусты, што робіцца на тым беразе. Мы спрабуем таксама ўгледзецца, але нічога ня бачым, тым часам стралкі мэтодычна пасылаюць стрэлы не-

куды ў кусты таго берагу, дзе, відаць, павінен быць „праціўнік". Трохі пазьней мы даведаліся, што танкі наступаўшых атакавалі разам з стралкамі той вучастак, ад якога пазаўчора адкаціўся іхны напалоханы выведніцкі атрад. Першая лінія абароны ня вытрымала ўпартага націску танкаў, і абаронцы мусілі адступіць на рубяжы другое абароннае лініі. Танкі пераправі-ліся цераз раку, скамячылі драцяныя загарады і сваім агнём падтрымалі наступаўшую пяхоту!

Байцы, захапіўшыся баявымі дзеяньнямі, сумесна з тэхнікай, ігнаруючы дрэннае надвор'е, восенскую імгу, дождж і балота, былі цалкам пад уплывам выкананьня баявых задач, засваеньня тэхнікі боя. Пад моцным уплывам шырока разгорнутае партыйнае, палітычна-масавае работы на працягу другога этапу манэўраў у партыю ўступіла 150 чалавек, 100 у комсамол і шмат у колгасы.

З хвіліны на хвіліну павінен зьявіцца наш „форд", але яго няма яшчэ, і мы крыху ўстрывожаны, ці ня выкрыты дзе-небудзь, натрапіўшы на „праціўніка", белы пасрэдніцкі сьцяжок і ці ня ўзята разам з работнікамі політаддзелу і машына. Зусім побач з намі бомкае батальённая гармата, устаноўленая якраз насупроць маста.

Пагрузіўшы базу, ідзем у сталовую. Доўга прыходзіцца стукаць, пакуль, нарэшце, дзьверы адчыняюцца, і мы ажыўляем няжывую цішыню прытульнае сталоўкі. Нам тлумачаць, што загадана не адчыняць сёньня. У вакно нам відаць, што агонь з боку абаронцаў узмацняецца, і адчуваем, што настае рашучы момант. І можа таму ня фліртуе вачыма сымпатычная блёндынка з буфэту, погляд воч у яе затуманены чымсьці: трывогай ці чаканьнем, не пазнаць. Мы шпаркa закусваем і ў перапынках перахопваем погляд па-нямецкаму акуратнае блёндынкі. Седзячы гэтак тут, зусім ня хочацца выяжджаць і канцэнтравацца на гэтай бязьлітаснай паўтаратонцы.

Прыходзіць „форд"; нам відаць праз вакно яго брудны, што быў некалі белым, пасрэдніцкі сьцяжок. Мы выгружаемся з прытульнае сталоўкі і ў думках разьвітваемся шчыра і цёпла з сымпатычнай блёндынкай, якая некуды зьнікла якраз у гэты момант.

Шофэр „Амо" круціць ручку мотору датуль, пакуль той не падаецца і пачынае трахкацець. Корпус машыны ўздрыгвае дробна, сударгава—мы пакідаем гасьцінны саўгас з яшчэ больш гасьцінным сталоўкай. Блёндынка з карымі вачыма і гукі „баёў" застаюцца далёка пазадзе.

Нявылазная гразь на дарозе. Праўда, дарогі некалькі дзён таму назад ладзіліся: ударным парадкам дзесяткі і сотні колгасных і сялянскіх хурманак вазілі на грэблі пясок, сапёры ўмела выраўноўвалі, тахцілі грэблі, капалі на абапал равы; там, дзе гразьлі сялянскія коні, дзе хурманшчык надрываў свой пуп, ідуць лёгкія, запырсканыя, але далікатныя, „форды", паўтаратонкі „Амо", шэрыя бранявікі.

Дарогі было-б не пазнаць, каб не дажджы, якія за апошні тыдзень зрабілі з яе вадкую глейкую калатушу. Манэўруючых часьцей тым часам гэта не палохае. Вось на грузавікох імчыць стралковая часьць, вось коньнікі—запырсканы крысы шынэляў... Мотарызаваныя часьці... Усе сілы—на лінію абароны. Ад шпаркага манэўру залежыць выкананьне баявое задачы, залежыць посьпех.

А мы ўсё далей ды далей аддальваемся ад тэатру „вайны", сустракаючы коньніцу, пяхоту, мотоцыклі, разьмінаючыся з бранявікамі і абозамі з сялянскага транспарту. У шэрых і рыжых сялян-

ціх сьвітках ішлі пры вазох адны з гэрояў манэўраў—колгасьнікі. Турманаў аднаго раёну пасьля чатырох дзён работы ў абозе вайсковай часьці адпускалі дамоў. Усе яны адзін, яны адмовіліся і мабілізаваліся на ўвесь час манэўраў. Грошы, якія належалі ім за хурманкі, яны прасілі аддаць у фонд абароны. Да канца манэўраў яны працавалі ў парадку соцыялістычнага спаборніцтва на лепшую паклажу, захаваньне грузу і дысцыпліну маршу.

Увечары, пасьля цэлага шэрагу непрадбачаных і непрадбачаных астановак, мы спыніліся апошні раз у аднэй вёсцы на дзень, каб выпусьціць апошні нумар газэты. Нумар газэты прысьвячаўся барацьбе за аўладаньне вучобай і тэхнікай аднаго баявога стралковага палка.

Казалі, нібыта гэтае ночы быў сапраўдны восенскі мароз і нават ішоў сьнег; мы-ж ведаем толькі адно, што з паўночным калючым ветрам з Менску прыехаў нарэшце прысланы друкар. Прыехаў ён тады, калі ўвесь тыраж нумару быў надрукаваны і сфальцаваны. Друкара заставалася толькі накарміць, бо ён дарэмна толькі згаладаваў за дарогу і пасадзіць да „амэрыканкі“ на „Аму“.

... Увечары нас ветліва сустракалі агні Менску.

Сяргей Знаёмы

Паходы

I.

— Алесь, а дзе-ж твая павязка?— Макоўскі нічога не адказаў. Толькі і зраб.ў, што, зьнізіўшы галаву, моўчкі падаўся ўбок. І ад таго, што Алесь маўчаў, ад таго, што некалькі вострых зіркаў працялі Макоўскага, ад таго, што з нейкай прыкрасьцю зірнуў комрот, Цэраху самому стала няёмка.

— Навошта я зрабіў яму заўвагу? Чорт... Але-ж пацягне за язык.

Якісь час маўчалі, а потым ад ціхіх шэптаў і кароткага перакіданьня словамі перайшлі да гучнага гоману і звонкага сьмеху. Яно ў нас так заўсёды. Дома ці ў паходзе ў моманты працы пануе ціш. Увага хлопцаў згрупавана над тым, што робяць. Так, ідзем, жвава і трапна мерым адлегласьць. Але хутка прывал. Адчуваеш яго патрэбу на нагах, як ніколі, а дзесяць-пятнаццаць хвілін прывалу даюць новую жывую струнку для руху.

Чуваць як наперадзе калёны заікаецца сьвісток камандзіра.

— Пры-ы-вал.

Сталі. І разам з камандай: „вольна", уздымаецца гоман, сьмех. Кожны паход і дзень нашай вучобы мае сваіх гэрояў, вакол якіх круціцца гутарка, жарты і сьмех. Але ёсьць і штатныя „аб'екты" нашых перамоў.

— Глядзі, хлопцы, ужо Макоўскі на левым флянгу, паказваючы пальцам, кажа Сяміжон.

— Э-эй, ты, нестраявік,—крычыць Матусэвіч.

— Але-ж і зараза гэты Матусэвіч. Які ён прыкры,—думае Макоўскі і тым часам пачынае адыходзіць назад. Адыходзячы, ён успамінае, што калі распранаўся дома, то забыўся на павязку, што гэтым выдаў сябе з галавой. І Алесю робіцца яшчэ няпрыемней. Надыходзіць злосьць.

— Тав. Макоўскі, тав. Макоўскі, куды вы прэце на строй... На сваё мейсца. А-арш!—крычыць камандзір. Злосьць уздымаецца і ўжо не на Матусэвіча, а на камандзіра.

— Чаго ён так крычыць. Э-эх...— Макоўскі адыходзіць на правы флянг, а з левага ўжо даўно ідзе прыёмка вопраткі і зброі. Хацеў Алесь першым здаць, хутчэй да дому пайсьці. Ды не. Не задалося. „Служакі",—кажа ён сабе пад нос.

А хлопцы з прыўзьнята бадзёрым настроем разыходзяцца, зьнікаюць у чалавечай гушчы вуліц. Хочацца Макоўскаму разам з імі ісьці. Дагнаць хочацца, але неяк. Ён у страі, ён яшчэ ня здаў вопраткі. „Хутчэй,—думае Алесь,—хутчэй-бы скончыўся гэты дзень, а потым... ах, які марудна цягучы, да назолы сумны дзень".

...Вось ідзе Алесь да хаты, і думкі неадлучна цягнуцца за ім: „А што, ці дадуць мне званьне камандзіра?

— Не,—праказаў ён уголас. Сэрца мацней застукала, крыўда ў грудзёх пачала зьбірацца, кроплі поту скаціліся з ілба на бровы і, заблытаўшыся ў валосіках, павісьлі.

Чамусьці ўсплыло ў памяці:

Гучна раздаецца голас камандзіра тав. Дубавіка. Кожны камандзір пры камандзе мае свае асаблівасьці ці то ў голасе, ці то ў постаці. Вось прыкладам Дубавік. Камандуе „ат, два, тры", а помкомрот тав. Калінін „раз, два, тры, чатыр-р-ры", а старшыня роты тав. Курыльчык да „тры" кажа ціха, а

„чатыры" так гойкне, што калі ідзеш блізка ад яго, то ў вушшу абавязкова заложыць.

— Ат, два, тры,—чуваць каманда. Стройна крочыць разьдзел на іспыты. Прыслухайся, здаецца, гэта адзін чалавек з цьвёрдай паходкай моцна ступае па ўтоптанай дарозе. А ідзе—разьдзел. Нават Рублёў, які заўжды зьбіваецца з нагі, сёньня ідзе добра.

Не пасьпелі стаць, як адтуль, дзе стаялі камандзіры, вышаў і накіраваўся да разьдзела комбат. Я зірнуў на Сяміжона, ён стаяў ціха, толькі вачыма цёпаў, вось, вось, здаецца заплача. Аляхновіч шавяліў плячыма, а Шпілеўскі смаркаўся,—на ліха і нос нешта залёг. Ах, наша баязьліваськь. І каб здаецца ня ведаў. А-то нават тыя, што лічыліся лепшымі, аддаліся ў палон нерашучасьці, баязьліваські.

Прагучэла „зважай". А потым, потым пачалося тое, чаго чакалі, па што прышлі.

— Вось вы,—паказаўшы на Брукаша, паказаў комбат,—будзеце камандаваць аддзяленьнем.

Бедны Брукаш, ён адразу паказаў свой спуд. Вышаўшы з строю, хапіўся праціраць акуляры, потым з штанамі неладнае здарылася. Невялічкі, з гарбатым носам і даўгімі вушамі, з няголеным тварам, ён быў сьмешны і ў той-жа час яго было шкада. Брукаш вышаў, і стаўшы перад строем, скамандаваў:

— Зважай.—Слова вылецела, а ўпэўненасьці, патрэбна яно ці не,—ня было. Другія каманды Брукаш падаваў таксама няўпэўнена, ціха і нячотка. Відно стала, што чалавек шукае слоў, тужыцца знайсьці... але слоў няма.

А Макоўскі стаяў і ўнутраным сьмехам кпіў над Брукашам.

— Глупства ўсё гэта. Выклікалі-б мяне.

Яму чамусьці ўспомніўся горад, людзкое скопішча. Снуюць людзі, бегаюць, ідзе і Алесь ды не адзін. Поплеч яна. Такая жвавая, радасна-лёгкая, што вось, вось здаецца возьме ды паляціць. У яе беленькая галоўка і загарэлы твар. Яна ўпілася вачыма ў Алеся і коле яго, коле зіркам сваіх сініх воч у самае сэрца. А сэрца ў Алеся зьнябылося,—месяц як ня бачыліся. І гэта пасьля ранейшых штодзённых стрэч, гутарак, крыўд і скарг, трывог і радасьці першага каханьня.

Яна просіць Алеся; ёй зусім мала патрэбна, толькі, ну пагуляць вечар, ну пагутарыць, хочацца, каб расказаў Алесь пра ўсё, драбнюсенька пра ўсё. Алесю і самому жадалася-б, ён і сам рад бы быў, але хтосьці з злоснай гіроніяй сіпіць унутры, хтосьці кпіць. Як камень вісіць па-над ім думка, што вось хутка трэба ісьці ў лягер, што ён павінен зьявіцца ў тэрмін. А інакш, інакш будзе дрэнна.-Эх, вырвалася з грудзей, і крыўда ўзьнялася на сябе, на старшыню роты і нават на пісара, які хай-бы па абмылцы напісаў замест 19 гадзін хоць-бы 22. Алесь узяў за руку яе і толечкі жадаў разьвітацца, як:

— Вы, таварыш, з права другі, будзеце камандаваць... Выйдзеце.

Макоўскі вышаў. Ён забыўся паўтарыць загад.

— Якія вы ведаеце парадкі аддзяленьня.

— Стайка і... у глотцы Алеся перасохла.

— Пераблыталі, ня тое. „Стайка" даўненька паляцела з нашага статуту. Але... вядзеце аддзяленьне.

Макоўскі павёў.

— Павярнеце кругом.

— Кру-гом,—скамандаваў Алесь і зьдзівіўся. Аддзяленьне перш не павярнулася, і толькі потым хто як.

Ён і забыўся, што няправільна скамандаваў.

— Пачнеце калоць чучала.

Алесь застанавіў аддзяленьне. Нейкую хвіліну падумаў і потым нечакана, ня толькі для чырвонаармейцаў, але і для самога сябе, скамандаваў:

— Да бою...—а далей ён ня ведаў як падаць команду.

Комбат пакруціў галавой. Апусціўшы долу вочы, Алесь стаў на мейсца. Ён рашыў, яму так здавалася, што званьня малодшага камандзіра не нададуць. І тым ня менш хацелася верыць, што гэтая думка, думка няправільная, што яна чужая і далёкая. „А можа, можа і нададуць",—падказваў хтосьці чужым няўпэўненым голасам.

Зноў успомнілася яна, з сінімі вачыма і белай кужэльнай галоўкай. Яна стаяла і моўчкі глядзела Алесю ў твар. Толькі цяпер гэты погляд ня радаваў, а з тамлівай дакорлівасьцю хіліў Алеся долу, ад чаго рабілася крыўдна, дужа крыўдна, на камандзіра аддзяленьня, камандзіра разьдзелу і больш за ўсё—на сябе, за тое, што хадзіў у шпіталь, за тое што вольны час аддаваў буфэту і нікчэмным марам.

II.

Учора быў сход. А сёньня батальён рыхтаваўся да выхаду на працу па прокладцы бруку на новым шляху.

Сёньня выходны, і дзесяць процантаў байцоў маюць права ісьці ў горад. Але ўсе на мейсцы. Усе чакаюць, усе падрыхтаваліся. Чакаюць, калі днявальны гукне:

— Выходзь строіцца

І покуль ня чуваць каманды, гутараць чырвонаармейцы. Хто пра што, а Эстэркін пра сябе, пра сваю працу. Ён з толкам махае рукамі, часам вокам міргане. Яго шэрыя вочы хутка бегаюць па суседзях, а язык з пырскамі сьліны часта выторкаваецца праз шчэрбіну рту.

— Каб я жыў быў, што праўда,—вось пабачыце.—Няхай толькі ў мяне зыйдуць мазалі... Мне праца ня боязна.

...А раздатчык хлеба Сьцёпка Рабакоў скардзіцца кучцы хлапцоў з першага аддзяленьня;

— Недапушчальна, безабразьзе, ядуць як не ў сябе. Гэта-ж думаць трэба, сёньня зноў не хапіла пяці порцый хлеба. І тутака-ж пра сябе: „адну та порцыю я ўзяў, а хто-ж астатнія чатыры?".

* * *

...Працавалі на дзіва добра. За якіх тры гадзіны засыпалі каменьнем звыш трохсот мэтраў дароґі. Не здарма комбат вынес падзяку.

— Чуеш, Эстэркін, табе комбат падзяку выносіць,—з усьмешкай праказаў Бараноўскі.

Эстэркін засмуціўся. Ён адчуў на сабе погляд таварышоў, убачыў іх саміх спацелых і запыленых. Эстэркіну зрабілася сорамна за сябе, за свой даўгі язык і фізычную слабасьць. Яму зрабілася няёмка за ўсіх тых, што больш гавораць, чымся робяць.

Падышоў політкіраўнік.

— Эстэркін, а як з газэтай, выпусьцілі?

— Не, таварыш політкіраўнік.

— Дрэнна, таварыш Эстэркін, дрэнна. Пабачце, першы і трэці разьдзелы выпусьцілі, а вы качаеце. ...Такая работа нікуды ня варта.

Эстэркін нічога не адказаў, толькі і зрабіў, што, смарганўшы носам, пачаў пераабувацца.

* * *

Грышук ляжаў ды думаў:

— Чаму гэта, як народзіцца чалавек, дык ён здолен стала працаваць праз якіх дзесяць-пятнаццаць год. Конь—праз год-два, машына—як толькі атрымае энэргію, а рыба, калі толькі народзіцца, здабывае сабе ежу. Чаму гэта?

— Хто гэта выдумаў, што на занятках нельга курыць?.. І што я шкоднага зрабіў, калі заснуў учора на стрэльбішчы. Я-ж адстраляў і быў вольны?

— Няўжо я павінен слухаць аддзялькома? Ён-жа такі нязграбны і калі да мяне зьвяртаецца з чымнебудзь, дык усё з усьмешкай, груба...

— Добра, што я спазьніўся на два дні. Вінтоўкі ў мяне няма, лапаткі няма, нечага і чысьціць ня трэба, лішні цяжар цягаць ня буду.

— А што, каб схадзіць да доктара, можа-б мяне часам звольнілі?

Дзьве першых дэкады былі самымі цяжкімі. Надыходзілі паходы, самае страшнае для таго, хто не ўцягнуўся, каму яшчэ мяшае скатка, хто адчувае на плячох цяжар вінтоўкі, хто на першым прывале хапаецца за ваду, у каго боты ціснуць, а незручна накручаная ануча трэ ногі.

Грышука зволіла гарнізонная камісія ад паходу. Макоўскі таксама выкруціўся, Эстэркін гоіць мазалі, Касому нагу абкруцілі. Гуляюць хлопцы. На атрыманую стыпэндыю падтрымліваюць каля крамы ЦРК жаргу, кніжкі пачытываюць.

А батальён вучыцца хадзіць. Ідучы ўчора з заняткаў комрот загадаў паскорыць крок.

— Сто дваццаць крокаў у хвіліну задача гэтай пяцідзёнкі.

Хтосьі сказаў, што кадравікі даюць сто сорак чатыры.

— Ня верыцца нешта. Людзі-ж мы, а не машына,—хацеў сказаць фрумкін.

Але...

— Пайшлі. Наперад пусьцілі трэці разьдзел. Тут людзі рослыя, крэпкія і ходкія. Моцы шмат ды і харобрасьці з задзёрам ня мала. Ісьці дык ісьці. Ну і пашлі.

Ня ішлі, а беглі кусты паўз дарогі, разьміналі слупы, пыл, не пасьпеўшы асесьці, слупам стаяў за калёнай. Ішлі. Не пасьпявала стрэлка паказаць хвіліны, як сто семдзесят крокаў было адмерана. Паўгадзіны. Сорак хвілін і пяць кілёмэтраў пройдзена.

— Пры—вал.

Нехта асунуўся на зямлю і, задзёрты ўгору ногі, прыпёр іх да дрэва. Горка ў глотцы, томна ў грудзёх. Часта-часта стукоча сэрца. Ах як хочацца піць...

Комрот тав. Драздоў, ідучы папарадзе, меркаваў:

— Усё-ж так хутка ня варта каб хадзілі. Ну якая карысьць, што за сорак хвілін пройдзена пяць кілёмэтраў. Умарыліся, ледзь ногі цягнуць. Здарся цяпер з „ворагам“ сустрэцца, дык мая рота не баяздольна... Не, больш як сто дваццаць крокаў у хвіліну ня дам хадзіць.

* * *

Камандзіры аддзяленьня ў нас чырвонаармейцы кадравікі. Што ім паходы. Яны ўцягнуліся і зараз ім дужа сьмешна, як гэта мы такія хлопцы ды на другім кілёмэтры пацеем. Сьмешна ім. А камандзір трэцяга аддзяленьня тав. Панеўчык да Чырвонай арміі рабочы сэзоньнік гіронічна ўсьміхаецца ды кажа:

— Інтэлігеншчына гэта. Ляпуюцца яны. Шкадуюць сіл сваіх.

— Э—х заяда,—ледзь чутна кажа Матусэвіч,—вожык.

...Камаддзяленьня Сідарук, абапёршыся на статку, пакурвае. Поплеч зім ляжыць чырвонаармеец Басалыга. Ён мокры, нібы-та з рэчкі вышаў. Ляжыць і пейкім плаксівым, поўным скаргі, крыўды і стомы голасам пытае:

— Тав. командзір, няўжо і вас так ганяюць?

— От чудак. Ці-ж то ганяюць, то-ж вучаць. Для нас дык гэта плюнуць, а вам канешні цяжка. Але што, нічога. Паходы са два зробім і вам тады хадзьба страшна ня будзе,

Непадалёк прайшоў командзір кулямётнага разьдзела тав. Прыдачын. Яго чорнасінія галіфэ надуваў вецер, і ад таго, што штаны ў яго шырокія, а сам ён невялічкі, тоўставаты, здалёк здавалася, што ня ідзе Прыдачын, а коціцца.

— Э-х, ды каб мне гэтакія-ж штаны,—думае Сідарук і тут-жа рашае ў наступны выходны абавязкова пайсьці ў горад. У яго ёсьць каля ста рублёў, і ён купіць, бязумоўна купіць сабе галіфэ. Дармо, што Сідарук атрымае званьне камандзіра аддзяленьня толькі па восені, калі скончыць палкавую школу, дармо, галіфэ ён купіць зараз.

Сідарук не па гадох вытрыман. Па гадох ён што, хлопчык, яму яшчэ і дваццаці няма, а ўжо і хутка камандзірам будзе, а там, праз які год ці другі і вышэй. Ён яшчэ, як

толькі паступаў ў армію, даў сабе абяцаньне не пакідаць яе ніколі. Вось ужо другі год Сідарук у арміі, а яшчэ ня меў ніводнае нават заўвагі. Заўсёды першы, усюды першы, таму і лічыцца ў школе ў ліку лепшых курсантаў, а ў нашым батальёне прыкладным камандзірам. „Огнеупорны", так завуць яго ў разьдзеле.

— Дык, ты Басалыга, не качай. Ідзі, ідзі наперад, не адставай.

— Ня мажу, таварыш камандзір, кулямёт абцяжарыў.

— Э-эх, ты, ваяка,— і Сідарук бярэ ў Басалыгі „Дзегцярова". Лягчэй крочыць Басалыга, усьміхаецца, лёгка яму, але і сорамна крышку.

Сідарук ідзе ды думае: „І чаго тут цяжкага. Пяць год таму назад я і не такую цяжар насіў", і паўстае перад ім перажытая батрацкая доля, пройдзены жыцьцёвы шлях, цяжкі ў каляінах... І толькі ў арміі ён адчуў сабе чалавекам, роўным і такім-жа моцным, як сотні і тысячы іншых.

Зноў прывал, зноў перакурка. Аддзяленьне Сідарука згрупавалася вакол свайго камандзіра. А Сідарук лае байца Шустара. Лае за тое, што Шустар ня ўмее абуваць. Накруціць абы як анучы, а потым не пасьпее некалькі крокаў прайсьці, як просіць дазволу перабуцца.

— Куды-ж гэта варта такое абуваньне,—і Сідарук сам абувае Шустара, ды ўвесь час сварыцца на яго, дапікае. Глядзі і здаецца, што гэта бацька вучыць недаростка-сына.

Хлопцы іншых аддзяленьняў, сабраўшыся, часта шкадавалі, што не папалі да камандзіра Сідарука. Яно сабе і ў трэцім аддзяленьні добры камандзір, адно—гэта крышку ваўкаваты і самаўпэўнены. Яму заўжды здавалася, што больш за яго ніхто ня ведае і ведаць ня можа. Ён жадаў кожнага навучаць як сябе трымаць. Яго слухалі, загады яго выконваліся, усё, на вошта ён заўважаў, тут-жа выпраўлялася. Але яму здавалася, што ён... не Сідарук, што Сідарука больш любяць і хваляць, чым яго.

III.

Ішла другая дэкада. І з кожным днём усё ярчэй і ярчэй праяўляліся цьмяныя ад незразумеласьці бакі вайсковага жыцьця.

Батальён выхоўваўся і гартаваўся на праявах парушэньня вайсковай дысцыпліны, на нявытрыманасьці, на неразуменьні ролі малодшага камандзіра. А такіх фактаў было багата. Барацьбой за валявога малодшага камандзіра, за прыкладнасьць камуністых і комсамольцаў у баявой вучобе, партыйна-комсамольская арганізацыя дамагалася патрэбнага аўторытэту і павагі з боку байцоў і каманднага складу.

Чырвонаармеец Плучык быў у арміі, быў нават камандзірам аддзяленьня, а цяпер яго прымусілі падпарадкавацца. Для Плучыка, які бачыць чужыя хібы, якому здаецца, што ён добра ведае вайсковую справу,—дужа цяжка. Цяжка адтаго, што папраўляюць цябе на кожным кроку, робяць заўвагі, і хто?.. малапісьменны камандзір аддзяленьня.

— Мне былому камандзіру-кадравіку хлопчык робіць заўвагу.

Крыўдна і цяжка. А тут яшчэ „лазьня" на сходах. І Плучык захаваў унутры сваю незадаволенасьць і як просты мэханізм,—так абы выканаць, пачаў рабіць тое, што загадваў камандзір.

Паходы.

Яны сталі надзвычайна частымі і вялікімі. Ужо трэба было ісьці не дзесяць кілёмэтраў, а дваццаць і дваццаць пяць, ды яшчэ вырашаць па дарозе тую або іншую баявую задачу.

Часу ў абрэз. А вінтоўку трэба чысьціць. А чырвонаармейцу Астроўскаму думалася, што чысьціць вінтоўку штодня камандзір аддзяленьня прымушае так сабе, па сваёй уласнай ініцыятыве. Таму ён вырашыў, пасьля таго, як ня выканаў двух практыкаваньняў, якіх дні са два ня чысьціць вінтоўкі.

Рашыў і зрабіў. Калі ўсе ішлі насьціць зброю, Астроўскі адпраўляўся ў чытальню або да буфэту... Так адзін, другі дзень, а калі на трэці дзень камандзір пачаў правяраць зброю, ён убачыў, што стрэльба Астроўскага заржавела. Астроўскі трымаў нарад.

Вось цяпер, адбываючы яго, Астроўскі стаіць пад „грыбам" на „перадняй лініі" ды ціханька пяе самім-жа складзеную песьню:

. . . . . .

Карабэла мая ізмяніла,
І ўсе кулі пайшлі паўзьмішэнь.

Я за гэта сваю карабэлу
Не пачысьціў, ня змазаў два дні.
Карабэла мая заржавела,
Камандзір даў за гэта нарад.

Астроўскі склаў цэлую песьню пра сваю карабэлу і пра тое, як ён атрымаў прызначэньне. Гэта песьня пайшла ня толькі па аднаму выздзелу, яе ведалі чырвонаармейцы ўсяго батальёну. І Астроўскага ведаў кожны, яго нават зваць пачалі—карабэла.

Астроўскі напяваў, схаваўшыся пад прыплюснуты часам „грыб". А за Менскам батальён вёў наступленьне. Добра акапаўся моцны супраціўнік, добра расставіў кулямётныя гнёзды, а там, дзе гэтага было мала, захаваныя, але напагатове стаялі бронямашыны. Сунься, спрабуй.

... Выходнае палажэньне. Рэканасцыроўка мясцовасьці. Рушылі, наскуючыся за кустамі і ўзгоркамі; кожнае аддзяленьне пайшло ў сваім напрамку, прытрымліваючыся дадзенага сэктару.

Пачалося наступленьне. Гэта была корсткая барацьба. Гэта былі іспыты, праверка таго, як засвоілі тэму—наступленьне.

Супраціўніка не ўдавалася выбіць з акопу: ён моцна трымаўся. І вось артылерыйскі агонь прымусіў „ворага" адступіць, пакінуць акопы. Толькі гэтага і патрэбна было. Кулямётны агонь і ні на крок няспыненае наступленьне прымусілі „ворага" бегчы цэлых дванаццаць кілёмэтраў.

Апошняя схватка.

„Вораг" у нашых руках. Цалюткія роты, колёны, захоплены кулямёты, батарэя і толькі нязначныя рэшткі, перапалоханыя агнём, захаваліся ў лесе.

Скончыліся заняткі. З ветлівасьцю пазіраюць адзін на аднаго камандзіры, яны, як і чырвонаармейцы рады за посьпехі, за тое, што тэма добра засвоена, за тое, што посьпехі баявой вучобы найлепшыя.

Вось комрот, тав. Спэгальскі ён,—што заўсёды маўчыць,—сёньня шмат і моцна сьмяецца, гутарыць. А комрот Драздоў—яго тонкая постаць уся ў руху, ён сёньня на цэлую галаву большым здаецца.

* * *

Ідучы ў лягеры, чырвонаармеец Касы адставаў. Сёньня ён амаль упяршыню быў на занятках. Касы ня прывык да паходаў, і таму цяжар вінтоўкі, падсумкі, супроцьгазы, цісьне яго долу. Ногі заплятаюцца, а мокрая вопратка ліпне да цела. Касы каля двух дэкад ня быў на занятках: ён „хварэў". І зараз ідучы мяркуе, перакідае думкі з кута ў куток сваёй ня дужа вялікай галавы.

— Чаму гэта мяне не скарыстаюць, зволіўшы ад строю, на іншай рабоце? Чаму-б гэта мяне ў штабе не скарыстаць, і пішу я добра, або ў ротнай канцылярыі... От хутчэй-бы ўжо скончыўся гэты збор...

... Здавалася ногі волавам наліліся. Таму так цяжка і падняць іх. Падымеш нагу, адарвеш ад зямлі, а яна зноў уніз, бот з грукатам апускаецца на камень. Ацяжарылі ногі, цела стомай і болем працяло. Так хочацца адпачыць хвілінку якую. А вінтоўка цісьне ўніз, вузкая шлейка рэжа плячо, лапатка на аб'ехаўшым рамяні без перастанку трэ бакавіну. Панамакаўшыя анучы пааб'яждалі—муляць ногі. Унутры нейкая млявасьць. Целы дзень ня еўшы. Ідзе Іван Караўлёў, думаць

хоча, а думы з галавы лятуць. І толькі адна моцна засела, закрапалася ў мазгох—прыпыніцца-б, адпачыць.

Яшчэ ісьці багата па цьвёрдай падбоістай дарозе. А ногі ледзьве гнуцца, падэшвы ажна садзюць. „Вось ды каб у мяне была машына. Не балелі-б ногі, ехаў-бы сабе як пан ды і годзе. Фордзіка, от гэтакага невялічкага... І да жонкі зьезьдзіў-бы часьцей... добра. А як-бы рада Галька-дачка была... Што робіць зараз жонка, ці думае яна пра мяне? А можа закруціла з кім? Ці чорт... А партадлікі ў мяне ня плочаны, мусіць, месяцы ўжо чатыры? Ось будзе перцу... Ня шкодзіла-б пераабуцца".

— Іван, ты пачаў адставаць, шырэй крок.

— Не магу, дыхаць закладае, разумееш, ногі слупянеюць... Я зараз адстану, выйду з строю. Ведаеш, ня ідуць ногі, ось цягну іх як памакі.

— Што, што ты, звар'яцеў? Зірні на сваё аддзяленьне, хлопцы ледзьзе крочаць, варта табе адстаць, як за табой і яны ўсе адстануць... Не забывайся Іван, што ты сягоньня камандзір, і што ўчора пра авангарднасьць сам гутарыў, помніш, казаў—наперадзе трэба быць. А зараз што-ж, у кусты? Да абозу, падвязуць? Э-э, брат... Хлопцы, давай песьню, зацягвай там хто.

А ў гэты час хтосьці з левага флянгу завёў:

Студэнт, ідзі сьмялей у бой...

і дружнае звонкае рэха раскацілася па лесе:

Сьмялей у бой.

* * *

Іван Гарасімавіч Сілкін навучае разьдзел строю.

— Раз, два, левай,—стоячы на ўзгорку, падае ён команду.

Як ні дзіўна, а мы, студэнты, людзі, якія нечаму вучыліся і вучацца, нешта бачылі, а вось хадзіць у страі ня ўмеем. Ня ўмеем нагу трымаць, ня ўмеем роўным крокам ісьці. Вось, хоць-бы цяпер, ішлі, і здавалася добра, і раптам Брукаш узяў свой „грамадзянскі" крок. Ён закрочыў дробненька ды густа. За Брукашам Шацкі „курыным крокам" пашоў, а там і іншыя. Там у момант левы флянг затупацеў, зашушукаў.

— Левы флянг, ай-яй, на-гу, таварышы. на-гу, ну куды-ж гэта варта. — Іван Гарасімавіч зморшчыўся, ад чаго твар яго і ўся міна, якія і так заўсёды дваіліся, зараз так выдаліся на паверх, што ажно прыціснулі долу і да гэтага крышку згорбленую постаць камандзіра Сілкіна.

Іван Гарасімавіч—двайны чалавек. Яго погляд, яго рухі, увесь ён дваіцца. Надворна—ён з намі, тут-на полі, вучыць, падае команды, раіць, як хутчэй навучыцца зьвяртацца да камандзінага складу, рапарт як аддаваць, лепш паварачвацца. Ён нават раіць:

— Вы, хлопцы, не саромцеся, а ў вольны час шматок парапартуйце дрэву, слупу якому, або адзін аднаму і навучыцеся.

Але ўсё гэта ня тое. І як Сілкін ні змагаецца, усё роўна ціснуцца напаверх цені другога, захаванага глыбока ўнутры, чалавека. Цені ўсё большаюць ды большаюць, шчыльна абымаючы Івана Гарасімавіча. Душна робіцца камандзіру Сілкіну. І Іван Гарасімавіч расплікае каўнер.

— Аць, два,—камандуе камандзір Сілкін.

А ў гэты час Іван Гарасімавіч успамінае дом, жонку. Вось яна Мар'я Маркаўна, каля яго, мерна дыхаючы, соладка сьпіць. Ужо відна. Па вуліцы загрукацеў рамізьнік. Пачуўся званок трамваю... Коўдра Мар'і Маркаўны крышку спаўзла, адчыніўшы для пажывы мух правае сьцягно. Іван Гарасімавіч вынуў з-пад коўдры руку і... камандзір Сілкін зірнуў на руку, якая павісла

ў паветры. Нейкі момант ён думаў, а потым хуценька сунуў яе ў кішэнь і, дастаўшы насатку, выцер.

— Аць, два, левай,—зноў падае команду Сілкін.

А ў Івана Гарасімавіча ўзьнікаюць новыя ўспаміны. Полк застанавіўся каля Дрысы... Водаль, адліваючы зёнае сьвятло, цячэ Заходняя Дзьвіна, на тым баку якой белапольская армія.

Вось ужо сьцямнела. Месяцу яшчэ няма. Ён ўзыйдзе каля поўначы.

— Сілкін,—гукнуў комрот.

— Я, тав....

— Да компалка.

— Загадана ісьці да...

— Ну, ідзеце хутчэй...

— Ёсьць.

Праз паўгадзіны Сілкін ішоў у выведку.

— Аць, два, левай, левай,—камандуе Сілкін.

„І навошта ганяюць гэтак хлопцаў, ці то-ж з іх будуць камандзіры? Дзе там... Ім бы толькі ўнівэрсытэты скончыць...“ Зноў паўстае мінулае, і ад таго, што мінула яно, ад таго, што ня вернецца зноў, робіцца Івану Гарасімавічу і шкода і крыўдна.

Сілкін ідзе ў выведку.

Ледзь гойдаецца вадзяная роўнадзь Дзьвіны. Ціха плюскае аб падмытыя берагі вада. Сілкін, тады яшчэ не камандзір, з асьцярогай апусьціўся ў ваду. Вось і бераг. Вунь непадалёк стаіць польскі вартавы... Пра што ён думае? Мо' ў яго маці памерла? Мо жонка да пана спаць пашла. Хадзілі-ж калісь бабы нашага фальварку спаць да пана Запольскага... Мусіць, каб ён мяне ўбачыў, адразу забіў-бы. Дармо, што такі мужык, як і я. Дармо, а за паноў стаіць... Пабачыма, як ты ў мяне зараз канеш.

* * *

... Сілкіну дзякаваў камандзір палка. Сілкіну ціснуў руку комісар. Радасьць, непамерная вялікая радасьць абымала Сілкіна. І Іван Гарасімавіч дужа шкадаваў, чаму гэтаён ня кінуўся на тых дзесяць белапольскіх салдат, якія беглі за ім? Чаму ён зьняў толькі аднаго вартавога, а ня болей? Ён гатовы быў у гэты час на ўсё. На ўсё, нічога не шкадуючы, ні на вошта не зважаючы. А калі камандзір палка сказаў, што ён напіша рапарт аб узнагародзе Сілкіна ордэнам Чырвонага Сьцягу, Іван Гарасімавіч ледзьве быў ня скочыў... але зьлева зашчабяталі кулямёты.

— Пачалося,—вырвалася ў некага, і раптам нешта грымнула і разам з слупам сыпучай зямлі ўзьняло ды раскідала па ўсім полі і камандзіра, і комісара, і ўсіх хто стаяў. Куды што, куды каго. А Сілкіна, які стаяў крышку воддаль, засыпала, замуравала сырой, цяжкай зямлёй.

У шпіталі Іван Гарасімавіч часта ўспамінаў компалка і словы пра ордэн. Горка і крыўдна было тады на сэрцы, і рука міжвольна, як і цяпер, апускалася на левы бок грудзей—вось тут ён вісеў-бы—мільганула ў думках.

— Аць, два, левай,— нібы спудзіўшыся сваіх думак, праказаў Сілкін. У страі зашоркалі, мяняючы нагу. Скаланула Івана Гарасімавіча, пот цурком пакаціўся з ілба.

— Ат, чорт, нейкія мышы заскраблі ўнутры... Чаго-б гэта ім... Тав. Баранаў... памкомразьдзела адзін,—з голасам поўным жалю гукнуў камандзір Сілкін.

— Памкомразьдзел.

І не пасьпела яшчэ змоўкнуць рэха, як Баранаў прыняў на сябе команду, а Іван Гарасімавіч, згорбіўшыся, нейкай разьбітаю ходкаю накіраваўся ўздоўж крывулек вузкай сьцяжынкі.

IV.

— Што такое дысцыпліна,—запытаўся політкіраўнік.

— Хоць-бы ня мне адказваць,—падумаў Давідка.

Момант нейкі цішыня. І за гэты момант шэрыя вялізныя вочы кіраўніка прашчупаюць кожнага. Ах, які ў яго калючы погляд. Можа ад таго што носіць ён акуляры, можа

таму і здаецца, што калі глядзіць ён на нас, дык унутрана гіронічна кпіць над намі, над нашай паволь насьцю. Сапраўды яму сьмешна. Сьмешна таму, што мы—студэнты ды такіх простых пытаньняў ня ведаем. Ён ківае галавой, дзівіцца. А нам ажно ў пяты коле. І кожны думае, кожны, нават Шустар, гатовы ўшчыпнуць сябе моцна-моцна за тое, што не паглядзеў у дысцыплінарны статут.

— Дысцыпліна гэта падпарадкаваньне правілам, якія ўстаноўлены статутамі і законамі і падтрымліваюцца загадамі і распараджэньнямі каманднага складу,—тлумачыць політкіраўнік.

— Дык і я-ж так думаў,—выцягваючы галаву з-за Брукаша, мяркуе Шацкі.

— Правільна,—шэпча сабе пад нос Элентух.—Ён выклаў маю думку. І чаму гэта я не адказаў. І самому зрабілася ніштавата, сорам нават пыхнуў на шчоках...

— Ну, скажам, што там такога, калі я на полі гадзіне шапку зьняў. Ну мне пажадалася, то я зьняў. А ён давай з гэтага мораль выводзіць... Не, брат, гэта не работа. Пакуль Голуб у думках скардзіўся на політкіраўніка, які ўчора зрабіў Голубу заўвагу, Дудніцкі, перасунуўшыся за сасонку, пасьпеў ужо разуцца. Бліснуўшы на сонцы, акуляры політкіраўніка павярнуліся да дрэва. Кіраўнік усьміхнуўся, зноў абвёў усіх поглядам. Скончыў сказ і неяк раптам, так нечакана скамандаваў:

— Устаць, нейкі момант усе спыніліся ў нярухомасьці і ўжо толькі потым, нязграбна, хто як, папраўлялі вопратку.

— Дрэнна ўстаеце, больш жвавасьці трэба... Пяць крокаў назад, арш!

Усе пашлі, а калі спыніліся, то ўзрыд сьмеху ахапіў разьдзел. Каля сасны з аднэй нагой босай, а другой у халяве боту стаяў Дудніцкі. Штаны аб'ехалі і шапка на баку. Невялічкі, тоўсты. А на твары ў яго было разьліта нібы малако. Ад таго і шчокі ў зморшчкі пабраліся, ён быў дужа сьмешны. Але ў ім было і нешта такое, што прымусіла кожнага падумаць і пра сябе. Мы ўсе стаялі нібыта перад люстэркам і рагаталі з сваёй немаччы. Гэтае ўяўленьне надышло не адразу. А надыходзіла хутка, і ўціхаючы рогат быў гэтаму сьведкам.

— Па мясцох,... сядай!

І зноў пацягнулася гутарка пра тое, што трэба рабіць політкіраўніку перад тым, як падзел павінен ісьці на позыцыю, якія яго задачы.

— Ну што-б вы рабілі, калі-б ведалі, што командзір мяркуе весьці часьць праз вёску Гарбачы. А з гэтай вёскі ў вас скажам дваццаць чырвонаармейцаў... Адкажэце вы, тав. Бараноўскі.

— Я-б сказаў командзіру, што вёску гэтую варта абыйсьці.

— Чаму?

— А таму што розныя недарэчнасьці могуць быць. Выбягуць суседзі, сваякі, родныя ўбачаць сваіх, павітацца захочуць.

— Можна не дазволіць.

— А гэта ня выхад. Ня пусьціш, помсту і злосьць часам уздымеш сярод чырвонаармейцаў. А дазволіш, таксама ня выхад. Можа і да п'янкі дакаціцца сустрэча з сваякамі... Лепш за ўсё абыйсьці гэтую вёску.

— Тав. Галеціч, а калі ўсё-ж і на гэтыя правільныя вашыя прычыны, якія выставіў Бараноўскі, командзір дасьць загад ісьці праз Гарбачы, што вы будзеце рабіць?

— Зраблю ўсё неабходнае для выкананьня загаду командзіра.

— Правільна, таварышы, лепш за ўсё абыйсьці гэтую вёску. Бо такія чырвонаармейцы, як Дудніцкі, вам дадуцца ў знакі. Калі ён сёньня знайшоў прычыну пераабуцца ў час заняткаў, дык у сваёй вёсцы ён выставіць гэтых прычын дзесяць.

Дудніцкі сядзеў ды толькі вачыма лыпаў. Можа і здалося, але ён ахвотна заплакаў-бы.

* * *

Басалыгу „прабралі“ ў газэце. ...жа ён таму і хмурыцца на Міха...та, што падазронасьць мае. А ...ым часам курыць хочацца. Не ...прасіш, ніхто сам ня дасьць. Чорт“ як не зразумець, што хо...цца курыць... А дзе гэты Міхалат ...тунь бярэ... А-а, жонка яму дасы...е, у колгасе даюць... Не, брат, ...т нейкая недарэчнасьць. У кол...зсе тутунь даюць сваячасова, а ...ам ужо другую дэкаду няма... ...іхалат, ён усё-ж свой хлопец... ...е во я яму сёньня нос даў. Ён ...брат, соцумовы ня выканаў, а я ...ыканаў, брат, дваццаць тры, а ён ...инаццаць.

— Міхалат, дай кіну за цябе.

— Няма тут чаго... скруці лепш ...евялічкую.

І ўжо пакурыўшы, Басалыга пера...даў думкі, нібы клумкі, забытыя ...ейкім падарожнікам. І былі сярод ...тых клумкаў розныя—важкія і ...ёгкія, невялічкія і сярэднія. Але ...ылі і такія, што „гумном“ назваць ...жна. Вось калі забіраўся ў гэтае „гумно“ сваіх думак Хведар Баса...ыга, то часам так блытаўся ў іх, ...то і выйсьця не находзіў.

Хоць-бы і зараз. Ну, як выра...ыць: яна не жадае, а Басалыгу ...жа хочацца ў загс. Сьмялей-бы, ...зды нечага абыходзіўся з ёй. І ...яму яна не жадае. Скажам, мне ...ык штодня карціць. А ей? Чорт, ...е разумею гэтых дзяўчат.

І Хведар так залунаў, што ня ...рыкмеціў, як „вораг“, абышоўшы ...боку, захапіў яго—вартавога ў ...лон. І калі Басалыгу вялі да на...альніка заставы ён праказаў:

— Вось табе і выканаў соцумову. ...ачна быць мне зноў у газэце.

А першы раз Басалыга зусім за ...простую рэч папаўся на пяро ваен...кора.

Фарсыравалі Сьвіслач. Выцягнуў...ыся ў адну колёнку, рота пера...одзіла кладку. Адзін чырвонаар...меец гэтак ступнуў на кладку, што тая аж у ваду схавалася. Заўважыўшы гэта, камандзір праказаў:

— На кладку ступаць лёгка.

І пакацілася гэта эстафэтай па роце. Дайшло і да Басалыгі. І Хведар не пачуўшы, што перадаваў сусед, выкрыкнуў словы, якія да, несьліся да яго здалёк;

З кладкі ўпасьці лёгка.

І паляцелі словы, выклікаючы непаразуменьне, а ў некаторых спуд. На левым флянгу яны ўзьнялі перапалох. І нават пасьля таго, калі перапалох быў уняты, шмат хто, трасучыся, ступаў на кладку. Шмат каму бель заслала шчокі.

* * *

Шэптам, спалохана ненадзейнай трывожнасьцю пракацілася ў начной цішы адно толькі слова:

— Тры-во-га.

Вылецела слова, пачуўся замі...раючы сыгнальны голас. Узьнялося некалькі спалоханых галак. І ўсё. Толькі часам, зьнячэўку, пачуецца лязг замка. Тады камрот здрыганецца, скрывіць твар і ціха нібыта сабе скажа:

— Калі гэта мы навучымся... І хто гэта там цісьне цынгель. Пад нагамі дзірван травой заняўся. Таму і ня чутно хады роты. Непадалёк ідуць іншыя роты, але калі-б іх ня бачыў, не пачуў бы руху іхняга, ціхага, асьцярожнага. Раптам нясьмелыя і нейкія тужліва-жалобныя звоны павісьлі ў ночы.

— Га-а-а-з.

Куляй праляцела слова. Момант. Шорканьне, ціхі стук і зноў той самы мерна трывожны, але цьвёрда ўпэўнены рух.

А звоны калышуцца ў ночы. Ракеты, ўзьняўшыся адна за аднэй і рассыпаўшы іскры па сіні, селі між густога яловага гольля. Рота набліжалася да выходнага становішча.

... Покуль ішла рэкагнасцыроўка мясцовасьці, рота, захаваўшыся ў кусты лагчыны, чакала першай у ночы сутычкі з „ворагам“.

Бой ноччу—гэта ня бой днём. Начная сутычка мае свае асаблівасьці, свае законы. Вось чаму кожны з малодшых камандзіраў „накачвае“ сваіх байцоў. Кожны імкнецца не прапусьціць ніводнае дробязі. Цалюткі дзень зудзілі. Мала, ото і цяпер навучаюць.

Сідарук, адвёўшы пад разьвіслы дуб сваё аддзяленьне, „шчупае“ хлопцаў.

— Правільна, Міхалат, —кажа. Як толькі ракета, дык на месцы замры, ні духу, ні руху,—камень і ўсё... А што, Мяльніцкі, калі ўбачыш ворага і табе ў гэты момант кашляцуць прысьпічыць, а вораг, брат, непадалёк пачуць можа?

— То я ў рукаў кашляну.

— То-ж ты калі завернеш галаву, каб кашляцуць у рукаў, ворага з вачэй спусьціш, ён брат смаргане ў бок, а тым лепш для яго, калі блізка будзе якая ахова.

— Мабыць і па-вашаму, толькі ня можа ён так хутка захавацца ад майго назіраньня.

— Ай можа, ды яшчэ як, маланкай, браце, спаліць... Кашляць трэба ня ў рукаў, гэта, браце, гіблая справа, а захацеў кашляцуць, то хуценька палец у рот. І амінь. Няхай сабе кохлік і то не кашлянеш.

За кустом, што гольлем упіраўся ў дуб, гутарылі між сабой Сушка з Сівіцкім.

— Разумееш,—казаў Сушка,—я за супроцьгаз, а гэта неадчэпная думка ў галаву. Ну, разумееш, праз якіх дваццаць дзён мы з табой зноў у горадзе. Зноў вучоба, формулы. А ўвечары дзеці, жонка. Дармо, што яна ў мяне працуе. Але кабеціна рухавая. Ну вось разумееш, такая як і сёньня ноч добрая, цёплая. Ляглі гэта мы спаць, дзеці паснулі ды і мы, перакаціўшыся які раз, то-ж сьпім... І раптам, разумееш, трывога. Я на нагах, жонка на нагах, а дзеці сьпяць. У мяне ёсьць супроцьгаз, у жонкі ёсьць супроцьгаз, а ў дзяцей няма. Мне трэба бегчы ў інстытут, жонцы трэба бегчы на фабрыку, а што рабіць з дзяцьмі? Куды іх дзець? Удзень то яны на пляцоўцы, а ў ночы што-ж рабіць з імі, у ночы ды яшчэ ў час трывогі? Вось над гэтым я, разумееш, і думаю. Ды ці толькі адзін я. Мо сотні, тысячы бацькоў і маці носяць у сабе гэтую думку.

— Я хоць і ня думаў пра гэта раней, але цалкам згодзен з табой. Толькі вырашыць яго ня так лёгка. Здаецца, што вырашыць гэтае пытаньне...

— Соцыялізм... Ведаю, гэта ты хацеў сказаць, ты ўсё згодзен яму на плечы ўзваліць. Але ты вось будзь ласкаў, скажы, ці нельга зараз нешта зрабіць.

— Памяркуй. Можа ты проекцыю якую і ўнясеш. Тады за цябе ўсе маткі будуць богу маліцца, а газэты тваю фізію надрукуюць.

— Ты, Сівіцкі, не жартуй. Я гэта, брат, усур'ёз. А вось, што тычыцца газэты, то ты можа і правы. Мабыць ім і варта было-б каторай узьняць гэтае пытаньне.

Вецер ціха прайшоўся па-над галовамі. Дзесьці за трасьцянцом грымнуў гарматны стрэл, а па верхавінах лесу, што цямнеў воддаль, месяц пачаў карабкацца, і таму было добра відаць, як нехта паўз мяжы поўз у напрамку акопаў. Значыць хутка бой.

Першы бой у ночы.

(*канец будзе*)

КРАІНА ПАВІННА ВЕДАЦЬ СВАІХ ГЭРОЯЎ

Янка Скрыган

Дарога чалавека [1])

I.

Шырокім рыўком адчыніліся дзьверы, і ў канторку зборачнага цэху нэрвова ўскочыў высокі, танклявы чалавек. Тым-жа самым нэрвовым рыўком ён зачыніў дзьверы, прыглушыўшы гуд мацераў выпрабавальнае станцыі, што густа былі ўварваліся разам з чалавекам. Зачыніўшы дзьверы, чалавек накрыцку суняўся і выцягнутаю наперад галавою абвёў канторку. На худым яго твары вочы забегалі горача, рыўкамі, таксама як рыўкамі ўздрыгвалі губы, гарэлі шчокі, як увесь ён сам—на высокіх танклявых нагах, з высокімі вострымі плячыма, з доўгаю шыяю, прыгнуты, наспружынены—быў рыўком.

Абвёўшы канторку, чалавек суняўся на рагавым століку і шырокаю буславатаю хадою пайшоў на яго.

— Таварыш Санаторскі, вы ведаеце, што робіцца ў цэсе?—апускаючыся на крэсла, раптам агалушыў чалавек начальніка цэху.

Санаторскі падымае галаву ад раскладзенага рысунку, і на рысунак пальцы кладуць нажавую падкладку—ён зьвяраў падкладку з рысункам.

— А што такое, таварыш Белабжэцкі?

— А тое самае, што і ўчора і заўчора, і тыдзень, і месяц таму назад. Прарыў.

Санаторскі глядзіць на Белабжэцкага, і яму неяк нязручна. Ён яшчэ нават добра не разумее Белабжэцкага. Ускочыў як на пажар, а гэта адчыняе Амэрыку.

— Вы гаварэце толкам, тав. Белабжэцкі.

— Вось я толкам і гавару. Я пытаюся, ці ведаеце вы, як начальнік, што робіцца ў цэсе?

— Я-ж толькі што прышоў, пробуе апраўдацца Санаторскі'—і наогул, вы-ж самі ведаеце, што я рэдка бываю...

— Вось пра гэта я і прышоў гаварыць У цэсе прарыў. Не хапае дэталяй З трыццацёх прысланых рам дванаццаць адпраўлена назад. Бакавіны не прасьвідрованы. Шасьцёркі запораны. Кранштэйны з косымі пальцамі. А вы ведаеце, што гэтак і ўчора, і заўчора і штодня?

У Санаторскага чыста выбрыты, худаваты, доўгі, але друзлы твар, і на твары пачынае тузацца шчака Шэрыя крыху пудкія вочы падаюць на стол і пачынаюць нечага шукаць. Нажавая падкладка. Пальцы бяруць і адсоўваюць падкладку далей, а пасьля пальцам няма чаго рабіць, і яны кіпцямі ўядаюцца адзін у адзін.

---

[1]) З нарысаў пра Гомсельмаш. Пачатак—„Маладняк" № 10.

— Дык у чым рэч, таварыш Белабжэцкі? То тут-жа вінаваты мэханічны...

Рэч у тым, што няма гаспадара. Белабжэцкі налягае грудзямі на стол, шырока за край бяручыся рукамі, і ўпіраецца вачыма ў Санаторскага. Санаторскі падымае голаў, глядзіць на Белабжэцкага і ўпяршыню заўважае, да чаго Белабжэцкі кашчавы.

Вострымі краямі вытыркаюць паднятыя плечы. На тонкай шыі галава выцягнута наперад, і, можа, ад этага на твары так вытыркаюць сківіцы, і так цьвёрда напіраюць яго гарачыя, мулкія ад худобы вочы Нават насупленыя бровы ня могуць пераняць гэтага распаленага бляску. Рэч у тым, што няма гаспадара... Так, вінаваты мэханічны. Але вы калі-небудзь былі ў мэханічным, каб дамовіцца, каб перасьцерагчы? Можа ў мэханічным няма рабочае сілы, і нам трэба памагчы перакінуць сваіх? А ў нас зрыў. У нас тузаніна, недахваткі, гарачка, і вы ня ведаеце, чым жыве цэх. Вы ня ведаеце, як працуюць брыгады, чым яны жывуць і якавы сёньня стан цэху. А вы павінны былі-б ведаць і адказваць за гэта, як начальнік. Хто адказвае, што брыгады раскіданы, дэмаралізаваны непаладкамі, пракурваюць дзень за варотамі, што ў брыгадах растуць прагульнікі? Вось табельніца дала пілюлю: Зыскін ня прыходзіць на работу дванаццаць дзён, Грыцькоў дзесяць, Барэйша—дзесяць, Балдаценка — восем, Багданаў — сем. А колькі чалавек—па два, па тры? Гэта нармальна? У цэсе няма гаспадара, няма дысцыпліны, няма арганізованасьці, няма адказнасьці за яго. Вы нават ні разу не пацікавіліся, не запыталіся ў мяне, што сёньня ў цэсе, як выканана заданьне, што перашкаджае. І я жыву нейкім самацёкам, без ніякага кіраўніцтва, без ніякага кантролю. Гэта нармальна? Гэта нармальна, што я пускаю Каганаву брыгаду да хаты і вы нават ня ведаеце, чаму я не пускаю?

У Санаторскага зноў ня ведаюць дзе дзецца пальцы. Яны нэрвова скубуць дошку стала, а пасьля падымаюцца і ўпіваюцца ў губу. Губа тузаецца, вырываецца, пальцы зноў ловяць яе, мнуць, жмакаюць і да таго ўядаюцца, што, здаецца, хочуць пракусіць яе.

— Так, гэта ненармальна... Але я не магу быць у цэсе, таварыш Белабжэцкі, фізычна не магу. Заружаны. Ведаю сам, што ня добра, а—загружаны... Вось мае пасады: начальнік зборачнага цэху—раз, намесьнік загадчыка вытворчасьці—два, інжэнер па падрыхтоўцы новых машын—тры, інжэнер тэхнічнага аддзелу—чатыры. Цяпер вы бачыце, што мне цяжка ўсюды бываць, усюды ўсё ведаць.

Белабажэцкі выпушчае стол. Рукі зьбягаюцца, сьціскаюцца ў пальцах, і ён доўга думае. Пасьля ён гаворыць, і голасам такім, у якім перагарэла злосьць.

Але ў цэсе трэба бываць хоць-бы ў вызначаныя гадзіны, каб я знаў—каб цэх знаў—то над ім ёсьць кіраўніцтва і кантроль. Другое, я хачу, каб вы ў мяне пыталіся, каб цікавіліся, як ідзе выкананьне пляну, каб патрабавалі з мяне, каб вы ведалі, як і чым жыве цэх—стварыўшы адказнасьць кожнага за сваю справу. І трэцяе, я хачу ведаць пра свае абавязкі і права майстра цэху. Катора пара, як я майстра, а я ня ведаю, чым я магу распараджацца, што ўваходзіць у межы маіх абавязкаў, і якія мае адміністрацыйныя функцыі. Я хачу ведаць як, у якой ступені я магу распараджацца хоць-бы з тымі прагульнікамі, якія сёньня прыходзяць у цэх і бузяць. Вытворчасьць гэта-ж машына, у якой павінна быць найвялікшая дакладнасьць і дысцыпліна. А я ня ведаю, што я маю, права рабіць.

Санаторскі зноў скубе губу і гаворыць голасам ціхім, ужо спакойным, але такім, у якім была трывога: „Вядома, гэта ня добра. Але інструкцыі дае ня ён, а заводакіраўніцтва. Ладна. Ён перадасьць, у заводакіраўніцтве яны недзе ляжаць надрукаваныя. Трэба дысцыпліна і дакладнасьць—пэўна. Але ён ня можа бываць ў цэсе, фізычна ня можа, бо ў яго чатыры пасады і ўсюды хоць разарвіся. Што рабіць? Але добра: з сёньняшняга дня ён будзе на вытворчасьці заўсёды пару гадзін. Ад гадзіны да трох. Добра? Ну вось. І навошта-ж крычаць, калі тут і так галава трашчыць. Мэханічны? Дэталі? Тузаніна ў брыгадах? Зрывы? Але-ж тут трэба рабіць нешта такое, што павінна пераіначыць усю сыстэму. Вось у яго нажавая падкладка. Яна няправільная. На цэлых чатыры мілімэтры таўсьцейшая пятка. Ідзе ад канструкцыі, ад мадэлі. І тут непаладкі не ад цэхавае ўстойлівасьці, а недзе глыбей, у самой арганізацыі вытворчасьці...

Санаторскі супакойвае Белабжэцкага цэлаю сыстэмаю поглядаў, тлумачэньняў, фактаў, але Белабжэцкі ўжо ня слухае Санаторскага. Нехта ўвайшоў у канторку і па голасе мататораў выпрабавальнае станцыі, што ўварваліся праз адчыненыя дзьверы разам з чалавекам, Белабжэцкі пазнае, што цэнтрабежная сіла матору зьменшана, што паток парваны, што паток не падае машын.

Заела. Гэта яшчэ ўчарашняя адрыжка. Запараныя бакавіны. Даводзіцца падрэзваць дзіркі—класьці дубальтовы час. Падгонка тармозіць, паток разрываецца, выпрабавальная станцыя ня мае машын, і маторы пачынаюць 'сьціхаць.

Санаторскі яшчэ ўсё нешта гаворыць, але Белабжэцкі ўжо ўстаў і ідзе ў цэх. Яго буславатая хада напырыстая, і ззаду па тонкай шыі на кожным кроку напінаюцца дзьвжылы. е

Зборачны цэх цягнецца доўгаю шырокаю заляю. Ён канчаецца тут, каля канторкі, упіраючыся ў выпрабавальную станцыю, а пачатак ідзе з далёкага канца—ад мэханічнага, ад першае брыгады ўстаноўкі і шаброўкі падшыпнікаў. Паток зборкі сіласарэзак цягнецца праз увесь цэх, падаючыся пад выпрабавальную станцыю. Але паток застраў у другой брыгадзе. Брыгада не даатрымала дэталяй. Брыгада атрымала дэталі няправільныя і цяпер засела на падгонцы.

Мінаючы варштаты, абыходзячы няскончаныя машыны, прагалінамі парваным патокам, Белабжэцкі ідзе ў другую брыгаду. Брыгадзір Лейкін, нагнуўшыся над рамаю, сам аглядае брак: штангелем вымервае ступень недакладнасьці. Дзіркі з боку Бакавіны не прыпадаюць. І ўсёжтакі лепшых няма, ня выкінеш—трэба падпільваць.

— Падпільваць!—гаворыць ён да рабочага.

Напільнік зашоргаў, і Лейкін ужо ідзе на другі працэс: там таксама не прыпадаюць грабёнкі. На хаду яго наганяе Белабжэцкі. На моцны ўдар па плячы Лейкін азіраецца.

— Ну, што?

— А вось, бачыш, кешкаемся. Сёньня нейкі вар'яцкі дзень. Забіраеш з-пад рук у мэханічнага, і ўсёроўна—няма. А не—спрэс брак. Вось, бач, селі, — і Лейкін паказвае на брыгаду, на няроўны шар патоку, на стук, шоргат, тузаніну заедзеных працэсаў.

— Трэба падагнаць, кажа Белабжэцкі,— трэба здохнуць, а выпрастаць лінію—стачыць паток! Дзе Каган?

Ён шукае вачыма Кагана там, дзе павінна быць яго брыгада, але паток каганавае брыгады пусты, застыў, і людзі, скарыстоўваючыя прастой, вышлі курыць.

— А вунь далі партыю тоўстых вальцаў, трэба ператочваць,—кажа

Лейкін і ідзе на працэс, дзе рабочы марудзіць, падбіраючы шасьцёркі.

Каган паказваецца на канцы цэху каля выпрабавальнае станцыі. Белабжэцкі кліча яго махам рукі, і гэтую-ж руку перабівае рабочы.

— Таварыш Белабжэцкі, няма балтоў,—на зашмальцованай далоні ён трымае болт і паказвае.—Дал] вось якіх, а яны зусім кароткія. Дзе ўзяць балтоў?

— Найдзеце з старых, з браку хоць крыху. Пратрымайцеся пакуль дамо. Балты зараз будуць... Тав. Каган,—ён ужо гаворыць да чалавека з тонкім энэргічным тварам—да брыгадзіра апошняе брыгады на патоку зборкі сіласарэзак.

— Таварыш Каган, брыгаду пакінуць. Пяцёх чалавек давай Лейкіну на падгонку дэталяй. Трох стаў на ручныя плашкі—нарэзваць балты. Трох у мэханічны—няхай буксуюць, няхай падцягваюць, няхай, калі трэба, точаць самі! Рэшту на свой працэс. Стачыць паток! Выцягнуць, хоць тое, што можна.

— З канторкі выходзіць Санаторскі. Выбрыты друзлы, твар яго ў цэсе здаецца блядым, і на хаду ён нешта гаворыць памочніку майстра, Сімховічу. Сімховіч пацiскае плячыма, відаць не разумее, ці не згаджаецца, а пасьля махае рукою і ідзе на паток. У цэсе перабіўчаты стук, звон, шоргат, скрыгат жалеза. Людзі, прыгнуўшыся, пільна стаяць на сваіх процэсах. На патоку стаіць Белабжэцкі і яшчэ нешта думае. Ён правярае, ці добра аддаў, загад, ці правільна расставіў сілу. Думку перабівае Сімховіч. Сімховічу ён перадае загад, а сам—буксаваць, падцягваць, сварыцца—ідзе ў мэханічны.

II

Яго можна ўявіць у рабочым зашмальцованым гарнітуры, у шкураной тужурцы, у плашчы, ці ў палітоне—але заўсёды гэта будзе высокі танклявы чалавек з вострымі плячыма, з худым тварам і можа ад худобы, ад вострасьці плеч крыху прыгорбленым. І ён заўсёды будзе ў цэсе, у дюдзях, на патоку зборкі сіласарэзак, паяўляючыся то тут, то там, пільна прыслухоўваючыся да пульсу патоку; вачыма слыхам, чуцьцём правяраючы цэх.

На зборцы пульс залежыць ад мэханічнага. Мэханічны часта зрывае дэталі і, трэба пільна сачыць каб змагчы папярэдзіць, уладзіць непаладкі, стачыць канцы, знайсьці выйсьце. І гэты чалавек заўсёды ў русе, заўсёды ў цэсе, на заводзе, заўсёды ў рабоце, у дэталях, у думах—у бегатні. То ён перш відзен каля выпрабавальнае станцыі, поркаючыся правяраючы закончаную машыну, то раптам ён ужо ў мэханічным спрачаецца з начальнікам цэху з Дрыцам, бо трэба прысьпешыць абробку дэталяй. І зноў ужо на зборцы, у людзях, у патоку, на працэсах работы, з рабочымі. Вось ён прыгнуўся над рамаю, бо рабочы паклікаў праверыць дакладнасьць прыпушчаных дэталяй. Вось ён выпрастаўся і ідзе пад варштат, дзе Яфімаў зьбірае кранштэйн. Кранштэйны з дэфэктамі—ці ня кораткі будуць пальцы? У яго ўжо ў руках штангель, і галава нагінаецца праверыць мілімэтры... Падыходзяць другія, або клічуць махам рукі у іх на іхным працэсе, таксама затрымка або недакладнасьць...

Патрэбна сыстэма. Патрэбна дакладная сыстэма, такая, каб цэх быў з нармальным пульсам, каб паток зборкі машын ішоў бесперабойна, матэматычна дакладна гатовымі машынамі да выпрабавальнае станцыі. Але завод яшчэ новы На заводзе багата непаладкаў, зрываў, няўсталяванасьці. У гарачцы пуску заводу дапусьцілі багата недакладнасьцяй у рысунках, у канструкцыях, у дэталях. І цяпер, калі завод пачаў расьці—муляцца пачалі шурпатасьці штодзённымі перабо-

[illegible], зрывамі, недавыкананьнем заданьня. А зборка павінна ісьці патокам бесперабойнае падачы мас[illegible]ын пад выпрабавальную станцыю.

Але дзень заўсёды трывожны. На зборцы, на патоку прарывы. Графік выкананьня заданьня нэрвова хістаецца, тузаецца ломанаю лініяю, як тузаецца ўвесь цэх. Непаладкі. Мэханічны даў бракоўныя дэталі... Мэханічны падачу дэталяй затарказіў... Лёгка-кацельны не зрабіў патрубкаў... Кавальскі ня даў восяй, шайб... У брыгадах на зборцы туманіна. У брыгадах парушана сыстэма патоку—заела! Графік выкананьня хістаецца—падае ўніз.

І Белабжэцкі зноў у цэсе, між людзей, між патоку, аддаючы апэрацыйную каманду.

Але-ж гэта ня ўсё—думае Белабжэцкі, калі паток зноў наладжваецца,—гэта ня ўсё і не заўсёды кыць сілаю пераключкі. Дэталі заядаюць штодня, штогадзіны. Графік выкананьня бярэцца нэрвамі. Вінаваты мэханічны? Так, але вінавата і сыстэма апэрацыйнага кіраўніцтва ўсяго заводу. Прывычная старасьвецкая пазольнасьць і наплюйства. Мы гаворым, што зборка можа ня толькі выканаць, але і перавыканаць прамфінплян і ўсё-ж такі: дзённыя заданьні замест трыццацёх сіласарэзак васемнаццаць, дваццаць. Значыць ёсьць няўвязкі. Хіба нармальна, што брыгада зборкі дыскаў—сорак чалавек—не дае больш дзевятнаццацёх дыскаў за зьмену? Значыць ёсьць лішнія людзі Значыць прападаюць рабочыя гадзіны. Мы крычымо, што зборка ўся ў парадку, а хіба гэта ня гультайства? А лодыры і прагульнікі? А тое, што багата яшчэ хто любіць увесь дзень пракурыць за варотамі і, як правіла, стаць на работу толькі згадзіўшы чвэртку гадзіны пасьля гудка? Сіла стаіць не рацыянальна: Сіла без дысцыпліны, без дакладнасьці заводзкага мэханізму. Гэта хворая сыстэма, гэта адсутнічае апэрацыйнае кіраўніцтва, дысцыпліна, каманда. Трэба новыя мэтады, трэба індывідуальная адказнасьць кожнага за свой працэс за норму...

У думах, у напружанай рабоце мысьлі Белабжэцкі ідзе да Санаторскага, каб начальнік падаў каманду. Але столік начальніка цэху пусты.

III.

Але ўсё-такі трэба зрабіць. І трэба пачаць менавіта са зборкі, за свайго цэху—удакладніць, падчысьціць, паставіць на месца людзей. Трэба пановаму расставіць рабочую сілу падвысіць пэрсанальную адказнасьць кожнага. Зборку трэба зрабіць здароваю.

І Белабжэцкі на дварэ, каля кавальскага, наганяе Сімховіча. Сімховіч ціхі, задумлівы і заўсёды з цяжкімі апушчанымі рукамі. Ён падымае свае, таксама апушчаныя, вочы і ўжо хоча нешта сказаць Белабжэцкаму, але Белабжэцкі перабівае яго.

— Дык, давай мы гэта сёньня і зробім.

— Давай.

— Ладна. Тады ты смалі ў цэх, а я да Генкіна. Пагавару зім. Скажы ўсім хлопцам, што зразу пасьля работы. Каб не разыходзіліся. Шырокаму скажы, каб затрымаў усю брыгаду... А ім дамо Лейкіна. Хлопец —во!—выцягне. Смалі!

Вострымі сутулаватымі плячыма Белабжэцкі зьнікае за заводзкаю брамаю, а Сімховіч яшчэ доўга стаіць сярод двара варочаючы ў руках штангель. І толькі тады, калі штангель зьнячэўку ўшчыквае палец, адумляецца і ідзе ў цэх. У цесе ён перадае нешта брыгадзірам, рабочых і, не адрываючыся ад сваіх працэсаў, кіўком галавы яны даюць знаць, што зразумелі, пачулі. Доўга талкуе Сімховіч з Шырокім. Тузаючы ў руках молат, Шырокі спрачаецца, але молат пасьля супакой-

ваецца, упіраецца ў дыску, і Сімховіч адыходзіць, зноў варочаючы ў руках штангель.

Цэхавая сырэна прагула канец рабочага дня. Цэх сьціхае грукатам і ажывае чалавечым рухам. Хаваючы струмант, праходамі, прагалінамі, застыўшым патокам машын—рабочыя сыходзяцца ў дыскавы куток цэху. Брыгада Шырокага абростае натоўпам чорных фігур. Рабочыя гарнітуры робяць людзей шырокімі і блішчаць зашмальцованымі крысамі.

А ты стой, не ўцякай, пасьпееш!—цягне за руку невялікі лахматы чалавек грузнага шырокаўца, што мерыцца выйсьці з цэху.

— Хлопцы, стой! Сур'ёзная рэч, а вы, як мышы!—крычыць нехта з натоўпу і яго рука паказваецца над галовамі.—Таварыш Шырокі, брыгада ўся?

Ўся.

Пачынаем!

Да варштату каля сьцяны—сьпінаю прыпіраецца Белабжэцкі. Галава падаецца наперад. Шкураная шапка блішчыць, зачыняючы казырком твар. Ад матавага бляску запыленых вокан худою сківіцаю вытыркае шчака і слабымі контурамі вырысоўваецца край адтатурчаных губ.

— Гаворка будзе кароткая, у нас—прарыў. Заданьне—дваццаць пяць сіласарэзак. Мы далі сустрэчнае трыццаць, а ня выконваем і дваццацёх. У чым прычына? У нас! Вінаваты мэханічны? Падцягнем—трэба падцягнуць мэханічны, і гэта трэба зрабіць нам. Але гэта пасьля. Цяпер пра зборку. У нас усё ў парадку? Не, у нас—прарыў. І асобныя брыгады, і асобныя рабочыя за завод не хварэюць.

Белабжэцкі на трошку спыняецца і, па казырку шапкі, па ценю на сківіцы відно, што ён аглядае—мацае—натоўп. Зашмальцованыя гарнітуры шчыльней зьбіўшыся наперадзе—назадзе паўрымшчваліся на варштатах, сядзяць на зложаных дысках, на дэталях машын. Вочы цені на шчацэ застылі, зноў пачуўся голас:

— Узяць брыгаду Шырокага. Зборка дыскаў. Сорак чалавек у брыгадзе і даюць толькі дзевятнаццаць дыскаў у зьмену, тады кажа нам трэба трыццаць. Два чалавекі на дыску. Гэта нармальна? Вы кажаце лопаецца—кроккі чыгун. Багата браку. Але брак-жа робім мы? Я сёньня спэцыяльна зрабіў пробу. Дыска нармальнае цьвёрдасьці, і брак гэта—наш. Але будам гаварыць пра брыгаду. Сорак чалавек і дзевятнаццаць дыскаў. Дзе-ж прападае рабочы час? Яго зьядае наплюйства, безадказнасьць, абязьлічка, падзёншчына. Цэх пераходзіць на гаспадарчы разрахунак. Цэх пераходзіць на зьдзельшчыну. А мы жывом тэмпамі чарапахі. Доўга гаварыць ня трэба. Брыгаду трэба паставіць па-новаму.

Белабжэцкі зноў перадыхнуў. На шчацэ заторгаўся мускул. Наперадзе гурт парадзеў—расьсеўся па цэсе на дысках.

— Зрабіць так: брыгаду Шырокага скараціць на палову; падвысіць пэрсанальную адказнасьць кожнага за свой працэс, падняць дысцыпліну, дакладна давесьці да варштату нормы, кожнага прымацаваць на сваю дэталь, зьнішчыць абязьлічку.

— Гэта ня возьме!

— Ня выпаліць!

— Вышэй пупа не падскочыш!—падымаецца з дыскі доўгалыгі шырокавец і глыбока засоўвае руку ў кішэню шырокіх нагавіц.

— А як-жа?

— Ды так, як ёсьць. З прарыву людзей ня здымаюць, а даюць на прарыў. Але-е!

Белабжэцкі адыходзіць ад варштату. Цьмяны бляск сьлізгае па

атыліцы шкураное шапкі. Перабіўшатымі галасамі шыракоўцы заяўляюць протэст. Старшыня цэхкамітэту грукае жалезінаю па варштаце

— Парадак!

— Што парадак?—зноў падымаецца з дыскі курчаваты з выпацканаю шчакою рабочы.—Гэта ня возьме! Ня можам нормы—значыць бяз сілы. Што мы гуляем? Не машыны мы, каб рабіць бяз меры, а робім мы тое, што можам.

— На вуліцу выкінуць хочаш? Пама-алу. Ды гэта і ня страшна. Работы ўсюды—уга.

— Такога прагоняць.

...Сход шуміць перабойнымі галасамі. Гарнітуры шавеляцца, шавеліцца цэх. Шыракаўцам ня хочацца распускаць брыгады, каб страціць дарагую павольнасьць. Старшыня цэхкамітэту кліча да парадку, і ён ужо трымае прамову. На дысках гнілая атмасфэра. Хіба ня з іхнае брыгады на днях цэхкамітэт абгаворваў прагульнікаў? Хіба ня з дыскаў вечна сядзяць ля варот, пракурваючы гадзіны, пакідаючы горы недакуркаў? Прывыклі рабіць з халадком.

— Трэба новыя формы, новыя мэтады,—канчае старшыня, і натоўп зноў гудзе.

Але на шыракаўцаў напор здаровы. Цэх, зборка—рабочыя іншых брыгад зборкі—шыракоўцаў вінавацяць у прарыве. І яны гавораць так, як-бы знаюць брыгаду навылет

— Лодыраў багата ў вас—во.

— Адзін аднаго прыкрываеце!

Белабжэцкі сядзіць на раме ходу; казырок шкураное яго шапкі нагнуты ўніз і па ім відно, што Белабжэцкі глядзіць у зямлю. Ірэнцікам ён варочае па падлозе нажавую падкладку. Такая-ж самая як была ў Санаторскага на стале. На чатыры мілімэтры ў яе вышэйшая пятка. А брыгада кляпала, стаўляла няправільна нажы, і ёй хоць-бы што А пасьля дэфэкт у гатовай машыне—на выпрабавальнай станцыі. Няправільная зборка праходзіць праз увесь паток, каб пасьля даць тормаз. А яны крычаць за сваю чэснасьць...

— Ды ня можна-ж рабіць так!—недзе з кутка з-пад вакна гудзе здаравенны голас.—Прарыў, а вы заліваеце кулі. Дыскі.. А дыскі то што нам падаюць з неба? На зубы трэба браць мэханічны, а мы—скароціце—не дамо і таго, гэта ясна. І сёньня гаварыць пра скарачэньне брыгады, значыць рабіць шкодніцтва.

— Ого!

— Рапартуй, рапартуй!..

Шыракаўцы не здаюцца.

Выступае сэкратар парт'ячэйкі, Сімховіч, Лейкін, комсамольцы выпрабавальнае станцыі, Пракаповіч, Купрыянчык, брыгадзіры брыгад, рабочыя—цэх: сілаю, воляю, рабочаю праўдаю—правам на масавы пралетарскі контроль і правам на сацыялістычную будоўлю. Ясна ўсім: на дысках балота, на дысках прарыў—і прарыў трэба зьнішчыць.

Масавая воля разьбівае шыракаўцаў. Так у іх ёсьць гніль, і пра гэтую гніль гаворыць ужо сам шырокавец. Гаворыць праўдаю рабочага болю за норму, болем змаганьня за графік.

— Так у нас блытаніна,—у матавым бляску шчокі гараць,—ёсьць блытаніна, і трэба разблытаць. Два чалавекі на дыску—грэх. Гэта горш чарапахі.

— Ёсьць у нас грашкі—верна...

Масавая воля разьбівае шыракаўцаў і ў разьбітае палавіны наростае большая злосьць. Здаравены голас з кутка расьце сілаю, яго падтрымліваюць другія, і тады чалавек, адзяліўшыся ад сьцяны, апускае кулак па струмантальнай шафцы.

— Гэтага так ня будзе! Разгром! Гэта не падаруецца!

І, да варштату, дзе прыпёршыся стаяў Белабжэцкі, выходзіць невялікая фігура. Фігура невялікая, але складзістая, і ў хадзе нават нейкая грузнасьць. „Галоўны інжынэр“,— гаворыць нехта з натаўпу. А „галоўны інжынэр“ —сакратар партыйнага калектыву, Генкін, і ня інжынэр ён, а бывалешні токар, мэталіст, які любіць завод, жыве яго пульсам, знае навылет. Ён вечна ў заводзе, у рабочых масах, у парадах; рабочыя яго ведаюць як бацьку заводу, самага блізкага кіраўніка, і за гэта завуць „галоўным інжынэрам“. Але цяпер ніхто ня заўважыў быў Генкіна. Можа ён тут вось стаяў і слухаў, і ніхто яго ня бачыў у гарачцы.

Не дайшоўшы да варштату, Генкін стаў, павярнуўся, і ў кучаравую галаву па прывычцы натрошку ткнулася рука. Невялікаю, але складзістай фігураю ён стаіць неяк шырока.

— Што-ж будам гуляць у жмуркі? Можа возьмам яшчэ мячык ды будам качаць па цэсе? Куды ты хаваеш нож? Ты нож пакажы ўсім!— Генкін галавою глядзіць пад струмантальную шафку. Здаравенная фігура няспрытна неяк згінаецца, як-бы корчыцца, мнучы падол рабочае кашулі.—Вось бачыце. А вы гаворыце, што ўсё добра. За тое, што на дысках гніль, што на дысках прарыў і ў рабоце, і ў людзях—гаворыць сёньняшні сам сход. Я ня чуў ніводнага камуніста. які-б выступіў і чэсна прызнаўся. А прызнавацца ёсьць у чым багата.

І зноў, запускаючы руку ў чупрыну, Генкін гаворыць фактамі, фактамі чалавека, які бачыць брыгаду, цэх, завод—навылет. З фактаў нікуды не выскачыш. Брыгада ня жывая, не паваротлівая—як на панщчыне. Няма зацікаўленасьці ў рабоце, болю за цэх, за норму. Дзе прапановы па раціяналізацыі, зьніжэньне сабекошту, ударніцтва, спаборніцтва? Брыгада загнілася, і яе трэба аздаравіць. Падкулачнікаў кулакоў з нажамі—вытруціць. Бой прагулам, гультайству, неахайнасьці абвясьціць новымі формамі работы. Прапановы Белабжэцкага ажыцьцявіць—праветрыць гнілое месца. Гэтага патрабуе ўвесь цэх.

Шырокаўцам ня добра сябе адчуваць разьбітымі. Так, гэтага патрабуе ўвесь цэх, і вось ён сышоўся, каб сваею сілаю наступіць шырокаўцам на горла. Вунь нехта гаворыць зноў, але ў руках ён ужо трымае ліст пажмаканае, зашмальцованае паперы і—чытае:

— брыгаду скараціць—накінуць дваццаць два чалавекі...

— прымацаваць да процэсаў, зрабіць новыя расцэнкі...

— падняць дысцыпліну, ускласьці пэрсональную адказнасьць...

— лепшых работнікаў даць мэханічнаму цэху...

— выклікаць на спаборніцтва, брыгаду ўзяць на буксір...

— зьняць Шырокага—брыгадзірам паставіць Лейкіна...

І... зноў нехта чытае і ўжо новы ліст—умова соцыялістычнага спаборніцтва.

Праз шырокія вокны запыленых квадраткаў шыб па цэсе плавае матавы бляск. У матавым бляску, на патоку зборкі дыскаў, людзі ажывіліся. Ліст падымаецца над галовамі, чуцён нечы голас „хвоза“, і ўгору пачынаюць падымацца чорныя ад пылу і жалеза рукі. Бляскам між рук, пераходзячы ў натаўпе, адсьвечвае шкураная шапка. Шапка сунімаецца. У натаўпе зноў перабоямі ажываюць галасы, але ўжо такія, як па камандзе „вольна“. З гэтымі-ж галасамі разыходзіцца натаўп, і ўжо ў баку Белабжэцкі прыгінаецца, каб у бакавую кішэньку пакласьці пажманыя лісты паперы. Нехта з разгону шарахае яго ў бок, порстка прабягаючы міма. Шырокімі, ненатуральна згорбленымі плячыма ён ужо

мігнуў у цэхавых варотах, і, гледзячы ўсьлед, Белабжэцкі прыпамінае: грузны граміла, якога за руку цягне на сход невялікі лахматы чалавек; здавенны голас з кутка на спрэчках; ...ож, і нехта няспрытна, мнучы, абцягвае падол рабочае кашулі...

Зборачны цэх адпачывае застыўшым патокам. Праз квадраткі шыб муцьцю на паток наплывае вечар. На далёкім канцы цэху адпужваюць вечар агні начное зьмены мэханічнага.

Мэханічны заліты электрычным бляскам. У бляску палошчуцца трансмісіі, працуюць варштаты, камандзірамі каля варштатаў варушацца людзі, і цэх—у прыгожай сіле матэматычна дакладнага руху.

Белабжэцкі стаіць з майстрам начное зьмены мэханічнага. Яму няма калі ісьці дахаты разам са зборкаю. Трэба застацца тут, каб бачыць самому, ці добра ў мэханічным разьмеркаваны дэталі, ці зроблены будуць дэталі на заўтра—ўмяшацца ў мэханічны патрэбамі зборкі. Танкляваю фігураю ён шворыць між варштатаў, мацае, правярае яшчэ цёплыя дэталі—толькі-б, чэрці, не давалі браку, і—нешта надумаўшы—праз увесь цэх, патокам застыўшае цьмянае зборкі—ідзе на другі далёкі канец. Каля канторкі з ручнымі электралямпамі, таксама ваююць яшчэ за норму пара энтузыястаў камсамольцаў выпрабавальнае станцыі. Ім трэба кончыць яшчэ апошнюю машыну. Недзе ў перадачы дае перабой. І яны асталіся пасьля брыгады, каб паправіць машыну,—хоць-бы на процант выпрастаць графік.

Белабжэцкі кладзе Купрыянчыку на плячо руку.

— Ня злуешся?

Купрыянчык глядзіць на Белабжэцкага маладым круглявым замурзаным тварам. З нізу на твар адсьвечвае электрычная ручная лямпа, і ў гэтым косым сьвятле цяпліцца усьмешка.

— Кінь, што ты.

— А чорт, яго, браце,—гаворыць Белабжэцкі, таксама хаваючы недзе ў сябе такую-ж усьмешку і скубучы каля вуха рукою,—згарача я гэта накрычаў. Сам знаеш—натузаешся так от за дзень, нанэрвуешся—ну і перагнеш бывае. Так і з табою...

— Кінь, што я ня знаю?

Белабжэцкі яшчэ раз кладзе Купрыянчыку руку на плячо, сьціскае, і ў гэтай руцэ Купрыянчык чуе добрую. харошую цяплынь начальніка. Купрыянчык глядзіць яму ўсьлед, а Белабжэцкі ўжо адчыняе дзьверы канторкі і там—за столікам, за распрацоўкаю заўтрашняга заданьня—яшчэ застае Сімховіча.

— Накрычаў быў удзень на хлопцаў за затор машыны, а сам вінаваты... Ну што ў цябе?—ужо пытаецца ён, гледзячы на разьметкі, і цяжка апускаецца на крэсла.

За вокнамі ноч. Недзе з канца цэху глуха па сьценах чуцён гуд мэханічнага; па канторцы расплываецца бляск адзінотнае лямпкі, і Сімховіч неяк грузна падымае цяжкую галаву.

— На заўтра ня будзе ўсіх рам. Не ў час падалі, і Саранчук ня змог зашабраваць. Трэба другую брыгаду паставіць на гадзіну пазьней.

— Так. Давай-тка дамо мэханічнаму дакладную нарадку на ўсе дэталі. Дамо пад нос усё як на далоні, і няхай папрабуюць сказаць, што яны ня ведаюць, чаго ў нас няма.

Сьцены гудуць далёкім гудам мэханічнага. За вокнамі ноч. Над столікам нагінаюцца, вылічваюць на паперы заўтрашні дзень, дзьве фігуры. Заўтрашні дзень трэба вымацаць шчыльна. Вымацаць лічбамі, дэталямі, процэсамі, патокам—гра-

фікам заданьня. Увесь завод трэба бачыць вось так, на далоні. Мэханічны падгадзіць, сарве, і ён будзе паказваць прычыны. Няўдалыя разцы, парваліся пасы, заела сьвідроўка, няма самакалу, стаялі варштаты... Мэханічны знойдзе тысячы об'ектыўных прычын. Трэба вылічыць заўтрашні дзень, хоць цяжка, хоць вылічэньне будзе варажбою.

За шырокімі вокнамі ноч. Глуха па сьценах чуцён далёкі гуд мэханічнага. Дзьве фігуры ў канторцы нагнуты над столікам і коса па канторцы кладуцца іхныя цені. Ноч сьпіць. Цені згінаюцца, іх варушыць дрымотная цяжкая ўтома.

Пасьля цені ўстаюць. Рука датыкаецца да выключальніка—у канторцы тухне сьвятло.

Каля цэхавых варот фігуры разьвітваюцца. Высокая варочаецца назад і ужо скураною шапкаю відна ў мэханічным. Трэба яшчэ раз паглядзець на проекцыю заўтрашняга дня. Трэба майстру перадаць нарадку, пахадзіць каля варштатаў, памацаць, праверыць дэталі, а тады можна пайсьці.

На вуліцы Вароўскага сонная ціш. Вуліца сьпіць прыгараднаю муравою, застыўшым па платох вішняком, выдыхаючы ў ноч лёгкі сагрэты пах зеляніны. Па мураве ногі ступаюць мякка. І ўдыхаючы гэту мяккасьць і ціш—па целе разьліваецца прыемная лёгкасьць. Белабжэцкі шукае нечага ў памяці, і здагадваецца: гэта грузам валіўся сёньняшні дзень.

— Куды гарачэй як на 401 вярсьце,—шэпча ў думках Белабжэцкі і цёплаю усьмешкаю перабірае ўспаміны.

IV

401 вярста асталася ў памяці Белабжэцкага рэволюцыяй.

1917 год. Зямля ў агні. Людзі ў тузаніне, сумяціцы, у нэрвах, у рэволюцыі. Дзьве рэволюцыі. Людзі, франты, кулямёты, атрады, страляніна. І недзе напіраюць немцы. І недзе зьбіраюцца банды. І загад—адступаць.

401 вярсьце трэба тэрмінова эвакуявацца. Разгружаюцца ваенна-інтэндацкія склады. Снуюць хворымі трыбухамі паравозы. Бегаюць людзі з кацялкамі, з бомбамі, з вінтоўкамі, з мацюгамі, з песьнямі, з недаедзенымі скарынкамі хлеба. І Белабжэцкі ў людзях, у нэрвах, у сьпешцы тэрміновай эвакуацыі. Трэба хутчэй разгружаць склады—быць грузчыкам, пакатнікам, стрэлачнікам—вагоны, вагоны—адпраўляць вагоны!

Гэта кавалак—401 вярста—у нэрвах, у бяссоньніцы, у мацюгні, у тлуме, у тузаніне,—у памяці.

Пасьля: Смальляны, Нарабраз, Брыгневіч, Валвыканком, камісіі, камітэты, хлебанарыхтоўкі, царкоўныя каштоўнасьці, банды, кулакі. Трэба быць асьцярожна. Трэба зноў быць на нэрвах, на сходах, на мітынгах, трэба... трэба даставіць краіне хлеб. Гразкія доўгія лясістыя дарогі па сёлах. Напружана, пільна трэба трымацца на мітынгах. А пасьля—трэба ведаць дарогі, трэба ведаць, дзе спаць, і сьціскаць увесь час у руках наган. За хлеб сурова разьлічваюцца кулацкія банды...

Гэта зноў кавалак—у нэрвах, у напружанасьці, у штурме,—у памяці.

Пасьля вінтоўку Белабжэцкі здаў, пайшоў на вучобу. Скончыўшы Магілеўскі індустрыяльны тэхнікум, ён да 1928 году тэхнік-практыкант Аршанскага заводу „Чырвоны Кастрычнік". У 1928 годзе—у трэсьце конструктарам. У дваццаць-жа восьмым годзе Белабжэцкі каманды-руецца на Гомсельмаш.

Сельмаш яшчэ толькі будуецца. Стаяць рыштаваньні, узводзяцца корпусы, але трэба рабіць падрыхтоўку. Трэба рабіць рысункі, проекты, конструкцыі, модэлі, каб пасьля работаю пусьціць завод.

У кутку пабудаванага корпусу—маленькі цэх. Адсюль павінен разьіцца Сельмаш. У цэсе пятнаццаць чалавек рабочых, такароў, сьлесароў, мэханікаў, інжынэраў, практыкаў—разам. У цэсе стаіць пара варштатаў, пахне земляны дол, людзі хоцяць па дошках—робяць мадэлі, узоры, дэталі будучых машын.

У студзені 1930 году—пробныя машыны гатовы. На заводзе ўжо чалавек трыста рабочых. Але машыны ідуць туга. Машыны новыя, новая справа—багата недаглядаў, затрымак, недакладнасьцяй. А галоўнае, няма практыкі, няма ўмельства. Людзі робяць, перарабляюць, зноў робяць, і ўрэшце—тры-чатыры машыны за дзень.

Сьмешныя тэмпы. Трэба добрага камандзіра, добрага кіраўніка, работніка, каб умеў наладзіць і людзей, і машыны, і работу. З канструктарскага аддзелу Белабжэцкі мабілізуецца ў цэх на прарыў, на зборку сячкарань. Ня хоча, а ўсё-ж такі трэба.

У Белабжэцкага вялікая ўпартасьць. У Белабжэцкага вялікая воля і кемкасьць. Галоўнае—правільна расставіць рабочую сілу. Правільна, стройна паставіць паток. Але паток зрываецца, машыны ня ідуць—заядае. Блытаніна ў дэталях. Значыць вінаваты рысункі. Значыць трэба на хаду папраўляць памылкі.

І Белабжэцкі памылкі папраўляе на хаду. Ён начамі сядзіць у цэсе; слухае, прыглядаецца да сячкарань; варочае, вымервае дэталі і лічбы запісвае ў кніжку. Але папраўленая дэталь сыстэмы ня лепшыць, і—зноў трэба начамі сядзець, вымерваць, вывучаць, каб паправіць сыстэму. І галоўнае—трэба ўмеючы людзям падаць каманду...

Каманда дадзена добра.

Зборка сячкарань пайшла патокам.

Белабжэцкі мабілізуецца зноў на прарыў—на сіласарэзкі. Ён прызначаецца памочнікам майстра ўсяго зборачнага цэху.

На сіласарэзках справа куды горш. Машына зусім новая. Канструкцыя няправільная. Дэталі паблытаныя. І тады-ж Белабжэцкі ідзе да сэкратара партыйнае ячэйкі—да Сімховіча.

— Трэба пачынаць з самага пачатку—трэба нанава канструяваць.

Але майстра цэху, Гэйхман, пярэчыць. Нанава канструяваць—значыць спыніць зборку. Гэтага нельга зрабіць, дый наогул—чаго ён лезе не ў сваю справу, калі майстра ня ён, а—Гэйхман. Мы выпускаем дванаццаць машын—і хопіць.

Але Белабжэцкі з Сімховічам ідуць у заводакіраўніцтва. Гэтых машын пускаць нельга. Няма стандарту. Дэталі з аднае машыны ня прыпадаюць да другое. Няма як даваць запасных частак. Трэба зрабіць новую конструкцыю машыны.

Загадчык вытворчасьці, Фэльдман ня хоча. Заводакіраўніцтва дазволу не дае. Іхную руку трымае адзін толькі Генкін.

І раптам—выпадак: няма чыгуна, завод сунімаецца на два тыдні.

Пад сваю адказнасьць Белабжэцкі з Сімховічам у цэсе пакідаюць трыццацёх чалавек рабочых. Разьбіваюць работу: Белабжэцкі на зборцы, на падрыхтоўцы новых дэталяй; Сімховіч на контрольных прыладах: зарыхтаваць кондуктары, шаблёны, каб рабіць масавы выпуск стандартам. Напал разьбіваюць рабочую сілу. Бяруцца за работу. І—зноў ідуць ночы бяз сну, ночы ў цэсе, ночы за работаю новых машын. Трэба сьпяшацца. Трэба выкарыстаць перапынак, каб сабраць новую конструкцыю, і—два чалавекі ня могуць пакінуць заводу—астаюцца ў цэсе спаць...

Прылады гатовы. Сабрана тры новых машыны, але Фэльдман ня хоча пускаць. Лепей старыя. А можа ня ўдасца, і тады яшчэ горшая мука.

Рызыкнулі. З вайною, з грызьнёю, але пусьцілі. На новым патоку Белабжэцкі зноў ня можа выходзіць з цэху. Можа ёсьць памылкі і іх трэба паправіць на хаду, каб не ўпікалі. Але перамога відаць адразу: паток пачынае даваць па дваццаць машын.

Зборка наладжана. Але зборка залежыць ад усяго заводу. Як пададуць дэталі загатоўчыя цэхі? Мэханічны тармозіць сыстэматычна. Мэханічны танцуе, як хворая нэрва і патрабуе капітальнае перабудовы. Але зборку зрываюць і такія цэхі, як лёгка-кацельны, ліцейны, кавальскі, і гэтых—трэба ўзяць у муштру.

Сіласарэзкі сталі. Сіласарэзкі ня могуць зьбірацца. У лёгка-кацельным аграмадны прарыў. Няма ні ланцугоў, ні патрубкаў. Ня могуць рабіць.

На прарыў—Белабжэцкі. Праз месяц—запас. А яшчэ праз месяц зноў няма ні патрубкаў, ні кажухоў. Але Белабжэцкі ўжо сунімае Сімховіча.

— Давай на буксір.

— Давай.

Сімховіч зьбірае брыгаду. Брыгада ўрываецца ў лёгка-кацельны. На сьценах павісьлі плякаты-трывогі—прарыў. Беглая вытворчая нарада—і брыгада чатыры дні буксуе лёгка-кацельны. На штурме Белабжэцкі чаргуецца з Сімховічам—трэба-ж быць і на зборцы.

У гэтага чалавека вялікая воля і ўпартасьць. У гэтага чалавека вялікае ўмельства гнутка падаць каманду. Галоўнае—правільна расставіць рабочую сілу. Галоўнае—умеючы яе арганізаваць. Жыць цэхам, заводам, знаць яго пульс, каб манэўраваць, як на фронце.

І ў Белабжэцкага добры таварыш па барацьбе, па штурме, добры работнік-энтузыяст, Сімховіч—перш сэкратар парт'ячэйкі, а пасьля яго памочнік, калі ён становіцца на пасаду перш майстра, а пасьля начальніка цэху. І ў Белабжэцкага яшчэ актыў з энтузыястаў-рабочых.

Завод Гомсельмаш яшчэ малады. Завод перажывае пускавы пэрыод, хварэе на так званыя „дзіцячыя хваробы"—на непаладкі, зрывы, пускавую тузаніну.

Програма—дваццаць пяць сіласарэзак на месяц.

І зноў гугнявяць Фалкіны, Фэльдманы. Будзе прарыў. Програма праваліцца. Дзе гэта—выканаць гэткую норму...

А сельмашаўскія энтузыясты даюць сустрэчную праграму: трыццаць машын.

Зноў бой за графік, бой за выкананьне програмы. Але галоўнае—трэба ўмець манэўраваць—падцягнуць адсталыя вучасткі. Зборка залежыць ад загатоўчых цэхаў, а загатоўчыя цэхі пасуюць. Трэба зборцы падаць каманду манэўраў.

І тады Белабжэцкі ідзе да начальніка цэху, у канторку, сварыцца, што цэх без каманды. Санаторскі ня можа. Санаторскі фізычна ня можа, бо ведаеце-ж самі...

Каманду бярэ Белабжэцкі.

І вось:—

Завод у нэрвах, завод у прарыве, завод у „дзіцячых хваробах". Ліцейны марынуе ліцьцё—ня можа спраўляцца. Кавальскі зрывае дэталі—нехапае жалеза. Мэханічны снуецца ў бязьсільлі, у непаладках, у зрывах—сыстэматычна. Графік выкананьня хістаецца—падае ўніз. Але-ж трэба заваяваць сустрэчнае.

У Сімховіча заўсёды цяжкія рукі, а цяпер яны адвісаюць, як чужыя. Але пасьля работы Белабжэцкі з Сімховічам доўга астаюцца ў цэсе, яны нешта мяркуюць, плянуюць, вылічваюць, запісваюць у замурзаны блёкнот—складаюць праект каманды.

І каманда такая: брыгады, спаборніцтва, буксір, апэрацыйныя манэўры.

Энтузыястам на штурм зьбірацца ня доўга.

У ліцейным брыгады са зборкі самі выбіраюць апокі, самі робяць абрубку, абчыстку; цягнуць у мэханічны, точаць, сьвідруюць, і—на зборку. Мэханічнаму цэху аддаюць сваіх лепшых работнікаў—толькі дайце дэталі! Кавальскаму брыгады робяць жалеза—па дварэ выбіраюць патрэбнае з браку, валочаць, цягаюць—нацe!..

V.

Доўгаю заляю, застыўшым патокам машын адпачывае цэх. Адна за аднэю машыны стаяць ланцугом і ад таго, што выпіраюць яны патрубкамі ды адводнымі трубамі, ланцуг здаецца шурпатым. Цэх маўчыць.

На сьцяне, на адмысловай дошчачцы, Белабжэцкі запісвае графік. Ад спэцыяльнае шпулькі ён адрывае нітку вузенькае чырвонае паперынкі і наклейвае. Упоперак графіку ідзе таксама чырвоная, але тоўстая лінія—трыццаць. Белабжэцкі пераводзіць гэтую лінію на адзін квадрацік і моцна прыціскае пальцам паперынку.

Ну, вось і добра. Трыццаць адна. Пацягаліся, але ўзялі. Перавалілі і сустрэчнае. А цягацца давялося багата. Чаго каштавала скараціць брыгаду Шырокага. Нават нажы даставалі. А вышла эфэктна: скарацілі брыгаду бадай удвойчы і ўдвойчы брыгада падвысіла норму. Дагнала да сараку дыскаў. Добра. Толькі наладзіўся-б яшчэ мэханічны...

Белабжэцкі яшчэ раз прыціскае паперынку, уздыхае і шырокаю далоньню пацірае лоб так, што шапка зьяжджае на патыліцу.

— Та ак,—гаворыць ён сам сабе, відаць, канчаючы нейкую думку і гладзячы тэю ж далоньню шчаку, паволі ідзе па цэсе.

VI.

А ўсё-такі—якая складаная сыстэма гэты завод. І які дакладны павінен быць мэханізм гэтае сыстэмы. Вось недзе парушылася маленькая калёсінка, і на заводзе зноў прарыў.

У Сімховіча больш апускаецца галава. Яшчэ больш цяжэюць, абвісаюць рукі. Неяк моўчкі пакрыўджана працуюць брыгады. Генкін праходзіць па цэсе, і чамусьці няма чаго сказаць яму: ні пахваліцца, ні паскардзіцца. Проста—крыўдна. Так добра падымаўся графік угору, так добра, хораша ішоў паток, а гэта—правал. Крыўдна. І чорт яго—як гэта здарылася? Запароць усю дзённую норму рам...

Генкін грузна ідзе па патоку. Паток парваны. Лысеюць пустыя прагаліны, а на першых працэсах нават няма людзей.

— Запароліся,—гаворыць да Сімховіча Генкін.

Сімховіч разводзіць рукамі. Няма чаго гаварыць. Хіба ня відно, што запароліся, селі. Ды яму і цяжка гаварыць, бо ён цэлую ноч ня спаў, і цяпер галава—як цэбар. Шуміць. Усё думалася, што можа што-небудзь можна прыдумаць...

Сімховіч яшчэ раз разводзіць рукамі, цяжка іх апускае і таксама-ж цяжка накаса перасякае цэх.

З канторкі мэханічнага відаць Белабжэцкі з начальнікам мэханічнага цэху—з Дрыцам. Дрыц круглы, здаравенны, дробна семяніць нагамі і, што раз азіраючыся, заўзята нешта тлумачыць Белабжэцкаму. На круглым твары яго губы мыляюцца неяк надзвычай скора, і па куткох адкладаецца пенка.

— Я табе пакажу, што бакавін мы не сарвалі. Мы сарвалі рамы, гэта праўда, і за гэта вы нас беце. Але-ж вы не падымайце гармідару там, дзе ня трэба. Вы на нас крычэце, памагайце нам, але-ж рабеце

гэта толкам. А то: дзе толькі што чуць заела, дык вінаваты мэханічны. А я табе пакажу, што вы самі зрываеце—вы падымаеце паніку...

У Дрыца усё драбней трасуцца губы, і па крайкох ўсё больш зьбіраецца пенкі. Белабжэцкаму няма чаго гаварыць—ён сваё ўжо адкрычаў у канторцы, і злосьць асталася толькі ў перагарэўшай нагары ў горле. Ён сьпяшае, каб пасьпець за Дрыцам, але Дрыцаў голас раптам абрываецца, і Дрыц сунімаецца каля варштата.

— Ну? — пытаецца Белабжэцкі, нагнаўшы.

Дрыц маўчыць. У яго зразу суняліся трэсьціся губы, і па крайкох пенка застыла. Ён глядзіць на кучу дэталяй, і на круглым твары акругляюцца і вочы.

— Цяпер я нічога не разумею,— гаворыць ён, ужо раптам гледзячы на Белабжэцкага.—Ты разумееш?— дэталі здадзены на абробку яшчэ ўчора. Дэталі здадзены на варштат, і яны не аброблены. Ых, гэты Мацьвеенка. Гэта вось так ён давёў заданьне да варштата. Ну, ты разумееш?..

— І ў цябе заўсёды так, таварыш Дрыц, і заўсёды ты не вінаваты... сьвінства,—раптам перабівае Белабжэцкі, паварочваецца і порстка ідзе на зборку.

Сімховіч з Саранчуком гнуцца над кучаю забракаваных рам. Хаця-б штук з дзесятак папалася добрых. Хаця-б ня пускаць дахаты людзей.

Але ў Белабжэцкага нарадзілася думка (можа і выгарыць), і ён на хаду ўжо крычыць Сімховічу.

— Давай людзей. Перакідай сюды з гуляшчых брыгад, стаўляй на работу.

Сімховіч глядзіць, ён яшчэ не разумее, яшчэ не пачуў, што гаворыць Белабжэцкі.

— Выберам. Гуртам наляжам—падгонім, пакуль нагатуюць новых. Як-небудзь, хоць трохі, а выцягнем.

Накаса прабягае раззлаваны Дрыц. Ён крычыць на Мацьвеенку (на Р. Б.[1]) свайго цэху), і той, ледзь пасьпяваючы за ім, вінавата пярэчыць. Заўсёды бо ён ды ён вінаваты, вінаваты ня ён, а струмантальнік. Паставілі нягегліцу нейкага, практыканта—тармазіў усю зьмену. Варштаты стаяць (дрыляваць-жа пальцам ня будзем), а ў яго па гадзіне чарга па патроны ў сьвідроўку. А цяпер віна на яго: не давёў да варштата заданьня... Ды наогул—калі мэханічны спраўляўся?..

— Давай, хлопцы, давай. Давай разам наляжам, каб выраўняць. А ну, можа і выцягнем трохі,—коратка, забыўчыва гаворыць Белабжэцкі да штурмавое Сімховічавае брыгады, і сам падымае раму на ход.

Але нешта там сталася ў Каганавай брыгадзе, і яму трэба бегчы на другі канец пэху.

... Які вар'яцкі сёньняшні дзень. Недзе ў мэханічным парушылася маленькая калёсінка, і на зборцы такая высокая тэмпэратура. Спрэс, тузаніна. Трэба брыгады зьнімаць з сваіх месцаў. Трэба тасаваць, перакідаць людзей на чужыя процэсы—падганяць, выраўняць, сточваць паток. А паток не даецца. Ён тузаецца парушанаю калёсінкаю, парушаючы хаду ўжо ўсяе сыстэмы, усяго арганізму. І парушаная сыстэма ўжо дае перабоі на другіх дэталях, на ўсім патоку...

— А можа выцягнем?—пытаецца Белабжэцкі, гледзячы з-пад ілба з нейкім нядобрым, калючым бляскам.

Лейкін перш доўга не адказвае. Выціраючы бруднаю рукою шчаку і пакідаючы сьлед на ёй, ён нешта прыгадвае. А тады бярэ ў рукі падшыпнік і, падшыпнік калупаючы, гаворыць:

— Яно можа і ўзялі-б, але-ж зборка стала пазьней на работу. Больш гадзіны патрацілі на ўсялякую музыку...

[1]) Р. Б.—Разьмеркавальнае бюро.

— А што калі-б гэтыя гадзіны нагнаць?

Белабжэцкі перш доўга глядзіць на Лейкіна, на яго шырокі запэцканы твар, а пасьля вочы забываюцца, ападаюць уніз, а на ілбе вырэзваюцца шырокія складкі ад нахмураных броў. Так, так. А што, калі гэтыя гадзіны нагнаць? а? Тады роўным астанецца графік. Тады ня будзе прарыву ў выкананьні пляну. Будзе хораша закончаны квартал... А што, калі гэтыя гадзіны нагнаць, а?

— А што ты думаеш,—можна!— перарывае Лейкін, з размаху кладучы падшыпнік на раму.—Давай паталкуем з хлопцамі. Гадзінак са дзьве папрацуем ды можа і выцягнем...

Раскалолася толькі Саранчукова брыгада, першая брыгада па зборцы сіласарэзак. Напружаны момант. Трэба сёньняшні дзень зрабіць гэроічным. Трэба сёньня штурмам ліквідаваць прарыў. І ў брыгадзе раскол. Няўжо пахісьнецца графік?

Гудок на канец рзбочага дня. Тры далейшых брыгады не скаранаюцца з месца. Людзі рушаць наперад адсталы паток. Выпрабавальнай станцыі трэба даць яшчэ восем машын. Трэба выцягнуць...

Саранчук настарожваецца. Гудок, і ён знае: яго брыгада можа сарваць. Ён ведае, што ў яго брыгадзе багата прагульнікаў і сымулянтаў, і з імі ваяваць будзе цяжка.

Вось Калацкі ўжо падымае рыжую галаву.

— Дык што гэта—зноў штурмаваць?

— А ты што, запарыўся?

Калацкі не адказвае, а паволі выціраe рагожынаю рукі і спакойна канчае сваю думку:

— Даво-олі. Я свае сем адпрацаваў і магу пайсьці.

— Але. Лепш будзе, калі ты пойдзеш, смалі!—такжа сама спакойна заўважае круглявы рабочы, бяручы на шаброўку новую раму.

Калацкі ўжо каля шафкі складае струмант і быццам ня чуе. Фон-Левін палажыў струмант дачасу на раме. Ён мяркуе—як яму быць: пайсьці ці астацца?—і, каб не паказаць, што ён гэтым заняты, папраўляе папружку.

— А ты-ж куды, Гусараў?

Гусараў як-бы пужаецца, сьцепаецца, але забіраючы шабру, прабуе ўсьміхнуцца і гаворыць, робячы голас спакойным.

— Я? Да хаты... Была-ж сырэна... І праз гэтую насьмешку прарываецца злосьць.

Фон-Левін пытаньне таксама ўжо вырашыў, рама яго пустая. Нехта ўкрадкі, баючыся нават свайго права, зьбіраецца пакінуць работу яшчэ.

— Ыы, сволачы. І яны будуць гаварыць, што ім дораг завод.

— Ім даражэй лыжка капусты.

Гусараў выціраe рагожынаю рукі, і ў рагожыне пальцы трасуцца. Ён зразу пасьля гудка пачуў-быў, як унутры ў яго тарганулася нейкая нэрва. Ён ня ведаў тады яшчэ: астанецца ці не, і ўнутры ваявалі тады яшчэ два чалавекі.

Таргануліся ў рагожыне пальцы.

Нехта сказаў пра капусту і пра завод. Гэта што ён хацеў быў сказаць пра капусту? І чаго гэта на іхную брыгаду глядзіць увесь цэх? Што ён ня хоча астацца?

— Так, мне дорага лыжка капусты, бо я адпрацаваў свае сем гадзін і цяпер хачу гэтую лыжку зьесьці. Ты мяне сарамаці ў рабоце. Ты з мяне патрабуй тады, а цяпер мне на ўсё наплявать!

— Верна!

— Ну і плюй, толькі выходзь, не замінай у цэсе.

Саранчук трывожыцца, бо завязваецца сварка. Вось яшчэ каля шафкі варочаецца і Калацкі і Фон-Левін, і, едка ўсьміхаючыся, яны таксама

ўкідаюць па слову. Рабочыя ў спрэчках, і што калі возьме сарвецца сіла...

— Хлопцы! Ніхто нікога не прымушае аставацца. Калі—хочаш памажы, калі хочаш—ідзі і не перашкаджай другім. Давайце, хто хоча, ня будам марудзіць. Уся зборка чакае на нас, глядзеце.

— Адчальвай на лёгкім катэры,— злосна выпростваецца над рамаю той-жа самы круглявы шаброўнік,— чаго яшчэ гугніш?

У Гусарава накіпае злосьць, што яго за яго-ж права абсьмейваюць, бэсьцяць. Адным махам рагожына ляціць у куток і Гусараў порстка скідае рабочы гарнітур.

— І пайду, і ты мне нічога ня зробіш, бо я сваё аддзяжурыў... Ну, хто хоча—хадзем... Я свой сацыялізм яшчэ пабудую,—гаворыць ён ужо з цэхавых варот, наганяючы сваіх прыяцеляў.

...Вышаўшы з заводу, Гусараў зьменшвае крок. Зноў пачынае торгацца ўнутры нейкая нэрва. Ня добра зрабіў. Не астаўся, ды яшчэ і накрычаў. І хіба добра, што на яго глядзела ўся зборка, глядзела з пагардаю—баіцца перадаць сваіх дзьве гадзіны... Зрабіў—ня добра...

Гусараў сунімаецца, і доўга пальцы перабіраюць нешта ў кішэні. Скрынка запалак. Скрынка сьціскаецца пальцамі. Патрэсквае. Перакошваецца. Вось яна ўжо гатова зламацца, але пальцы слабнуць, пускаюць назад... Ч-чорт—пагарачыўся!.. І раптам: пальцы ўядаюцца, скрынка ломіцца з хробустам, і Гусараў рыўком варочаецца. На прасьцяк цераз двор ён крочыць назад у цэх...

У цэсе машынамі сточваецца парваны паток. Недзе каля выпрабавальнае станцыі шкураною шапкаю маячыць Белабжэцкі. Да Саранчука падыходзіць Сімховіч і таму, што Саранчук рукавом выцірае запараны лоб, Сімховіч усьміхаецца белымі рэдкімі зубамі і гаворыць:

— А ўсё такі выцягнем!

VII

Яго можна ўявіць або ў рабочым зашмальцаваным гарнітуры, або ў шкураной тужурцы—але заўсёды гэта будзе высокі, танклявы чалавек, з худым тварам, з вялікаватымі, можа ад худобы, вачыма, і заўсёды ён будзе на заводзе, у цэсе.

Рабочы дзень зборнікаў даўно ўжо кончыўся, даўно адпачывае зборачны цэх, але ён ня можа не астацца на заводзе. Ён павінен вымацаць заўтрашні дзень і заўтрашні-ж дзень нарадзіць ужо сёньня падрыхтоўкаю дэталяй, вывучэньнем слабых вучасткаў, расстаноўкаю рабочае сілы—у пляне, у праекце—на заўтра.

На зборцы ноч, і цэх адпачывае застыўшым патокам. Белабжэцкі шкураною шапкаю маячыць у мэханічным. У электрычнасьці шапка адбліскваe, шапка нагінаецца каля варштату. У руках у Белабжэцкага штангель—ён правярае дэталь. Каб толькі не запаролі. Каб заўтра не заелі патоку. Трэба самому праверыць якасьць дэталяй, пасварыцца з майстрам, параіцца—каб ведаць, каб вывучыць заўтрашні дзень.

Недзе ў канторцы зборачнага сядзіць яшчэ Сімховіч. Ён таксама мацае заўтрашні дзень вылічэньнямі, плянамі, лічбамі дэталяй на вузлох, на працэсах. Белабжэцкі ўспамінае нешта і ідзе па змрочнай велічы гуляшчага цэху.

У Сімховіча, як і скрозь, цяжкая галава. Яна нізка апускаецца над сталом, і відаць, што нечым занята. Сімховічавы пальцы заняты графікам. Яны вельмі таропкія, гэтыя Сімховічавы пальцы. Вось прыклалі чырвоную папяровую палоску, давялі да трыццацёх пяцёх і абарвалі палоску. Гэт, немач, а трэба-ж давесьці як сьлед. Сімховіч адрывае другую палоску, ужо ўважлівей прыціскае пальцамі і даводзіць да трыццацёх васьмёх. Трыццаць восем сіласарэзак. Во—гэта графік.

такі і наклейваць будзеш з ахвотаю... На гэтулькі перакрочыць сустрэчнае. А яшчэ-ж як...

Але мары перабівае Белабжэцкі.

— Ну, думаў?

Сімховіч падымае цяжкую галаву, і ў вачох яго зьліплая ўтома.

— Думаў, але-ж гэта сур'ёзная рэч, і яе трэба не надумаць, а распрацаваць.

У Белабжэцкага таксама рэжуцца вочы. Ён тры ночы ня спаў. Вагоны, хаданіна, вагоны... Быў на экскурсіі на ўкраінскіх заводах. Прэміяльная экскурсія. З дарогі прывёз новую думку і ёю падзяліўся з Сімховічам. Думка сур'ёзная. Але гэта дасьць новую форму работы, адказьнейшыя адносіны да яе. Ён цяпер начальнік зборачнага цэху, і на яго ўскладзена яшчэ большая пільнасьць.

— Давай памазгуем. Ты сур'ёзна вазьміся. Распрацуем проект і да Камаева. Гэта ня Фалкіну цёзка—раскусіць. А тады зразу за работу, і за месяц каб быў гатовым. Праўда?.. Ну, а цяпер—дахаты.

Белабжэцкі падымаецца з крэсла, і, кладучы па канторцы цень, фігура яго робіцца яшчэ больш доўгаю. На змораным твары векі ападаюць нізка, і відно, што гаркатою рэжуцца вочы.

...Ноч падыхае невялікім сьвежым ветрам. Пад нагамі храбушча жвыр. Недзе на чыгунцы перагрукваюцца буфэры, і далёка з гораду чуцён апошні працяжны голас аўтобусу.

Гэта абавязкова трэба зрабіць,— думае Белабжэцкі, перасыпаючы думкі хробустам жвыру.—Да гэтага даўно ўжо завод падышоў, і гэтага патрабуе штодзённы наш рост. Будзе цяжкавата. Трэба вылічыць. Трэба надзвычайна дакладна вылічыць, колькі часу возьме кожны процэс, кожны вузел, кожная дэталь. Гэта самы асноўны прынцып. А адсюль трэба будзе па-новаму расстаўляць і рабочую сілу. Гэта трэба страшэнна вялікая дакладнасьць. Каб нідзе ні на адну хвіліну ня было замятку, а так, як мэханізм у гадзіньніку. Прышла пара: паток і парушыўся на вядомую меру мэтраў і часу. Та-ак... І бадай давядзецца рабіць на крукох. Крукамі адна за адну, адна за адну,—цэлым патокам—а наперадзе рукавік: хай цягне.

А вось з рухавіком гэтым, чорт яго, трэба падумаць. Трэба падумаць, каб ён рушыў паток праз вядомы час, вядомаю сілай, на вядомую меру. Вось гэта і... трэба сур'ёзна падумаць над гэтым.

Белабжэцкі ўжо праходзіць Палескую, мінае апошнія электрычныя агні, каб павярнуць на сваю ціхую з мяккаю муравою вуліцу, як на плячо лажыцца нечая рука.

— Юрка!

Белабжэцкаму зразу пазнаць не дае перарваная думка. Ён паволі падае руку і толькі пасьля ўжо гэтую руку моцна сьціскае.

— Здароў! Во, дзівак, ледзь пазнаў. Ну, куды-ж ты?

„Дзівак"—стары прыяцель Белабжэцкагаз часоў хлебаразьвёрстак—токар з заводу Ланцуцкага. Ён распытваецца ў Белабжэцкага пра экскурсію, пра Украіну, пра завод імя Шаўчэнкі, пра комбайны, пра вопыт. І ня ўсьпеў яшчэ Белабжэцкі пачаць, падзяліцца, як „дзівак" перабівае яго раптоўным крыкам:

— Стой! Я і забыўся—дай руку!

Белабжэцкі няўцямна глядзіць. У яго нават абрываецца крок.

— Чаго ты?

— Віншаваць хачу! Ты што-ж, і ня хвалішся?.. А—позна надумаўся...

Белабжэцкі апускае галаву, і здаецца, ён слухае хаду сваіх крокаў. Агні Палескае асталіся далёка, і „дзіваку" ня відаць, што пад нагнутым казырком загараюцца іскры чалавечае цёплае радасьці. Пад казырком-жа лажыцца і ўсьмешка, такая, якою сустракаюць цёплую радасьць, ня хочучы паказаць яе.

— Ня мог я. Усё думаў, што яшчэ... ну, як тут... не гатоў, ня вышабраваны... А цяпер...

Белабжэцкі гаворыць пра тое, як доўга ён ішоў да сябе бальшавіка, і як гэта цяпер для яго неабходна.

Можа гэтая дарога пачалася з 401 вярсты, але яна ішла складаным процэсам чалавечага росту, чалавечае пераробкі ў рабочым цэсе... Белабжэцкі вырас у цэсе чалавечага гарту, у змаганьні, у штурме заводам прарываў, у цэсе формоўкі людзей-бальшавікоў.

— А думаў я доўга, гэта ты праўду сказаў... Шабраваўся...

„Дзівак" разьвітваецца, прападае ў завулку, і, залізваючы яго цень, зразу тужэе ноч. Вуліца дрэмле вішняком на платох, выдыхаючы ў ноч лёгкі сагрэты пах зеляніны.

— Аксеня ўжо мабыць сьпіць?— думае Белабжэцкі, чамусьці настаўляючы каўнер тужуркі. Але раптам думка губляецца, і ён напружана шукае ўжо нечага ў памяці.

... на крук ох, але... Адна за адну, адна за адну і цэлы рушлівы паток. Конвэер. Гэта трэба як мага хутчэй рабіць. Так як на Шэўчанкаўскім заводзе... Праз месяц павінен пайсьці конвэер... Трэба дакладна вылічыць... колькі часу зойме кожны процэс, кожны вузел, кожная дэталь, і так расставіць рабочую сілу, каб на мэханізаваным патоку ня было ніякага замятку. Матэматычна дакладна, як гадзіньнік: прышла пара, і паток парушыўся на вядомую меру... Конвэер прывучыць да дысцыпліны, прывучыць да парадку, ускладзе на кожнага адказнасьць. сам дыктаваць тэмпы. Так... дыктаваць тэмпы работы...

У напружаным уяўленьні Белабжэцкаму раптам здаецца, што ў цэсе ўжо сапраўды працуе конвэер, і ён павялічвае толькі што затоены мысьлямі крок...

Кастрычнік, 1931 г.
г. Менск.

Цім. Зарэчны, С. Ліхадзіеўскі

Поэма пра гэройства

Пятро Савіч

I.

Шуміць у бурных паводках маладзіца—Бяроза—дагэтуль спакойная, ціхая, прыгладжаная шырачэзнымі грудзьмі плытоў, абвеяная вольнымі песьнямі плытагонаў, шуміць Бяроза—ўзмахамі пеністых хваль, грабянямі раскрышаных крыг, хрустам трэсак і сьнегу.

На беразе Бярозы—адхоністым, закіданым ярусамі брусоў, дошак, дзябёлых камлёў—гудзіць і грыміць волат лясной Беларусі: горда ўзьняты ў гару конвэер падае бярвеньні—звонкія, набраклыя пахучаю смалою; бярвеньні плывуць у войстрыя зубы рам, адтуль—шалёўкамі, дылямі, аполкамі—у ярусы, на склады, у штабялі, каб уласьціся ў новы дом, у вежы на сілас; і ліжуць нажы кражы, і пеніцца жаўцізною шпона, і клеіцца, варыцца, сартуецца фанэра—альховая, дубовая,—сухая, абрэзаная, праштампованая стандартным надпісам—„Lesbel export"; фрэзэры вырэзваюць дэталі—ніжнікі, сярэднікі, верхнікі; шыпяць нажы шыпарэзаў, стукочуць малаткі збойшчыкаў, і аўтовагонэткі з задорам падхопліваюць бялявыя, фугаваныя дзьверы; і жывіць увесь гэты рух—токам і параю—электрасэрца комбінату; трубы выхаркваюць густы прагорклы дым, гудуць турбіны, пражорлівыя качагаркі глытаюць тоны апілкаў і дрыўлянага друзу; вымі сэрца, зьняжыві яго—стане волат мерцьвяком...

2.

І сэрца раптоўна стала:

Замёр волат лясной Беларусі—застыг у нярухомасьці конвэер, спынілі бег лупільныя станкі, і фрэзэры раптоўна змоўклі.

Волат у апошні раз каўтнуў глыток студзёнае вады, і ў апошняй конвульсіі здрыгануліся лесарамы.

Забегалі людзі—устрывожаныя, спалоханыя, узрушаныя. Адзін аднаго закідвалі пытаньнямі і ў адказ адзін перад адным разводзілі ў замешанасьці рукамі.

Першай замерла турбіна. Кондэнсатар ня даў турбіне вады. Вады кондэнсатару не дала цыркуляцыйная труба. Значыць—труба першая атрымала ўдар.

Цыркуляцыйная труба—ад кондэнсатара турбін электрастанцыі, крутым выгінам—пад кутом ў 90°, праз глыбу зямлі, пераплеценую, зцэмэнтаваную стружкамі, трэскамі, утрамбаваную і прыбітую, цераз помпавую станцыю, цераз дзьве запасныя студні—на глыбіні 10 мэтраў ад паверхні зямлі—ўрываецца ў стромкую плынь Бярозы, каб смактаць, качаць, гнаць—з пякучаю смагай, са зьвярынаю прагнасьцю—крынічную студзёнасьць вады кондэнсатарам электрастанцыі.

Цяпер труба дзесьці прарвана, ня вытрымала бурнага напору вады,—труба млее ў глухім бясьсільлі. З гэтае прычыны і замёр волат, і трубы качагарак ня выхаркваюць у неба густога прагорклага дыму.

Тысячы рабочых рук паніклі ў бязьдзейнасьці, машыны адмовіліся ім падначальвацца.

Спрабуй—адшукай балючую і шчымлівую рану цыркуляцыйнай трубы, дай ей магчымасьць зноўку захліпацца новым напорам бурных вод Бярозы.

І людзі кінуліся капаць і разварочваць пераплеценую і зцэмэнтаваную глыбу зямлі, секчы яе рыдлёўкамі, разьбіваць яе пласты вострым і важкім ломам.

Дзе? Што? Як? Людзі ня ведалі і ведаць не маглі: даўжыня трубы за сотню мэтраў. Але зямлю капалі, раскідвалі, разварочвалі.

Рыпалі дзьверы габінэту дырэктара; перазвоньваліся званкі тэлефонаў партколектыву і заўкому, і шапкі спацелых інжынэраў і тэхнікаў зьбіваліся на патыліцы.

Над камбінатам вісела пагроза прастаяць два тыдні.

Два тыдні—сотні тысяч рублёў, два тыдні—навала прастояў і страт.

Капалі ад раніцы да глыбокае ночы. Груды гразкае зямлі пластаваліся адна на адну, выросталі ў пакамечаны грэбень валу.

Адкопвалі трубу, і раны трубы не знаходзілі. Зноў капалі, выкідвалі на паверхню пясок і суглінак. Грукацелі рыдлёўкі, грымелі ламы і кіркі ўгрызаліся ў грунт зямлі.

Вісела пагроза прастаяць два тыдні, страціць сотні тысяч рублёў.

3.

Комбінат стаяў другія суткі. Рабочыя па ранейшаму прыходзілі ў свае цэхі, але, не знаходзячы работы, зьбіраліся групамі і з трывогай абмяркоўвалі становішча.

У габінэт дырэктара прышоў малажавы чалавек. Кінуў у пепельніцу недакураную папіросу, агледзіўся. Спакойна і проста вылажыў сваю думку, падаў сваю прапанову.

Дырэктар хмурыў бровы, маршчыніў лоб і катэгорычна не згаджаўся. А чалавек настойваў на сваім. Яго спрабавалі пераконваць і не пераконвалі.

Тэхнік з рэдзенькай бародкай і з шавялюрай пад ёршыка далікатна ўзяўся танклявымі пальцамі левай рукі за грузік прамасьлянае кашулі малажавага чалавека, праваю рукою па-бацькаўску пахлопаў па яго плячы, і лісьліва, ледзь прыкметна ўхмыляючыся, скрозь зубы праказаў:

—З агнём жарты, хлопча, малыя... Былі і мы некалі зялёнымі... Да чорта на ражон лезьлі... З агнём гуляеш, хлопча, кажу.

А ён напружана маўчаў. У габінэце гулка гаманілі, спрачаліся, даводзілі. Дырэктар нахінуўся галавою да тэхнічнага кіраўніка і штосьці яму на вуха пачаў гаманіць. Сэнс гутаркі раставаў у дыме пакою, чуліся толькі паасобныя словы:

— Небясьпечна... Можа рызыкаваць...

— Дыямэтр трубы толькі 35 сантымэтраў...

— Асабліва на выгіне...

— Ні ў якім разе...

— Не дазваляць...

Дырэктар падняўся з крэсла, рыўком адсунуў у бок тэлефон, хмура праказаў:

— Адказваць за вынікі мы ня можам... Справа сур'ёзная... і... небясьпечная...

Тады да стала праціснуўся пажылы дзядзька Астап, што з брыгады прэсаўшчыкоў фанэрнага цэху, і, размахваючы рукамі, перабіў:

— А па нашаму,—спадзяецца на сябе—няхай робіць! не стаяць жа комбінату... А мы яму дапамагаць гуртам! Я так сабе мысьлю!.. І ўсё!..

Дзядзька Астап крута павярнуўся і, захінуўшыся крысамі спэцоўкі, адышоў ад стала.

Сьціхлі галасы ў пакоі, людзі стаялі бяз рухаў,—наступіла маўчаньне, якое мучыла і прыгнятала.

4.

За вокнамі маўчала ноч. Гадзіньнік электрастанцыі паказваў палову другой.

Малажавы чалавек, скінуўшы верхнюю вопратку, абвязваўся жалезным тросам.

Каля кандэнсацыйнага баку стала невялікая група рабочых. Інжынэры па некалькі разоў аглядалі трайнікі, заглядвалі ў чорную зяпу патрубка, які вёў у цыркуляцыйную трубу—ўніз, пад зямлю, у самую Бярозу.

Чалавек прымацоўваў да грудзей электрычны ліхтарык. За кожным яго рухам уважліва сачылі, прыглядаліся. Ня то жартам, ня то спачуваньнем празьвінела:

— Разьвітаўся б з жонкай... Мо-ка-б лягчэй на сэрцы было...

Чалавек нічога на гэта не адказаў. Ён агледзеў самога сябе, абвёў вачыма зяпу трубы і спакойна спусьціўся ў яе. І калі ён прапоўз некалькі мэтраў, да слыху няясна данеслася:

— Калі што якое, дык мы за трос... І зараз-жа на паверхні...

Плечы ў чалавека дужыя—маладыя. Ім патрэбен прастор, ім патрэбна шыр. Вузкае жарало трубы цісьне, давіць маладыя плечы. Іржа цераз бялізну шчыпле скуру; здаецца—па сьпіне бегаюць мурашкі, і ў локці колюць вострыя іголкі. Ажухлая вільгаць глухога сутарэньня асядае на лёгкія.

Чалавек паўзе ўглыб, прабіваецца праз цемень і жудасьць.

На паверхні лічаць хвіліны. А хвіліна трывожнага чаканьня—як цэлая гадзіна. Людзі, як бы адчуваючы нейкую віну, з нецярплівасьцю чакаюць звароту чалавека з-пад зямлі. Узрушаны інжынэр без усялякае мэты бегае з месца на месца.

Дзесяткі вачэй сочаць за рухам тросу: ён павольна разматваецца і зьнікае ў густа-чорным жарле трубы.

Вочы гараць агнём спачуваньня і веры ў перамогу. Маланкаю голас:

— Хлопцы, я лезу ўсьлед!.. Ахватней будзе...

Гэта голас качагара электрастанцыі Мадорскага.

Густа-чорнае жарло трубы глынае і яго.

А чалавек паўзе... паўзе... У трубе холадна і зябка. Цела аблі-ваецца ліпкім потам... Ён падпаўзае да выгіну трубы—самага небясьпечнага месца. Тут труба на 90° паварочвае ў бок, бярэ просты напрамак да Бярозы.

Цела чалавека—пругкае і дзябёлае—паварочваецца на бок і, па форме трубы, ломіцца ў цаясьніцы пад простым кутом. За выгінам труба становіцца больш прасторнай. Чалавек адчувае сябе вальней. Пальцы, намацваючы дарогу наперад, качанеюць, як у моцны мароз. Цьмянае сьвятло ліхтарыка асьвятляе гразь і склізоту. Працятая іржою сарочка ліпне да цела, і ўрэшце зморацы зрок засьвяціўся іскрамі цёплай радасьці: на трубе шчэрылася шырачэзная шчыліна.

5.

Чалавек варочаўся назад. Выгін трубы сапраўды быў небясьпечны: абясьсіленаму целу шмат каштавала, каб яго абмінуць.

Спачатку толькі закружылася галава, цьмянае сьвятло ліхтарыка здалося ружовым: міргае, хвалюецца ў шэрай пары вільготнасьці і склізотнай азызласьці, дрыжыць мутным бляскам у цемені трубы.

А потым па целу разьлілася мляўкая стомленасьць, здалося: цьвітуць сады—кветкамі, пярэстасьцю красак, і на прагалінах сухой зямлі—пад бярозкамі, у кустох лазьняку—пралескі: сінія, што колер неба ў пагодлівы дзень. І шумы, і песьні навокал: ня то раўчук бурліць па каменчыках, ня то цокат капытоў каня па гарадзкім бруку, ня то звонкія гукі шарманкі на дварэ.

Лібава, дымны горад Лібава! Радзіма... Першыя гады дзяцінства... Брук вуліц—гладкі, абмыты дажджом, бляск сонца—праменісты,

якім бывае ён толькі ўвесну. Цокат капытоў па бруку—цокі цок!—і хлапчукі бягуць за рамізьнікам, і газэтнікі выкрыкваюць самыя апошнія навіны.

... Вайна, — жудаснае слова,—сьмерць. Газэтнікі бегаюць па гулкіх вуліцах гораду і фурманкі ўцекачоў цягнуцца ўсьцяж вуліц—за горад, на ўсход сонца, па пыльнай камяністай шашы.

Уцекачы суровымі і хілкімі зданямі зьнікаюць за ўзгоркам, тады цягнікі—гулкімі галасамі гудкоў—урываюцца, кружацца, а бацька-стрэлачнік—гладзіць па галаве і гаворыць:—Уцякайма, сынку, немец набліжаецца... Туды, на ўсход...

А ўсход—у грукаце цягнікоў па дарогах, у вогнішчах і дыме... І гэта растала... Канула дзесьці... Ні з сяго, ні з таго выбягае пазнанец, той—курносы, з блудлівымі вачыма—сячэ бізуном па сьпіне і прыгаворвае:—Так табе, сукін сын... Ня будзеш тэлефонных правадоў перарэзваць,.. І пажары, пажары навакол: гарыць мост, падаюць бярвеньні ў Бярозу, неба дрыжыць ад гулу адзічэлых гармат...

Цягнікі грукацяць... І камсамолец Калейнікаў, блізкі таварыш, хлопае па плячы, прыжмурвае вочы, сьмяецца:—Слухай, братка... Пашлі на сход... Будзеш у нас камсамольцам!

І цокат капытоў па бруку, і сіняя каляровасьць неба ў пагодлівы дзень, і сполах, і жах: уцякаць, уцякаць,—з усяе сілы, аж дух заціпае,—бо гоніцца, бяжыць усьлед—рыжы і курносы (вайна, сьмерць!)—паляк с бізуном... Уцячы ад яго, схавацца... Бо дагоніць—адлупцуе, прыб'е, прыгаворваючы:—Вось табе, сукін сын, ня будзеш тэлефонных правадоў перарэзваць!..

1931 г.

Бабруйск—Менск.

6.

На паверхні зямлі цягнулі за трос. З чорнага жарла трубы чалавек паказаўся бясформеным, скамечаным. Вопратка была запацкана ў гразь і іржу. Чалавек быў бяз прытомнасьці. А калі яго адкачалі, першым ягоным словам было:

— Ёсьць!

Больш ён нічога не сказаў. Грудзі захлыналіся ў сьвежым струмені паветра. Мускулы дрыжэлі, і ён стомленай рукою правёў па спацелым твары.

. . . . . .

Два дні аднаўлялі цыркуляцыйную трубу. Людзі разварочвалі зцэмантаваныя глыбы зямлі, секлі яе рыдлёўкамі, разьбівалі пласты важкім ломам.

Урэшце цыркуляцыйная труба была заладжана. Кандэнсатар турбіны электрастанцыі зноўку глынуў сьцюдзёнай вады Бярозы. Запульсавала электрасэрца комбінату, і на адхоністым беразе Бярозы загуў і загрымеў волат лясной Беларусі. На пляцформы грузілі новыя стандартныя дамы рабочым Данбасу, жалезнымі абручамі абівалі пакункі фанэры, бракеры прымалі сьвежыя партыі экспартных дзьвярэй.

Малажавы чалавек стаў гэроем Бабруйскага комбінату. Пра яго пісалі ў газэтах:

— „Камуніст Пятро Савіч сваім гэроічным учынкам папярэдзіў прастой, які пагражаў камбінату, у выніку аварыі ў цыркуляцыйнай трубе. Пятро Савіч—лепшы ўдарнік электрастанцыі, актыўны рабкор—зьяўляецца прыкладам бальшавіцкага энтузыязму на франтох сацыялістычнай рэконструкцыі. Рабочыя высока шануюць свайго гэроя і будуць раўняцца па ім у сваёй штодзённай рабоце і барацьбе".

КРЫТЫКА

Ю. Дворкіна

Творчы шлях А. Александровіча

У 1921 годзе быў надрукаваны першы верш Андрэя Александровіча „Да моладзі". З гэтага часу і пачынаецца творчы шлях нашага паэты, які заваяваў сабе вядомасьць ня толькі ў межах Беларусі, але далёка і за яе межамі. Дастаткова адзначыць, што некаторыя вершы яго перакладзены на розныя мовы, як, напр: польскую, расійскую, баўгарскую, узьбекскую, яўрэйскую ды інш.

У 1925 годзе выдаецца зб. „Па беларускім бруку" і поэма „Паўстанцы", і ў 1926 г. зб. вершаў „Угрунь" і „Прозаліць", і ў 1929 г. „Фабрыка сьмерці". Затым выходзіць у 1930 г. асобным выданьнем вядомая поэма „Цені на сонцы". Таксама ў гэтым жа годзе выходзіць „Поэма імя вызваленьня", і ўрэшце ў 1931 г.—поэма „Нараджэньне чалавека" і зб. „Вершы і поэмы". З гэтага № „Маладняка" пачынае друкавацца новая драматычная поэма „Напор".

Зараз, калі мы сьвяткуем 10-гадовы юбілей творчасьці Александровіча, трэба зрабіць некаторы агляд ягонай літаратурнай творчасьці, падвесьці некаторыя вынікі ягонай працы, паглядзець, што-ж даў нам поэта за гэты час, якія ідэі і погляды праводзіў ён у мастацкай форме, на карысьць каго працаваў і за што ён змагаўся.

Чытаючы поэмы і вершы Александровіча, асноўнае, што адразу кідаецца ў вочы, гэта вострая палітычная накіраванасьць творчасьці гэтага пісьменьніка, гарачая аддананасьць справе пролетарыяту.

Як у пачатку сваёй творчасьці, у невялічкіх вершах, так і далей у процэсе свайго росту, у больш дасканалай мастацкай форме, Александровіч апявае нашае будаўніцтва. Усюды піша ён аб тым уздыме, з якім будуе рабочая кляса сваю будучыню, усюды абураецца ён супроць ворагаў-шкоднікаў і бюракратаў. Каб давесьці гэта, дастаткова ўзяць зб. „Вершы і поэмы". (Гэты зборнік ўключае амаль усе папярэднія вершы).

Для Александровіча, як для пролетарскага поэты, рост і разьвіцьцё Беларусі сталі магчымы толькі пасьля Кастрычніка і толькі, як краіны саветаў:

—Ярмо жабрачае ахвачана агнём,
народжаным іскрой рабочага падполья.
Уздрогнула зямля!
З зямлі прарваўся вар!
І ўжо ў астатняй,
але страшнай завірусе,
як жылы,
сьціснуліся межы карт,—
Ўзышла зямля—
Савецкай Беларусі!

І тут поэта паказвае нам шлях аднаўленьня Беларусі, якая пачынае ад-

жываць, якая пачынае ўздымаць сацыялістычную прамысловасьць і ператвараецца ў роўнапраўную рэспубліку краіны саветаў.

„І па цаглінцы ... так з году ў год
разбураны край будавалі.
І пакутна-сьлязьлівая песьня яго
Стала радасным звонам сталі.

Александравіч прышоў у беларускую літаратуру адразу, як прадстаўнік гарадзкога пролетарыяту. Ён першы ўнес у яе мотывы гораду, песьні аб „беларускім бруку". Дзякуючы гэтаму мы знаходзім у Александровіча процэсы працы шаўцоў, знаходзім газэтчыкаў і г. д. Але ён прывітае рост індустрыалізацыі раней адсталай краіны; прывітае машыну, якая, ва ўмовах соцыялістычнай бацькаўшчыны, палягчае працу рабочага; ён прывітае фабрыку, ён жадае для Беларусі „заўтрае клікаць сталёвай машынай".

„У шэрых завулках
разносіцца гулка
І ў цёмныя ночы,
І ў сонечны дзень
Скрогат суровы
машыны сталёвай,
Як песьня рабочых
агнём з грудзей".

Адкуль прыйшоў Александровіч? Чаму ён адразу знайшоў сваё месца ў грамадзе? На гэта мы знаходзім адказ у яго поэме „Дваццаць".

Бедная шавецкая сям'я. Часам няма хлеба, з гора бацька п'е, няма працы. Поэта дае мастацкае супроцьстаўленьне двух канцавосьсяў: капіталістычнага гораду, беднасьці рабочых кварталаў і багацьця, роскашы буржуазіі:

„У горадзе звонка,
вітрыны, агні
гудуць беспрасонку
і ночы і дні.
Са сьвістам ізвозчык
імчыцца з гары.
Вярбуюць на плошчы
Кіно-ліхтары.
Оркестра склікае
У кафэ-рэстаран.
Тракцір забаўляе
Песьняй цыган".

А тут поруч:

„Глуха ў завулках,—
бяднота, гальлё.
Лахмоцьце прытулак
Падпольлю дало!
Ні хлеба, ні сала—
Галодная сьмерць.
Рабочы ў падвалах
Выкоўвае сьмерч".

І адсюль вельмі лёгічна паўстае пытаньне, пытаньне балючае, якое няўхільна патрабуе адказу:

„Але за што? За што гэта
Адны ў сухотах мруць?
Другія сытным рогатам
Дукаты ў банк кладуць?"

Вось з гэтых падвалаў і раздаўся кліч: „Далоў царскі стан! І зусім зразумела, што пасьля рэволюцыі, калі выхаванец гэтага асяродзьдзя выходзіць на самастойны шлях жыцьця, ён ведае, з кім ён і супроць каго.

Яшчэ ў 1923 г. Александровіч піша:

„Гэй браты, кавалі жыцьця новага.
Вы прыміце мяне ў грамаду сваю,
Разам з вамі пайду ўперад сьмела я
Нясучы сьветач волі здабытае.

Сам я выйшаў з народу працоўнага.
Праца заўжды са мной неразлучная,
Мне знаёмы кавальскія молаты,
Мне ня нова, што там праца цяжкая"

У поэме „Дваццаць" ён яшчэ больш акрэсьлена паказвае свой шлях.

Пайшоў з рабочымі над сьвіст ліхіх віхур
Пайшоў бадзёры я, з прыпеўнасьцю агністай
І сёньня разам я з грамадай комуністаў
За цэглай цэгліну ўкладаю ў новы мур".

Аднак ня трэба думаць, што станаўленьне пролетарскага стылю ёсьць гладкі, нясупярэчлівы процэс, процэс, які роўна бяз усялякіх перашкод адбываецца, захоўваючы такім чынам чыстату гэтага стылю. Клясы ня ёсьць замкнутыя монады; у процэсе клясавай барацьбы адчуваецца

плыў розных клясаў, і нават на пролетарскі стыль часам уплываюць чужыя настроі. Сваясаблівасьць беларускага пролетарыяту, які быў раней і пад эканомічным і пад нацыянальным уціскам, знайшла сваё адлюстраваньне, праўда мымалётнае, у творчасьці Александровіча.

Адлюстраваньне нацыяналістычных настрояў знаходзім часткова у такіх вершах, як „На магілу Багдановіча", „Вечар", часткова ў поэмах „Дваццаць" і „Паўстанцы".

Так у поэме „Дваццаць" мы знаходзім наступныя радкі:

Глумілі нат накінуўшыся шквалам,—
За што? Хіба за тое, што, як кажуць,
нас злучала
адно—нацыянальнае—калтун!

. . . . . .

Казалі многа нам... Ці-ж ветры не
навеюць?—
Мужык і хам, і гад, і галыцьба.
І чым ня лаялі прыблудныя зладзеі,
краіну, дзе спрадвек пакутнасьці завеі,
дзе ня ўгледзіш чалавека без гарба".

Гэтыя моманты аднак не зьяўляюцца характарнымі для Александровіча. Ён мае права сказаць, што „поступу слаўнае перабудовы служыць маё бальшавіцкае слова" (эпіграф да другой часткі зб. „Вершы і поэмы"). І сапраўды, амаль усе вершы і поэмы зьяўляюцца гімнам працы і энтузыязму. Асабліва часта піша Александровіч аб фабрычным росквіце, аб машынах, аб радасьці працы.

„Варштат заменіць соткі рук,
Што робіш час, ён дасьць хвілінай.
Гэй ты, крылаты вольны друк,
Цябе вітаю я, машына".

Лепшай музыкай зьяўляюцца для яго фабрычныя гудкі, якія завуць да светлай будучыны, якія напамінаюць аб цёмным мінулым прыгнечанай краіны і аб радасным яе сёньня:

„Была дрыгва далінаю
Праз цэлыя вякі—
Цяпер гудуць машынныя
Гудкі... гудкі".

Ці:

І дзень і ноч гудзі, завод.
Ў паход, рабочыя паўстанцы!
І блізка час: сярод балот
Пачуем гул электростанцый.

Александровіч яскрава паказвае свае адносіны да гэтага новага; уздымам і бадзёрасьцю прасякнуты яго творы, сапраўднай партыйнасьцю. Аўтар выступае як барацьбіт, як змагар за гэтае будаўніцтва.

„Як добра жыць!
Цаглінкаю румянай
Будуем новыя, ня знаныя нам дні"

чуем мы ад яго.

Для яго

Нашы дні не маўклівы камень,
а шчасьлівы юнацкі разьбег".

Малюнкаў вёскі ў Александровіча амаль няма. Ён там адчувае сябе госьцем, але добра разумее ролю гораду ў справе перабудовы вёскі і важнасьць саюзу рабочага з працоўным сялянствам. Так на заводзе машына працуе

„Каб хутчэй, хутчэй у вёску
Пасланць сталёвы плуг.

. . . . . .

Селянін і рабочы, дарога
працярэблена вамі адна".

Але разам з апяваньнем росквіту Савецкай Беларусі мы знаходзім у Александровіча, у шмат якіх вершах, ідэі інтэрнацыяналізму; ён адчувае шчыльную сувязь паміж прыгнечаным пролетарыятам капіталістычных краін і ўжо вольным пролетарам сваёй краіны, які пасьпяхова будуе соцыялізм.

Так у вершы „Два сьветы" ён піша:

„Якая розьніца?
—Аднаж бяда пакута
Ўткачоў і Беластоку,
і Ліону
і Калькуты.
Якая розьніца?
(Хоць шлях змаганьня свой там)
Ці токар з Токіо,
ці з Вены,
ці з Дэйтройту".

У вершы „Крык галодных рыкш“ ён падае змаганьне працоўных Кітаю за сваё вызваленьне ад расійскіх і кітайскіх генэралаў, якім

„У гонар іх пагонаў
ім выдаў мандарын—
нью-ёркія патроны,
ангельскі карабін“.

Чоткі, чэканны памер гэтага вершу яшчэ больш падкрэсьлівае асноўныя яго вобразы. Але яшчэ больш вершаў прысьвячана становішчу працоўных ў Зах. Беларусі, якія стогнуць пад цяжкасьцю панскага гнёту. Такія вершы, як „Падпольлю“, „Беларуская марсэльеза“, „Панскі падарунак“ і цэлы шэраг іншых адбіваюць гэтую барацьбу працоўных за сваё вызваленьне там, дзе „лепшы сын краіны сёньня катаржанін“. Але поэта ўпэўнены ў перамозе працоўных над эксплёататарамі

„Узыйдзе й там пагода
Савецкай Беларусі“

Андрэй Александровіч бачыць ня толькі дадатнае ў нашым жыцьці. Аднэй з выразных рысаў поэты зьяўляецца яго вострае клясавае чуцьцё, нянавісьць да ворагаў нашай краіны. Амаль кожны верш яго, дзе ён бадзёра піша аб нашых перамогах, разам з тым папярэджвае, што трэба быць пільным, што яшчэ ёсьць „ворагі ў доме“, з якімі трэба змагацца, якіх трэба выяўляць, выкрываць, бо яны

„Жывуць, як след, жывуць
Прыкрыўшыся савецкім добрадушшам“.

Так у „Сасьне“ поруч з энтузыязмам працы мы знаходзім і такія месцы, як:

„Шмат каму нашае сёньня варожа,
Гатовы атрутай,
— чорнай пакутай,
— чорнай пакутай,
стрыножыць!
Чэшуцца рукі спрадвечных злодзеяў!

Калі мы возьмем ранейшыя вершы Александровіча, дык убачым, што яны больш багатыя агульнымі словамі, чым пазнейшыя. На гэтым моманце ў Александравіча мы спынімся далей, але пакуль што мы-б хацелі зьвярнць увагу на тое, што і вобразы ворагаў раней былі больш агульнымі, чым потым. Так у „Сасьне“ мы бачым, „ворага наогул“. У „Дзьвіне“ аўтар толькі абураецца супроць былых чыноў ды сучаснага мяшчанства, якія праводзяць свой час за картамі і грамафонам, але далей твар ворагаў усё больш канкрэтызуецца на працягу творчай працы пісьменіка.

У вершы „На лева-леваю“ мы знаходзім такое месца:

„І хоць бы ў нас савецкая краіна.
Дыктатура. Пролетарыят.
А зноў вылазіць за прылавак магазыну,
Як масла на ваду,
Буржуй і бюрократ“.

Гэта сьведчыць аб тым, што поэта гарыць клясавай нянавісьцю, але ўсё-ж ён не дастаткова ўсьвядоміў нашу рачаіснасьць, недыялектычна ахапіў яе ў яе супярэчнасьцях і анасродкаваньнях, бо гэткае няпры, няцьце нэпу гучыць неразуменьнем неабходнасьці дадзенага этапу ўпроцесе аднаўленьня нашай краіны. І тое, што „вылазяць новыя на нашы берагі„—гучыць так, быццам яны лезуць супроць нашаго жаданьня, быццам не палітыка Савецкай улады іх часова выклікала.

Александровіч, які раней крыху адчуваў уплыў нацыяналістычных ідэй, даволі хутка ад іх ацьвярозіўся. І далейшая яго праца ідзе па лініі жорсткага адпору нацдэмаўскім концэпцыям і тэорыям.

Ён змагаецца супроць ідэалізацыі мінулага (аб чым так настойліва пісалі нацдэмы); ён выступае супроць той думкі, быццам у „заляты век“ добра жылося народу. Поэта піша:

„Дзе ладанам чадзіў Францішак Скарына,
Чакалі стагодзьдзямі сонечны дзень.
Раней езуіты глумілі бясчынна—
Дый пакаленьні праклятых князей.“

Як мы ўжо вышэй казалі, ён супроцьстаўляе концэпцыі „адраджэнізму“—пролетарскі погляд, што толькі пасьля кастрычніка Беларусь магла зрабіцца вольнай, што яе будучае, трэба клікаць „сталёвай машынай“. Ён выкрывае ворагаў Савецкай улады, паказваючы іх сапраўдны твар, зрываючы з іх маскі, пад якімі яны хаваюць сваю зьвярыную нянавісьць да ўлады працоўных. Поэма „Цені на сонцы“ і зьяўляецца такой галерэяй варожых тыпаў, якія „жывуць, прыкрыўшыся савецкім добрадушшам“, якія ганяюцца за „ўзвышанымі спэцстаўкамі“ і абкрадваюць савецкую краіну.

Цэлы шэраг тыпаў, абмаляваных мастацкаю рукой поэты, праходзяць перад вачыма чытача. Болем і жгучай нянавісьцю, пролетарскай нянавісьцю гучаць словы поэты.

„Капейкі дарагія
зьбіраем мы адны,
А з іх жывуць былыя
праклятыя чыны.
І хочацца часьценька,
Каб ценяў гэтых жуць
Узяць і колкім венікам
страхнуць-бы, страсануць“.

Тут выслужыўся ў генэрал-барона ўнтэр-офіцэр, які жыве, „як спэц“, у ролі „кансультанта ў Саветаў“. Другі гэрой

„Няма т е дарогі
Дзе не рассыпаў-бы імкненьні
ён свае“.

Ён быў царкоўным старастай, хацеў быць архімандрытам, але... пашчасьлівілася—і ён пралез у шэрагі спэцаў.

Трэці славуты кум

„ня раз зьмяняў свой грым.
Ён земгусарам быў,
чыноўнікам,
міністрам
У Скарападскага па справам нутраным“.

Але, дзякуючы протэкцыі, і ён... знайшоў сабе цёпленькі прытулак.

Александровіч выкрывае іх шкодную ролю, іх мінулае, калі яны змагаліся супроць савецкай улады, калі яшчэ адзін з гэтай хэўры

„пра вернасьць кайзэру
аддана
тэлеграму
падпісваў крываваю рукой“.

А вось больш дробная сошка, „вядомы крытык“, які трымаецца, дзякуючы сваёй лісьлівасьці і падхалімству, якім памыкаюць нават сябры па справе, і ў якога таксама погляды вельмі хутка зьмяняюцца ў залежнасьці ад абставін.

„Расіец заўзяты ў расійскім парадзе,
выходзіў палякам на польскі парад,
Цяпер беларус пры савецкай уладзе“...

Простай мовай, у якой гучыць насьмешка разам з нянавісьцю і абурэньнем, малюе нам Александровіч гэтыя тыпы. Лёгкі рытм разам з высокамастацкай абмалёўкай, уменьне адшукаць асноўную рысу і выпукліць, адцяніць яе робяць гэтую поэму вельмі лёгкай для ўспрыняцьця яе чытачом; поэма робіць адпаведны ўплыў, дае патрэбную зарадку. Вось падхалім, ён стаіць, як жывы перад намі. Гэты чалавек добра ведае, дзе як трымацца, дзе як павярнуцца, каму як угадзіць.

„Дзе трэба—
лі сьлёзы,
дзе трэба—
падмаж.
Поміць свой лёзунг—
падхалімаж“

І ён не памыляецца:

„.. дзе падмажа, дзе зьліжа
зе пройдзе, а дзе падбяжыць“.

Александровіч, зьдзекваецца над імі ўсімі, выкрываючы ўсю іх варожасьць, шкоднасьць і ўменьне падмазывацца, карыстаючыся тым, што савецкая ўлада гасьцінна прыймала ўсіх спэцаў, усіх тых, хто выказваў жаданьне працаваць на карысьць Савецкага саюзу.

Але разам з тым аўтар хварэе за тое, што яны так сасуць працоўныя грошы, хаваючы камень за пазухай.

„Праца ўзяла бальшавіцкі ход.
У спаборніцтва выйшаў
працоўны народ!
А сэрца
балюча парой зашчыміць
калі, як хрыстос
на будоўлі стаіць
і брудзіць стан
бальшавіцкі
наш—
плянавы падхалімаж.

Александровіч не абмяжоўваецца толькі тым, што ён выкрывае твар ворага. Ён кліча працоўных да барацьбы супроць гэтых „ценяў“, заклікае ісьці вайною на іх, зьнішчыць гэтых паразытаў, якія зьядаюць працоўныя грошы, сабраныя для пасьпяховага будаўніцтва.

У той час, калі пачалася пісацца гэтая поэма ў 27 г., яшчэ ня была вядома тая контррэволюцыйная шкодніцкая праца, якую вялі ў нас, на Беларусі, зараз выкрытыя нацдэмы. Але варожасьць іх нашаму сёньня, пагоня за „спэц-стаўкамі“ без карыснай працы, іх паводзіны і адносіны да ўсяго савецкага кідаліся ў вочы пісьменьніку, які і даў нам гэтыя тыпы, заклікаючы на барацьбу з імі.

Пролетарскае чуцьцё не падманула поэту. Выкрытая нацдэмаўская організацыя, якая мела блізкія адносіны да СВУ і промпартыі, паказала ўсю агідна-шкодную ролю гэтых злодзеяў у той краіне, у якую яны зьвярнуліся, абяцаючы шчыра працаваць на яе карысьць. І вось Александровіч піша сваю невялічкую „поэму пра ворага“, эпіграфам да якой ён узяў вядомыя словы М. Горкага:

„Если враг не сдается, его уничтожают“.

Тут ён паказвае, як узварушыліся ворагі ў сувязі з тым, што „наш кожны крок сьлед прошласьці зьнішчае“, як кулакі, расійскія царадворцы і беларускія нацдэмы знаходзяць агульную мову згоды; як яны імкнуцца прадаць рабоча-сялянскую краіну „врозницу и оптом“:

„Хто даражэй заплоціць
Таму і ўклон з пакорай.
Вораг, што ў хаце—
Самы люты вораг“.

У ўдалай форме сатырычнага фэльетону малюе Александровіч у „Аўкцыёне“, як нацдэмы гандлявалі Беларусьсю:

„Цьвікевіч кляўся богам—
Ёсьць гліна, шкло і дзёгаць.
Лёсік голасам маршалкі:
Ёсьць сярнічкі ці запалкі.
Пан Ластоўскі ў грудзі стукаў:
Ёсьць спірытус, бульба, цукар.
Некрашэвіч сыпле ў жар:
Ёсьць крухмал і шкіпідар.

. . . . . .

І крычалі, і пісалі,
чаргаваліся лізалі
генэралам дэфэнзывы
так пакорна, так лісьліва“.

Такім чынам у асобе Андрэя Александровіча мы маем актыўнага змагара ў літаратуры за нашае будаўніцтва супроць ворагаў, супроць тых, хто шкодзіць нашаму будаўніцтву, хто імкнецца зацямніць „сонца будаўніцтва“.

І тым больш дзіўным здаецца ўдзел Александровіча ў лісьце 3-х пісьменьнікаў, учынак, які сыграў на руку нацдэмам, як унутраным так і замежным, тым, супроць якіх ён так востра змагаўся. Гэта было, бязумоўна, вялікай памылкай Александровіча, але ён хутка ўсьвядоміў і адмежаваўся ад яе. Гэты факт сьведчыць аб упартасьці класавай барацьбы ў нашай краіне аб тым, які ўплыў можа мець варожая ідэолёгія нават на лепшых пролетарскіх пісьменьнікаў.

Як прыклад яшчэ аднаго такога чужога ўплыву можна лічыць элемэнты богемскіх настрояў у невялікай колькасьці вершаў Александровіча. Але яны сустракаюцца не як сучасныя настроі аўтара, а як адносіны яго да якойсьці хваробы, якую ён здолеў перамагчы. Ён піша: „дзівішся надзвычай, выпадкам вынырнуў з атручаных богем“.

Такі эпітэт, „атручаныя“ богэмы, яскрава сьведчыць аб адносінах пісьменьніка да гэтага. Гэта быў уплыў чужы, уплыў дробна-буржуазнай інтэлігенцыі, якая была на шляху дэклясацыі. Але гэта ўвайшло ў творчасьць Александровіча, толькі як здань мінулага. На гэтым нават ня варта было-б спыняцца (бо ў творчасьці Александровіча гэтыя элемэнты займаюць нязначнае месца), калі-б у адным з крытычных артыкулаў у „Узвышшы“, на грунце двух-трох вершаў з богемскім адценьнем (падкрэсьліваю, што богемшчына заўсёды ў Александровіча паказваецца, як ужо пераможаная аўтарам), ігноруючы амаль усю астатнюю творчасьць яго, крытык імкнецца давесьці, што „Александровіч не ад пролетарыяту“, што ён не пролетарскі поэта. Гэткае сьцьвярджэньне толькі паказвае неразуменьне дыялектыкі нашай рачаіснасьці, неразуменьне супярэчлівасьці, станаўленьня таго ці іншага клясавага стылю, і ў прыватнасьці стылю пролетарскага, які можа адчуць на сабе часам, нават, і варожыя ўплывы, уплывы іншых клясаў ці клясавых груповак. Пролетарскі стыль не нараджаецца гатовым, адразу суцэльным, ён выкоўваецца, загартоўваецца ў процэсе клясавай барацьбы, у процэсе змаганьня з чужымі ідэолёгіямі, у процэсе росту і разьвіцьця сваёй сьвядомасьці, паглыбленьня свайго сьветапогляду.

Андрэй Александровіч унёс у беларускую літаратуру новыя рытмы, новыя бадзёрыя настроі, пролетарскі оптымізм, якія і выразіліся ў новых маляўнічых сродках. Гучныя вершы, лёгкі рытм—характарны для нашага поэты. Ягоныя мэтафоры і параўнаньні гучаць той-жа бадзёрасьцю, адцяняючы настрой вершаў, яго мэтафоры ўзяты з акаляючага асяродзьдзя і і служыць той-жа мэце.

„Цаглінкаю румянай будуем новыя нязнаныя нам дні“, кажа поэта, і ён вечар параўноўвае з разьвясёлым юнаком; у яго „вецер прысеў і сьпявае за фабрычным вакном“.

„Новы год ідзе чорнарабочым“. Гэтыя і цэлы шэраг іншых сьведчаць аб конкрэтнасьці ягоных параўнаньняў.

Сваю клясавую нянавісьць да нацдэмаў ён таксама змог перадаць праз яскрава-чоткія вобразы гэтых „гэрояў“, вобразы выпуклыя і пагэтаму высока мастацкія. Наогул, мы ў творчасьці Александровіча знаходзім шмат вельмі мастацкіх твораў, якія зьяўляюцца каштоўнымі скарбамі беларускай пролетарскай поэзіі.

Але разам з тым, асабліва ў ранейшых творах, мы маем і схэматызм вобразу, агульнасьць слоў. Тут варта ўспомніць вядомыя словы Плеханава аб тым, што, чым больш акрэсьленай будзе ідэя твору, тым у больш мастацкіх вобразах яна знойдзе сваё выражэньне. Мы можам сказаць, што, чым глыбей зможа мастак заглянуць у дыялектыку нашага разьвіцьця, чым глыбей ён зможа ўсьвядоміць супярэчлівае разьвіцьцё рачаіснасьці, тым больш высокай мастацкай каштоўнасьці творы ён зможа даць. У Александровіча часам трапляюцца такія вершы, дзе ідэя, іх установкі зьяўляюцца вельмі адцягнутымі, агульнымі, што

можа выразіцца ў мастацтве толькі праз агульныя словы. Такім прыкладам і зьяўляюцца хоць-бы частка вершу „Сасна“, дзе песьня рабочых вельмі агульная, хоць-бы „Чырвонаармейская“ „Вечар“ і некаторыя іншыя. Гэта часам трапляецца і выклікае няпрыемнае ўражаньне. Трэба адзначыць, што гэта з цягам часу ўсе зьмяншаецца, што ў процэсе свайго творчага росту Александровіч імкнецца пазбавіцца ад гэтага схэматызму, аб чым сьведчаць ягоныя новыя творы.

Аднак разам з тым трэба на гэтым спыніцца бо гэта вельмі важна пытаньне, пытаньне творчага мэтоду, прынцыпу ягонага ўсьведамлерачіснасьці.

У пролетарскага пісьменьніка, г. з. у пісьменьніка, сьветапогляд якога зьяўляецца пролетарскім, які выражае ў сваёй творчасьці ідэі, погляды і настроі пролетарыяту, гэта пытаньне ўпіраецца ў пытаньне ўзроўня яго сьветапогляду. І трэба сказаць, што, ня гледзячы на вялікае значэньне творчасьці Александровіча ў разьвіцьці пролетарскага стылю на Беларусі, ці, правільней кажучы, дзякуючы гэтаму, Александровічу ёсьць яшчэ над чым працаваць.

Творчы мэтод Александровіча недастаткова дыялектычны. Ён не заўсёды ўспрымае тое ці іншае зьявішча ў яго разьвіцьці і супярэчнасьцях. Як прыклад мы ўжо вышэй прыводзілі яго адносіны да „нэпманскае банды“, як да якойсьці навалы, якая „вылазіць на нашы берагі“, не разумеючы ці не гаворачы аб тым, што гэта таксама ёсьць супярэчнасьць нашага разьвіцьця. Гэта мы маем, нават, у лепшай поэме „Цені на сонцы“... У поэты мы знаходзім некаторае спрашчэньне тых ці іншых процэсаў нашага жыцьця. Вось, напр., у „Поэме імя Вызваленьня“ мы маем:

„Гудуць валы:
— Складай сталы.
І міма ходам:
— Ёсьць камода.
І... ў міг
Шкаф для кніг...“

Ці ў „Нараджэньні чалавека“

„Так з старой, падранай—мігам
робім новенькую кнігу“.

Прыкладам некаторай агульнасьці могуць быць і вершы „Першамайская“ і „Установка“.

Чым-жа тлумачыцца, што поруч з высокай мастацкай каштоўнасьці поэмамі і вершамі мы знаходзім некаторую спрошчанасьць зьяў і ўсё тое, аб чым казалі вышэй. Па нашай думцы, справа тут выключна ў некаторым адставаньні ўзроўня сьветапогляду поэты ад якасьці сьветапогляду, і гэту супярэчнасьць яму неабходна будзе перамагчы.

Вось гэты момант спрашчэньня і схэматызацыі, які залежыць ад узроўню сьветапогляду, і парадзіў такі твор Александровіча, як „Поэма імя Вызваленьня“, якая, бязумоўна, зьяўляецца зрывам у поэтычнай творчасьці Александровіча.

Тут, у гэтым творы, мы сустраем моцны ўхіл у бок лефаўскіх творчых установак. У гэтай поэме змагаюцца дзьве тэндэнцыі. Першая—імкненьне даць поэму выключна фактаў і лёзунгаў, імкненьне бязумоўна няправільнае, з другога боку, аўтар сам часам гэтага ня вытрымлівае і паказвае свае пачуцьці і адносіны да таго, аб чым ён піша. Бязумоўна, ужо самы падбор фактаў заўсёды гаворыць аб адносінах аўтара, аднак само гэтае імкненьне зьяўляецца няправільным, не нашым, зьяўляецца водгукам на буржуазныя, лефаўскія „об'ектывісцкія“ установкі.

Гэтыя ўстаноўкі адбіліся на мастацкім баку гэтай поэмы. Немузыкальны рытм, схэматызм вобразаў, нават падмена іх лёзунгамі, нацягнутасьць рыфмы—усё гэта сьведчыць аб няправільнасьці гэтых тэндэнцый.

Вось прыклад спрашчэньня зьявы жыцьцёвай, зьявы складанай.

„Сабе
хугары
у барацьбе
пакарыў
і ў нас—
кол-
гас“

І якраз найбольш мастацкімі месцамі гэтай поэмы зьяўляюцца тыя, дзе аўтар дае сваю ацэнку, дзе ён ня вытрымлівае ролі „обектыўнага“ наглядальніка. Тут між іншым мы бачым яскрава, як суб'ектывісцкая лёзунгавасьць ужываецца з об'ектывісцкай лефаўшчынай тыпу гульні на фактах.

Але гэткая ўстаноўка цалкам супярэчыць папярэднім установкам Александровіча, сапраўднай вострай партыйнасьці ягоных твораў, ягонай клясавай накіраванасьці. Гэткі ўплыў быў магчымым, дзякуючы вышэй паказаным момантам.

Асноўныя хібы ў творчасьці Александровіча—гэта неадпаведнасьць яго насычанай і вострай баявой партыйнасьці з недастаткова глыбокім разуменьнем супярэчнасцяй жыцьця ўва ўсёй ягонай складанасьці. Гэта да некаторай ступені паменшае і вастрату яго партыйнасьці.

Але калі возьмем два апошнія творы Александровіча: вершаваны роман „Нараджэньне чалавека“ і драматычную поэму „Напор“, дык мы ўбачым, што гэты ўплыў ён перамог, што ў гэтых творах мы зноў сустракаемся з бальшавіком-партыйцам, які змагаецца за новага чалавека, за новыя мэтоды працы,за перамогу соцыялізму („Напор“).

Роман „Нараджэньне чалавека“ па сваім ідэёвым зьмесце і мастацкім афармленьні стаіць значна вышэй папярэдняй поэмы. У аснове яго ляжыць цікавая для нас і ўдзячная ідэя аб перавыхаваньні чалавека пад уплывам савецкай грамадзкасьці, працы на савецкім прадпрыемстве. Праўда, і тут мы яшчэ маем некаторыя зрывы, ёсьць яшчэ некаторыя шурпатасьці, але вельмі многа значыць і тое, што аўтар адмовіўся ад „лініі найменшага супраціўленьня“, што ён паставіў перад сабой складаную ідэёва-мастацкую задачу паказаць складаны шлях „нараджэньня“ новага чалавека, даць паказ псыхолёгіі гэтага чалавека (якая мае значэньне, як псыхолёгія пэўнай клясы ці соцгрупоўкі), у абставінах клясавай барацьбы.

Крок за крокам сочыць аўтар за жыцьцём сваёй галоўнай гэроіні Марылі, цёплым пачуцьцём атуліває ён гэты вобраз. Цёплыя адносіны да яе адчуваюцца ў шэрагу лірычных адхіленьняў, заўваг і зваротаў.

Бедная дзяўчына, астаўшыся адна, трапляе ў рукі шпіёна і выконвае яго даручэньні. Аднак яна не сьвядомая шпіёнка. Яна нічога ня ведае, і, дзякуючы сваёй несьвядомасьці, яна можа быць выкарыстанай шпіёнам. Работа шпіёнскай банды, для якой Александровіч знайшоў досыць моцныя словы,—гэта адзін з бакоў клясавай барацьбы. Поэта паказвае, як несьвядомасьць іншы раз можа прывесьці да здрады, як у выпадку з Марыляй.

Пасьля выхаду з ЧК яна знайшла знаёмых і жыве ў іх. Тут мы знаходзім новы від клясавай барацьбы ў нас,—сальніка-гандляра Залтушкіна з ягонай хэўрай, якія спаіваюць шаўца, у сям'і якога жыве Марыля. Павал, сын шаўца, комсамолац, давёў да ведама міліцыі аб тым, што яны гоняць самагон. За гэта банда яго зьбівае.

Вельмі жывы тып Клемуся—хулігана, які хоча жаніцца на Марылі:

„Клемусь-хлюст—
пільнуй кішэні
Вокам як прыкінь,
Сплюне раз, штурхне, адсыценіць
І... бывай гадзьзіньнік..."

Пад добрым уплывам Паўла Марыля пачынае па крысе ўсьведамляць, што з ёй было, з кім яна павінна ісьці. Але гэта адразу лёгка не даецца. Калі Павал рубам ставіць перад ёй пытаньне:

„Прымай ці бывай
ці нашым, ці вашым",

яна яшчэ не адчувае сябе ні з кім, яна адчувае сябе, нават, лішняю ў жыцьці:

„А сёньня, здаецца, мяне нехта гоніць,
Як вецер, староньнюю хвалю".

Яна яшчэ не адчувае пад сабою глебы, яна няўпэўнена глядзіць на жыцьцё, яна яго палохаецца, яе турбуе

„Пытаньне адно,
Куды накіруе
жыцьця старно"

Яна, нават, думае проста ісьці на бульвар, ня ведаючы, куды прыхінуцца. Гэта не змагар, чалавек новы, гэта яшчэ толькі „трэска на хвалях", якая бездапаможна плыве туды, куды нясуць яе хвалі.

Аднак ёй удаецца паступіць на працу ў пераплётную майстэрню. Далей упэўніўшыся, што яна была толькі несьвядомай зброяй у руках шпіёна Дарубашвілі, яе вызваляюць з-пад нагляду ЧК. На разьвітаньне адбываецца цёплая гутарка са сьледчым, які таксама, як і Павал кажа ёй:

„Ці з багацеямі супроць братоў паўстаўшых,
Альбо з працоўнымі супроць багатыроў".

Але яна ўжо ня тая, што раней. Выбар яе ўжо канчаткова вырашаны; яна гаворыць, што цяпер яна зноў нарадзілася. І сапраўды, яна робіцца актыўнай грамадзкай працаўніцай, сумяшчаючы сваё асабістае, сваё каханьне да Паўла, ся сваімі грамадзкімі абавязкамі.

Такім чынам мы бачым, што некаторыя пытаньні пастаўлены тут досыць глыбока. Гэтая тэма сьведчыць аб тым, што аўтар больш глыбока пачынае ўсьведамляць нашую рачаіснасьць. Аднак, разам з тым неабходна паказаць і на тыя моманты, якія ўсё-ж знаходзяцца не на дастатковай вышыні, якія зьяўляюцца тут зрывам і адбіваюцца на ідэёва-мастацкай вышыні поэмы. Першае, на чым мы-б хацелі спыніцца, гэта на некаторых паасобных заўвагах аўтара, на некаторых непасрэдных яго выказваньнях. Сярод іх сустракаюцца нават і памылковыя погляды, погляды не марсысцкія, не нашы.

Напр., „Была вайна, ацэнім яе цаною крыві чалавека"—гучыць надта па-рэмаркаўскі, бо мы ацэньваем вайну цаною ня толькі крыві чалавека, а больш глыбокімі соцыяльнымі крытэрыямі. Тое самае і ў вершы аб людзкой злосьці, дзе аўтар кваліфікуе яе як нешта вечнае, пастаяннае і г. д.

Асноўным недахопам у гэтай поэме мы лічым адсутнасьць паказу працоўнага колектыву, пад уплывам якога перавыхоўваецца, пераражаецца Марыля. Яна паказана толькі ў сваіх адносінах з Паўлам, са сьледчым, і таму атрымліваецца ўражаньне, быццам адзіным фактарам выхаваньня, адным, хто меў на яе ўплыў, быў Павал, ну, і часткова, сьледчы. Ня гледзячы на тое, што аўтар імкнецца паказаць працоўны колектыў, гэта яму ня ўдаецца, і ён падмяняе яго процэсамі працы, адным тэхніцызмам. Але, нават, і процэсы працы падаюцца досыць спрошчана, аб чым мы ўжо казалі вышэй. Такім чынам, вобраз Марылі ня шчыльна зьвязаны з колектывам,

а зусім засланяе яго. Гэта прыніжае асноўную ідэёвую накіраванасьць твору, гэта не дае правільнага вырашэньня пастаўленай задачы, гэта гаворыць аб тым, што аўтар ня зусім справіўся са сваёй тэмай паглыбленага паказу чалавека, чалавека соцыяльнага, чалавека, які працуе на карысьць грамады, і які перавыхоўваецца пад яе ўплывам.

Пераходзячы да апошняга твору Андрэя Александровіча, твору, які зараз друкуецца ў „Маладняку" (№№ 11, 12), мы павінны сказаць, што ён стварае новы этап у творчасьці пісьменьніка, што ён сьведчыць аб творчым росьце поэты, што ён зьяўляецца каштоўным укладам у беларускую літаратуру і ў прыватнасьці ў тэатральны рэпэртуар.

Тут перад намі ўжо сапраўдны колектыў, комсамольскі колектыў дрэваапрацоўчага заводу, які будуе для Донбасу стандартныя дамы. Вось гэты момант — момант значэньня працы аднаго заводу для ўсяго Саюзу вельмі ўдала падкрэсьліваецца аўтарам праз аднаго з сваіх гэрояў, якраз шкодніка.

Гэта—драматычная поэма пад назваю „Напор" паказвае, як комсамольскі колектыў змагаецца за промфінплян, змагаецца за тэмпы, выкрываючы шкодныя, варожыя элемэнты.

Некаторыя таварышы параўноўваюць гэты твор Александровіча са „Стрэлам" Бязыменскага. Аднак трэба сказаць, што „Напор" выгодна адрозьніваецца жывасьцю сваіх вобразаў, як дадатных, так і варожых, ад „Стрэлу". Кожны з яго комсамольцаў, членаў працоўнага колектыву, мае сваю жывую індывідуальнасьць, што Бязыменскаму не ўдалося.

Сапраўды, лёгка запамінаецца Чыж, вынаходца, які марыць аб ракеце, што будзе лётаць „цераз мора, цераз горы", але якому не хапае конкрэтных ведаў. Яго ніколі ня зблытаеш ні з Базылём, ходзячым з складам розных цытат, ні з Стрэльбіным, сэкратаром комсамольскага колектыву, які ўсе сілы аддае працы, але які перагінае палку, лічачы, што ўсё асабістае перашкаджае працы.

Жывыя фігуры ворагаў: Клыча, старшага ў арцелі сэзоньнікаў і бракёра заводу, якія ціханька, няпрыкметна вядуць шкодную працу.

„Змоў ня трэба, не, ня трэба,
Ты сабе, а я сабе".

Гэта характарызуе кулаччо, якое ў сьляпой нянавісьці да ўсяго сучаснага („вось да вайны" ім было добра) імкнецца, дзе можна, пашкодзіць. Так, калі сапсаваўся конвэер, дык Клыч ад імя ўсяе арцелі выстаўляе рвацкія запатрабаваньні, і толькі дзякуючы комсамольцам удаецца яго справіць.

Але іх (ворагаў) выкрываюць, выкрываюць у напружаных абставінах паводкі, калі яны імкнуцца не дапусьціць падняць плаціну. Падняўшы плаціну можна выратаваць завод, але гэта затопіць частку рабочага пасёлку. І тут кулак выступае ў ролі абаронцы рабочых, протэстуючы супроць затапленьня пасёлку, таго самага пасёлку, аб якім ён раней казаў: „хай-бы яго затапіла". Аднак яму гэта не ўдаецца.

Трэба сказаць, што гэтая п'еса пабудавана вельмі жыва і ярка. Як ужо вышэй адзначалася, жывыя вобразы выклікаюць у гледача спачуваньне і могуць зрабіць адпаведную зарадку. Лёгкая вершаваная мова, шмат народных прыказак, „цытат", тое, што аўтару ўдалося пазьбегчы схэмы і даць сапраўдна-выпуклыя жывыя вобразы, усё гэта разам з комсамольскім працоўным энтузыязмам і бадзёрасьцю, напор-

лівасьцю ў змаганьні за прамфінплян і таварыскай вясёласьцю ў часы адпачынку, робіць п'есу сапраўдным агітатарам за соцспаборніцтва, за ўдарніцтва.

Гэту п'есу мы можам лічыць сапраўды новым этапам, новай ступеньню ў творчасьці А. Александровіча.

Такім чынам, аглядаючы творчы 10-гадовы шлях нашага пісьменьніка, мы можам сказаць, што гэты шлях быў ня зусім роўны, што пісьменьніку прыходзілася перамагаць тыя ці іншыя перашкоды на сваім шляху, што гэты шлях быў шляхам і перамог і зрываў, шляхам упартай працы.

Адзначаючы 10 год творчай працы Александровіча выразім пажаданьне, каб ён і далей змагаўся за клясавасьць, за партыйнасьць у літаратуры, каб у процэсе свайго далейшага творчага росту і працы над сабой ён даў бы беларускай пролетарскай літаратуры яшчэ больш цэльныя, яшчэ больш каштоўныя мастацкія творы.

С. Куніцкі

За ідэёва-мастацкі рост рабочых-ударнікаў

Расьце новы аўтар пролетарскай літаратуры, аўтар, які непасрэдна зьвязан з вытворчай практыкай, які зьвязан з заводам, фабрыкай. Заклік — масавы прыліў рабочых-ударнікаў у літаратуру — яскрава сьведчыць аб далейшым пасьпяховым разьвіцьці ленінскай культурнай рэволюцыі ў пэрыод уступленьня краіны ў соцыялізм, у пэрыод абвостранай клясавай барацьбы, якая выклікана рашучым наступам соцыялізму на варожыя элемэнты па ўсяму фронту.

Масавы прыліў рабочых-ударнікаў у літаратуру зьяўляецца яшчэ адным пераканаўчым адказам тым варожым тэорэтыкам мастацтва, якія ў свой час адчынена высоўвалі тэорыі (а ў замаскаванай форме высоўваюць яшчэ і зараз) аб немагчымасьці існаваньня пролетарскай культуры, пролетарскага мастацтва, пролетарскай літаратуры.

Масавы прыліў рабочых-ўдарнікаў у літаратуру таксама сьведчыць аб актыўнасьці і культурным росьце рабочае клясы Савецкага саюзу, сьведчыць аб тым, што літаратурная справа становіцца часткай агульнапролетарскай справы.

Рабочы прадпрыемства, па ўдарнаму выконваючы прамфінплян на сваім заводзе, на сваёй фабрыцы, падымаючы соцыялістычную вытворчасьць усё на вышэйшую і вышэйшую ступень, змагаючыся за аўладаньне тэхнікай, у гэты-ж час, у гэтым процэсе перавыхоўвае сябе: пашырае і паглыбляе свой сьветапогляд, усебакова разьвіваючы сябе інтэлектуальна. Адбываецца процэс зьнішчэньня розьніцы, ранейшай прорвы паміж фізычнай і разумовай працы на базе новых, супроцьлеглых капіталістычным вытворчых адносін, на базе колектыўнай працы, аграмаджанай гаспадаркі.

„Аграмаджаная вытворчасьць,— казаў у свой час Ф. Энгельс, гаворачы пра комуністычнае грамадзтва,—забясьпечыць усім членам грамадзтва існаваньне ня толькі матэрыальнае, зусім здавальняючае і заўсёды лепшае, але і гарантуе ім таксама вольнае разьвіцьцё і выяўленьне іх фізычных і духоўных талентаў".

Менавіта сьведкамі і ўдзельнікамі гэтага процэсу мы ўжо зараз зьяўляемся—у пэрыод разгорнутага соцыялістычнага будаўніцтва, у эпоху дыктатуры пролетарыяту.

І тольлі дзякуючы дыктатуры пролетарыяту, толькі дзякуючы ленінскай нацыянальнай палітыцы, дзякуючы правільнасьці генэральнай лініі комуністычнай партыі, у Савецкім саюзе мы маем нябывалы ў гісторыі чалавецтва росквіт культуры, культурны рост працоўных мас. Тады як у сьвеце капіталізму, які заблытаўся ў супярэчнасьцях, які раз'ядаецца крызісам, мы маем абсолютны заняпад культуры,—там культура, якая страціла пэрспэктывы далейшага разьвіцьця.

Што-ж новага ўносяць рабочыя-ўдарнікі ў пролетарскую літаратуру?

Перш за ўсё ў творчасьці рабочых-ўдарнікаў мы маем актуальную тэматыку, такую тэматыку, якая непарыўна зьвязана з клясавай практыкай маладых пачынаючых аўтараў. Такую тэматыку, якая бярэцца маладымі аўтарамі з пункту гледжаньня барацьбы за соцыялістычную вытворчасьць, якая сконцэнтравана навокал заводу, фабрыкі, цэха, якая накіравана на дапамогу выкананьня промфінпляну, на дапамогу аўладаньня тэхнікай, на паказ ударніка соцыялістычнай вытворчасьці, супроць прагульшчыка, шкодніка, гультая, за соцыялістычныя мэтоды працы.

Аб гэтым сьведчаць цалкам усе творы рабочых-ўдарнікаў, якія друкуюцца ў заводзкіх і фабрычных шматтыражках, цэнтральных газэтах, часопісах. Аб гэтым сьведчыць і той колектыўны зборнік рабочых-ўдарнікаў, які вышаў на днях, у якім удзельнічае да дваццаці рабочых-ўдарнікаў Менску.

Аднак зусім няправільна было-б сьцьвярджаць, што толькі ў тэматычным пляне зьяўляецца каштоўнай творчасьць рабочых ўдарнікаў. Справа ня ў тэме (хаця гэта мае вялікае значэньне), якую бярэ той ці іншы аўтар для свайго твору, а справа ў тым, наколькі мастацкі гэта тэма перададзена, чыя ідэя праз перадачу гэтай тэмы выражаецца. Гэта—галоўнае.

Творчасць рабочых-ўдарнікаў выражае нам ідэолёгію той асноўнай масы рабочае клясы, якая ўжо перамагла ў сабе ранейшага „наёмнага рабочага“ і рашуча змагаецца за ідэі соцыялізму на ўсіх франтох нашай рачаіснасьці, якая змагаецца за новыя адносіны да працы, соцыялістычныя адносіны.

Менавіта ідэолёгію гэтай перадавой часткі рабочае клясы выражае ў асноўным творчасьць рабочых-ўдарнікаў.

Аднэй з характарных ліній творчасьці рабочых-ўдарнікаў зьяўляецца лінія, якая выражае сабой неабмежаваную любоў, адданасьць прадпрыемству, машыне, варштату, неабмежаваную шчырасьць да працы на прадпрыемстве, адданасьць гэтай працы. Пры гэтым гэта шчырасьць ня вузка асабовага эгоістычнага парадку, а ў выразных інтарэсах сваёй клясы ў цэлым.

Возьмем для прыкладу хаця-бы творы варашылаўцаў. У іх гэта шчырасьць, адданасьць да працы праходзіць праз усе творы яркім пасьцам. Напрыклад, у творы рабочага ўдарніка Малашэнкі „Выхаванец комсамолу“, дзе комсамолец Мікола так захапіўся працай, што працуе зьверх тэрміну. „Захапленьне працай,—кажа аўтар,—засталося і на сёньняшні дзень. Таму і сёньня Мікола працуе пасьля гудка“.

У творы рабочага-ўдарніка гэтага заводу С. Шаўцова „Чырванасьцяжны“ рабочы Цімка, якому прыціснула нагу ў час працы на заводзе і якога ўрачэбная камісія на пэўны час аслабаніла ад працы,—ня хоча пакідаць працы. Гэты самы Цімка кажа: „Цяпер хварэць няма часу. Трэба вось скончыць гэту злыбяду ды за новае. Па маёй хваробе я буду магчы працаваць. Нагой-жа не працую. Хоць сеткі буду прышрубоўваць—і то праца“.

Тое самае мы маем у творы Я. Камянецкага „Нараджэньне“, дзе таксама рабочы-ўдарнік ня лічыцца са станам свайго здароўя, працягвае працаваць, гаворачы: „Пакуль ня скончу, ня кіну, хоць бюлетэнь у кішэні ляжыць“.

Тое самае мы бачым у творах рабочых-ўдарнікаў іншых прадпрыемстваў.

Напрыклад, у творы П. Швэйдэля „Фотографія“ (друкарня імя Сталіна) гэту шчырасьць да працы, адданасьць да працы мы бачым у цэлага колектыву, дзе „кожны

працаваў з такой хваткай, нібы яму пагражала небясьпека сьмерці, ад якой можна было пазбавіцца толькі, працуючы напорней і хутчэй".

Гэтыя прыклады сьцьвярджаюць словы тав. Сталіна, сказаныя ім ішчэ на XVI зьезьдзе партыі, аб тым, што мы маем карэнны павапот поглядаў на працу, што праца (труд) ператвараецца „из зазорного тяжолого бремени, каким он считался раньше, в дело чести, в дело славы, доблести и геройства". „В психологии мас, в их отношении к труду произошел громадный перелом, в корне изменивший облик наших фабрик и заводов" (Таксама словы тав. Сталіна).

Лепшай ілюстрацыяй гэтага пералому, гэтага павароту да працы менавіта зьяўляецца творчасьць рабочых-ударнікаў, якая адлюстроўвае гэты паварот.

У творчасьці рабочых-ударнікаў мы маем досыць яркі, глыбокі паказ, як наша сучаснасьць, наша соціялістычнае будаўніцтва перавыхоўвае людзей, блізкіх нам па сваёй клясавай сутнасьці, а таксама процэс перавыхаваньня тых людзей, якія ў сілу адпаведных прычын — уплыву на іх варожага соцыяльнага пласту, варожых элемэнтаў—адарваліся ад актыўнага ўдзелу ў соцыялістычным будаўніцтве.

Паказ гэтага процэсу перавыхаваньня мы маем хоць-бы ў творы А. Лёйбмана „Заява" (рабочага-ўдарніка заводу імя Варашылава).

У гэтым творы аўтар падае нам складаны псыхолёгічны вобраз з яго ўнутранымі перажываньнямі, падае чалавека, які прымаў актыўны ўдзел у грамадзянскай вайне, які ў гэты час аддаваў жыцьцё за справу рэволюцыі, але, калі папаў на завод, „здрэйфіў", як кажа аўтар. Гэты чалавек—Карпель кажа: „Я на вайне ваяваў, зараз хачу добра жыць, вольна дыхаць"...

На Карпеля зрабіла ўплыў мяшчанскае асяродзьдзе. Ён падпаў пад уплыў п'яніц, хуліганаў. У выніку гэтага ён робіць прагулы, п'янствуе, напяваючы Ясеніна:

„Кто-то мне в кабацкой сильной драке
Саданул под сердце финский нож".

І вось аўтар паказвае, як гэтага чалавека, фактычна нашага па сваёй клясавай сутнасьці, заводзкі комсамольскі колектыў перавыхоўвае, што гэты чалавек сілай магутнага соцыялістычнага процэсу вырываецца з варожых рук, варожых уплываў: мяшчанства і хуліганаўп'яніц. Аўтар паказвае, як гэты чалавек да глыбіні пераконваецца ў шкоднасьці тых учынкаў, якія ён рабіў пад уплывам мяшчанства ды п'яніц, і становіцца такім-жа актыўным змагаром, якім быў на фронце грамадзянскай вайны, становіцца ўдарнікам заводу.

Праўда, у гэтым творы ёсьць пэўныя зрывы. Але ў асноўным аўтар мастацка-ідэйна апраўдаў Карпеля.

Такое-ж перавыхаваньне мы бачым і ў творы Я. Эстэркіна: „Мішка Базарынаў".

Я. Эстэркін паказвае перараджэньне, перавыхаваньне бяспрытульнага Мішкі—юнака, які, „ня маючы ні бацькоў, ні дому, блукаў па вуліцы, шукаючы месца, дзе-б можна было паспаць ці дастаць чаго небудзь паесьці. Калі гэта не ўдавалася, ён краў".

Гэты бяздомны юнак (паказаны, праўда, схэматычна) пад уплывам нашага соцыялістычнага будаўніцтва, пад уплывам комсамолу становіцца правадыром піонэрскага атраду, пасьля пападае на завод, становіцца актыўным комсамольцам ды робіцца лепшым рабочым заводу. „Мішка ўзяўся за работу. Для яго завод, варштат, разец, ключ, матор —нешта роднае блізкае. Добра зробленыя дэталі—для Мішкі ўсё".

Аўтар далей паказвае, як Мішка становіцца майстрам, інструктарам цэху.

Такіх прыкладаў можна было-б прывесьці цэлы шэраг.

Гэтыя прыклады гавораць за тое, што творчасьць рабочых-ударнікаў у цэлым—ёсьць сапраўдная разьвіцьцё пролетарскай літаратуры, што іх творчасьць, якая выцякае з непасрэднай практыкі пролетарыяту, якая адлюстроўвае процэс змаганьня за социялістычнае будаўніцтва,—зьяўляецца ў той-жа час вострай зброяй у руках пролетарыяту на фронце гэтага будаўніцтва.

Творчасьць рабочых-ударнікаў зьяўляецца вялікай сілай, якая дапамагае пролэтарскай літаратуры ліквідаваць сваё адставаньне ад тэмпаў социялістычнага будаўніцтва, якая дацамагае пролетарскай літаратуры выканаць социяльны заказ нашай сучаснасьці, змагацца „за вялікае мастацтва бальшавізму".

Але справа крытыкі ў адносінах да творчасьці рабочых-ударніках ня ў тым, каб адзначаць толькі дадатныя бакі гэтай творчасьці, каб толькі хваліць маладых аўтараў. Я думаю ў гэтым рабочыя-ўдарнікі ня маюць патрэбы. Яны самі добра ведаюць, што яны робяць вялікую справу для сваёй клясы, для социялістычнага будаўніцтва.

Справа нашай крытыкі заключаецца ў тым, каб правільна ацаніць іх творчасьць, каб правільна ўказаць на тыя значныя недахопы, якія маюцца ў творчасьці рабочых-ударнікаў. І толькі робячы гэта, мы дапаможам рабочаму-ударніку падняцца на вышэйшую ступень, дапаможам іх творчасьць зрабіць яшчэ больш актуальнай, яшчэ больш каштоўнай у інтарэсах сваёй клясы, у інтарэсах социялістычнага будаўніцтва, у інтарэсах выхаваньня мільённых мас працоўных.

Трэба сказаць, што ў нас мае месца нездаровы падыход да творчасьці рабочых-ударнікаў, падыход, які ня толькі недапамагае далейшаму росту ўдарніка, а, наадварот, спыняе гэты рост.

Гэтыя няправільныя, і разам з тым шкодныя, падыходы да творчасьці рабочых-ударнікаў ідуць у двух кірунках, хаця яны робяць адну паслугу.

Ёсьць пэўная частка пісьменьнікаў, нават з белаппаўцаў, якія гатовы крычаць на ўвесь голас, што творчасьць рабочых-ударнікаў зьяўляецца нікудышнай, не мастацкай, або, нават, няпісьменнай. Заклік рабочых-ударнікаў у літаратуру, гэтыя таварышы лічуць—не процэсам, які адбываецца ўнутры рабочае клясы і які абазначае яе культурны рост толькі пустым вымаганьнем пісьменьніцкіх організацый, штучным стварэньнем літаратурных кадраў. Аб шкоднасьці гэтага погляду гаварыць ня прыходзіцца.

Праўда, гэтыя таварышы адчынена гэты свой абмежаваны погляд не выказваюць, але ён мае месца.

Другі погляд на творчасьць рабочых-ударнікаў, які выказваецца нашымі таварышамі і які, на жаль, рэалізуецца на старонках нашых часопісаў,—гэта празьмернае захвальваньне маладых аўтараў. Погляд, які праяўляе неабмежаванае інтэлігенцкае „рабочелюбие". Гэтыя таварышы ў творчасьці рабочых-ударнікаў бачаць ужо зусім афармленыя творы пролетарскай літаратуры. Яны лічаць творчасьць рабочых-ударнікаў высока-мастацкай творчасьцю. На іх думку, маладыя аўтары рабочыя-ўдарнікі цалкам уладаюць дыялектычна-матэрыялістычным мэтодам, і астаецца толькі нашым пролетарскім пісьменьнікам павучыцца ў рабочага-ўдарніка, тады пролетарская літаратура ліквідуе сваё адставаньне і г. д.

Я хачу спаслацца на шкодны ў гэтых адносінах артыкул Н. Кабакова „Ударнік прышоў у літаратуру", які зьмешчаны ў 6-7 кнізе „Полымя" за гэты год і на верш Юркі Лявоннага „Размова з поэтам-ударнікам", які зьмешчаны ў 8 кнізе „Полымя" за гэты год.

Што гаворыць у сваім артыкуле Н. Кабакоў адносна творчасьці рабочых-ударнікаў?

Ён сьцьвярджае, што рабочыя ўдарнікі цалкам уладаюць „дыялектычна-матэрыялістычным мэтодам, які (ударнік—С. К.) усе зьявы бачыць і малюе ў супярэчнасьцях, дае зьявы ў тым выглядзе, у якім яны знаходзяцца зараз, але паказвае, куды гэтыя зьявы растуць, дае зьявы ў іх руху". Н. Кабакоў ня бачыць, а таму і ня ўскрывае у творчасьці рабочых-ударнікаў тых значных недахопаў ды зрываў, аб якіх я кажу ніжэй.

Тое самае з аплёмбам заяўляе і Юрка Лявонны ў вершаванай форме:

Вас падымаюць
драбіны гісторыі,
Лепей за ліфта
намасьлены шруб,
З нетраў,
што доменным бляскам
азораны,
На поэтычны
заежджаны брук.

Па-першае ў гэтых радкох выражаецпа політычная няпісьменнасьць. У Юркі Лявоннага атрымоўваецца так, што заклік рабочых-ударнікаў у літаратуру мае той сэнс, што рабочага-ўдарніка проста спасаюць ад нечага, выцягваюць за вушы „з нетраў, што доменным бляскам азораны, на поэтычны заежджаны брук".

Поўная няпісьменнасьць. Здаецца кожнаму ясна, што ў нас, дзе азараюць доменныя бляскі, ня „нетры", а арэна, перадавы фронт социялістычнага будаўніцтва, адкуль рабочага-ўдарніка зусім не патрэбна выцягваць „на поэтычны брук", а ў гэтым доменным бляску, у процэсе вытворчасьці рабочы сам расьце ўва ўсіх адносінах. Вынікам гэтага росту зьяўляецца і яго прыход у літаратуру. І вось тут і трэба дапамагчы рабочаму-ўдарніку, але не дыфірамбам, не халтурай, а сапраўдным пролетарскім творам, таварыскай дапамогай.

Бязумоўна, гэтыя абодвы погляды на творчасьць рабочых-ударнікаў зьяўляюцца шкоднымі. Яны не даюць магчымасьці маладому аўтару перамагаць у сваёй творчасьці тыя недахопы, якія маюцца. Не даюць магчымасьці, такім чынам, падымацца на вышэйшую ступень разьвіцьця.

„Роля ўдарнікаў пролетарскай літаратуры ўзмацнілася. Аднак будзе перавялічэньнем сказаць, што ўдарнік ужо стаў цэнтральнай фігурай пролетарскага літаратурнага руху („Праўда", 19 лістапада 1931 г.).

Які творчы мэтод ударнікаў на данай ступені іх творчага разьвіцьця?

На данай ступені разьвіцьця творчы мэтод рабочых-ударнікаў, бязумоўна, зьяўляецца матэрыялістычным у сваёй аснове. Але недахоп дыялектычнага падыходу да зьяў дае сябе адчуваць. Маладыя аўтары ня ў сілах свой сьветапогляд зьліць у адзінстве вобразу з фактам, з об'ектам твору. Ня ў сілах праз індывідуальнае паказаць агульнае, праз частку-цэлае і наадварот.

У рабочых-ударнікаў зусім правільны адыходны пункт у іх творчасьці. І зараз ударнікі ў сваёй масе стаяць на шляху аўладаньня мэтодам дыялектычнага матэрыялізму, што ў далейшым пазбавіць іх ад тых недахопаў, тых зрываў, якія маюць яшчэ месца ў іх творчасьці.

Зараз у творчасьці рабочых-ударнікаў займае вялікае месца схэматызм. Схэматызм не абстрактны, які меў месца на першым этапе разьвіцьця пролетарскай літаратуры, а схэматызацыя конкрэтных людзей, конкрэтных рэчаў.

Маладыя аўтары часта ня ў сілах падаць у мастацкіх вобразах тую ідэю, якая ў іх сформавана ў лёгічным мышленьні; ня ў сілах яшчэ для выражэньня тае ці іншай

ідэі выбраць асноўнае і гэта асноўнае выразіць, перадаць у мастацкіх вобразах.

Возьмем хаця-б таго-ж Я. Эстэркіна і яго твор „Мішка Базарынаў". Аўтар задумаў даць цікавы факт, каштоўную ідэю, якая выцякае з сучаснага этапу соцыялістычнага будаўніцтва. Паказаць, як вытворчасьць, якую людзі ператвараюць, ператварае людзей. Але-ж гэта перадача, паказ у аўтара атрымаўся схэматычным. Аўтар паказвае нам бяспрытульнага Мішку. Раптам Мішка становіцца правадыром піонэрскага атраду. Затым з такой-жа раптоўнасьцю, без паказу перараджэньня, Мішка апынуўся на заводзе, тут ён становіцца комсамольцам, кваліфікаваным рабочым, затым інструктарам і нават сэкрэтаром комсамольскай ячэйкі. Усё гэта адбываецца з такой хуткасьцю, што чытачу, нават, цяжка сконцэнтраваць увагу на яго поступе ўперад і поўна ўявіць яго вобраз.

Такі схэматызм таксама мы маем у творы Я. Камянецкага „Нараджэньне", дзе аўтар паказвае змаганьне аднэй брыгады з прарывам. Твор сам па сабе вельмі цікавы. Але-ж аўтар упаў у схэматычнае адлюстраваньне. У аўтара рабочы колектыў выступае неяк у аднэй вопратцы, моналітным; рабочыя без індывідуальных асаблівасьцяў; справы вырашаюцца неяк вельмі лёгка.

Калі на сходзе старшыня ставіць пытаньне: „давайце прагаласуем за сустрэчны прамфінплян на дзесяць экстрактараў" і пытае: „хто за"?

Усе паднялі рукі.

„Хто супроць?"

Шульман—Я.

„Хто за ўзняцьце продукцыйнасьці працы?"

Зноў усе паднялі рукі ўгору.

„Хто супроць"?

„Я—прагаварыў Шульман".

„Хто за зьніжэньне сабекошуу на 25 процантаў?

„Зноў паднялі рукі".

Усё неяк гладка, лёгка, усё вырашаецца неяк на адным сходзе: і сустрэчны прамфінплян, і продукцыйнасьць працы, і зьніжэньне сабекошту і г. д. Не адчуваецца сурьёзнасьці і глыбокай прадуманасьці вытворчых пытаньняў.

Тое-ж самае ў адносінах схэматызму можна сказаць і пра апавяданьне П. Швэйдэля „Фотографія". Аўтар паставіў проблему клясавай барацьбы на вытворчасьці, але адпаведна яе не паказаў. У гэтым творы П. Швэйдэль адлюстроўвае барацьбу з прагульшчыкамі, якія зрываюць прамфінплян вытворчасьці. Але з твору атрымоўваецца, што прычыны прагулу заключаюцца ў тым, што хлопец пакахаў дзяўчыну, з гэтай прычыны ён робіць прагулы. Глыбей гэтага аўтар прагулу ня тлумачыць.

Вялікае месца ў творчасьці рабочых-ударнікаў займае эмпірызм. У чым ён заключаецца?

Ён заключаецца ў тым, што паступкі, погляды і пачуцьці асобнага рабочага не пастаўлены ў цесную сувязь з тым агульным, што адбіваецца ў краіне.

Зразумелая справа, што тут нама патрэбы абмалёўваць, апісваць усё тое, што адбываецца, напрыклад, зараз у нашай краіне: даваць поўны малюнак эканомічнага і палітычнага жыцьця, даваць лічбы росту нашых колгасаў, клясавую барацьбу на вёсцы. Але неабходна браць факты соцыялістычнага наступленьня і адлюстроўваць іх так, каб яны былі цесна ўвязаны з агульным соцыялістычным процэсам, каб гэтыя факты ня браліся і не адлюстроўваліся адарвана, павярхоўна. Паказаць, якое месца той ці іншы факт займае на прадпрыемстве, паказаць яго аснову і як ён узьдзейнічае на сьвядомасьць рабочага.

Амаль кожны малады аўтар бярэ факт соцспаборніцтва, ударніцтва на тым ці іншым прадпрыемстве, бярэ факт барацьбы за выкананьне

прамфінпляну, факт барацьбы з бракам, прагулам і інш. Але далёка ня кожны рабочы-ўдарнік паказвае, як гэта барацьба за падвышэньне соцыялістычнай вытворчасьці ў сваю чаргу ўзьдзейнічае на псыхіку рабочага, псыхіку рабочага колектыву. Інакш кажучы, констатуецца той ці іншы факт, але не паказваецца актыўная роля гэтага факту, генэзіс яго.

Для прыкладу возьмем твор рабочага-ўдарніка заводу „Комунар" Гольмана „Рост".

Асноўная ідэя гэтага твору—паказаць рабочага-ўдарніка заводу, які праз клясава-сьвядомыя адносіны да працы, праз вялікую зацікаўленасьць процэсамі вытворчасьці праз аўладаньне тэхнікай, падымаецца аж да годнасьці дырэктара заводу. Навокал гэтай ідэі, росту гэтага рабочага да дырэктара заводу, мы бачым змаганьне рабочага колектыву за тэмпы працы, за выкананьне прамфінпляну. Але мы таксама бачым няроўныя адносіны да працы з боку рабочых. Асноўная маса рабочых працуе па-ўдарнаму, але ёсьць і нядбайнікі, гультаі, лятуны. І вось у паказе гэтых няроўных адносін да працы аўтар далей констатаваньня факта ня ідзе.

Напрыклад, такі факт (які мае месца ў творы) як лятунства. Тры маладыя рабочыя хлопцы пакідаюць завод і хочуць ехаць у іншы горад. Чаго? Невядома. Толькі калі ў іх запыталіся, чаму яны пакідаюць завод, дык адзін дае тлумачэньне такое:

„Калі я пакідаў завод, я быў з моцнай думкай паехаць адгэтуль. Справа заводу, што не хапае рабочых рук,—менш усяго клапаціла мяне. Так, так, па праўдзе кажучы, я нават і думаць не хацеў аб гэтым".

Аўтар бачыць факт, факт зусім рэальны ў жыцьці заводу. Але глыбей паверхні факту аўтар нічога ня бачыць. Для чытача зусім не зразумела, чаму гэтыя маладыя хлопцы пакідаюць завод, чаму ў іх такія індыфэрэнтныя адносіны да яго. Таксама застаецца толькі констатаваньнем факту тое, што „ранейшыя рвачы, прагульшчыкі і лятуны, як Ламакін Борка і іншыя,—сталі ўзорнымі рабочымі." Аўтар не паказвае нам розьніцы паміж рабочым-ударнікам і лятуном ці рвачом у іх сьветапоглядзе, у псыхолёгічным разрэзе. і таму застаецца толькі голы факт.

Трэцім недахопам у творчасьці рабочых-ударнікаў зьяўляецца публіцыстычнасьць. Такая публіцыстычнасьць, якая не знаходзіцца ў адзінстве з вобразным мысьленьнем. Часьцей усяго бывае так, што маладыя аўтары ня ўсілах перадаць у вобраз тую ідэю, якая выцякае з іх штодзённай практыкі. Неяк адчуваецца недахоп фарбаў для абмалёўкі таго цэнтральнага ў творы праз, што аўтар хацеў перадаць сваю ідэю. Таму аўтар зрываецца на голую публіцыстыку, прымушае свайго гэроя гаварыць газэтнай мовай або гаворыць сам гэтай мовай.

Зноў-такі для прыкладу можна прывесьці твор рабочай-ударніцы заводу „Комунар" Ф. Фельдман „Комсамольскі інтэрнат". У гэтым творы аўтар паказвае актыўнага комсамольца, які змагаецца за новы быт рабочага. Мастацкі паказ зусім слабы. Аўтар увесь час зьбіваецца на публіцыстычную апавядальнасьць, а самы канец твору заканчваецца проста урыўкам з газэтнага артыкулу.

„Комсамольскі інтэрнат—лепшы падарунак МЮД'у. Рад гэтаму Янка, а з ім ўвесь рабочы калектыў заводу".

„Такіх комсамольцаў, як Янка, шмат на заводзе. Змагаючыся на гаспадарча-палітычным фронце, яны даюць рашучы адпор усім тым, хто марыць аб тым, каб пакінуць завод".

Такім чынам мы маем тры асноўныя недахопы ў творчасьці рабо-

чых ударнікаў, якія адбіваюцца на мастацка-ідэйнай вартасьці іх твораў. Ударнікі факты рачаіснасьці бяруць ня ў сувязі з агульным процэсам, ня ў руху, ня ў супярэчнасьцях, а часьцей усяго статычна. Інакш кажучы, моцнай здаровай клясавай практыкі, глыбокай чульлівасьці не хапае дыялектычнага падыходу.

Рабочыя-ўдарнікі яшчэ ня ўмеюць той ці іншы факт рачаіснасьці перадаць так, каб ён сабой падаваў нешта цэлае, ня ўмеюць паказаць праз частку-цэлае, праз прыватнае агульнае.

Адгэтуль зразумела і тое, чаму ў творах рабочых ударнікаў мы маем пэўную абмежаванасьць светаўспрыйманьня. Тая тэматыка, якая бярэцца аўтарамі для сваіх твораў, тыя факты соцбудаўніцтва ў галіне вытворчасьці, якія адлюстроўваюцца рабочымі ударнікамі, у сваім мастацкім паказе неяк ня выходзяць за межы брыгады, цэху, заводу, фабрыкі. Менавіта завод, фабрыка, цэх, брыгада бярэцца статычна,—не ў процэсе агульнага соцыялістычнага будаўніцтва. І больш гэтага, нават, ў межах аднаго заводу ці фабрыкі, у межах цэха ці брыгады адлюстраваньне часта набывае аднабаковы характар. Паказваецца адзін бок жыцьця вытворчасьці. Часьцей усяго паказваецца змаганьне рабочых з прарывам, з недахопамі на вытворчасьці барацьба за выкананьне прамфінпляну (ўсё гэта, бязумоўна, зьяўляецца важным), але разам з гэтым паказам недастаткова паказваецца, (ва ўсякім разе ня глыбока і ня поўна) той барацьбіт соцыялістычнай вытворчасьці, рабочы - ўдарнік гэрой пяцігодкі, які ўдзельнічае ў гэтым процэсе.

Гэтага рабочага-ўдарніка, які сьвядома змагаецца за ідэю соцыялізму, які зьяўляецца новым чалавекам цяперашняга этапу соцыялістычнага будаўніцтва мы бачым толькі каля варштату, за працай. Маладыя аўтары яшчэ не паказваюць нам гэтага новага чалавека ў іншых момантах жыцьця рабочае клясы. Слаба паказваецца сувязь політычнага, бытавога жыцьця з практыкай, жыцьцём на вытворчасьці.

Мы тут спыніліся і прыводзілі прыклады з прозаічных твораў рабочых-ударнікаў. Трэба сказаць, што тая агульная характарыстыка якая прыводзілася намі ў адносінах да прозаічных твораў рабочых-ударнікаў зьяўляецца характарнай і для поэзіі.

Сярод поэтаў рабочых-ударнікаў ёсьць таварышы, якія ўжо даюць нядрэнныя вершы, якія ў пэўнай меры ўладаюць тэхнікай вершу. Возьмем хоць-бы вершы С. Нортмана (завод Імя Варашылава). У вершах Нортмана мы маем зусім правільнае вобразнае адлюстраваньне рачаіснасьці. Вершы Нортмана прасякнуты пафосам соцыялістычнага будаўніцтва. Ён адлюстроўваючы той ці іншы факт рачаіснасьці, выходзіць зусім з правільнай асновы, з практыкі рабочай клясы.

Возьмем яго верш „Супроцьлегласьці“, дзе аўтар стараецца паказаць поўную супроцьлегласьць у разьвіцьці краіны дыктатуры пролетарыяту, дзе:

„... будуецца край,
паўстаюць
новыя
фабрыкі,
колгасы,
заводы.
Расьцем,
цьвіцем,
нібы май,
Ідзем
ад адпэй
да другой
перамогі

і краі капіталістычных дзяржаў, дзе руйнуецца гаспадарка, дзе жыцьцё згарае ў супярэчнасьцях.

Нортман у гэтым вершы яскрава падкрэсьлівае нашу магутнасьць, нашы перамогі ў будаўніцтве соцыялізму на ўсіх франтох.

Праўда, вершы Нортмана маюць і свае недахопы. Яны не пазбаўлены некаторага схэматызму, у яго вершах шмат лёзунговасьці. Гэтыя лёзунгі часта нанізваюцца адзін на другі, і паміж сабой у іх слабая мастацкая сувязь.

Досыць моцнымі зьяўляюцца таксама вершы Бацюшкова, у прыватнасьці яго верш „На кліч эпохі“ У гэтым вершы аўтар падкрэсьлівае вялікае значэньне нашых тэмпаў і мэтодаў у соцыялістычным будаўніцтве. Поэта падкрэсьлівае, што наша шчырая адданасьць да працы, наша класавая сьвядомасьць зьяўляецца сьмяротным ударам па клясаваму ворагу.

Магілай ворагу
Будзь наша праца.

Аўтар у гэтым вершы заклікае шчыльней згуртавацца навокал працы, навокал соцыялістычнага будаўніцтва.

За строем строй
паход!
Шчыльней колёны!
Чацьвёрты стрэнем год
Ударам стомільённым“.

Таксама характарным для маладога поэты зьяўляецца верш „Мы рэжам і стружам“. У гэтым невялічкім вершыку аутар хоча падкрэсьліць шчырасьць да працы, перадаць тэмпы самой працы на дрэваапрацоўчай вытворчасьці.

У гэтым вершыку ўдала перадаецца размах гэтай працы, сустракаюцца сьвежыя і нядрэнныя параўнаньні.

„Рассыпайся трэльлю,
грымзай варштаком,—
каб качкаю падстрэленай
круціўся стружак ком“.

Недахопам вершаў Бацюшкова зьяўляецца тое, што аўтар мае тэндэнцыю да абстрагаванасьці, павярхоўнай перадачы. Мала цікавіцца ён об'ектам з пункту гледжаньня прычыннай сувязі яго з рачаіснасьцю, часта зусім ня ўскрывае тых ці іншых сувязяй.

У С. Нортмана і М. Бацюшкова ёсьць пэўнае ўменьне, здольнасьць перадаць адпаведную ідэю (хаця з пэўнымі недахопамі) праз вобраз у вершаванай форме.

Кажучы наогул аб поэзіі рабочых ударнікаў, трэба сказаць, што яна зьяўляецца шмат слабейшай за прозу. У прозе мы маем паўнейшую і глыбейшую перадачу ідэі, адлюстраваньне рачаіснасьці. У прозе рабочых-ударнікаў больш конкрэтнасьці чым поэзіі.

У некаторых поэтаў у вершах надзвычайна шмат прозаізмаў, як напрыклад:

„Гаспадарчы разьлік
на заводзе—
дапаможа ў працы
брыгад.
У выкананьні усяго
прамфінпляну
і кваліфікацыі ўдарных
брыгад“.

Але і поэзія, як і проза, мае здаровы пачатак. Маладыя поэты зыходзяць з практыкі сваёй клясы яны пішуць у імя барацьбы гэгай клясы за ідэі соцыялізму.

Такім чынам, у творчасьці рабочых-ўдарнікаў мы маем магутную сьвежую сілу, якая дапаможа і дапамагае пролетарскай літаратуры ліквідаваць сваё адставаньне ад тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва, сілу, якая дапаможа стварыць вялікае мастацтва бальшавізму, якая дапаможа пролетарскай літаратуры заваяваць гэгемонію. З другога боку, творчасьць рабочых ударнікаў у сваю чаргу патрабуе крытычнага да сябе падыходу, патрабуе вялікай дапамогі з боку пролетарскай літаратуры, з боку марксысцка-ленінскай крытыкі, у сэнсе паглыбленьня і пашырэньня сьветапогляду маладых аўтараў рабочых-ударнікаў, у сэнсе дапамогі ім у аўладаньні мэтодам дыялектычнага матэрыялізму, у аўладаньні тэорыяй марксызму-ленінізму. Бяз сур'ёзнай работы над сабой у гэтым напрам-

ку: ідэйна-мастацкі рост іх творчасьці не магчымы.

Творчасьць рабочых-ударнікаў павінна стаць у цэнтры ўвагі нашай марксысцка-ленінскай крытыкі. Наша крытыка павінна не абмяжоўвацца агульнымі артыкуламі пра творчасьць рабочых-ударнікаў, а браць іх паасобныя творы і канкрэтна ўказваць на іх дадатныя бакі і іх недахопы.

Новыя рабочыя-ўдарнікі з кожным днём уліваюцца ў агульнае рэчышча пролетарскай літаратуры. Літаратура прымае масавы характар. Да літаратуры і мастацтва наогул з кожным днём ставяцца ўсё большыя і большыя запатрабаваньні з боку працоўных мас.

У свой час У І Ленін у лісьце да Клары Цеткін пісаў:

„... Нашы рабочыя і сяляне заслугоўваюць чагосьці большаго, чым відовішчаў. Яны атрымалі права на сапраўднае вялікае мастацтва"

„... Рэволюцыя разьвязвае ўсе скованыя да гэтага сілы, і гоніць іх з глыбіні на паверхню жыцьця... але, зразумела, мы комуністы. Мы не павінны стаяць, склаўшы рукі, і даваць хаосу разьвівацца куды хоча. Мы павінны зусім плянамерна кіраваць гэтым процэсам і фармаваць яго вынікі".

Е. Гальперына.

Праявы вялікадзяржаўнага шовінізму ў літаратуразнаўстве і крытыцы

Контррэволюцыйны нацыянал-дэмократызм знайшоў надзвычайна яркае і акрэсьленае выяўленьне ў мастацкай літаратуры, гісторыі літаратуры і крытыцы на Беларусі, як закончаная сыстэма поглядаў. Гэта значна палягчала тую ўпартую і сыстэматычную барацьбу, якую на працягу апошніх год правяла з ім комуністычная крытыка на Беларусі. Між тым вялікадзяржаўны шовінізм у Беларусі ня даў у гэтых галінах такіх адчыненых і сыстэматызаваных выступленьняў, якія-б абагульнялі ўсе віды яго праяў у літаратуразнаўстве і крытыцы. За апошнія гады ён выступае ў гэтых галінах, галоўным чынам, як „паўзучы ўхіл", ён характарызуецца выпадамі на самых рознастайных дзялянках літаратурнага фронту, але выпадамі разрозьненымі, асобнымі. Ён маскуецца зьявамі, якія на першы погляд ня маюць з ім нічога агульнага. Зразумела, што гэты бясформены характар, гэта вонкавая неўлавімасьць робіць вялікадзяржаўны шовінізм яшчэ больш небясьпечным і абцяжарвае барацьбу з ім. Недастатковасьць выкрыцьця вялікадзяржаўных тэндэнцый беларускай крытыкай была аднатавана і апошнім пленумам БелАПП і на конфэрэнцыі АКНАПП. Тым больш неадкладнай задачай марксысцка-ленінскай крытыкі Беларусі зьяўляецца—выбіваць вялікадзяржаўны шовінізм з усіх вучасткаў літаратурнага фронту, зрываць з яго маскі там, дзе ён баіцца прымаць адчынены бой, выкрываць яго паасобныя выступленьні, як моманты закончанай сыстэмы вялікадзяржаўнага нацыяналізму ў літаратуразнаўстве і крытыцы. Неабходна самая рашучая барацьба з прымірэнчымі адносінамі да вялікадзяржаўных тэндэнцый і з тымі памылкамі нашых таварышоў, якія граюць на руку вялікадзяржаўнаму шовінізму. У барацьбе на два фронты—галоўны ўпор на выкрыцьцё вялікадзяржаўнага ворага.

Яшчэ некалькі год таму назад клясавы вораг выступаў з наіўнай адчыненасьцю. У 1922 г. у „ўрачыстай" уступнай лекцыі ў БДУ ідэаліст і вялікадзяржаўнік профэсар Вазьнясенскі выхваляў літаратуру, як „аснову ў справе будаўніцтва нацыянальнай цывілізацыі". Літаратура павінна была вызначаць „шлях культурных паводзін кожнага індывідуума і цэлай грамады, накіраваных да ўтварэньня і захаваньня таго, што складае „сыстэму нацыянальнай культуры". Выканаць гэту высокую місію профэсар жадаў пад эгідай установы, якая ўзначальвае нашу нацыянальную навуку—гэта ўстанова—Расійская акадэмія навук"[1]). Рускі нацыяналізм буржуазнага профэсара выступаў тут у наіўна-цынічнай форме. Гэта

[1]) Працы БДУ—1922 г., № I, стар. 137—138

зусім не перашкодзіла прафэсору потым цёпла спрацавацца з нацыянал-дэмократамі, якія выступалі пад эгідай нацдэмаўскага Інбелкульту. І ў апошнія гады мы маем у галіне культуры шэраг выступленьняў адчынена і яскрава вялікадзяржаўных (хоць-бы ўпартае супраціўленьне беларусізацыі некаторых выкладчыкаў ВНУ і школ, якія трэціравалі беларускую мову, як „ніжэйшую"). Але апроч іх усё большую ўдзельную вагу займаюць удакладненыя формы маскіроўкі.

Клясавая існасьць вялікадзяржаўнага шовінізму была сформулявана як „імкненьне аджываючых клясаў панаваўшай раней вялікарасійскай нацыі, зьвярнуць сабе згубленыя прывілеі" [1]).

Рэзолюцыя XII зьезду партыі ясна акрэсьліла асноўныя соцыяльныя колы, дзе маюць месца гэтыя адбіткі былога прывілегіяванага становішча вялікарусаў. „Яны (т. е. перажыткі вялікадзяржаўнага шавінізму) жывуць яшчэ ў галовах нашых савецкіх працаўнікоў, цэнтральных і мясцовых, яны гняздуюць у нашых дзяржаўных установах, у цэнтральных і мясцовых, яны атрымоўваюць падмацаваньне ў выглядзе „новых" зьменавехаўскіх вялікарасійска-шовіністычных павеваў, якія ўсё больш узмацняюцца ў сувязі з НЭП-ам". (Від работы па нацпытаньню Сталін, ст. 190).

Ідэолёгія рэшткаў і абломкаў рускай буржуазіі ўціскае на найменш устойлівыя прапластаваньні партыйных і савецкіх работнікаў. „Вялікарускія комуністы, якія працуюць на акраінах, узросшыя ва ўмовах існаваньня „дзяржаўнай" нацыі і ня ведаўшыя нацыянальнага прыгнёту, нярэдка зьменшваюць значэньне нацыянальных асаблівасьцяй у партыйнай і савецкай рабоце, ці зусім ня лічацца з імі, ня ўлічваюць у сваёй рабоце асаблівасьцяй клясавай пабудовы, культуры, быту, гісторычнага мінулага дадзенай народнасьці, вульгарызуючы такім чынам і скажаючы політыку партыі ў нацпытаньні" [1]).

Калі вялікадзяржаўныя настроі ўзмацняліся разам з НЭП'ам, адбіваючы напор узрастаючых кулацкіх элемэнтаў, то гэта ні ў якім выпадку ня значыць, што вырашэньне пытаньня „хто каго" (супроць капіталізму, на карысьць сацыялізму) здымае небясьпеку вялікадзяржаўнага шовінізму, як і мясцовага нацыяналізму, і што можна паслабіць барацьбу на два фронты. Клясавая барацьба працягваецца ў больш захаваных формах і ў галіне культуры яна будзе працягвацца ў яшчэ больш тонкіх і складаных формах, чым раней. Апрача таго, з пэрыодам уваходу ў соцыялізм зьвязаны шэраг памылак у ацэнцы новага этапу, дробнабуржуазныя спробы „пераскованьня праз этапы" ў самых рознастайных галінах гаспадарчага жыцьця ў проблеме савецкіх грошай, коопэрацыі, у пытаньнях зьдзельшчыны, абязьлічкі, ураўнілаўкі і г. д. Зусім ясна, што ў культурным будаўніцтве гэтым зьявам могуць адпавядаць спробы дробнабуржуазнага „перескокваньня" да інтэрнацыяналізму, скажэньня ленінскай пастаноўкі нацыянальнага пытаньня ў дусе зьняцьця яго ў дадзены пэрыод. Ясна, што гэтыя дробнабуржуазныя перахлёстваньні зьявяцца зброяй ідэолёгіі вялікадзяржаўнага ўхілу, які праяўляецца тут пад выглядам нацыяльнага „нігілізму". Ясна і тое, што „лявацкія", трацкісцкія настроі могуць зараз праяўляцца ў гэтых формах, выкрываючы ўсе формы маскаваньня вялікадзяржаўніцтва, трэба надзвычайна пільна выкрываць гэтыя сваясаблівыя формы яго праяў на дадзеным этапе. Цікава, што ня толькі вялікадзяржаўны ўхіл ма-

[1]) Сталін, даклад на XVI зьезьдзе партыі. Стэн. справаздача, стар. 56.

[1]) Рэзолюцыя X зьезду партыі.

скуецца пад імем інтэрнацыяналізму, але і расійскі нацыяналізм, як непасрэдна буржуазная ідэолёгія можа маскавацца, калі ён ідучы на блёк з буржуазіяй раней прыгнечаных нацый, падфарбоўваецца пад „нацыяналізм наогул", захоўваючы свае вялікадзяржаўныя рысы. Апошні від маскаваньня, надзвычай пашыраны ў гады НЭП'у, проста выяўляе тэндэнцыю аб'яднаньня ўсіх груп клясавага ворага. Вялікадзяржаўны шовінізм хавае свае кіпцюры, ідучы на палітычны блёк з контррэволюцыйным нацдэмократызмам.

Так, напрыклад, у кнізе Мілюкова „Национальный вопрос" (1925 г.) вялікадзяржаўны шовінізм пададзены ў далёка не „зоолёгічным" выглядзе. Праўда, аўтар крытыкуе інтэрнацыяналізм, як беспрынцыповы кампроміс між космополітызмам і нацыяналізмам. Аднак, ён „культурна" вонкава адмяжоўваецца і ад цынічна-расавых тэорый заходняга фашызму і іронізуе над „вечным і нязьменным духам народу" ў нацыяналістых і не згаджаецца з агрэсыўнасьцю ў дачыненьні да іншых нацый. Мілюкоў прыкрывае свой „навуковы" пункт погляду вопраткамі эволюцыйнай тэорыі, зьменнасьцю нацыянальных адзнак і г.д. Мэты „культурнага" маскаваньня мілюкоўскага нацыяналізму выкрываюцца ў разьдзеле аб нацыянальнай палітыцы савецкай улады. Аўтар імкнецца даказаць, што правы нацый і нацменшасьцяй у СССР застаюцца чыстай фікцыяй, што нацыянальнасьці Саюзу справядліва абураны на тэрорыстычны цэнтралізм бальшавікоў. (Фактамі гэта, зразумела, не аргумэнтуецца). Інакш кажучы, вялікадзяржаўнік П.Н. Мілюкоў хоча спасаць няшчасныя „малыя нацыянальнасьці" ад прыгнёту савецкай улады. Тут-жа ідуць заляцаньні да нацыянальнай інтэлігенцыі. Умудроны вопытам апошніх дзесяцігодзьдзяў Мілюкоў падкрэсьлівае, што „анты-нацыянальная і асіміляцыйная палітыка, зьвернутая нацыянальнай большасьцю супроць меньшасьці, вяла да азлабленьня і абвастрэньня адносін, да хворага росту прасьледуемага нацыянальнага пачуцьця, да паслабленьня, а пры першым зручным выпадку, і да раскладу дзяржаў, якія дазволілі сабе такую палітыку" [1]).

Зусім ясна, што ідэолёг Адзінай і Недзялімай прымушаны маскавацца ў сувязі з падрыхтоўкай інтэрвэнцыі, у сувязі з неабходнасьцю апірацца пры гэтым на нацыянальнае кулацтва рэспублік Саюзу. Адсюль заігрываньне з малымі нацыямі, адсюль рафінаваныя формы нацыяналізму, у адрозьніваньне ад разгулу „зоолёгічных" тэорый заходняга фашызму.

Але, ня толькі эміграцкія, а і „отечественные" рэшткі буржуазных клясаў у нашых саюзных рэспубліках блёкаваліся з кулацкім нацыянал-дэмократызмам, хаця-б у тых-жа шкодніцкіх організацыях. Няўжо мы ня мелі ў галіне літаратуразнаўства на Беларусі шчыльнага і дружнага яднаньня расійскай і беларускай буржуазнай прафэсуры, хаця-б на акадэмічнай канфэрэнцыі 1926 г., няўжо тут вялікарасійская буржуазная навука ня прыкрывалася надзвычайнай зацікаўленасьцю да беларускай літаратуры (зразумела, не да пралетарскай).

Формамі маскаваньня вялікадзяржаўнага ўхілу „пад комуністычную ідэолёгію", якія найбольш часта спатыкаюцца, зьяўляюцца розныя варыянты гэтак званага нацыянальнага нігілізму. Вялікадзяржаўныя настроі часьцей за ўсё прабіраюцца ў ідэолёгію нашых работнікаў у форме індыфэрэнтызму да нацпытаньня, наплевацельскай пагарды да праблем нацыянальнай культуры. Гэтыя дробнабуржуазныя настроі, бязумоўна, мэтодолёгічна крэўны „пераскокваньню праз этапы", бо

[1]) Мілюкоў—Национальный вопрос, Прага 1925 г., стар 192 .

неразуменьне важнасьці ленінскага вырашэньня нацпытаньня—да інтэрнацыяналізму праз росквіт нацый—вельмі часта зьвязана з мэтодолёгіяй трацкізму, мэтодолёгіяй мэханістычных скокаў да інтэрнацыяналізму, зьвязаны з агульным неразуменьнем і недаацэнкай заканамернасьцяй пераходнай эпохі. Яскравейшы прыклад—ваганьняноўшчына[1]). Аднак гэтыя тэндэнцыі дробна-„буржуазных загібаў" у нацпытаньні об'ектыўна адбіваюць расійскі нацыяналізм раней панаваўшых клясаў. Зрошчваньне гэтага вялікадзяржаўнага шовінізму з трацкізмам, як перадавым атрадам контрэвалюцыйнай буржуазіі, „перахлёстваньне" ў нацпытаньні ў бок ложнага інтэрнацыяналізму былі выкарыстаны некаторымі таварышмі (накшталт тав. Іонава) для кваліфікацыі вялікадзяржаўнага нацыяналізму, як „левага" ўхілу, надаючы яму характар, так сказаць, „не галоўнай" небясьпекі і тым самым скажаючы роль і месца барацьбы з вялікадзяржаўніцтвам у барацьбе на два фронты.

Вялікадзяржаўны шовінізм ня ёсьць нігілізм у нацпытаньні[2]), але ён цяпер часьцей за ўсё і танчэй за ўсё прыкрываецца нігілізмам, і таму гэта маскаваньне трэба выкрываць асабліва ўпарта.

Ленінскі шлях вырашэньня нацпытаньня — да інтэрнацыяналізму праз росквіт нацыянальных культур—мэтодолёгічна выяўляецца ў супярэчлівай дыялектыцы, супярэчлівым адзінстве пролетарскага, соцыялістычнага зьместу культуры і яе нацыянальных форм. Усялякія скажэньні палітыкі партыі ў гэтым пытаньні, разрываючы палітычна саюз пролетарыяту з сялянствам Саюзных рэспублік, мэтодолёгічна прыходзяць да формалістычнай ці мэханістычнай пастаноўкі пытаньня, бо адны разрываюць гэта супярэчлівае адзінства, другія атоесамліваюць нацыянальныя і інтэрнацыянальныя моманты, зводзячы першыя да другіх. Але ўсякі мэтодолёгічны разрыў адзінства нацформы і соцыялістычнага зьместу мае сваім палітычным эквівалентам буржуазную тэорыю барацьбы дзьвюх культур, як у яе вялікадзяржаўным, так і нацдэмаўскім адменьніку.

Ленін падкрэсліваў барацьбу двух клясава варожых культур у межах кожнай нацыі—„ёсьць дзьве нацыі ў кожнай нацыі". І ў пэраходны пэрыод на культурным фронце вядзе змаганьне пролетарская культура кожнай нацыі з клясававароЖымі, буржуазнымі тэндэнцыямі гэтай-жа нацыі. Але апрача гэтага ленінскага разуменьня ёсьць, як вядома, і буржуазная тэорыя барацьбы дзьвюх культур, як супроцьстаўляе расійскую культуру цалкам культурам раней прыгнечаных нацый таксама цалкам, як дзьве варожыя сілы, якія змагаюцца. Нацдэмаўскі варыянт гэтай тыорыі ўяўляе беларускую ці ўкраінскую культуру, як цалкам „дэмократычную", народную ў супроцьвагу расійскай „буржуазнай культуры прыгнетальнікаў"—адгэтуль ізоляцыя ад расійскай культуры, барацьба з ёй (на самай справе—барацьба супроць культуры расійскага пролетарыяту[1]). Вялікадзяржаўны варыянт тэорыі барацьбы дзьвюх культур надае расійскай культуры інтэрнацыянальна-пролетарскі характар, супроцьставячы яе культуры раней пры-

---

[1]) Якраз зараз, калі ліст тав. Сталіна падкрэслівае ўсю важнасьць ўзмацненьня барацьбы супроць ўсякіх праяў трацкізму, мы павінны асабзіва завастрыць ўвагу на выкрыцьці ўсякіх трацкісцкіх ідэй у нацыянальным пытаньні.

[2]) Гэты момант правільна падкрэслівае тав Гірчак: „Вялікадзяржаўны шовінізм ня ёсьць нацыянальны нігілізм, гэта не якісь сваеасаблівы інтэрнацыяналізм ці што іншае, а гэта ваяўнічая ідэолёгія буржуазіі пануючай клясы" (Нацпытаньне та правій ухіл—Харків 1930 г)

[1]) Глядзі разьвіцьцё гэтай тэорыі напр. у Дубоўкі ў поэме „Пурпуровых ветразяй ўзьвівы.

гнечаній нацыі цалкам, як сялянскай і нацыянальнай. Адгэтуль імкненьне да паглынаньня яе больш „высокай расійскай культурай".

Неабходна ўсяляк падкрэсьліваць, што ўсе віды вялікадзяржаўнага ігнараваньня нацыянальнай формы культуры і літаратуры ўзыходзяць у канцы канцоў да буржуазнай концэпцыі барацьбы дзьвюх культур, з вялікадзяржаўнай пропагандай паглынаньня больш слабай культуры больш моцнай. Бо не разьвіваць соцыялістычную культуру нацыянальную па форме больш адсталых, прыгнечаных раней нацый—гэта і значыць аддаваць яе фактычна на падпарадкаваньне больш моцнай. У галіне гаспадаркі—ідэолёгія барацьбы дзьвюх культур выяўлялася ў фэтэшызацыі экономічнай няроўнасьці, у культываваньні акраін, як колёній, якія існуюць для гаспадарчага ўздыму цэнтру [1]). Тут клясава буржуазны характар гэтай тэорыі яўна выпірае вонкі, бо гэта простае працягваньне гаспадарчай політыкі царскай Расіі.

У вядомым дакладзе т. Дыманштэйна [2]) падкрэсьліваецца супроцьстаўленьне гарадзкой, інтэрнацыянальнай пролетарскай культуры і нацыянальнай, вясковай. Культура па Дыманштэйну ідзе ў нацыянальныя масы „звонку", звонку прыстасоўваецца да іх. Замест адзінай соцыялістычнай па зьмесьце і нацыянальнай па форме культуры пролетарыяту — атрымоўваецца разрыў формы і зьместу і барацьба дзьвюх клясава-розных культур. Пры гэтым пролетарскай культуры прыпісваецца чысты інтэрнацыялізм і ў канцы канцоў больш адсталая нацыянальна-вясковая культура нязьбежна паглынаецца моцнай інтэрнацыянальна-пролетарскай. Скажэньне ленінскай політыкі праяўляецца і ў скажэньні марксысцка-ленінскай мэтодолёгіі (разрыў формы і зьместу) і носіць зусім акрэсьлены характар вялікадзяржаўнага ўхілу.

У галіне культуры вялікадзяржаўны шавінізм адмаўляе ці змазвае нацыянальную форму, то робячы гэта адчынена то зводзячы яе да якога-небудзь аднаго элемэнту і тым самым зьніштажаючы яе фактычна.

У ваганьянаўскай трацкісцка-вялікадзяржаўнай концэпцыі нацыянальнай культуры—культура нацыянальнага пролетарыяту зводзіцца да культуры на нацыянальных мовах. Боязьнь супроцьпаставіць зьмест культуры яе форме і тым быццам бы парушыць іх дыяліктычнае адзінства прыводзіць Ваганьяна да простага мэханістычнага атоясамліваньня формы і зьместу, бо ён проста зводзіць нацыянальную форму да інтэрнацыянальнага зьместу. Атрымоўваецца, што і зьмест і форма інтэрнацыанальны. На долю-ж нацыянальнага моманту застаецца толькі тое, што Ваганьян называе „вонкавай формай",—мова. Праўда, па існасьці, і мова адбіраецца Ваганьянам ад нацыянальнай формы, паколькі аўтар пропагандуе русіфікацыю, „справу паглынаньня слабых, няразьвітых, не багатых моў і гутарак найбольш сільнымі і магутнымі мовамі" [1]).

Вялікадзяржаўнае ігнараваньне нацыянальнай формы выяўляецца ў выхалашчваньні розных яе элемэнтаў. У Ваганьянаўшчыне зьвядзеньне яе да мовы лёгічна прыводзіць да замены культуры нацыянальнага пролетарыяту перакладам на яго мову "агульна-п ролетарскай інтэрнацыянальнай культуры."

Прымаючы-ж пад увагу адносную сілу і разьвітасьць расійскай культуры—гэта зводзіцца да гвалтоўнай русіфікацыі і мэханічнага ўкараненьня расійскай культуры ў нацыянальныя масы. Так ажыцьцяўляецца

---

[1]) Гэта як раз характэрна для трацкіста Ваганьяна. (Гл. яго „О нацкультуре,

[2]) Дыманштэйн—Проблемы нацкультуры. Вестнік Комакадэміі, № 31 1929 г. (асабліва старонкі 117—128).

[1]) Ваганьян — О национальной культуре, 1927, стар, 27.

трацкісцкі „скачок“ праз нацыянальнае. Такім чынам і тут мэханістычная мэтодолёгія захоўвае тэорыю барацьбы дзьвюх культур, об'ектыўна (у дадзеным выпадку нават вельмі празрыста) паўтараючы колёнізатарскія імкненьні расійскай буржуазіі да паглынаньня малых нацый.

Мэтодолёгічна асабліва цікава ў гэтым выпадку ўпартае ігнараваньне таго, што нацыянальная форма пролетарскай культуры вызначаецца менавіта ўсім спалучэньнем адзнак нацыі, што агульная сыстэма ўмоў, у якіх адбываецца барацьба нацыянальнага пролетарыяту і будаўніцтва яго культуры і вызначае сваяасабліваснь яе нацыянальных форм.

Калі Ваганьян зводзіць нацыянальную форму да мовы, то магчыма зьвязденьне яе і да іншых адзнак, і праз гэта-ж ўскоснае яе ігнараваньне. Так у концэпцыі нацыянальнага мастацтва тав. Маца, спэцыфічнасьць барацьбы нацыянальнага пролетарыяту, якая дае і спэцыфіку нацыянальнай форме, зводзіцца да асабліваснцяй яго гаспадарчага процэсу, да мясцовых адрозьніваньняў умоў вытворчасьці. Але зьвязденьне нацыянальнай спэцыфікі толькі да гаспадарчага моманту наогул, зразумела, зьнішчае яе як такую.

Нацыянальнае, як спэцыфічная гісторычная катэгорыя, губляецца. Фэтэшызацыя вытворчага процэсу за лік усёй складанасьці клясавай барацьбы, бязумоўна, мае ў т. Маца праверзіянскі прысмак. Аднак, тут важна тое, што ігнараваньне спэцыфікі нацый, як гісторычнай зьявы, прыводзіць тав. Маца і да далейшых памылак. Зацьвярджаецца вечнасьць нацыянальных форм. Разьвіцьцё пролетарскага мастацтва па Мацу „вядзе да зьмяншэньня розьніцы (нацыянальнай Е. Г.), але ніколі да поўнага зьніштажэньня яго, ніколі не даходзіць да абстрактнага абсолютнага інтэрнацыяналізму“ [1]). Лёгіка думак тав. Маца такая—калі ўсе нацыянальныя адрозьніваньні зводзяцца да мясцовых, дык мясцовыя адрозьніваньні застануцца-ж і тады, калі ўсе нацыянальныя адрозьніваньні будуць зжыты. Тым самым нацыянальныя моманты т. Маца (чытай: мясцовыя) становяцца вечнай катэгорыяй. Такім чынам мэханізм усёй концэпцыі т. Маца і ў нац. пытаньні выяўляецца надзвычайна яскрава.

Правядзеньне знака роўнасьці паміж суадносінамі мастацтва, напр. расійскага пролетарыяту Масквы і Уралу, з аднаго боку, і суадносінамі мастацтва пролетарыяту расійскага і беларускага, з другога (атоясамліваньне мясцовых адрозьніваньняў з адрозьніваньнямі нацыянальнымі)—гэта і ёсьць фактычнае адмаўленьне нацыянальнай формы і тым самым памылка яскрава вялікадзяржаўнага характару. Цікава, што тав. Маца з другога боку датыкаецца і да нацдэмаўскіх тлумачэньняў гэтай проблемы. Утыраванае падкрэсьліваньне спэцыфічнасьці самога зьместу побач з поўным неразуменьнем супярэчлівай дыялектыкі зьместу і формы нацыянальнага мастацтва пролетарыяту і адначасна сьцьверджаньне вечнасьці і пазагістарычнасьці нацыянальных адзнак—гэтыя моманты ня толькі расчыняюць у Маца мэханіста, але і змыкаюцца з позыцыямі нацдэмаў. Істотнейшае пытаньне аб мове проста ігноруецца тав. Маца. З аднаго боку перабольшваньне ролі мовы, зьвязденьне нацыянальнай формы да мовы, што замяняе нацыянальную культуру „перакладной культурай“ (Ваганьян) адбівае вялікадзяржаўнае грэбаваньне да маладых пролетарскіх культур менш разьвітых нацый. Але, з другога боку, змазваньне ролі мовы ня менш ярка об'ектыўна выяўляе

[1]) Маца—Очерки теоретического искусствознания, стар.—47.

супраціўленьне вялікадзяржаўнікаў разьвіццю нац. культур. Яно ня менш шкодна і тады, калі яно носіць найбольш замаскаваную форму—калі проста „абыходзіцца" пытаньне аб мове.

Для кіраўніцтва нацыянальнай (і ў прыватнасьці беларускай) пролетарскай літаратурай надзвычай важна, разьвіваючы соцыялістычны па сваёй існасьці сьветапогляд пісьменьнікаў і паглыбляючы інтэрнацыянальныя тэндэнцыі яго, у той-жа час падкрэсьліваць тыя спэцыфічныя формы барацьбы пролетарыяту (сваяасаблівая расстаноўка клясавых сіл, гісторычныя ўмовы фарміраваньня пролетарыяту, асаблівасьці культурных уплываў і г. д.), якія і надаюць нацыянальную форму гэтаму стылю. Барацьба за дыялектыка-матэрыялістычны мэтод пролетарскай літаратуры не выключае, а мяркуе і тыя спэцыфічныя формы, у якіх ён конкрэтызуецца ў літаратуры дадзенай нацыі. У галіне тэматыкі мы змагаемся супроць замкнутасьці, коснасьці, супроць вузасьці кола закранаемых проблем, супроць зьвядзеньня, напрыклад, усёй тэматыкі беларускай пролетарскай літаратуры, да тэматыкі чыста беларускай, супроць недаацэнкі інтэрнацыянальнай тэматыкі, якая ўяўляе сабой моцную зброю інтэрнацыянальнага выхаваньня,— бо ўсе гэтыя моманты палітычна ўяўляюць сабой нацдэмаўскае „спэцыфікатарства" і фактычна выхалашчываюць соцыялістычны і інтэрнацыянальны характар самога зьместу літаратуры. Але ў той-жа час мы за распрацоўку тэм і проблем гаспадарчага і культурнага будаўніцтва ў конкрэтных абставінах дадзенай рэспублікі. Не сэкрэт, што беларуская пролетарская літаратура пакуль яшчэ толькі прыступае да распрацоўкі пытаньняў гаспадарчага будаўніцтва Беларусі, паказу гэрояў пяцігодкі ў сваяасабліваасьці рысаў беларускага ўдарніка, гісторыі заводаў у сваяасаблівых (і цікавейшых) рысах прамысловага разьвіцьця Беларусі і г. д. Яшчэ дагэтуль не паказаны складанейшыя пераплёты нацработы на Беларусі. Але-ж глыбокі паказ гэтых конкрэтных тэм якраз і павінен узбройваць беларускі пролетарыят у яго конкрэтнай барацьбе ў дадзеных умовах. Пагэтаму—упор на конкрэтную тэматыку, на паказ асноўных проблем соцыялістычнага будаўніцтва ў дадзеных конкрэтных умовах. Неразуменьне гэтага было-б таксама сваяасаблівай формай вялікадзяржаўнага недаўліку задач нацыянальнай пролетлітаратуры.

Але-ж проблема нацыянальнай формы гэта ня толькі проблема конкрэтнай тэматыкі. Справа ідзе аб спэцыфічнай конкрэтызацыі нашага творчага мэтоду ў вобразах, у стылі, ва ўсіх момантах структуры літаратурнага твору. Справа ідзе аб конкрэтных тыпах, аб іх разьвіцьці ў сваяасаблівых умовах.

Шлях кіраўніцтва нацыянальнай пролетлітаратурай—у барацьбе з практычным недаўлікам нацыянальнай формы ў літаратуры, што об'ектыўна адбівае вялікадзяржаўныя настроі і ў барацьбе з утрыроўкай нацформы, што змазвае пролетарскую існасьць нашай літаратуры.

Трэба падкрэсьліць, што ігнараваньпе нацыянальнай формы практычна вядзе да скажэньня і саміх асноў творчага мэтоду пролетарскай літаратуры. Яно вяло-б (і часта вядзе) да абстрактнасьці, схэматызму, паўтарэньня агульных месц, да штампаваных лёзунгаў літфронтаўшчыны, што зусім выхалашчывае баявое значэньне пролетарскай літаратуры.

Цікава адзначыць глыбокую ўнутраную мэтодолёгічную сувязь вялікадзяржаўнага ўхілу люксэмбургіянскага тыпу, трацкізму і літфронтаўшчыны. Для ўсіх іх характэрны дробнабуржуазны суб'ектывізм і волюнтарызм. Адсюль мэтад мэтафізычнага супроцьстаўленьня жадаемага і існуючага, неразуменьне

супярэчлівасьцяй дыялектыкі. Вялікадзяржаўныя шовіністы разрываюць пролетарскае і нацыянальнае, супроцьстаўляючы першае другому; трацкізм у літаратуры адрывае літаратуру будучай соцыялістычнай грамады ад літаратур эпохі капіталізму, адмаўляючы пролетарскую літаратуру пераходнага пэрыоду; літфронтаўшчына разрывае процэс пераробкі клясавага чалавека ў культурнай рэволюцыі, мэтафізычна і схэматычна супроцьстаўляючы яго старыя і соцыялістычныя рысы, як вонкавыя адзін другому.

Усё гэта—мэтодолёгія ашалелага дробнага буржуа, які ня хоча лічыцца з складанай і цяжкой дыялектыкай пераходнага пэрыоду, які хоча гэтай мэтодолёгіяй „скокаў" пераскочыць праз цяжкасьці барацьбы, якіх ён баіцца.

У літаратуразнаўстве і крытыцы вялікадзяржаўны шовінізм яскрава выкрывае сваё клясавыя карэньні, упарта змагаючыся нятолькі супроць нацыянальнай формы пролетарскай літаратуры, але і наогул супроць беларускай пролетарскай літаратуры. Зрошчваючыся з буржуазным ідэалізмам і эклектызмам, вялікадзяржаўны шовінізм, выкарыстоўваў зусім устарэўшае рызьзе ідэалістычнай мэтодолёгіі, дзеля таго, каб даказаць прынцыповую немагчымасьць навуковага вывучэньня пролетарскай літаратуры. Тэорыйкі аб тым, што толькі сівая старасьветчына паддаецца навуковаму аналізу, пролетарская-ж, як і наогул сучасная, літаратура могуць толькі суб'ектыўна і публіцыстычна ацэньвацца—такія тэорыйкі ў расійскім літаратуразнаўстве кваліфікуюць звычайна проста як акадэмічнакосную нянавісьць буржуазнай навукі да культуры пролетарыяту. Аднак, ва ўмовах разьвіцьця літаратуразнаўства Беларусі настойлівае паўтарэньне гэтых тэзісаў выяўляла барацьбу з беларускім нацыянальна-пролетарскім літаратурным рухам і набывала вялікаруска-шовіністычны характар [1]). Пры гэтым яны гучаць у адзін хор з нацдэмаўскімі варыянтамі таго-ж тэзісу, бо і нацдэмаўскія тэорэтыкі гэтым-жа самым ідэалістычным падзелам публіцыстычных ацэнак і „навуковых" досьледаў абгрунтоўвалі свае ўцёкі ў мінулае, сваю барацьбу з пролетарскай літаратурай [2]).

Магчыма цэнтральным пунктам праяў вялікадзяржаўніцтва да беларускай пролетарскай літаратуры—зьяўляецца неразуменьне (ці намеранае скажэньне) яе клясавай сутнасьці. Адмаўляецца яе пролетарскі характар, яна расшыфроўваецца, як дробнабуржуазная, сялянская.

Процэс станаўленьня, формаваньня пролетарскай літаратуры Беларусі—гэта процэс надзвычай складаны з-за сваяасаблівых шляхоў формаваньня самога беларускага пролетарыяту і беларускага рамесьніцтва і сялянства. Гэты процэс, які ў шырокай форме адбываецца толькі пасьля Кастрычніцкай рэволюцыі пры індустрыялізацыі Беларусі, накладае на пролетарскую ідэолёгію сваяасаблівы адбітак. Зразумела, што пражыткі дробнабуржуазнай ідэолёгіі яшчэ моцны ў сьвядомасьці беларускага пролетарыяту. Зразумела, адгэтуль, што супярэчлівасьць яго творчага мэтоду на шляху аўладаньня мэтодам дыялектычнага матэрыялізму праяўляецца асабліва востра і рэзка. Асноўная проблема для разуменьня шляхоў разьвіцьця гэтай літаратуры ёсьць якраз складанейшая дыялектыка яе станаўленьня, зжываньня ўсіх пражыткаў дробна-буржуазнай, сялянскай і рамесьніцкай ідэолёгіі. Вялікадзяржаўны шовінізм у сваёй пагардлівасьці да гэтай „літаратуры малых

---

[1]) Глядзі, напрыклад, за апошнія гады выказваньні гэтага тыпу расейскай буржуазнай прафэсуры на Беларусі—Вазьнясенскага, Замоціна.

[2]) Літаральна тое-ж можна знайсьці і ўкурсе гісторыі беларускай літаратуры проф. Піотуховіча.

нацый" абсолютызуе, фэтышызуе гэтыя сялянскія, дробнабуржуазныя пережыткі, пагардліва трэціруе ўсю пролетарскую літаратуру, як літаратуру сялянскую. Вялікадзяржаўны шовінізм непасрэдна змыкаецца тут з трацкізмам у адмаўленьні магчымасьцяй пабудовы пролетарскай літаратуры наогул і тым больш у „адсталых рэспубліках".

Вось гэты пункт—ігнараваньне станаўленьня нацыянальна-пролетарскай літаратуры і трэціраванье яе як сялянскай і ёсьць адзін з асноўных пунктаў, на якім зрашчваюцца вялікадзяржаўны шовінізм і пераверзіянства.

Пераверзеўшчына—надзвычай добрая літаратурна-мэтодолёгічная база вялікадзяржаўнага шовінізму, якраз паколькі мэханіцызм ня ведае дыялектыкі станаўленьня, ігноруе супярэчлівасьць гэтага процэсу, мысьліць закончанымі, адарванымі, ня пераходзячымі адна ў другую зьявамі. Ці літаратура абсалютна закончаная пролетарская, ці дробнабуржуазная. Таму беларускія пераверзеўцы, ня бачачы „абсолютна закончанай" беларускай пролетарскай літаратуры, адмаўлялі яе наогул. Якраз таму буйнейшыя пролетарскія пісьменьнікі Беларусі (Чарот, Галавач, Александровіч, Лынькоў) ацэньваліся пераверзіянцамі, як тыпова сялянскія ці рамесьніцкія. Але гэты мэханіцызм набываў на Беларусі яўна вялікадзяржаўны характар, паколькі ігнараваліся спэцыфічныя ўмовы фармаваньня беларускай пролетарскай літаратуры. Праявы вялікадзяржаўна-пераверзеўскага адмаўленьня пролетарскай існасьці беларускай пролетарскай літаратуры былі ня толькі ў крытыцы, але і ў выкладаньні ў школах, у праграмах рабфакаў, тэхнікумаў і г. д.

Асобна трэба аднатаваць, што нацдэмаўскія прадстаўнікі пераверзеўшчыны на Беларусі трэціравалі белапаўскую літаратуру як мяшчанскую, бо і яны ў барацьбе з пролетарскім літаратурным рухам, выкарыстоўвалі на сто проц. мэханіцызм пераверзеўскай мэтодолёгіі.

Нацдэмакраты спрабавалі кулацкую літаратуру выдаваць за пролетарскую (варта толькі ўспомніць ідэалізацыю кулацкай часткі „Узвышша" з боку яе тэорэтыкаў Купцэвіча і інш.) Вялікадзяржаўныя шовіністы спрабавалі пролетарскую літаратуру зганьбіць, як дробнабуржуазную. Але і тыя і іншыя мелі агульныя клясавыя асновы—нянавісьць буржуазіі і кулацтва да маладой пролетарскай літаратуры.

Першачарговай задачай беларускай марксысцкай крытыкі зьяўляецца выкрыцьцё вялікадзяржаўнага падыходу да проблемы спадчыны. Зараз перад намі пастаўлена задача пабудовы ўпяршыню марксысцкай гісторыі беларускай літаратуры, задача, па існасьці ўпяршыню з навукова-марксысцкіх позыцый ацаніць як спадчыну, яе мінулае. І тут прыходзіцца весьці барацьбу, як з вялікадзяржаўным, так і з нацдэмократычным падыходам да мінулага беларускай літаратуры.

Два моманты выступаюць тут: папершае—адносіны да буржуазнай літаратуры Беларусі, з пункту погляду яе, як спадчыны, па другое—ацэнка магчымасьцяй выкарыстаньня і ролі гэтак званай народнай творчасьці.

Вялізарная памылка—ацэньваць усё мінулае буржуазнай літаратуры як цалкам рэакцыйнае, як адзіны рэакцыйны струмень, бяз уліку яго гісторычнай ролі, яго функцыі на розных этапах клясавай барацьбы. Клясычны прыклад вялікадзяржаўнай пагарды да гісторыі нац-літаратуры даў Ваганьян, кваліфікаваўшы яе як чыста рэакцыйную. „Літаратура малых народаў і прыгнечаных раней нацый уяўляе малюнак невясёлы. Побач з ідэалізацыяй нацыянальнага мінулага, вялікае месца ў ёй займае ныцьцё і скаргі на ўціск, нацыянальнае самахвальства, варожасьць і нянавісьць да суседзяў,

клерыкалізм і самы жорсткі консэрватызм, ідэалізацыя нацыянальнай буржуазіі і сваёй інтэлігенцыі“ [1]). І нацыянальна-вызваленчыя моманты літаратурнага мінулага Ваганьян лічыць нягоднымі для выкарыстаньня, паколькі „ў малых нацый, зноў-такі па прычынах, якія вельмі лёгка адгадаць, нацыянальныя вызваленчыя тэмы апраналіся ў формы яскрава шовіністычнага адзінага нацыянальнага фронту“ [2]). Гэтыя зьявы, якія надаюць буржуазнай літататуры цалкам рэакцыйны характар, набываюць асабліва рэзкі прысмак вялікадзяржаўніцтва ў сувязі з ацэнкай Ваганьянам мінулага расійскай літаратуры. Расійскай літаратуры зноў-такі ў цэлым надаецца прогрэсыўны, супроць-нацыяналістычны характар. Плямы нацыяналізму ўласьцівы ў расійскай літаратуры па Ваганьяну толькі „чорнасоценным папам ды абшарнікам“. Ваганьян прапануе пролетарыяту спакойна ўзяць ў спадчыну ўсю клясычную расійскую літаратуру, бо гэтым самым пролетарыят ужо загадзя выкідвае за борт „усе вялікадзяржаў нае, усё чорнасоценна-папоўскае, ўсё нацыяналістычнае“. З гэтага пункту погляду, напрыклад, рэакцыйная філёзофія Дастаеўскага, як і рэакцыйныя моманты сьветапогляду Талстога, ня кажучы ўжо аб нацыяналістычных момантах расійскага сымболізму,—усё гэта павінна цалкам упітвацца даверлівым пролетарыятам. У гэтай пагардзе да культуры раней прыгнечаных нацый,—у апраўданьні ўсяго вялікарасійскага гучыць амаль няпрыкрыта вялікадзяржаўны нацыяналізм. Мэтодалёгічна тут выступае чыста мэханістычны анты-гісторызм, які зьлівае ў адно цэлае ўсю расійскую літаратуру, як і ўсю літаратуру прыгнечаных раней нацый, без усялякіх спроб разабрацца, на якіх этапах буржуазная літаратура і тых і другіх нацый грала прогрэсыўную ролю і ў якіх умовах яна становілася выяўніцай рэакцыйнага нацыяналізму і проста контррэволюцыйных кулацкіх тэндэнцый. Выказваньні Ваганьяна шырока вядомы, як найбольш тыповы выпадак вялікадзяржаўнай ацэнкі спадчыны. Аднак і зараз маюцца прыклады падобных адносін да спадчыны. Тэндэнцыі вялікадзяржаўнага ухілу ў пытаньнях культуры аформлены у кніжцы т. Вольфсона [1]). У гэтай працы аўтар у захапленьні барацьбой з нацдэмаўскай фэтэшызацыяй рэакцыйных момантаў мінулага, змазвае ўсю розьніцу паміж нацыянальна-вызваленчым буржуазным рухам канца XIX ст. і контррэволюцыйным кулацкім нацыянал-дэмократызмам апошніх год, ніколькі ня ўлічваючы клясавай функцыі гэтых зьяў у конкрэтна -гісторычных сытуацыях. З пункту погляду такога пазагісторызму пры пабудове гісторыі беларускай літаратуры з сападчыны апынулася-б зусім выключанай уся буржуазная літаратура канца XIX і пачатку XX ст. Між тым, гэта буржуазная літаратура, у той меры, у якой яна зьвязана з нацыянальна-вызваленчым рухам, накіравана супроць вялікадзяржаўнага прыгнечаньня царызму, а таксама супроць рэакцыйнай літаратуры абшарнікаў (напр. Багушэвіч супроць Дуніна-Марцінкевіча), у той меры яна была прогрэсыўнай і можа быць практычна выкарыстана, як спадчына. Зразумела, зусім інакш падыходзім мы да кулацкай літаратуры апошніх год, да пісьменьнікаў, якія непасрэдна выяўлялі ў творчасьці ідэолёгію фашысцкай інтэрвэнцыі.

Змагаючыся, аднак, з вялікадзяржаўным выкрэсьліваньнем усёй нацыянальнай літаратурнай спадчыны, трэба адначасна выкрываць нацдэ-

---

[1]) Ваганьян. О национальной культуре, 1927 г. (стр. 89.)

[2]) Там-жа.

[1]) С Я. Вольфсон – Навука на службе нацдэмаўскай контррэволюцыі (і дэолёгія і мэтодолегія нацыянал-дэмократызму). Менск. 1931 г. I выпуск.

маўскія спробы апраўдаць усю мінулую літаратуру Беларусі, апраўдываць яе па існасьці так сама, як Ваганьян фэтышызуе расійскую. А ад рэакцыйных момантаў мінулай літаратуры, нават на яе нацыянальна-вызваленчым этапе, трэба, зразумела, адштурхоўвацца пры „вучобе ў клясыкаў".

Другое пытаньне ў адносінах да спадчыны, якое служыць асялком як вялікадзяржўных, так і нацдэмаўскіх скажэньняў,— гэта ацэнка ролі народнай творчасьці. Ваганьян у гэтым выпадку кінуўся ў адваротны бок, прымаючы ўвесь „фольклёр" цалкам. „Народны эпос, народныя сьпевы, музыка, танцы, вопратка, народная мова тым і адрозьніваюцца ад вышэйшай культуры пануючых клясаў, што яны маюць простую і ясна выяўленую інтэрнацыянальную ідэолёгію. Але-ж, бясспрэчна, што ў гэтак званым фольклёры народнай творчасьці ёсьць таксама розныя струмені, якія адбіваюць клясавае распластаваньне вёскі. Мы ня можам расцэньваць аднолькава фольклёр бядняцка-серадняцкіх пластоў вёскі і фольклёр кулацкі. Нацдэмакратызм за апошнія гады надзвычай цікава выкарыстоўваў народную творчасьць: фольклёр служыў для яго шырмай, якая хавала контррэволюцыйныя ідэйкі кулацтва. У гэтым сэнсе павінна быць дакладна выкрыта гэта псэўда-ідэалізацыя „народнага", якая ідзе ад кулацкай ідэолёгіі, бо гэта была псэўдо-народная вобразнасьць буржуазнай, антысавецкай літаратуры.

Аднак, барацьбу супроць нацдэмаўскіх выкарыстоўваньняў фольклёру, супроць іх культу „нацыянальнага"(а чытай кулацкага) стылю нельга весьці з пункту погляду фактычнага адмаўленьня нацыянальнай формы.

Так, напрыклад, у названай вышэй кнізе тав. Вольфсона дана крытыка рэакцыйнага выкарыстоўваньня фольклёру нацдэмамі, іх капаньня ў старажытнасьці, іх фэтышызацыі рэлігійных абрадаў і косных момантаў быту. Аднак у тав. Вольфсона атрымалася, што ўсякая цікавасьць да народнай творчасьці, увесь фольклёр цалкам (ува ўсіх яго клясавых струменях) зьяўляецца сам па сабе рэакцыйным і амаль што не контррэволюцыйным. Неадрозьніваньне тут кулацкага выкарыстоўваньня фольклёру ад яго самога і магчымасьцяй яго выкарыстоўваньня намі—фактычна ёсьць грабаваньне беларускай народнай творчасьці. Гэта мае ў тав. Вольфсона шчыльную сувязь з яго імкненьнем наогул зьменшыць ролю нацыянальнай формы. Таму ён недаверліва адносіцца і да момантаў народнай творчасьці і быту, што яны, як быццам дабаўляюць спэцыфікі нацыянальнай форме. Але баяцца спэцыфікі нацыянальнай формы можна толькі з пункту погляду вялікадзяржаўна-ўхілісцкага „інтэрнацыяналізму". Паколькі мы ўсяляк разьвіваем нацыянальную форму пролетарскай па зьместу літаратуры, пастолькі нам нечага баяцца народнай творчасьці. Наадварот, яна выкарыстоўваецца і ўбіраецца мастацтвам беларускага пролетарыяту, якое формуецца, але толькі ў яе прогрэсыўнай частцы. „Мы з кожнай нацыянальнай культуры бярэм толькі яе дэмократычныя (яе соцыялістычныя элемэнты, бярэм іх толькі і, бязумоўна, у супроцьвагу буржуазнай культуры, буржуазнаму нацыяналізму кожнай нацыі" [1]).

Таму ўсякім чынам выкрываючы нацдэмаўскія спробы рэабілітаваць рэакцыйна-нацыяналістычныя бакі мінулага, мы павінны пры пабудове гісторыі літаратуры і, наогул, пры ацэнцы спадчыны упарта змагацца з вялікадзяржаўным выкіданьнем за борт яго прогрэсыўных момантаў. Поруч з дасягненьнямі сусьветнай літаратуры і гісторыя

[1]) Ленін—Собрание сочинений, т. XIX Критич. заметки по нац.вопросу, стр. 48.

літаратуры сваёй нацыі павінна быць выкарыстана пролетарыятам.

Калі ёсьць ухілы да вялікадзяржаўнага шовінізму ў ацэнцы мінулага пры пабудове гісторыі літаратуры, то такія-ж ухілы магчымы ў разгортваньні марксыцка-ленінскай крытыкі на Беларусі. Такія тэндэнцыі наглядаюцца, праўда, галоўным чынам, у „паўзучым" выглядзе. Нярэдка правільнае ў аснове імкненьне да павялічэньня на дадзеным этапе ролі марксысцка-ленінскай тэорыі прыводзіць да скажэньня задач нашай крытыкі ў духе абстрактнага мэтодолёгізаваньня да захапленьня агульна-філёзофскімі пытаньнямі за лік разьвіцьця конкрэтнай крытыкі, а гэта значыць-за лік непасрэднага кіраўніцтва пролетарскай літаратурай. Адарванае ад конкрэтнай практыкі акадэмічнае мэтодолёгізаваньне наогул ёсьць ня што іншае, як дэборыншчына. Аднак, у кіраўніцтве нацыянальнай пролетарскай літаратурай, дэборыншчына, калі яна робіцца сыстэмай працы об'ектыўна, бязумоўна, прымае вялікадзяржаўную афарбоўку. На самай справе, калі тэорэтычная работа сыстэматычна зварачаецца ў самамэтную тэорыю, не ўвязваецца з конкрэтнымі задачамі нацыянальнага пролетарскага літаратрнага руху, то такая дэборыншчына адцягвае ўсе сілы ад конкрэтнай крытыкі і выконвае о'ектыўна вялікадзяржаўныя функцыі, затрымоўваючы разьвіцьцё пролетарскай літаратуры. У агульных умовах дэборыншчына— гэта найлепшая форма ўцёкаў ад пролетарска-літаратурнай сучаснасьці для габінэтных тэорэтыкаў. Ва ўмовах разьвіцьця нацыянальнай культуры мэтодолёгізаваньне ёсьць здатнейшая форма ўцёкаў для „тэорэтыкаў", якія з вялікадзяржаўнай пагардай адносяцца да разьвіцьця нацыянальных пролетарскіх літаратур.

У асаблівасьці трэба змагацца супроць узьнікненьня такіх настрояў у крытычнага маладняка, які часта зусім не ўсьведамляе іх аб'ектыўнага значэньня. У той-жа час, калі дэборыншчына органічна зрашчваецца з вялікадзяржаўным шовінізмам, то адваротная тэндэнцыя (ня менш небясьпечная) недаацэнка ролі марксысцкай тэорыі, жаданьне толькі конкрэтнай, хоць бы і грубай эмпірычнай крытыкі. Ня цяжка зразумець, што менавіта нацдэмаўскія пережыткі, імкненьне да абасобленасьці, замкнутасьці знаходзяць у вульгарным эмпірызьме сваё мэтодолёгічнае выяўленьне.

Змагаючыся з вялікадзяржаўным шовінізмам, мы павінны ў беларускай марксысцкай крытыцы ўсяляк беларусізаваць тэматыку літаратуразнаўства і крытыкі— выкрываць ня толькі варожыя плыні наогул, але, і ў першую чаргу, мясцовых носьбітаў гэтых тэндэнцый, ня толькі распрацоўваць агульныя пытаньні мэтодолёгіі але зьвязваць іх з конкрэтнай крытыкай беларускай літаратуры, не зьмяншаючы пры гэтым тэорэтычна паглыбленай работы і разумеючы яе, як частку агульна воапаўскай распрацоўкі пытаньняў літаратурнага руху.

Так вялікадзяржаўны шавінізм — гэта ідэолёгія аджываючых клясаўраней прывілегіяваных нацый зрашчываецца у літаратуразнаўстве з самымі рознастайнымі варожымі нам тэорыямі—буржуазным эклектызмам, перавэрзеўшчынай, дэборыншчынай, трацкізмам, як перадавым атрадам контррэволюцыйнай буржуазіі, тым самым выкрываючы клясавую крэўнасьць як нацыянальных ухілаў, так і буржуазных тэндэнцый літаратурнай мэтодолёгіі.

Ва ўсіх праявах вялікадзяржаўнага шовінізму ёсьць захаваная ці адчыненая барацьба супроць нацыянальнай пролетарскай літаратуры, шовіністычная пагарда, ганьбава-

ньне ёй. Але і, наадварот, празмернае захвальваньне ўсякай зьявы нацыянальна-пролетарскай і нават наогул нацыянальнай літаратуры, панска-ласкавае пахлопваньне па плячу—гэта адваротны бок той-жа пагарды. Можна наглядаць, як тыповыя вялікадзяржаўнікі, пасьля выкрыцьця існасьці іх „высокомерия", пачынаюць лісьліва захвальваць кожны твор і кожнага пісьменьніка. Небясьпека гэтага захвальваньня надзвычай рэальоа, бо якраз для формуючайся пролетарскай літаратуры Беларусі, роля крытыкі, якая дапамагае ёй зжываць яе дробнабуржуазныя перажыткі—асабліва важна. Усякія непамерныя выхваленьні, якія замазваюць недахопы творчага мэтоду пролетарскіх пісьменьнікаў, перашкаджаючы ім разьвівацца, аб'ектыўна садзейнічаюць вялікадзяржаўнай барацьбе супроць пролетарскай літаратуры.

За апошні час на Беларусі зноў актывізуецца вялікадзяржаўны ўхіл. Памятаючы, што ён зьяўляецца галоўнай нябясьпекай, трэба асабліва ўважліва выкрываць усе яго праявы, не паслабляючы барацьбы супроць усіх форм і праяўленьняў нацыянал-дэмократызму. Без рашучага змаганьня з нацухіламі, і ў першую чаргу з вялікадзяржаўным і прымірэнцтвам да яго, нельга пабудаваць беларускую пролетарскую літаратуру.

Менск. Кастрычнік 1931 г.

РАБОЧАЯ КРЫТЫКА

Платон Галавач—„Доляры“, аповесьць, БДВ, (*80 стар., ц. 30 к.*)

Аповесьць „Доляры“ належыць беларускаму пролетарскаму пісьменьніку Платону Галавачу. Тып няўстойлівай партыйкі Зосі Хмарынай, з аднаго боку, тып адданага працы рабочага Саламона, з другога, і назакол іх астатнія рабочыя дражджавога заводу—вось што нам дае аўтар у сваёй аповесьці.

Замкнутая ў рамках свайго жыцьця Зося супроцьстаўляецца Саламону, у якога грамадзкія інтарэсы затушоўваюць асабістыя.

Гэроіня аповесьці Зося Хмарына працуе 8 год у ўпаковачным аддзяленьні дражджавога заводу. Ня гледзячы на тое, што яна ўжо тры гады зьяўляецца членам партыі, завод ад яе ніякай карысьці ня мае. Праўда, Зося выступае на сходах, гаворыць пра прагулы і спазьненьні ў сваім аддзяленьні, але гэта толькі гаворкі, бо ніякай конкрэтнай працы па ліквідацыі прагулаў яна не праводзіць.

Яе рукі мэханічна пакуюць дрожджы, а яна сама аддаецца ўспамінам. У думках праходзіць маленькі пакой, наняты ў багатых нэпманаў, стары на пакрыўленых ножках ложак, а побач па суседзтву—цёплыя, багата ўбраныя парт'ерамі, фіранкамі і абітай аксамітам мэбляй, пакоі гаспадароў. Яна думае аб тым, як яе гаспадары праводзяць весела час, і хочацца ёй пажыць так, як яны.

Хмарына парэўноўвае заводзкае жыцьцё з жыцьцём гаспадароў. Гаспадары сваю незадаволенасьць „хаваюць ў цемры пакояў—каб ніхто ня ведаў“. А на заводзе „чуць гутарка—дык усё пра дрэннае, усе незадаволены“. Хмарына ніколі не падумала над тым, чаму гэта на заводзкіх сходах гавораць пра дрэннае. Яна не разумее таго, што трэба выяўляць дрэнныя бакі для таго, каб біць па недахопах у працы, для таго, каб рабочая грамадзкасьць ведала, што ёй патрэбна мобілізавацца і ліквідаваць прарывы на тых вучастках працы, дзе яны маюцца. Надаелі Зосі „сухія“, „сумныя“ сходы, і яна знаходзіць сабе задавальненьне ў цёплых пакоях гаспадароў.

Усё часьцей і часьцей яна пачынае іх наведваць. А гаспадары, сваімі прывабнымі мяккімі, ветлівымі адносінамі аблытвалі яе ўмела сатканым павуціньнем. Іх тон гаворкі падкупляе яе—яна добравольна ідзе насустрач іх імкненьням. Яе гаспадар—стары нэпман, які сам сябе характарызаваў наступнымі словамі: „Добра жыць, калі ўмееш. Увайдзі ў іх жыцьцё і сунься сабе з краю, краёчкам, каб ня быць ззаду ад яго і браць паціхеньку, што трэба і што можна. О, я заўсёды ў нагу з жыцьцём іду“... бязумоўна браў ад жыцьця ўсё, што яму было патрэбным і што ён мог вырваць.

Асьцярожна ён сваім ветлівым падыходам завяваў давер'е Зосі з мэтай пажаніць з ёю свайго сына Давіда і забясьпечыць яму будучыню: „Яна комуністка... Партыйная сям'я! Я служу сабе, чырвоны спэц“... З цягам часу на Зосю ўсё больш і больш ўплывоўвала тое мяшчанскае асяродзьдзе, якое акаляла яе. Пачынаецца яе адыход ад партыі. Яна перастае наведваць партшколу, за што трапляе, нават, на чорную дошку. А калі Хмарына атрымала ад дзядзькі з Амэрыкі дванаццаць тысяч долараў, яна не паведаміла аб гэтым парт'ячэйку, а складала пляны аб тым, як лепш пабудаваць сваё жыцьцё. Прычым жыцьцё гэтае, па яе думцы, складалася з цёплых пакояў, прыгожага паліто і добрых боцікаў.

Калі ячэйка даведалася аб долярах, атрыманых Зосяй, і патрабавала ад яе, як ад партыйкі, аддаць частку гэтай сумы ў партыйную касу, Зося адмовілася. А калі парт'ячэйка паставіла перад ёй пытаньне ў больш рэзкай форме—выбірай адно з двух: альбо партыю альбо грошы,—Хмарына здае свой партбілет.

Слабавольнай няўстойлівай Зосі аўтар супроцьставіць тып сапраўды адданага працы рабочага-Саламона.

Саламон працаваў падручным майстрам каля чану, але на заводзе скараціліся колькасьць рабочых, і ён трапіў у гэты лік. Саламон стаў чорнарабочым, але яму быў чужым той варожы настрой, які апанаваў часткай рабочых. Часта Саламон спрачаўся са сваімі таварышамі па працы адносна заробку. Калі стары несьвядомы рабочы разважае, што: „Завод наш—рабочы і мы рабочыя, а каму прыбытак? Усёроўна і сабе, здаецца, робім, нябось мы з табою па трыццаць сем рублёў выганялі, а дырэктар па дзьве соцельныя“...—дык Саламон яму адказвае: „Бо нам і няма за што... бо колькі ні давай табе, дык усё мала. Прывык ты, дзядзька, пра сваю кішэнь толькі дбаць, у яе ўсё цягнуць, дык і завод увесь хочаш туды. Ня варты мы, каб плацілі больш“!

Гэта вытрымка яскрава съведчыць аб тым, што ў Саламона грамадзкія інтарэсы стаялі значна вышэй уласных. Ён заўсёды знаходзіў,

што адказаць сваім таварышом, і яны, адчуваючы яго правату, змаўкалі.

Кожную хвіліну Саламон стараўся скарыстоўваць толькі на карысную працу. Пасьля працы ён ішоў дамоў, але і тут думкі яго круціліся навакол заводзкіх чанаў, навакол шклянак і хэмічных прылад у лябораторыі заводу. Саламон вельмі часта думаў над тым, як атрымаць большы процант продуктаў з пуду сыравіны; ён пераглядаў адпаведную літаратуру і з кожнай прачытанай кніжкай адчуваў больш энэргіі.

Праз пяць месяцаў яго зноў паставілі ля чану. Яго жаданьне зрабіць што небудзь значнае, карыснае для заводу расло і крэпла з кожным днём. Саламон ведаў, што для таго, каб даць гэта „што небудзь карыснае, вялікае", яму патрэбна працаваць у лябораторыі заводу.

Думка аб працы ў лябораторыі апанавала ім і нават у начы не пакідала яго. Саламон з упартасьцю і настойлівасьцю, характэрнымі для партыйца, пасьля доўгіх спрэчак з дырэктарам заводу і парт'ячэйкай дабіўся свайго—яго перавялі ў лябораторыю.

Платон Галавач у гэтай аповесьці паказвае нам вельмі ўдала класавага ворага. Ён паказаны тут не з сякерай ці браўнінгам, а інакш. Класавы вораг выведзены ветлівым, гасьцінным. Аўтар яму прыдае ўсе ўласьцівасьці знадворна-сымпатычнага і прастадушнага чалавека. Але адначасна Галавач паказвае, як той прыстасоўваецца да ўмоў савецкага жыцьця, спрабуючы выкарыстаць кожную шчыліну.

Класавы вораг імкнецца выкарыстаць усе магчымасьці для свайго ўплыву на паасобных партыйцаў. Для Кантаровічаў жаніцьба іх сына Давіда з Хмарынай неабходна, як сродак лепшага маскаваньня. Зразумела, як толькі сбудуцца іх мары, тады яны, бязумоўна, пакажуць свае кіпцюры.

Побач з Хмарынай і Саламонам мы ў аповесьці сустракаемся з заводзкай парт'ячэйкай. Але Галавачу не ўдалося паказаць ячэйку, як організацыю, якая стаіць на чале ўсяе рабочае грамадзкасьці заводу, організацыю, якая адказвае за ўсю яго працу.

На заводзе былі факты, якія гавораць аб прагулах, прарыве ў выкананьні прамфінпляну, рабочыя баяліся адміністрацыі, наглядалася мяшчанства, а Галавач не паказаў нам, што парт'ячэйка вядзе з гэтым рашучую барацьбу.

Наогул уся праца ячэйкі ў асьвятленьні Галавача не адпавядае тэй працы, якую павінны праводзіць і якую праводзяць парт'ячэйкі на нашых фабрыках і заводах.

Ня гледзячы на гэтыя недахопы, аповесьць „Доляры" зьяўляецца бязумоўна карысным творам. У ёй выводзяцца тыпы комуністых, у асобе Хмарынай, якіх не павінна быць у шэрагах нашай ленінскай партыі.

Гэты твор організуе волю для барацьбы з класавым ворагам, паказваючы яго ў выглядзе сям'і Кантаровічаў.

Рабочы літаратурны гурток фабрыкі-школы „Кім".

Н. Бараноўская, Б. Гітліц, Ф Кабакова, Б. Казлоўская, Ф. Круткевіч, Г. Маціеўская, Е. Пташнік, Д. Шэнкман.

ХРОНІКА

Б. С. С. Р.

Літаратурная выстаўка МенАПП

Літаратурная выстаўка МенАПП зьяўляецца першай літаратурнай выстаўкай у БССР. Мэта, пастаўленая МенАПП'ам пры організацыі выстаўкі,—паказаць змаганьне пролетарскай літаратуры на фронтах соцыялістычнага будаўніцтва.

Лёзунгі выстаўкі: літаратура на службу соцыялістычнаму будаўніцтву, за культуру соцыялістычную па зьместу і нацыянальную па форме, за вялікае бальшавіцкае мастацтва.

Выстаўка складаецца з наступных аддзелаў:

1. Ударнік ідзе ў літаратуру.
2. Праца пісьменьніцкіх брыгад у калгасах і прадпрыемствах БССР і СССР.
3. Да 10-годзьдзя літаратурнай дзейнасьці пролетарскага поэты Андрэя Александровіча.
4. Беларуская літаратура за 1931 год (аддзел ДВБ.)
5. У барацьбе з клясавым ворагам—за пролетарскую літаратуру (аддзел барацьбы з нацыянал-дэмократызмам у БССР).
6. Літаратура Заходняй Беларусі.

Афармлялі выстаўку мастакі: В. Станковіч, Ахрэмчык, Мурашоў, Азгур.

Выстаўка адчынена да XIV гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі—6-га лістапада 1931 году.

Ударнік ідзе ў літаратуру

Аддзел „Ударнік ідзе ў літаратуру" паказвае першыя вынікі закліку рабочых-ўдарнікаў у літаратуру на буйных прадпрыемствах Менску. Пачынаецца аддзел адозвай Сэкратарыяту БелАПП і ЦСПСБ аб закліку ўдарнікаў у літаратуру, дагаворам паміж менскім комсамолам і МенАПП'ам. На першым шчыце зьмешчаны фотографіі рабочых аўтараў заводу імя Варашылава (Шаўцоў, Нортман, Малашэнка, Лейбман і інш.). На першым шчыце знаходзіцца першая кніжка рабочых-ўдарнікаў заводу імя Варашылава „Новы цэх варашылаўцаў". На ніжняй частцы шчыта зьмешчаны нарысы і вершы рабочых пісьменьнікаў, надрукаваныя ў заводзкай шматтыражцы.

На другім шчыце паказана творчасьць рабочых заводу „Комунар", і „Дрэваапрацоўшчык. Наверсе шчыта—фотографія літаратурнага гуртка заводу „Комунар", выразкі з шматтыражкі „Комунаравец", нарысы рабочых-ўдарнікаў і здымкі паасобных рабочых-ўдарнікаў, закліканых у літаратуру. Ніжняя частка шчыта прадстаўляе літаратурны гурток заводу „Дрэваапрацоўшчык", фотографія ў цэнтры шчыта—здымак маладога рабочага-поэты Бацюшкава.

Трэці шчыт прысьвячаны цалкам дзейнасьці літаратурных гурткоў друкарні імя Сталіна. Ў друкарні працуе тры літаратурных гурткі: беларускі, яўрэйскі і гурток рабочай крытыкі. На шчыце зьмешчаны фотографіі Зайчыка, Швэйдэля, Кацовіча і інш. рабочых друкарні, якія маюць ужо цэлы шэраг літаратурных твораў. Тут-жа мы бачым літаратурныя старонкі газэты-шматтыражкі „Друкарская праўда", прысьвячаныя закліку рабочых-ўдарнікаў ў літаратуру.

На чацьвертым шчыце прадстаўлена творчасьць двух літаратурных гурткоў фабрыкі „Кастрычнік". Асабліва разгарнуў сваю дзейнасьць на фабрыцы „Кастрычнік" яўрэйскі літаратурны гурток. На шчыце—вершы, нарысы і апавяданьні рабочых-ўдарнікаў фабрыкі „Кастрычнік".

І, нарэшце, на пятым шчыце глядач бачыць цэлую масу выразак з розных газэт на розных мовах пад агульным загалоўкам: „У інтэрнацыянальна-клясавым адзінстве ўдарнік ідзе ў літаратуру".

Усяго па Менску да XIV гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі ахоплена ў літаратурных гуртках МенАПП звыш 200 рабочых-ўдарнікаў. Гэта зьяўляецца адным з буйнейшых дасягненьняў Менскай асоцыяцыі пролетарскіх пісьменьнікаў і сьведчыць аб карэннай перабудове работы організацыі, аб павароце да выяўленьня і выхаваньня новых рабочых кадраў.

Праца пісьменьніцкіх брыгад

Характэрнай адзнакай літаратурнага жыцьця ў 1931 годзе зьяўляецца паварот усіх пісьменьніцкіх організацый да непасрэднага ўдзелу ў жыцьці соцыялістычных прадпрыемстваў Савецкай Беларусі, Савецкага саюзу. За 1931 год мы мелі плённую работу значнай колькасьці пісьменьніцкіх брыгад у розных прамысловых цэнтрах, на паасобных прадпрыемствах, у калгасах і г. д.

Аддзел „Праца пісьменьніцкіх брыгад" пачынаецца невялічкім шчытом „Шатура-торф", куды выяжджалі П. Галавач, Ізі Харык. Мы маем на шчыце ўрыўкі з поэмы Ізі Харыка пра торф і паасобныя фотографіі Шатуры. У выніку паездкі на Шатуру і Асінторф П. Галавач і Ізі Харык працуюць-першы над романам „Торф", а другі над вялікай поэмай пад аднаімённай назвай.

Другі шчыт паказвае працу белаппаўскай брыгады на дрэваапрацоўчым комбінаце ў Бабруйску. У склад брыгады ўваходзілі т. т. Ліхадзіеўскі і Зарэчны. Брыгада выдавала газэту „На штурм прарыву", пісала вершаваныя лёзунгі ў шматтыражках, зьмясьціла цэлы шэраг допісаў ў цэнтральным друку. Праца брыгады ацэнена мясцовымі партыйнымі організацыямі вельмі станоўча. На шчыце мы маем агульны выгляд дрэваапрацоўчага комбінату, фотографіі лепшых рабочых-ударнікаў, выразкі з газэт, вершаваныя лёзунгі і інш. матар'ял пісьменьніцкай брыгады.

Трэці шчыт—праца брыгады ў складзе П. Броўкі, З. Астапенкі, А. Вольнага і Ц. Даўгапольскага ў Добрушы на папяровай фабрыцы „Гэрой працы". Брыгада ўдзельнічала ў выданьні шматтыражкі „Чырвоная бракамолка", выдавала друкаваную шматтыражку „За паперу", праводзіла масавую работу на прадпрыемстве ў выглядзе налётаў, зьлётаў рабочых і г. д. Вельмі цікавым вопытам работы, які быў праведзены брыгадай, былі лёзунгі, якія наклейваліся на машыны. На шчыце прадстаўлены два лёзунгі. Першы лёзунг напісаны на машыне ўдарніка:

„Гэта машына пакрыла заданьне.
Вось дзе працуе лепшы ўдарнік".

Другі-ж лёзунг прысьвячаны прагульшчыкам:

„Вось прамфінпляну стаіць недагрузчык,
На гэтай машыне ўдарны прагульшчык".

Брыгада дапамагла мясцовым організацыям і атрымала зарадку для сваёй творчасьці. Напрыклад, Пятрусь Броўка напісаў аповесьць „Каландры". Ц. Даўгапольскі ў выніку паездкі напісаў п'есу „Папера" з жыцьця добрускіх рабочых, якая прынята да пастаноўкі ў БДТІ.

Чацьверты шчыт—„Сельмаш-Гомель". Брыгада ў складзе: Я. Скрыгана і З. Паваротнага. На здымках паасобныя моманты з жыцьця прадпрыемства. На шчыце сэрыя нарысаў Дзяміда Бойчыка (З. Паваротнага), выпіска з пастановы бюро партыйнага колектыва Гомсельмашу, якая станоўча ацэньвае работу брыгады, рукапіс Янкі Скрыгана „Права на энтузыязм" пра гэроя Сельмашу т. Белабжэцкага, загад па рэдакцыі газэты „Зьвязда, які гаворыць аб тым, што брыгада правяла вялікую арганізацыйна-масавую і опэрацыйную работу на прадпрыемстве, умела падыйшоўшы да пытаньня барацьбы з важнейшымі недахопамі вытворчасьці, здолела мобілізаваць рабочы колектыў Гомсельмашу і заводзкія організацыі вакол задач барацьбы за прамфінплян. За карысную работу ўдзельнікі брыгады ўзнагароджаны рэдакцыяй газэты „Зьвязда" прэміяй па 100 руб. кожны.

Пяты шчыт зьмяшчае выданьні членаў яўрэйскай сэкцыі БелАПП, у аддзеле фотографія яўрэйскага пролетарскага пісьменьніка Ізі Харыка, група фотографій рабочых ударнікаў, закліканых ў літаратуру, літаратурныя старонкі газэты „Акцябр".

Шосты шчыт аддзелу—работа пісьменьнікаў у колгасах. На шчыце прадстаў лена работа пісьменьніцкай брыгады у калгасе „Бальшавік" (С. Баранавых і В. Сташэўскі), работа брыгады пісьменьнікаў ў сьвінагадоўчым саўгасе „Банонь" (Крапіва і А. Ліпнёвы), моманты з работы пісьменьніка Іл. Барашкі ў Гарадоцкім раёне (барацьба за контрактацыю ільну ў весну 1931 году). Найбольш поўна прадстаўлена работа брыгады ў саўгасе „Банонь". На шчыце мы сустракаем нізку вершаў Крапівы, сэрыю нумароў газэты „Зьвязда" за соцыялістычную сьвінагадоўлю", якая выдавалася брыгадай у саўгасе.

Сёмы шчыт аддзелу „Віцебск". Брыгада ў складзе А. Александровіча, М. Хведаровіча, С. Ліхадзіеўскага, Іл. Барашкі і С. Краснеўскага выяжджала ў жніўні г. г. ў Віцебск для дапамогі ў правядзеньні дэкадніку беларускай пролетарскай культуры. Брыгадай праведзены шэраг літаратурных выступленьняў і вечароў на буйнейшых прадпрыемствах і рабочых клюбах Віцебску, і выдадзена чатыры літаратурных старонкі ў газэце „Віцебскі пролетары". Праведзена праца па організацыі літаратурных гурткоў на фабрыцы „Дзьвіна" і „Сьцяг індустрыялізацыі". На шчыце фотографіі членаў брыгады, фотографіі лепшых чыгуначнікаў віцебскага вузла, літаратурныя старонкі „Віцебскага пролетарыя", заводзкія шматтыражкі, выразкі з газэт.

Восьмы шчыт паказвае работу інтэрнацыянальнай брыгады ВОАПП у Сярэдняй Азіі. Брыгада складалася з наступных таварышоў: Іл. Барашка, П. Глебка, А. Кушнярoў (Яўрэйская сэкцыя МАПП), С. Кржыжаноўскі „Украінскі Маладняк"-і М. Хведаровіч. Ня гледзячы на трудnасьці падарожжа па Сярэдняй Азіі брыгада ў Ташкенце наведала шэраг устаноў, завязала сувязь з Узбекістанскай АПП у Самаркандзе, правяла вялікі інтэрнацыянальны вечар пролетарскай літаратуры разам з Самаркандзкай АПП, азнаёмілася з жыцьцём аднэй з магутных шоўкамагальных фабрык „Худжум" (Наступ), зрабіла налёт на бавоўна-ачышчальны завод № 66 у парадку праверкі яго падрыхтаванасьці да ўборачнай кампаніі, азнаёмілася з пастаноўкамі Ўзбекскага дзяржаўнага тэатру ў Самаркандзе. Выехаўшы ў Бухару, брыгада вывучыла жыцьцё сучаснай Бухары, у Фэргане (усходні Ўзбекістан) брыгада азнаёмілася з становішчам найвялікшай у СССР тэкстыльнай фабрыкі імя Дзяржынскага, Масла-заводам № 10, цэплацэнтралью „Заря Востока", правяла інтэрна-

цыянальны вечар пролетарскай літаратуры для рабочых гораду Фэрганы, на якім прысутнічала звыш 4000 чалавек, наведала колгасы „Авуаль", праверыла падрыхтаванасьць да бавоўнаўборачнай кампаніі організацый Фэрганскай далины. Брыгада зьмясьціла цэлы шэраг допісаў аб сваім падарожжы ў газэце „Известия ЦИК СССР". На шчыту паасобныя фотографіі з жыцьця Узбекістану, вершы узбекскага поэты Гайраці, прысьвячаныя рабоце брыгады, чарнавікі допісаў і вершаў, маршрут брыгады, ды інш. На гэтым-жа шчыце выразкі з Ўзбекістанскага друку аб црыезьдзе ў Ташкент поэты А. Александровіча, які па даручэньню Савету ВОАПП выяжджаў у Узбекістан у весну 1931 г. для праверкі работы ЎЗАПП'а.

У верасьні 1931 г. створана Беларуская фэдэрацыя Аб'яднаньняў савецкіх пісьменьнікаў. Над шчытамі: Аддзелу працы пісьменьніцкіх брыгад—портрэты пісьменьнікаў, якія ўваходзяць у склад ФАСП'а.

У прасьветах — на вокнах стаяць шчыты з урывкамі вершаў М. Чарота, М. Хведаровіча і П. Броўкі.

Юбілей А. Александровіча

На выстаўцы вылучаны спэцыяльны аддзел, прысьвячаны творчасьці пролетарскага поэты Александровіча, 10- годзьдзе літаратурнай дзейнасьці якога спаўняецца ў сьнежні г. г.

З пачатку аддзелу ідзе кароткая біографія поэты. Далей зьмешчана фотарэпродукцыя потрэту поэты, зробленага мастаком Ахрэмчыкам. Мы сустракаем у аддзеле шмат газэт з розных канцоў СССР, дзе былі зьмешчаны, творы А. Александровіча: „Кізіл-Узбекістан", „Робітныча газэта", „Малады Комуніст", „Правда", „Известия", „Литературная газета", „Комсомольская правда", „Вечерняя Москва", „Правда Востока" і г. д. На выстаўцы прадстаўлена адна з старонак баўгарскай газэты „РЛФ", прысьвячаная творчасьці Александровіча. За тым ідуць кніжкі Андрэя Александровіча, пачынаючы ад першай колектыўнай кніжкі „Комсамольская нота" да апошняй кнігі „Нараджэньне чалавека". Тут-жа зьмешчаны кніжкі, напісаныя для дзяцей, як „Рыбак", „Горад раніцой" ды інш.

Прадстаўлена на выстаўцы і нізка твораў, напісаных композытарамі Мацісонам, Яфімавым, Тэраўскім і Туранковым на словы А. Александровіча.

У прасьветах паказаны асобныя кадры з гукавога кіно-фільму-„Поэма імя вызваленьня".

На сцэне залі, дзе зьмяшчаецца выстаўка, стаіць бюст правадыра Ў. І. Леніна, зьмешчаны лёзунг „Літаратурная справа павінна стаць часткай агульна-пролетарскай справы" (Ленін)

Барацьба з клясавым ворагам

1930 і 1931 год-гады разгорнутай клясавай барацьбы беларускай пролетарскай літаратуры з варожай кулацкай, нацыянал-дэмократычнай літаратурай. У гэтым аддзеле паказаны документы розных пісьменьніцкіх організацый БССР, якія ілюструюць моманты клясавай барацьбы ў літаратуры. Тут мы бачым верш Міхася Чарота „Суровы прыгавор падпісываю першым", „Поэму пра ворага" А. Александровіча, артыкулы А. Сянкевіча, М. Бэндэ, протэсты, пастановы і г. д. Ілюстраваны аддзел спэцыяльна-падобранымі фотографіямі. На гэтым-жа шчыце літаратура, якую выдала ДВБ супроць нацыянал-дэмократызму ў барацьбе за ленінскую лінію ў нацыянальнай політыцы.

Літаратура Заходняй Беларусі

Літаратура Заходняй Беларусі на выстаўцы падзяляецца на аддзелы: 1. Турэмная літаратура; 2. Радыкальная літаратура, 3. Выданьні КПЗ(б) (падпольная літаратура), 4. Фашыстаўская літаратура.

Краты. З-за крат глядзяць Фотографіі Б. Тарашкевіча. Дварчаніна. Мятлы, Валошына, Грэскага, С. Рак-Міхайлоўскага і інш. таварышоў, якія сядзелі ў польскіх фашыстоўскіх турмах, і якія і цяпер знаходзяцца ў засьценках. Тут-жа прадстаўлены выданьні ЦК Мопру Заходняй Беларусі, аднаднёўкі „Турмы клічуць да барацьбы", „Чырвоная дапамога", „МОПР", турэмная часопісь на гэктографе на яўрэйскай мове.

У аддзеле радыкальнай літаратуры паказаны вучнёўскія гектографаваныя часопісі вучняў віленскай беларускай гімназіі, газэты „Сіла праца", „Праца" „На варце", яўрэйскія часопісі на гектографе.

У аддзеле падпольнай літаратуры паказаны паасобныя нумары газэт „Чырвоны сьцяг", „Бальшавік", „Малады комуніст",—выданьні ЦК КПЗБ і ЦК КСМЗБ, часопісь „Пад сьцягам комунізму" партыйная літаратура. Самым цікавым сярод падпольнай літаратуры зьяўляецце кніжка вершаў М. Радзевіча „На паняволеных гонях", выдадзеная ў Вільні пад відам выданьня Кракаўскай акадэміі, і поэма Чырвонага Зьвястуна „Непераможная", выдадзеная на гэктографе. Фашыстоўская літаратура прадстаўлена выданьнямі беларускіх нацыянал-фашыстых Луцкевічаў, Астроўскіх і К-о, тут зьнешчаны „Хрысьціянская думка". „Зарніца" і інш.

На гэтым канчаецца выстаўка.

Beta

● Р. Мурашка канчае пісаць кіно-сцэнары. Тэма—1905 год на Беларусі.

● Л. Барашка піша кніжку нарысаў „Рэспубліка белага золата".

● А. Салагуб рыхтуе крытычны артыкул пра сучасную мастацкую літаратуру ў Зах.

Беларусі. Працуе над аповесьцю з жыцьця комсамолу Зах. Беларусі. Напісаў брошуру „Жыцьцё і дзейнасьць члена ЦК КПЗБ Арсэня Канчэўскага".

● Малады поэта Зах. Беларусі Таўлай піша поэму, якая прысьвячана жыцьцю і змаганьню Арсэня Канчэўскага.

● С. Куніцкі напісаў артыкул пра творчасьць Крапівы.

● Літаратурная брыгада МенАПП, у складзе менапаўцаў Ю. Таўбіна, Куляшова, С. Ліхадзіеўскага, П. Броўкі, С Баранавых, А. Кучара і члена „Узвышша" Крапівы выяжджала ў кастрычніку месяцы ў мяст. Заслаўе. Брыгада правяла шэраг дакладаў пра пролетарскую літаратуру і наладзіла шэраг літаратурных вечароў для парт. комсамольскага колектываў, рабочых, служачых і пагранічнікаў Заслаўя.

У друкарні імя Сталіна зараз працуе два паасобных літгурткі: беларускі і яўрэйскі. У яўрэйскім гуртку выявіліся Кацовіч, Ідольчык, Карпіловіч Лапідус і інш. Творы іх друкуюцца ў „Друкарскай праўдзе", „Акцябры" і інш. Зараз друкуецца зборнік твораў сяброў яўрэйскага гуртка. Гурток праводзіць значную творчую работу.

Па дакладу аб становішчы літработы ў друкарні парткалектывам прынята наступная рэзалюцыя:

Заслухаўшы даклад аб рабоце літгуртка друкарні імя Сталіна, бюро партколектыву адзначае, што за пэрыод 6-месячнай работы гуртка ён мае значныя посьпехі як у колькасьці— ахоплена 70 рабочых ударнікаў нашага прадпрыемства, как і ў якасным напрамку: выпуск дзьвюх літстаронак, падняцьце ідэолёгічна-мастацкай кваліфікацыі сяброў гуртка. Заняткі ў яўрэйскай сэкцыі праходзяць рэгулярна. Матэрыял гуртка ў большасьці зьвязаны з жыцьцём прадпрыемства. Аднак маюцца і недахопы, якія патрэбна ў хуткі час зжыць, а менавіта дрэнная работа польскай сэкцыі (сэкцыя амаль не працуе), перабоі ў рабоце беларускай сэкцыі, слабая популярызацыя гуртка на прадпрыемстве і г. д.

Улічваючы ўсё гэта, бюро пастанаўляе:

1. Замацаваць сталы дзень пяцідзёнкі за літгуртком, які ні ў якім разе не павінен быць сарваны.

2. Арганізаваць вечар сустрэчы літгурткоўцаў з рабочымі прадпрыемства і прадстаўнікамі БелАППа.

3. Бюро партколектыву, а таксама бюро комсамольскага колектыву ўключыць у плян працы даклады аб закліку ўдарнікаў у літаратуру.

4. Выдзеліць з сродкаў фабкому пэўную суму грошай на ўтрыманьне літгурткоў.

5. Перанесьці вопыт работы нашых літгурткоў на іншыя прадпрыемствы Менску і інш. гарадоў БССР.

6. Неадкладна арганізаваць польскую сэкцыю.

7. Увесьці на занятках гуртка сыстэматычныя лекцыі па марксызму і ленінізму. а таксама па гісторыі БССР.

8. Сыстэматычна павінна выходзіць літаратурная старонка пры „Друкарскай праўдзе", апрацаваная сіламі сяброў гуртка.

9. Разгрузіць членаў літгуртка ад другіх нагрузак, лічачы, што работа ў літгуртку зьяўляецца аднэй з асноўных нагрузак.

10. Работа на другой зьмене вельмі часта прымушае рабочага адсутнічаць на сходзе гуртка, таму дабіцца замены па магчымасьці гэтых рабочых у дзень вучобы.

11. Шчыльна зьвязаць работу „Сіняй блюзы" клюбу з літгуркамі, практыкуючы колектыўную творчасьць.

12. Пры ягнуць літгурткоўцаў да выпуску насьценгазэт і шматгыражкі.

13. Даручыць культполітасьвету стварыць адзінае бюро для кіраўніцтва ўсімі літгуркамі.

14. Даручыць яўрэйскаму літгуртку ўзяць на буксір беларускі і польскі гуркі.

15. Даручыць бюро літгурткоў арганізоўваць інтэрнацыянальныя літаратурныя вечары.

16. Ухваліючы ініцыятыву яўрэйскага літгуртка па стварэньні гісторыі друкарні, даручыць бюро прыцягнуць грамадзкую думку рабочых двукарні да гэтага пытаньня.

● Для кіраўніцтва Беларускай фэдэрацыяй аб'яднаньняў савецкіх пісьменьнікаў (БелФАСП) вылучаны рабочы сэкратарыят у складзе А. Сянкевіча (адказны сэкратар), Платона Галавача і Кузьмы Чорнага.

● 28 лістапада гэтага году спаўняецца 3-я гадавіна з часу арганізацыі Беларускай асоцыяцыі пролетарскіх пісьменьнікаў (БелАПП).

● Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр пад кіраўніцтвам народнага артыста рэспублікі Галубка рэорганізуецца ў трэці беларускі дзяржаўны тэатр (БДТ3).

● 25 лістапада склікаецца пашыраная канфэрэнцыя Менскай асоцыяцыі пролетарскіх пісьменьнікаў. На парадку дню конфэрэнцыі: політычны даклад ЦК КП(б)Б (тав. Шаранговіч), даклад тав. Бэндэ аб становішчы пролетарскай літаратуры БССР і яе далейшых задачах і інш.

У працы конфэрэнцыі будзе ўдзельнічаць творчы актыў рабочых літгурткоў менскіх прадпрыемстваў.

Да конфэрэнцыі выпушчаецца літаратурная газэта-аднадзёнка і выходзіць з друку зборнік рабочых-ударнікаў менскіх прадпрыемстваў.

● Па пастанове Менскага гаркому ЛКСМБ організавана комсамольская ячэйка пісьменьнікаў. У складзе ячэйкі налічваецца 13 комсамольцаў. Адказным сэкратаром ячэйкі абраны тав. Сьцяпан Ліхадзіеўскі.

● У Доме навукі і тэхнікі адбыўся вечар беларускай пролетарскай літаратуры—для Менскай гарадзкой організацыі комсамолу. Вечар быў прысьвячаны проблеме комсамольскай тэматыкі ў беларускай пролетар

скай літаратуры. На вечары выступалі Міхась Чарот, Ліхадзіеўскі, Б. Мікуліч, А. Кучар, П. Броўка, Сяргей Знаёмы, Мікола Хведаровіч, Гарцман і інш.

● Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі прыступіла да практычнага правядзеньня ў жыцьцё пастановы ЦК КП(б)Б аб рэарганізацыі выдавецкай справы. Арганізаваны самастойныя сэктары: літаратуры і мастацтва, масава-партыйны, вучэбна-пэдагогічны, юнацка-дзіцячы, сельска-гаспадарчы, вайсковы і эканомічна-прававы.

● У сьнежні месяцы будзе праводзіцца сьвяткаваньне дзесяцігадовага юбілею творчай работы пролетарскага поэта Андрэя Александровіча.

Для распрацоўкі практычных мерапрыемстваў і правядзеньня юбілея Наркомасьветы вылучыў спэцыяльную камісію.

● У Віцебску пачаў выдавацца штомесячны літаратурны дадатак „Штурм" да газэты „Віцебскі пролетары". У „Штурме", галоўным чынам, будуць зьмяшчацца творы рабочых-ударнікаў, закліканых у літаратуру.

● 7 сьнежня ў Доме комуністычнай асьветы пры ўдзеле комуністаў-пісьменьнікаў, комуністаў-работнікаў мастацтва, культпропаў, прадстаўнікоў друку і інш. адчыняецца усебеларуская партыйная нарада па пытаньнях мастацтва.

Для ўдзелу ў партыйнай нарадзе Комакадэмія камандыруе дырэктара інстытута літаратуры, мастацтва, і мозы тав. Дынамава, кіраўніка сэкцыі выяўленчага мастацтва тав. Маца, кіраўніка музсэкцыі тав. Лібедзінскага і тав. Шамардзіну (тэасэкцыя).

Тав. Дынамаў зробіць даклад на тэму „Ліст тав. Сталіна і задачы тэорэтычнага фронту ў галіне мастацтва".

● Ударная брыгада кінофабрыкі „Савецкая Беларусь" у Ленінградзе пад кіраўніцтвам рэжысэра Ю. Тарыча выканала свой гадавы прамфінплян к XIV гадавіне Кастрычніка ня толькі па колькасных паказчыках, але таксама і па якасных.

Брыгада ў бягучым годзе паставіла мастацкую карціну „Вышыня 88.5" у сямі частках. інструкцыйную карціну „Трывога" і змантыравала з фільмотэкі ў 24 гадзіны агітплякат „Увага".

У сучасны момант брыгада працуе над пастаноўкай адначасова дзьвюх карцін, аднэй мастацкай „Уцекачы" і другой інструкцыйна-вучэбнай „Работа штабу дывізіі".

● Канчаткова вырашана пытаньне ў Савеце народных камісараў БССР аб пабудове ў горадзе Віцебску кінофабрыкі.

Пабудова пачнецца ў сакавіку 1932 году і канчаткова закончана будзе ў кастрычніку 1933 году.

● Вытворчая програма кінофабрыкі на 1932 год мае значную колькасьць сцэнарыяў, якія заказаны паасобным пісьменьнікам і сцэнарыстам. На сёньняшні дзень фабрыкай ўжо заказана 52 сцэнары.

● Сцэнары „Нараджэньне чалавека" піша Александровіч. Тэма—зьнішчэньне рэшткаў дробна-уласьніцкай ідэолёгіі, як вынік актыўнага ўдзелу ў соцбудаўніцтве.

Над сцэнарыем „Грэбля" працуе Ліманоўскі. Тэма—барацьба за спэцыялізацыю ў колгасе.

Сцэнары „На рубяжы" піша Вольны. Тэма—быт і гэроіка пагранічнікаў.

Сцэнары „Жанчына" піша Рыгор Кобец. Тэма—рост жанчыны на грунце соцыялістычных процэсаў і форм працы савецкай вытворчасьці.

● Апрача заказаных сцэнарыяў фабрыка мае ў сваім портфэлі зусім гатовыя сцэнарыі для 1932 г. „Два разы народжаны"—гукавы сцэнары Рыгора Кобеца на тэму пераапрацоўкі адсталых пластоў сялянства ва ўмовах колгаснага будаўніцтва і клясавай барацьбы ўнутры колгасаў; „Чэмбэрлен" (сцэнары Марыенгофа) на тэму аб клясавай барацьбе ў сьвінагадоўчым колгасе. „На сутыку" (сцэнары Бахара), дзе тэмай зьяўляецца самаахвярная работа нашых пагранічных войск і іх быт; „Тытан" (комэдыя Кудраўцава і Талмачова) на тэму барацьбы за рэконструкцыю воднага транспорту. „ПВО" (сцэнары Васількоўскага) на тэму аб арганізацыі насельніцтва вакол супроць паветранай абароны, мобілізацыя ўвагі насельніцтва да проблемы тылу ў будучай вайне—асноўная задача ва ўмовах БССР, як прымежнай рэспублікі.

● Брыгада рэжысэра Вайнштока прыступіла да здымку гукавой поўнамэтражнай карціны „Слава сусьвету" на тэму аб падрыхтоўцы вайны супроць СССР і пераходзе вайны імпэрыялістычнай ў вайну грамадзянскую.

Па ходу сцэнарыя засьняты Дзяржаўны Эрмітаж.

● Брыгада рэжысэра Корша прыступіла да работы над поўнамэтражнай мастацкай карцінай „Кагі празраваюць сьляпыя" (сцэнары Рыгора Кобеца) на тэму аб нарастаньні рэволюцыйнага руху і абвастрэньні клясавых супярэчнасьцяй на Захадзе.

● Гэтая-ж брыгада заканчвае карціну ў пяці частках „Моцны паравоз". Карціна робіцца на заказу ЦК чыгуначнікаў і НКШЗ і зьяўляецца інструкцыйна-вучэбнай фільмай для машыністаў. Для фільма засьняты ўсе моманты прыбыцьця, установкі і зборкі дэсяці амэрыканскіх моцных паравозаў, якія прыбылі ў Савецкі саюз.

● Здымачная брыгада рэжысэра Ю. Тарыча прыступіла да здымкаў поўнамэтражнай мастацкай карціны „Уцекачы" на тэму аб дэзэртырстве.

Здымкі вытвараюцца на Каўказе. Адначасна з здымкай гэтай карціны брыгада здымае інструкцыйна-вучэбную карціну ў шасьці частках „Работа штабу дывізіі".

РСФСР

● У студзені 1932 г. склікаецца нарада РАПП па крытыцы. Нарада заслухае даклады аб становішчы і задачах крытыкі, аб прынцыпах марксысцка-ленінскага аналізу мастацкага твору, аб закліку рабочых-ударнікаў у крытыку і аб масавай рабочай крытыцы.

На нарадзе будуць шырока абгаварвацца крытычныя аддзелы цэнтральных і краявых часопісаў, крытычныя аддзелы літаратурных старонак, бібліографічныя выданьні і г. д.

На нарадзе мяркуюцца даклады прадстаўнікоў часопісаў аб сваіх крытычных аддзелах. Група крытыкаў „На литературном посту" цалкам уключылася ў падрыхтоўку да нарады; група разьбілася на брыгады, якія прапрацоўваюць крытычныя аддзелы цэнтральных, краявых і профсаюзных часопісаў.

Спэцыяльныя брыгады прапрацоўваюць крытычную продукцыю аб творчасьці ўдарнікаў, аб міжнароднай літаратуры, прадмовы да розных выданьняў. У рабоце брыгад прымаюць актыўны ўдзел асьпіранты Л. і М. Інстытуту чырвонай прафэсуры.

● У Маскве створана выдавецкае таварыства чужаземных рабочых у СССР. У задачы выдавецтва ўваходзіць выданьне агульнапалітычнай, даведачнай і мастацкай літаратуры на трынаццаці мовах для чужаземных рабочых, спэцыялістаў і вучняў, якія жывуць у СССР і за межамі.

Аднэй з важнейших работ выдавецтва зьяўляецца выданьне Леніна ў шасьці тамах на дзесяці мовах. Асноўны аддзел выдавецтва—аддзел агульна-палітычнай літаратуры—выпусьціў шэраг артыкулаў і брошур.

Апрача гэтага, выходзіць шэраг кніжок і брошур па сэрыях „Мэмуары старых бальшавікоў" і „Бальшавікі—пакаленьне Леніна".

Выдавецкі плян прадугледжвае таксама літаратуру па марксысцка-ленінскаму завочнаму навучаньню і вялікую колькасьць даведачнай літаратуры.

Выдавецтва выпускае шэраг твораў пролетарскіх пісьменьнікаў. Сярод іх „Разгром" Фадзеева, „Брускі" Панфёрава, „Запіскі нарміроўшчыка" Рэзьніка, „Стачка" Нікіфарава, „Барацьба за мэталь" Міхайлава, „Адзін з дваццаці пяці тысяч" Ізбаха і інш.

Асноўны прынцып, якім кіруецца выдавецтва пры выбары продукцыі, выходзіць з мэт азнаямленьня чужаземцаў, якія жывуць ў СССР і за межамі, з нашымі ўмовамі працы і быту і ўцягненьня іх у соцыялістычнае будаўніцтва СССР.

Пры выдавецтве будзе створаны рабочы рэдакцыйны савет чужаземных рабочых і склікана конфэрэнцыя чытачоў. Чужаземнае выдавецтва ставіць сваёй неадкладнай задачай наладзіць шчыльную сувязь з літаратурнымі організацыямі і выдавецтвамі.

● Выданьне спэцыяльнай сэрыі „Гісторыя заводаў і фабрык" будзе праводзіцца ОГИЗ'ам Створана тройка пад старшынствам Халатава для вырашэньня ўсіх організацыйных і рэдакцыйна-выдавецкіх пытаньняў.

● Крытычны часопіс Расійскай асоцыяцыі пролетарскіх пісьменьнікаў „РАПП", пачынаючы з нумару чацьвертага, рэорганізаваны ў новы часопіс марксысцка-ленінскай літаратурнай крытыкі і тэорыі, у орган ВОАПП „Пролетарская литература". З 1932 г. часопіс мяркуецца выдаваць на расійскай і украінскай мовах і на аднэй з моў Закаўказьля.

● Дзяржаўнае выдавецтва мастацкай літаратуры РСФСР рыхтуе антолёгію народаў Паўночн га Каўказу і Дагестану, якая ахопіць творчасьць чачэнскіх, лезгінскіх, дагестанскіх, асецінскіх, карагайскіх ды інгушскіх паэтаў і пісьменьнікаў.

● У выданьні ГИХЛ вышаў раман рэволюцыйнага негрыцянскага пісьменьніка Ленгстона Хьюза „Сьмех скрозь сьлёзы", у якім аўтар замалёўвае жыцьцё негрыцянскай сям'і работніка ў адным з Паўднёвых гарадоў Злучаных Штатаў.

● РАПП і Інстытут ЛІМ Комуністычнай акадэміі выпушчаюць новае выданьне „Литературное наследство" пад рэдакцыяй Авербаха, Іпаліта і Раскольнікава.

„Л. Н." выходзяць ў сваёй рабоце з ленінскіх выказваньняў пра патрэбу крытычнага перагляду і перапрацоўкі культурнай спадчыны мінулага. „Л. Н" распрацоўвае з марксысцка-ленінскіх позыцый, з погляду сучаснасьці пытаньні гісторыі расійскай грамадзкай думкі, гісторыі літаратуры і гісторыі журналістыкі.

„Л. Н." друкуе нявыданыя матар'ялы і дакуманты з гісторыі літаратуры і гісторыі грамадзкай думкі.

Найбольшую увагу „Л. Н. аддае адшуканьню і публікацыі нявыданай і загубленай літаратуразнаўчай спадчыны клясыкаў марксызму. У цэнтры ўвагі будзе-публікацыя матэрыялаў і дакумантаў, што датычацца гісторыі ды перадгісторыі пролетарскай літаратуры.

„Л. Н." упаршыню ў літаратуры ставіць сваёй задачай сыстэматычную і плянавую распрацоўку гісторыі пролетарскага друку.

„Л. Н." уводзіць аддзел крытычных агляданў, дзе знаёміць чытача з усімі літаратурнымі навінамі з кола пытаньняў, якія распрацоўвае „Л. Н." Спэцыяльная ўвага будзе аддадзена аналізу мэмуарнай спадчыны мінулага, якая выдаецца зараз. Для агляданў будуць прыцягвацца і гісторыка-літаратурныя выданьні саюзных рэспублік, а таксама Захаду, Усходу і Амэрыкі

Выданьне будзе выходзіць багата ілюстраваным.

● У выданьні „Крестьянской газеты" вышаў зборнік „В помощь призы нику-ударнику в литературу". Зборнік зьмяшчае палажэньне пралітгурток, програмы і шэраг аргыкулаў Замойскага, Батрака і інш.

● Алімпіяда нацыянальных тэатраў, якая адбылася ўлетку 1930 г. у Маскве, значна

пасунула справу разгортваньня сеткі нацыянальных тэатраў у РСФСР. За сёлетні год па РСФСР створана 22 новых нацыянальных тэатры. Сярод іх: два ўкраінскіх (Ленінград. Растоў на Дану), чуваскі, удумрскі (Воцкая аўтаномная краіна), перасоўны тэатр Комі, калмыцкі, тры татарскіх, дагестанскі, нямецкі, ойгурскі (Алма-ата), цыганскі (Масква), эстонскі, фінскі, карэйскі, кітайскі ды інтэрнацыянальны (ставіць п'есы на французскай, нямецкай, ангельскай мовах).

● Комуністычная Акадэмія зьлілася з інстытутам Чырвонай прафэсуры. Прэзыдыум ЦВК Саюзу ССР абавязаў Комуністычную акадэмію ў найхутчэйшы тэрмін увязаць сваю навуковую работу с актуальнымі задачамі будаўніцтва соцыялізму і ўжыць ўсе захады па ліквідацыі адставаньня навуковай думкі ад практыкі соцыялістычнага будаўніцтва.

У склад Комуністычнай акадэміі ўваходзяць наступныя інстытуты: эканомікі, аграрны, сусьветнай гаспадаркі, тэхнікі і тэхнічнай політыкі, гісторыі, савецкага будаўніцтва і права, філёзофіі, літаратуры, мастацтва і мовы нацыянальнасьцяй СССР, падрыхтоўкі кадраў.

Апрача таго ў складзе Комуністычнай акадэміі зацьверджана асоцыяцыя прыродазнаўства і асоцыяцыя для вывучэньня проблем вайны.

● Ленінградзкая сэкцыя навуковых працаўнікоў пачынае выданьне мастацкай манографіі „Деятели науки и техники", дзе будуць зьмешчаны біографіі дзеячаў навукі і тэхнікі, якія маюць заслугі на фронце соцыялістычнага будаўніцтва і грамадзкай работы.

● Пры Наркамасьвеце РСФСР утворана камісія для выяўленьня за межамі помнікаў літаратуры і мастацтва народаў РСФСР. Задача комісіі зьбіраць помнікі літаратуры і мастацтва ў орыгіналах або копіях зьбіраць матэрыялы, якія знаходзяцца за межамі царскага тычацца грамадзка-політычнага жыцьця, літаратуры і мастацтва дарэволюцыйнай Расіі і РСФСР. У склад комісіі ўвайшоў Бубноў (старшыня), Бонч-Бруевіч, Лупол, В. Палонскі, Неўскі і інш.

УССР

● У выданьні ЛІМ ДВОУ вышаў „Зборнік савецка-нямецкіх твораў" („Sammlung Sovjet-deutscher Dichtung"). Кніжка, якая выдана на нямецкай мове, зьмяшчае творы сямі савецкіх-нямецкіх пісьменьнікаў: Шэленбэрга, Г. Флюта, Г. Брандта, Г. Гаймана, Ф. Баха, Г. Бахмана і Г. Завадзкага, Зборнік месьціць багата матэрыялу (205 стар. цана 2 руб.) і дае чытачу некаторае уяўленьне аб нямецкай літаратуры ў СССР.

● Пры ЦБ Усеукраінскай організацыі пролетарска-колгасных пісьменьнікаў „Плуг" існуе нямецкая сэкцыя, якая аб'ядноўвае ў сваіх шэрагах нямецкіх пісьменьнікаў ня толькі Украіны, але і ўсяго Савецкага саюзу, бо ў іншых мясцох такіх сэкцый няма.

● Пры ВУСПП створана баўгарская сэкцыя У сэкцыю ўваходзяць Крум Кюляўкоў М Марчэўскі, Г. Глаўчэва, Ол. Кеткоў, М. Фруклееў, П. Аджэраў і інш.

● Харкаўская організацыя пролетарскіх комсамольскіх пісьменьнікаў „Маладняк" прыняла пастанову аб аб'яднаньні з ВУСПП у адзіную пролетарскую літорганізацыю на Украіне—ВУСПП.

У Марыупалі пры рэдакцыі грэцкай газэты „Калектывацісо" організавалася грэцкая сэкцыя ВУСПП-„Забою".

● Нядаўна выйшла з друку опэра — араторыя „Фронт і тыл" на тэкст Воінава з музыкай Гладкоўскага.

Опэра расьпяняе старонкі нашай гераічнай гісторыі, імкнучыся организаваць волю, мас навокал абароны соцыялістычнай краіны.

Сюжэт опэры—паход генэрала Юдзеніча на Петраград. Твор шчыльна зьвязаны з сёньняшнім днём, досыць дынамічны.

● Для стварэньня кадраў украінскай кінематографіі Украінфільм прымае вялікія захады.

На базе Адэскага кінотэхнікуму і Фотоадзелу Кіеўскага мастацкага інстытуту организаваны Інстытут кінематографіі. На базе першай і другой індустрыяльных профшкол организаваны ў Кіеве фото-тэхнікум, і ў Адэсе—тэхнікум дакладнай мэханікі.

Інстытут кіноматографіі рыхтуе мастацкія і тэхнічныя кадры для адэскай і Кіеўскай кінофабрык, фотатэхнікум—кадры для фотофабрык і Фотоатэльле і тэхнікум дакладнай мэханікі—для мэханічнага заводу, які выпускае кіноапаратуру.

● Для задавальненьня патрэб колектывізаванай вёскі створаны курсы кіномэханікаў, якія згодна пляну мяркуюць выпусьціць 2.150 кіномэханікаў.

● Музэй імя Скаварды (Харкаў) атрымаў новыя цікавыя матар'ялы пра дэкабрыстаў. Матэрыялы раней належалі ўнучцы дэкабрыста барона Розэна. Матэрыялы складаюцца з газэт („Северная пчела", „Русский инвалид или Военные ведомости"), розных афіцыйных папер, рукапісаў, малюнкаў і фото. Матэрыял мае значную цікавасьць ня толькі для гісторыі рэволюцыйнага руху, але і для гісторыі літаратуры. У матэрыялах маюцца вершы Рылеева, Одоеўскага і інш.

● Выдавецтва „Гарт" зварачае значную ўвагу на выданьне твораў рабочых-ударнікаў, закліканых у літаратуру.

Выйшлі альманахі літаратурных груп з ударнікаў, закліканых у літаратуру, якія организаваны пры заводах: Трактарабуд—пад назвай „Кузьня гэрояў", Авіозавод—„На крыльлях", Дніпрабуд—„На бэтоне" ды зборнік расійскай сэкцыі ВУСПП—„Ударный Харьков".